Магілёўскі цэнтр турызму, краязнаўства і экскурсій ЦФВіС
упраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама

Магілёўскі гарадскі савет Беларускага дабраахвотнага
таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры

Магілёўскае грамадскае аб'яднанне "Кола сяброў"

**М.С.Барысенка.**

# *"Магілёўшчына – мой любы і невядомы край"*

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА**: ***Бяспанскі С.І., Васількоў В.І., Капылоў У.І., Краўчанка У.Л., Ножнікаў М.А., Сідараў А.М., Хадоркіна С.А.***

**У 1-й частцы зборніка змешчаны тры экскурсіі па г. Магілёву: *"Архітэктурная спадчына Магілёва"* (пешаходная), *"Экскурсія-агляд па Старому гораду"* (пешаходная) і *"Абарона Магілёва ў 1941-м годзе"* (аўтобусная). Разлічаны яны на экскурсаводаў і кіраўнікоў экскурсійных груп навучэнцаў, педагогаў, усіх жадаючых і зацікаўленых у самастойным вывучэнні гісторыі і культуры горада. Выданне багата ілюстравана і ўключае ў сябе, акрамя добра вядомых звестак, новыя напрацоўкі гісторыкаў і краязнаўцаў за апошнія дзесяць год.**

**У другой частцы кніжкі будуць змешчаны 10 аўтобусных маршрутаў экскурсій па Магілёўскай вобласці (гл.дадатак).**

**Магілёў**
**2003**

***РЭЦЭНЗЕНТЫ**:*

**Агееў А.Р.**- дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.Куляшова, кандыдат гістарычных навук.

**Марзалюк І.А.**- дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.Куляшова, кандыдат гістарычных навук.

**Барысенка М.С.** Магілёўшчына – мой любы і невядомы край. Зборнік экскурсій у 2-х частках. Ч.1. Магілёў, 2003. 190 с.: іл.

Аўтар выказвае шчырую ўдзячнасць за дапамогу і слушныя заўвагі пры падрыхтоўцы выдання да друку магілёўскім гісторыкам, краязнаўцам, экскурсаводам, журналістам, музейным і бібліятэчным работнікам:

**Браценнікавай Таццяне**
**Бяспанскаму Сяргею**
**Васількову Віталю**
**Зарэмскаму Уладзіміру**
**Кандрацьевай Людміле**
**Капыціну Вячаславу**
**Катлёнак Але**
**Косцераву Аляксандру**
**Краўчанку Уладзіміру**
**Ножнікаву Мікалаю**
**Шымукенусу Міхаілу**
**Палажэнцавай Тамары**
**Рыдзеўскаму Генадзю**
**Седзіну Анатолю**
**Сідарэнку Барысу**
**Скульбедаву Уладзіміру**
**Тарасавай Марыне**
**Філіповічу Іераніму**
**Хадоркінай Святлане**
**Хамяковай Ларысе**
**Хобатаву Мікалаю**
**Шарухе Ігару**

ISBN

© Барысенка М.С., 2003.
© Барысенка С.М.,афармленне. 2003.

*“Чужое ведаць – добра,*
*сваё – абавязак.”*
**З. Глогер.**

Чалавек пазнае далёкае і незнаёмае, параўноўваючы яго з блізкім і вядомым. Перш чым пазнаёміцца з гісторыяй чужых краёў, неабходна пазнаць бліжэйшую мясцовасць, сваю родную старонку, дзе ты нарадзіўся, вырас, працуеш, дзе ляжаць твае дзяды і твой род, дзе будуць жыць і працаваць дзеці і ўнукі, дзе жыве той народ, з якога ты паходзіш.

Сустрэча з незнаёмым і незвычайным заўсёды глыбока хвалюе і ўзбагачае цікаўнага чалавека. Падарожжа ў сівую мінуўшчыну можна параўнаць з захапляючым вандраваннем у далёкую і малавядомую краіну.

Вядомы даследчык Беларусі, наш зямляк ***Аркадзь Смоліч*** адзначаў, што кожны чалавек любіць сваю Бацькаўшчыну незалежна ад велічу і хараства яе прыроды, ад яе багацця і славы, ад таго дабрабыту, які яна дае сваім сынам. Вандруючы жыхар паўночнай тундры любіць сваю суровую радзіму не менш, чым жыхар яскравага, поўнага жыцця і фарбаў, багатага поўдня. Такое замілаванне і прымушае нас цікавіцца родным краем, яго гісторыяй, культурай і прыродай.

Рыхтуючыся да самастойнага жыцця, мы часцей за ўсё, збіраемся правесці яго ў родным краі, ахвяруючы радзіме свае сілы і здольнасці. Адны з нас будуць працаваць у прамысловасці, другія - на зямлі, трэція - ў школах, але кожны будзе імкнуцца звацца грамадзянінам свайго краю і сынам свайго народу.



Ведаць гісторыка-культурную і прыродную спадчыну краю патрэбна і дзеля чыста практычных мэтаў, тым больш, што існуючыя напрацоўкі ў гэтым накірунку не закончаны. Сёння, бясспрэчна, трэба глыбей пазнаваць сваю малую радзіму, шукаць і бачыць яе арыгінальнае хараство, прыгажосць прыроды, дасканаласць гістарычных і архітэктурных помнікаў, што дайшлі да нас ад папярэдніх пакаленняў.

Непаўторна зачараванне, на першы погляд, непрыкметных краявідаў Магілёўшчыны. Хвойныя лясы суседнічаюць тут з цяністымі дубравамі, гаямі і пералескамі, прагрэтымі сонцам. Пад кронамі дрэў – суцэльны дыван з брусніц, суніц, чарніц, цягнуцца зараснікі ляснога арэха, маліны, яблынь і груш. Перамежаваныя лясамі і балотамі шырока распасцёрліся палі, сенажаці

і пашы. Мяккі цёплы клімат, павольныя і паўнаводныя рэкі, наяўнасць развітай дарожнай сеткі, а таксама шматлікія гістарычныя, архітэктурныя помнікі і аб'екты прыроды, здабылі Магілёўшчыне пэўную папулярнасць у гасцей-падарожнікаў і турыстаў.

Разам з тым, пасля красавіка 1986 года вобласць набыла і прыкрую адметнасць. ***Чорным крылом накрыла больш за 35% яе тэрыторыі радыяцыя.*** Зараз гэта "зона", уваход і ўезд куды дазволены толькі па спецыяльных прапусках. Некалі квітнеючыя , дагледжаныя землі са шматлікімі помнікамі зруйнаваны, зарастаюць пустазеллем і хмызняком. Сёняшнія жыхары і далёкія нашы продкі не маглі ведаць, што іх прывольная, дастатковая прыроднымі багаццямі зямля, іх благаславенная радзіма, ператворыцца ў чарнобыльскую зону адчужэння.

Як адміністратыўная адзінка Магілёўская губерня створана па ўказу Кацярыны II у 1772 годзе, а як вобласць існуе з 15 студзеня 1938 года. Размешчана на ўсходзе Беларусі, найбольшая працягласць з поўначы на поўдзень – 150 км., з захаду на ўсход – 300 км. Самы высокі пункт вобласці знаходзіцца каля чыгуначнай станцыі Цёмны лес Дрыбінскага раёна – 239 м. над узроўнем мора, самы нізкі – ля ракі Сож у ваколіцах в.Гайшын Слаўгарадскага раёна – 126 м. Тэрыторыя вобласці складае 29,1 тыс.кв.км., насельніцтва – 1180,8 тыс. (г.Магілёў – 362 тыс.) чалавек. У адпаведнасці з адміністрацыйным падзелам у яе склад уваходзіць 21 сельскі, 4 гарадскіх раёны і 197 сельскіх саветаў з 3145 сельскімі населенымі пунктамі. Буйнейшыя гарады – ***Магілёў, Бабруйск, Крычаў, Асіповічы, Горкі.***

Рэльеф вобласці пераважна раўнінны. Усходнюю частку яе тэрыторыі займае Аршанска-Магілёўская раўніна, заходнюю – Цэнтральна-Бярэзінская раўніна. Рэкі належаць да басейна ***Дняпра,*** які цячэ па тэрыторыі вобласці з поўначы на поўдзень на працягу больш 200 км. Найбольшыя яго прытокі – ***Друць, Сож, Бярэзіна;*** прытокі Прыпяці – Пціч; Сажа – Беседзь і Проня; Бярэзіны – Свіслач. Найбольшыя азёры – ***Чорнае, Выгада, Няропля,*** вадасховішчы – ***Чыгірынскае*** і ***Цяцерынскае*** на Друці, ***Асіповіцкае*** на Свіслачы. Лясы займаюць 34% плошчы, найбольшыя з іх ў Клічаўскім, Асіповіцкім, Глускім, Быхаўскім раёнах.

У межах вобласці знаходзяцца ***тры заказнікі рэспубліканскага значэння*** (гідралагічныя – ***"Заазер'е"*** у Бялыніцкім р-не, ***"Астравы-Дулебы"*** ў Клічаўскім і Бялыніцкім р-нах, ландшафтны – ***"Старыца"*** ў Быхаўскім р-не) і ***178 мясцовага значэння.***

Добра знаёмы жыхарам Магілёўшчыны такія ***помнікі садова-паркавага мастацтва рэспубліканскага значэння, як Грудзінаўскі парк*** у Быхаўскім і ***Жыліцкі -*** у Кіраўскім раёнах, ***дэндралагічны парк*** Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі; геалагічныя і гідралагічныя помнікі – ***"Ніжнінскі роў"***- агаленне міжледніковага тарфяніка ў Шклоўскім, ***"Блакітная крыніца"*** ў Слаўгарадскім, ***"Палыкавіцкая крыніца"*** ў Магілёўскім, ***міжледніковае агаленне*** ў Чэрыкаўскім раёнах.

Ідэя стварэння гэтай кніжкі з’явілася некалькі год таму назад, калі мы адчулі пэўны вакуум, а дакладней - адсутнасць выдання для моладзі і людзей сталага ўзросту, з дапамогай якога можна было б поўнамаштабна і комплексна азнаёміцца з даўнінай краю. Наяўнасць асобных, адзінкавых экскурсій па гораду і вобласці ў камерцыйных турысцкіх фірмаў праблемы не вырашала (да таго ж тэксты іх экскурсій недаступны з-за “цэхавога інтарэсу” экскурсаводаў).

Сур’ёзныя напрацоўкі гісторыкаў і краязнаўцаў дазволілі зрабіць гэта выданне максімальна насычаным фактамі, падзеямі і ілюстрацыямі. З яго дапамогай любы жадаючы можа падабраць маршрут ці яго частку і, крыху падрыхтаваўшыся, правесці добрую экскурсію ці асабіста папоўніць свой багаж ведаў.

Менавіта на вырашэнне гэтай праблемы і скіравана стварэнне дапаможніка, разлічанага ў першую чаргу, на ***падарожнікаў, экскурсаводаў, настаўнікаў, арганізатараў пазакласнай і пазашкольнай работы, студэнтаў, усіх зацікаўленых у вывучэнні роднага краю.***

У першую частку зборніка ўвайшлі кароткі гістарычны нарыс па Магілёўшчыне, тры экскурсіі па г.Магілёву і анонс аўтобусных экскурсійных маршрутаў па вобласці, якія складуць другую частку кніжкі.

# КАРОТКІ ГІСТАРЫЧНЫ НАРЫС.

Тэрыторыя Магілёўскай вобласці засялялася ў старажытнейшыя часы каменнага веку – ***палеаліту,*** калі чалавек яшчэ не ведаў ужывання металу, калі для задавальнення сваіх патрэб і абароны ад дзікіх звяроў карыстаўся толькі камнем, крэмнем і звярынымі касцямі. З іх ён вырабляў для сябе зброю, скура служыла адзеннем, мяса – ежай. Ад той аддаленай ад нас на многія тысячагоддзі эпохі захаваліся матэрыяльныя доказы ў выглядзе каменных прылад працы і палявання – адшчэпы, востраканечнікі, скрэблы, разцы, наканечнікі коп'яў і інш.

Наогул, камень у той час адыгрываў вельмі важную ролю ў жыцці чалавека. Як толькі чалавек выйшаў з дзікасці, ледзьве пачалося яго разумовае развіццё, як камень зрабіўся пастаянным спадарожнікам яго жыцця.

***Найстаражытнейшыя стаянкі каменнага веку*** на тэрыторыі вобласці выяўлены на беразе Дняпра каля ***в.Абідавічы Быхаўскага і в.Клеявічы Касцюковіцкага раёнаў.***

У VIII–X ст.ст. Магілёўшчыну насялялі славянскія плямёны ***дрыгавічоў, крывічоў, радзімічаў.*** Асноўным іх заняткам было земляробства і жывёлагадоўля, а дапаможным – рыбалоўства, паляванне, бортніцтва, гандаль.

Дрыгавічы жылі ў паўднёва-заходняй частцы вобласці, у басейне Бярэзіны, крывічы – у паўночнай частцы, а радзімічы – у паўднёвай і паўднёва-усходняй частцы вобласці, у басейне р.Сож. Іх адметнасці ў гэты час – археалагічныя помнікі ў выглядзе курганных магільнікаў з пахавальным абрадам трупаспалення ці трупапалажэння. У асобных пахаваннях трапляюцца прылады працы, кераміка, упрыгожанні, рэдка – зброя.

Уздоўж водных шляхоў (Сож, Дняпро) вырастаюць старажытнейшыя гарады, гандлёва-рамесныя цэнтры Магілёўшчыны. Паводле пісьмовых крыніц з ***1136 г. вядомы Прапойск,*** з ***1150 г. – Крычаў,*** з ***1156 г. – Мсціслаў,*** з ***1267 г.–Магілёў*** (афіцыйная версія). Важную ролю ў гэтым адыграў старадаўні вялікі дняпроўскі шлях ***"з вараг у грэкі",*** які да XIII ст. і пазней звязваў Скандынавію з Міжземнамор'ем.

У перыяд феадальнай раздробленасці тэрыторыя Магілёўшчыны ўваходзіла ў розныя ўдзельныя княствы. Паўночная яе частка – у Полацкае, а затым у Друцкае і Віцебскае княствы, частка паўночнага Пасожжа з гарадамі Прапойск, Крычаў, Мсціслаў у XII-XIII ст.ст. знаходзілася ў кладзе Смаленскага княства.

З X стагоддзя пачынаецца пашырэнне пісьменнасці. Несумненна, гэта звязана з ***хрысціянствам,*** якое аказала значны ўплыў на ўсе сферы жыцця

грамадства. Большасць твораў мастацтва была звязана з новай рэлігіяй, з яе культам. Помнікаў таго часу на Магілёўшчыне захавалася мала, але знойдзеныя пры раскопках у Мсціславе крыж-складзень XII ст., вырабы кастарэзаў, берасцяная грамата XII – XIII ст.ст. сведчаць аб высокім узроўні прыкладнога мастацтва і развіцці пісьменнасці.

З XIV ст. – Магілёўшчына - ў складзе Вялікага княства Літоўскага (пазней Рускага і Жамойцкага). Вялікі князь Літоўскі асабіста валодаў Магілёўскім староствам. Пад уладу вялікага князя ***Альгерда Гедымінавіча*** перайшло ў 1358 годзе і Мсціслаўскае княства. Тэрыторыя вакол Бабруйска ў сярэдзіне XIV ст. належала мінскаму князю ***Скіргайлу Гедымінавічу,*** князь ***Свідрыгайла*** ў 1430 г. атрымаў у валоданне Быхаў і Прапойск, князям ***Гальшанскім*** у XV ст. належаў Глуск. З 1390-х гадоў асобныя ўдзельныя княствы ліквідаваны, а ў 1413 г. - замест іх утвораны Віцебскае і Мсціслаўскае ваяводствы, у склад якіх увайшла тэрыторыя вобласці.

На працягу XV ст. былыя крэпасці–замкі (Бабруйск, Быхаў, Глуск, з XVI ст. Шклоў, Галоўчын) набылі рысы гандлёва–рамесных цэнтраў. Да сярэдзіны XVII ст. на Магілёўшчыне было больш за 40 гарадоў і мястэчак. Буйным горадам на Беларусі стаў Магілёў (8 тыс. жыхароў), да сярэдніх адносіліся Быхаў, Мсціслаў, (5 тыс. жыхароў), да малых – Бабруйск, Горы-Горкі, Крычаў, Шклоў, Чавусы, Чэрыкаў (менш за 2 тыс. жыхароў).

З 16 ст. паміж Магілёвам, Мінскам і Віцебскам існавалі пастаянныя гандлёвыя сувязі. Магілёўскія купцы мелі крамы ў Бабруйску, Шклове, Крычаве, Гомелі, Талачыне. Яны вялі ажыўлены гандаль з гарадамі Рускай дзяржавы, а таксама з Люблінам, Кракавам, Познанню, Канстанцінопалем , Малдавіяй. Гарады пастаянна дамагаліся ад вярхоўнай улады адмены натуральных павіннасцей на карысць мясцовых феадалаў, устанаўлення гарадскога самакіравання паводле магдэбургскага права, якое атрымалі Магілёў (1577 г.), Крычаў (1633 г.), Чавусы (1634 г.), Мсціслаў (1636 г.), Чэрыкаў (1641 г.), Бабруйск, Быхаў. Менавіта да таго часу адносіцца перыяд росквіту гаспадарчай дзейнасці гарадоў і мястэчак Магілёўшчыны.

Настаў час, калі Вялікае княства Літоўскае і Польшча аб’ядналіся ў адзіную дзяржаву – ***Рэч Паспалітую***. Люблінская ўнія 1569 г. і Брэсцкая царкоўная ўнія 1596г. дапамаглі феадалам і каталіцкаму духавенству ўмацаваць свае пазіцыі на беларускіх землях, але гэта рэзка абвастрыла нацыянальна-рэлігійныя і класавыя супярэчнасці. Пашырыліся выступленні сялян і гарадской беднаты. Многія з іх уцякалі ў Расію ці на Украіну, дзе папаўнялі рады запарожскага казацтва.

Восенню 1595 г. поўдзень і ўсход Беларусі апынуліся ў сферы дзейнасці украінскіх казакоў-паўстанцаў на чале з ***Севярынам Налівайкам.*** 13 снежня 1595 г. яго атрад штурмам узяў Магілёў, які на працягу двух тыдняў разам са сваімі паплечнікамі-казакамі, рабаваў і паліў. Як адзначаецца ў ***Баркулабаўскай хроніцы***: “Место славное Могилёв, место набожное, домы, крамы, острог выжгли: домов всех яко 500, а крамов с великими скарбами

400. Мещан, бояр, людей учтивых так мужей, яко и жон, детей малых побили, порубали, попоганили, скарбов тож неизлечоных побрали с крамов и з домов". Зборнае войска рэчыцкага старасты, гетмана ***Мікалая Буйвіда*** адагнала паўстанцаў ад Магілёва да Быхава і далей на Валынь.

У 1606 годзе ў Магілёве адбыліся бунты супраць заможных гарадскіх вярхоў, злоўжыванняў і хабарніцтва членаў магістрата. Гараджане на чале са ***Стахорам Мітковічам*** занялі ратушу і выбралі новую раду з прадстаўнікоў незаможных рамеснікаў. Да 1610 года з невялікімі перапынкамі дзейнічала рада ў інтарэсах шырокіх гарадскіх мас, але 23 ліпеня 1610 года на падставе прыгавору войтаўска–лаўніцкага суда, 5 кіраўнікоў паўстання былі смяротна пакараны на Ільінскай гары ў Магілёве, а ўся далейшая дзейнасць магістрата ажыцяўлялася пад наглядам магілёўскага войта ***Яраша Валовіча.***

У ***антыфеадальную вайну украінскага і беларускага народаў 1648–1651*** *гг.* паўстанні ахапілі і Магілёўшчыну. Казацкі атрад на чале з ураджэнцам Быхава, палкоўнікам войска Запарожскага ***Ільёй (Філонам) Гаркушам*** у 1648 г. прыбыў з Украіны на Беларусь, асадзіў Ст. Быхаў, аднак узяць яго не змог. У 1651 г. ён удала ваяваў у раёне Прыпяці, а потым на шляху з Чачэрска да Чэрыкава яго атрад быў разбіты войскам Вялікага княства Літоўскага.

У час ***вайны Расіі і Рэчы Паспалітай 1654-1667 гг.*** працяглыя і спусташаючыя баявыя дзеянні ў нашым краі праходзілі за гарады Мсціслаў, Шклоў, Прапойск, Ст. Быхаў, Магілёў. Акрамя страт і разбурэння яна нічога не прынесла народу, Беларусь засталася ў складзе Рэчы Паспалітай.

Падзеі ***Паўночнай вайны 1700 – 1721 гг.*** таксама не мінулі Магілёўшчыну. Яна зноў становіцца арэнай ваенных дзеянняў, цяпер ужо паміж рускімі і шведскімі войскамі. Пад Крычавам, у 1708 г. стаяў лагер рускіх войск на чале з ***Пятром І.*** 3 ліпеня 1708 г. каля в. Галоўчын Бялыніцкага р-на адбыўся бой, у якім перамогу атрымалі шведы. 7 ліпеня яны занялі і разрабавалі Магілёў. А 8 верасня 1708 г. (па ст. стылю) ужо рускія войскі ўвайшлі ў горад, зрабавалі, што яшчэ засталося пасля шведаў, а потым ушчэнт спалілі яго.

Пасля гэтай падзеі, а таксама ў выніку выхаду Расіі да Балтыкі ("акно ў Еўропу" Пятра І), калі перастаў існаваць транзіт праз Беларусь, Магілёў ужо не змог дасягнуць былога росквіту...

28 верасня 1708 г. рускія войскі каля в.Лясная Слаўгарадскага р-на разграмілі шведскі корпус генерала ***Левенгаўпта,*** які ішоў на дапамогу ***Карлу ХІІ.*** З усяго 16-ці тысячнага корпуса Левенгаўпт прывёў да караля крыху больш за 4-х тыс. чалавек.

Войны XVII–XVIII ст.ст. прычынілі вялікія разбурэнні гарадам і вёскам Магілёўшчыны. Асабліва дасталося Бабруйску, Крычаву, Магілёву і Чэрыкаву.

На працягу XIV–XVI ст.ст. утварылася ***беларуская народнасць***. За гэты час культура беларускага народа набыла самабытны характар, нацыянальную

своеасаблівасць. На ранніх этапах фарміравання і развіцця беларускай мовы найбольшае пашырэнне на Беларусі дасягнула службовая, афіцыйная пісьменнасць. У Вялікім княстве Літоўскім да канца XVII ст. беларуская мова была дзяржаўнай. На ёй пісаліся летапісы і хронікі, свецкія і царкоўныя творы, статуты, граматы, сеймавыя пастановы і іншыя дакументы, вялося справаводства ва ўстановах. Развівалася ў дзяржаве і кнігадрукаванне. Друкарні працавалі ў Бялынічах (1638-1653 гг.), Буйнічах (1635 г.), Магілёве (1616-1773 гг. з перапынкамі). Ураджэнец Мсціслава



Помнік П.Мсціслаўцу.

***Пётр Цімафеевіч Мсціславец,*** беларускі першадрукар і гравёр, разам з ***І.Фёдаравым*** заснаваў друкарні і працаваў у Маскве і Вільні. У Магілёве нарадзіўся беларускі друкар і асветнік ***Спірыдон Собаль***. У пачатку XVII ст. ён настаўнік і рэктар Магілёўскай брацкай школы, у 1630 г. заснаваў друкарню ў Куцеінскім манастыры пад Оршай, выдаў у Буйнічах "Псалтыр" (1637 г.), у Магілёўскай брацкай друкарні "Буквар" (1636 г.) і "Тэстамент" (1638 г.).

З Магілёўшчынай звязаны жыццё і дзейнасць беларускага педагога і перакладчыка, царкоўнага дзеяча ***Лаўрэнція Зізанія***, беларускага і ўкраінскага пісьменніка-палеміста, грамадскага дзеяча ***Мялеція Сматрыцкага.***

У гістарычна-мемуарнай літаратуры важнае месца займае ***"Баркулабаўскі летапіс",*** помнік беларускага летапісання пач. XVII ст., які быў складзены ў в. Баркалабава Быхаўскага р-на і ахоплівае падзеі 1545-1608 гг. з пункту гледжання чалавека, блізкага да народных нізоў. Твор гэты напісаны жывой, вобразнай і каларытнай беларускай мовай.



Герб Магілёўскай губерні.

У выніку ***падзелаў Рэчы Паспалітай*** ( першага ў 1772 г. і другога ў 1793 г.) Магілёўшчына адышла да Расіі. У 1772 г. была ўтворана Магілёўская губерня з Аршанскай, Магілёўскай, Мсціслаўскай і Рагачоўскай правінцыямі. Вялікія зямельныя надзелы і прыгонных атрымалі тут фаварыты ***Кацярыны ІІ***: генерал-фельдмаршал ***Р.А.Пацёмкін*** – землі былога Крычаўскага староства і г. Шклоў (з 1773г.), генерал ***С.Г. Зорыч*** – г. Шклоў (з 1778г.), князь ***А.М. Галіцын*** – г. Прапойск, княгіня ***К.Р. Дашкава*** – Круглае (з 1782г.). Гаспадарчае развіццё гарадоў у той час некалькі ажывілася, паступова яны выходзілі са стану разарэння. З губерні ў Маскву, Пецярбург і іншыя гарады вывозілі парусіну, лён, пяньку, воск, канапляны алей. У Крычаве ў 1773 г. ***Р.Пацёмкін*** стварыў буйную мануфактуру, на якой выраблялася парусіна для Чарнаморскага флоту. Тут жа дзейнічалі судаверф, канатная, гарбарная,

цагельная мануфактуры, бровар. Канатныя і парусінавыя прадпрыемствы былі ў Горках, Шклове, в. Благоева Клімавіцкага павета. ***Па вытворчасці парусінавага палатна Магілёўская губерня займала 2-е месца ў Расіі.*** Працавалі суконныя (Шклоў, Горкі), паташныя, жалезныя, медныя (в. Уюн Быхаўскага павета, каля 1795 г.), шкляныя (Крычаў, фальварк Лубянка Быхаўскага павета), гарбарныя, палатняныя (Круглае, 1797 г.), залаташвейныя (фальварк Сямёнаўскі каля Шклова) прадпрыемствы. Іх прадукцыя карысталася шырокім попытам на рынках Беларусі, рускіх і ўкраінскіх губерняў.

У першы ж месяц ***руска-французскай вайны 1812 г.*** тэрыторыя Магілёўшчыны стала арэнай ваенных дзеянняў. Пад націскам французаў рускія войскі адыходзілі з баямі, пазбягаючы генеральнай бітвы да аб’яднання 1-й і 2-й армій ў зручным раёне.1-я армія *(*генерал ***М.Б.Барклай-дэ-Толі)*** адышла на Віцебск, а 2-я армія (генерал ***П.І.Баграціён)*** адступала ў напрамку Ваўкавыск – Слуцк – Бабруйск – Магілёў. Але французскі корпус маршала ***Л.Даву*** апярэдзіў яе, падышоў да Магілёва раней і пасля бою з рускім гарнізонам 8 ліпеня (ст.стыль) 1812 г. заняў горад, перарэзаўшы шлях адступлення 2-й рускай арміі. 11 ліпеня (ст.стыль) каля в.Салтанаўка Магілёўскага р-на корпус генерала ***М.М.Раеўскага*** ў бітве стрымаў войскі Л.Даву, чым даў магчымасць пераправіць праз Дняпро ў раёне Новага Быхава і выратаваць ад разгрому асноўныя сілы 1-й арміі П.І.Баграціёна.

Важную ролю ў гэтай вайне адыграла ***Бабруйская крэпасць***, гарнізон якой (каля 5000 чал.) з 10 ліпеня па 10 лістапада 1812 г. вытрымаў асаду французскай 17-й пяхотнай дывізіі генерала ***Я.Дамброўскаг*а** і інш. часцей (усяго каля 12 тыс. чалавек).



Дз. Давыдаў

На тэрыторыі Магілёўскай губерні дзейнічалі партызанскія атрады генерал-лейтэнанта ***А.М. Сяславіна***, у р-не Шклова і Бялыніч - палкоўніка ***Дз.В. Давыдава****.* У лістападзе Магілёўшчына была вызвалена ад акупантаў.

Вайна 1812 г., як і папярэднія войны, нанесла вялікія спусташэнні: многія гарады былі разбураны, вёскі абрабаваны ці знішчаны, скарацілася колькасць насельніцтва.

Разам з тым жыццё не прыпынялася. На працягу 1-й паловы XIX ст. было пабудавана некалькі дарог, праз Шклоў і Магілёў прайшла ***Пецярбургска- Кіеўская шаша***. Да пачатку 1860-х гадоў пракладзены тракт Магілёў – Чавусы – Крычаў – Мсціслаў; Маскоўска – Варшаўская шаша прайшла ад Рослаўля на Крычаў – Чэрыкаў – Прапойск – Рагачоў – Бабруйск. З устанаўленнем у 1850-я гады тэлеграфнай сувязі паміж Пецярбургам і Варшавай тэлеграфныя лініі былі працягнуты да Бабруйска і Магілёва. У 1840 г. заснавана Горы–Горацкая земляробчая школа, ператвораная з 1848 г. у земляробчы інстытут – першую ў Расіі вышэйшую

аграналічную навучальную ўстанову, дзе па меркаванню многіх літаратуразнаўцаў была напісана знакамітая беларуская ***паэма "Тарас на Парнасе".***

Значную ролю ў гандлёвых перавозках па-ранейшаму адыгрывалі водныя шляхі. На Сажы, Дняпры, Бесядзі, Друці ў межах губерні налічвалася каля 20 прыстаней. Найбольш буйныя былі ў Магілёве, Крычаве, Шклове.

Не мінулі Магілёўшчыну і падзеі дзекабрысцкага руху. У 1823 г. у лагерах каля Бабруйска размяшчалася 9-я пяхотная дывізія, у палках якой служылі дзекабрысты ***С.І.Мураўёў-Апостал, М.П.Бястужаў-Румін, С.І. Павала-Швяйкоўскі, В.С.Нораў, В.К.Тызенгаўзен*** (апошнія тры– камандзіры палкоў). Тут быў распрацаваны Бабруйскі план паўстання, які прадугледжваў арышт цара ***Аляксандра I*** і яго світы ў час агляду імі войск у Бабруйскай крэпасці. Пасля расправы над паўстанцамі, ў Магілёў у 1826 годзе былі прывезены на допыт М.П.Бястужаў-Румін і С.І.Мураўёў-Апостал.

У гэты час на Магілёўшчыне працавалі вядомы рускі мастак ***У.Л.Баравікоўскі***, архітэктар ***М.А.Львоў***, у Магілёве пабываў ***А.С.Пушкін*** – у 1820 г. па дарозе ў Кішынёўскую ссылку, у 1824 г.- з Адэсы ў с. Міхайлаўскае Пскоўскай губерні. Менавіта тады пачаў творчую працу буйны прадстаўнік беларускай культуры, паэт, драматург і тэатральны дзеяч ***В.І.Дунін–Марцінкевіч,*** ураджэнец фальварка Панюшкавічы каля Бабруйска.



Дамбавецкі А.С.

У гісторыка-этнаграфічных даследваннях ***Адама Кіркора***, ураджэнца в.Слівіна Клімавіцкага павета (цяпер Манастыршчынскі р-н Смаленскай вобл.), вялікае месца адводзілася Беларусі. Яму належыць большасць нарысаў пра Беларусь у 3-м томе "Живописной России" (1882г.). Важкі ўклад у вывучэнне мінуўшчыны краю ўнеслі яго ўраджэнцы: ігумен ***Арэст, М.В.Фурсаў, П.В.Шэйн,*** а таксама працаваўшыя тут ***А.С.Дамбавецкі, Е.Р.Раманаў, А.Меер, І.І.Грыгаровіч, М.В.Без-Карніловіч, І.І.Насовіч, І.А.Сербаў, Дз.І. Даўгяла.***

Знакамітым асветнікам 18 ст. на Магілёўшчыне быў ***Георгій Каніскі***, пісьменнік, філосаф, царкоўна-палітычны дзеяч, з 1755 г. беларускі праваслаўны архіепіскап у Магілёве. ***Г.Каніскі*** прыклаў шмат намаганняў, каб вярнуць уніятаў у праваслаўе пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай; імкнуўся да пашырэння асветы ў Беларусі; аўтар курсаў піітыкі і філасофіі, гістарычных запісак пра Магілёўскую епархію.

Адметнай асобай у гісторыі Магілёўшчыны з'яўляўся ***С.І.Богуш–Сестранцэвіч***-царкоўны дзеяч, вучоны, літаратар, дзядзька ***В.Дуніна-Марцінкевіча.*** У 1782 г. Магілёўскі архібіскуп, а з 1798 г. – мітрапаліт усіх рымска-каталіцкіх касцёлаў у Расійскай імперыі.

Найбольш каштоўным помнікам гарадскога летапісання XVII-XIX ст.ст., апошнім беларускім летапісным зводам з'яўляецца "***Магілёўская хроніка Трафіма Раманавіча Сурты і Юры Трубніцкага***" (далей – ***Магілёўская хроніка***), якая ахоплівае падзеі з 1526 да 1856 гг. Складаць яе пачаў у Магілёве лаўнік і купецкі стараста ***Трафім Сурта*** ( падзеі з 1526 г. да 1701 г.). Тут усебакова адлюстраваны падзеі гарадскога жыцця насельніцтва Магілёва, Быхава, Шклова і інш. гарадоў, змешчаны цікавы матэрыял па гісторыі беларускага народа, Рэчы Паспалітай, Украіны, Расіі, пра міжнародныя адносіны XVII - XVIII ст.ст. ***Гэта адзіны ў сваім родзе летапісны твор у славянскіх літаратурах таго перыяду.***

Пад уплывам сувязей з Расіяй пэўнай з'явай беларускай культуры 2-й паловы XVIII–пачатку XIX ст.ст. былі прыгонныя ці ***прыдворныя тэатры.*** Буйнейшымі з іх на Магілёўшчыне з'яўляліся Шклоўскі тэатр графа ***С.Г.Зорыча*** - складаўся са спевакоў і артыстаў балета, вывучаных у шклоўскай балетнай школе, драматычных акцёраў і музыкантаў, да якіх далучаліся аматары, навучэнцы шклоўскага кадэцкага корпуса і гастралёры-іншаземцы; тэатр графа ***З.Р.Чарнышова*** ў Магілёве, дзе праводзілі канцэрты італьянская опера і прыдворная капэла з Пецярбурга ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра, так званыя "Чарнышоўскія музыканты"; тэатр ***Бжазоўскага*** ў Матэвушах каля Быхава. Акрамя таго, у канцы XVIII ст. працавалі тэатры ***С.І.Богуша-Сестранцэвіча*** ў Магілёве, ***Р.А.Пацёмкіна*** ў Крычаве, ***Юдзіцкіх*** у Глуску.

У эканамічных адносінах Магілёўшчана XIX–пачатку XX ст.ст. заставалася аграрнай ускраінай Расійскай імперыі са слабаразвітай прамысловасцю. З 1873 г. праз яе тэрыторыю прайшлі Лібава–Роменская і з 1902 г.- Пецярбургска – Адэская чыгункі.

Падчас І-й Сусветнай вайны Магілёўская губерня з 18 ліпеня 1914 г. была аб'яўлена на ваенным становішчы. У Магілёве з 15 верасня 1915 года да 26 лютага 1918 года размяшчалася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага рускай арміі на чале з імператарам ***Мікалаем ІІ***. Пярыяд паміж Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыямі ў гісторыі Магілёўшчыны - адзін з самых напружаных і, разам з тым, цікавых. Менавіта Магілёў быў у той час трэцім (пасля Петраграда і Масквы) цэнтрам , які вырашаў зыход рэвалюцыі. Зразумела, што адбывалася гэта таму, што тут размяшчалася Стаўка, вакол якой групаваліся ўсе контррэвалюцыйныя сілы.

Восенню 1917 г., пасля арыштаў у Стаўцы і штабах франтоў генералаў ***Л.Г.Карнілава, А.І.Дзянікіна, Маркава, Раманоўскага, Эрдэлі,*** а таксама пасля гібелі ў Магілёве 20 лістапада 1917 года выконваючага абавязкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага генерала ***М.М.Духоніна*** ваенная ўлада ў Магілёве і Расійскай імперыі перайшла да рэвалюцыйнай Стаўкі, якую ўзначаліў бальшавік, прапаршчык ***М.В.Крыленка***.

З 26 красавіка 1919 г. па 3 сакавіка 1924 г. Магілёў з'яўляўся цэнтрам павета Гомельскай губерні Расіі, потым РСФСР.

У 1924 годзе, у выніку першага ўзбуйнення, Магілёўскі, Быхаўскі, Клімавіцкі, Чавускі, Чэрыкаўскі, Горацкі і Мсціслаўскі паветы далучаны да БССР. Паводле новага адміністрацыйнага падзелу на тэрыторыі Магілёўшчыны ўтвораны Магілёўская, Калінінская (цэнтр Клімавічы) і Бабруйская акругі.

Павольна пачынаецца аднаўленне і развіццё прамысловасці. У 30-я гады XX ст. уступілі ў строй фабрыка штучнага валакна, трубаліцейны і аўтарамонтны заводы ў Магілёве, фанерна–дрэваапрацоўчы камбінат, швейная фабрыка і гідролізны завод у Бабруйску, сілікатны завод у Клімавічах, цэментны–у Крычаве, цагельны–у Чавусах, ацэтонавы–у Быхаве і інш.

У 1925 годзе пастановай СНК БССР да Горацкага сельскагаспадарчага інстытута далучылі Беларускі інстытут сельскай і лясной гаспадаркі. На базе іх была ўтворана ***Беларуская дзяржаўная акадэмія сельскай гаспадаркі імя Кастрычніцкай рэвалюцыі.***

Пэўныя зрухі адбываліся і ў культурным жыцці рэгёна, які ў поўнай меры захапіла нацыянальна–культурнае адраджэнне 1920-х гадоў. У Магілёве быў створаны філіял Усебеларускага аб'яднання мастакоў, што існаваў у 1927–1932 гг. З 1924 г. у Магілёве, Бабруйску і Клімавічах дзейнічалі філіі літаратурнай арганізацыі ***"Маладняк".*** Бабруйская філія у 1926–28 гг. выдавала альманах "Уздым", Магілёўская–"Дняпроўскія ўсплескі" (1927г.), "Ранне" (1929г.). На Магілёўшчыне нарадзіліся і пачыналі у гэты час свой творчы шлях пісьменнікі ***П.Галавач, Б.Мікуліч, В.Каваль, В. Шашалевіч, М.Ткачоў, М.Гарэцкі*** і інш.

У лістападзе 1924 г. па ініцыятыве аддзела народнай адукацыі было арганізавана ***Магілёўскае акруговае таварыства краязнаўства,*** 1-я канферэнцыя якога прайшла ў 1926 г. Найбольш энергічна працавалі ў гэты час Прапойскае, Быхаўскае, Шклоўскае і Клімавіцкае краязнаўчыя таварыствы.

У 20-я гады ў асноўным склалася сістэма народнай адукацыі. Увядзенне ва ўсе ступені адукацыі прадметаў па гісторыі і культуры Беларусі, пашырэнне выкладання на беларускай мове закладвалі асновы для выхавання нацыянальна свядомага пакалення людзей.

Але ў канцы 1920-х - пачатку 30-х гадоў уся гэта сістэма і найбольш яскравыя прадстаўнікі нацыянальна–культурнага адраджэння былі знішчаны сталінскім рэжымам. Пад смяротнай сякерай рэпрэсій аказаліся вядомыя пісьменнікі, навукоўцы і краязнаўцы, ураджэнцы Магілёўшчыны: ***Мікалай Азбукін, Платон Галавач, Максім Гарэцкі, Васіль Каваль, Андрэй Мрый (А.А.Шашалевіч –*** псеўд.) і ***Аркадзь Смоліч***.

Блізкасць сталіцы БССР - г. Мінска да польскай мяжы заўжды вызывала ў беларускага кіраўніцтва пэўную трывогу, і, ўрэшце, 19 кастрычніка 1937 г. ЦК КПБ прыняў пастанову аб пераносе сталіцы з Мінска ў Магілёў. Але з-за

нежадання многіх кіраўнікоў рэспублікі пакідаць Мінск, толькі праз 1,5 года пасля чарговай пастановы быў прыняты канкрэтны тэрмін пераносу (лістапад 1939 г.) і ўвода ў эксплуатацыю галоўных новасталічных аб'ектаў: Дома ўрада (зараз Дом Саветаў), будынка НКУС (зараз галоўны корпус МДТУ), жылога дома для чэкістаў і двух 50-ці кватэрных дамоў. Аднак пачатак ІІ-й Сусветнай вайны 1 верасня 1939 г. перакрэсліў планы такога перасялення. З далучэннем Заходняй Беларусі да БССР адпалі стратэгічныя аспекты пераносу беларускай сталіцы ў Магілёў. І толькі ***Дом Саветаў і будынак МДТУ, кінатэатр "Радзіма", будынкі палітэхнікума і гасцініцы "Дняпро"***, якія паспелі пабудаваць, напамінаюць нам аб прыгожых, але не збыўшыхся надзеях.

Нямецкі напад на СССР 22 чэрвеня 1941 года быў хаця і прагназіруемым, але неспадзяваным. З першых дзён вайны на Магілёўшчыне ўся работа дзяржаўных і грамадскіх органаў перабудоўвалася ў адпаведнасці з задачамі ваеннага часу і патрэбнасцямі фронту. З 25 чэрвеня па 3 ліпеня 1941 г. у Магілёве знаходзіліся ЦК Камуністычнай партыі Беларусі і Савет народных камісараў БССР. У раёне чыгуначнай станцыі Лупалава дзейнічала Цэнтральная эвакуацыйная камісія БССР.

Менш чым за тры тыдні было эвакуіравана 14 прадпрыемстваў, у т.л. магілёўскія заводы авіяцыйнага маторабудавання і гарбарны, фабрыкі штучнага валакна і швейная, Крычаўскі цэментны завод, 2065 трактароў, больш 100 тыс. галоў жывёлы, 7100 т. збожжа. Аналагаў такой маштабнай эвакуацыі ў вобласці не было ніколі.

***1 ліпеня 1941 г. у штабе Заходняга фронту,*** непадалёк ад Магілёва, адбылася нарада прадстаўнікоў Стаўкі Вярхоўнага камандавання з удзелам Маршалаў Савецкага Саюза ***К.Я.Варашылава*** і ***Б.М.Шапашнікава***, 1-га сакратара ЦК КП(б)Б ***П.К.Панамарэнкі*** і мясцовых улад. Тут былі разгледжаны задачы па разгортванню партызанскай барацьбы ў тыле ворага і зацверджан план абароны Магілёва, як найбольш важнага апорнага пункта на Дняпроўскім рубяжы. Некалькі пазней былі створаны абласны і гарадскі штабы народнага апалчэння, якое па вобласці налічвала каля 12 тыс. чалавек.

У канцы чэрвеня–пачатку ліпеня 1941 г. на тэрыторыі вобласці пачаліся напружаныя баі. 24-ы і 46-ы танкавыя карпусы 2-й танкавай групы (генерал ***Х.Гудэрыян***) 4-й танковай арміі (фельдмаршал ***Г. фон Клюге***) дасягнулі р. Бярэзіны і зрабілі спробу фарсіраваць яе, каб выйсці да Дняпра. У баях каля Бабруйска з 28 чэрвеня зводны атрад ( часці 121-й дывізіі, воіны авіяцыйных падраздзяленняў, курсанты Бабруйскага аўтатрактарнага вучылішча і інш.) пад камандаваннем камандзіра 47-га стралковага корпуса генерала ***С.І.Паветкіна*** на тры дні затрымалі праціўніка на р. Бярэзіне. Пасля цяжкіх баёў нямецкія войскі фарсіравалі Бярэзіну на фронце ў 80 км паміж г.п. Беразіно і Бабруйскам. Сустрэчнымі агнявымі баямі савецкія войскі затрымалі іх ў міжрэччы Дняпра і Бярэзіны больш чым на тыдзень. Кровапралітныя баі на Дняпроўскім рубяжы на лініі Шклоў–Магілёў–Быхаў

вялі войскі 13-й арміі ў складзе 61-га, 45-га стралковых і 20-га механізаванага карпусоў.

Вельмі напружаныя і жорсткія баі разгарнуліся ў раёне Магілёва, дзе абарону трымалі злучэнні 61-га стралковага корпуса генерала ***Ф.А.Бакуніна***. Непасрэдна горад абараняла уваходзіўшая ў склад корпуса 172-я стралковая дывізія (генерал ***М.Ц.Раманаў***), з прыданымі ёй часцямі і асобнымі падраздзяленнямі (каля 20 тыс. чалавек). З 3 па 9 ліпеня часці дывізіі вялі баі з ворагам на рубяжы р.Друць у раёне в.Чачэвічы і г.п. Бялынічы. Тут асабліва вызначыўся адступаючы дывізіён капітана ***Б.Л.Хігрына*** (462-гі артылерыйскі полк), які геройскі стрымліваў танкі праціўніка. 5 ліпеня батарэя 122 мм гаўбіц на р.Вosліўцы па Мінскай шашы падбіла 8 варожых танкаў, з іх чатыры былі падбіты асабіста Хігрыным Б.Л., які першым на Магілёўшчыне ў 1941 годзе атрымаў званне Героя Савецкага Саюза (пасмяротна).

Не маючы магчымасці ўзяць Магілёў лабавым ўдарам з захаду, немцы распачалі ўзмоцненыя атакі на стыках абароны палкоў 53-й, 110-й і 187-й стралковых дывізій, фарсіравалі Дняпро ў раёне Шклова - Быхава і рушылі на Смаленск, Рослаў. 15 ліпеня 1941 года, злучыўшыся у Чавусах, яны акружылі Магілёўскі абарончы раён. Амаль дзесяць дзён мужна змагаліся абаронцы горада ў поўным акружэнні, адцягваючы на сябе значныя сілы праціўніка. У ноч з 25 на 26 ліпеня на апошнім паседжанні кіраўнікоў абароны генерал ***М.Ц.Раманаў*** аддаў загад на прарыў з асаджанага горада. У час прарыву ён быў цяжка паранены, загінулі палкоўнікі ***С.Ф.Куцепаў, І.С.Мазалаў*** і інш.

У гэты ж час на левым беразе Дняпра выходзілі з акружэння іншыя падраздзяленні 61-га стр. корпуса на чале з генералам ***Бакуніным Ф. А.***, якія падчас жорсткіх 2-х дзённых баёў у Чавускім раёне, страцілі забітымі, параненымі і трапіўшымі ў палон каля 5 тыс. чалавек.

Па апошніх дадзеных з 10-ці томнай гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (1991 г.), пад Магілёвам нямецкія войскі страцілі 24 самалёты, каля 200 танкаў, 400 матацыклаў, 500 аўтамашын. Было знішчана 15 тыс. і ўзята ў палон каля 2 тыс. салдат і афіцэраў.

Гераічная 23-х дзённая абарона Магілёва – адна з яскравых старонак гісторыі II-й Сусветнай вайны.

Акупіраваная ў жніўні 1941 г., Магілёўшчына была залічана да вобласці армейскага тылу групы армій “Цэнтр“. Для падтрымання парадку “новыя гаспадары” стварылі тут канцлагеры, гета і турмы, а для савецкіх ваеннапалонных–перасыльныя лагеры (дулагі) у Бабруйску, Крычаве, стацыянарны лагер (шталаг) у Магілёве і ў інш. месцах.

Натуральна, што жыхары вобласці ва ўмовах акупацыйнага рэжыму ўступілі ў барацьбу з ворагам. Ужо ў 1941 г. на Магілёўшчыне былі арганізаваны і дзейнічалі да 40 партызанскіх атрадаў і груп.

Асноўнай базай партызанскага руху стаў Клічаўскі раён з яго вялікімі лясными масівамі, якія прымыкалі да Быхаўскага, Кіраўскага, Бабруйскага, Асіповіцкага і Бялыніцкага раёнаў. Партызаны кантралявалі большую частку тэрыторыі вобласці амаль на працягу ўсяго перыяду акупацыі. Яны пускалі пад адхон эшалоны, знішчалі танкі, броне- і аўтамашыны, жывую сілу праціўніка, палілі склады і інш. Перад злучэннем з Чырвонай Арміяй (восень 1943–лета 1944 гг.) у вобласці налічвалася больш 55 тыс. узброеных партызан.

Падпольныя патрыятычныя арганізацыі дзейнічалі ў Магілёве, Бабруйску, Бялынічах, Горках, Крычаве, Круглым, Клімавічах. Іх члены праводзілі дыверсіі, здабывалі каштоўныя звесткі аб праціўніку для армейскай і франтавой разведак, партызан.

11 партызан і падпольшчыкаў Магілёўшчыны за подзвігі, здейсненыя ў час вайны, былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Сярод іх ***С.Г.Жунін, М.П.Каралёў, А.М.Касаеў, В.І.Лівенцаў*** і інш.

26 верасня 1943 г. войскі Бранскага фронту вызвалілі адным з першых раённых цэнтраў Беларусі ***Хоцімск,*** а праз 8 месяцаў (на столькі затрымаўся фронт на р.Проня), ***29 чэрвеня 1944 г. Магілёўская вобласць была поўнасцю вызвалена ад акупантаў***. Здзейснілі гэта войскі 1-га і 2-га Беларускіх франтоў ( камандуючыя генерал арміі ***К.К.Ракасоўскі*** і генерал-палкоўнік ***Г.Ф.Захараў***), прычым у выніку ***Бабруйскай аперацыі***, праведзенай 3-й (генерал-палкоўнік ***А.В.Гарбатаў***), 28-й (генерал-лейтэнант ***А.А.Лучынскі***), 48-й (генерал-лейтэнант ***П.А.Раманенка***), 65-й (генерал-лейтэнант ***П.І.Батаў***), 16-й паветранай (генерал-палкоўнік авіяцыі ***С.І.Рудэнка***) арміямі, коннамеханізаванай групай (генерал-лейтэнант ***І.А.Пліеў***) і Дняпроўскай ваеннай флатыліяй (капітан 1 ранга ***В.В.Грыгор'еў***) быў утвораны бабруйскі "кацёл", у які трапілі 6 дывізій 9-й нямецкай арміі (40 тыс. чал.).

Падчас вайны 19 ураджэнцаў вобласці сталі поўнымі кавалерамі ордэна Славы, 103 Героямі Савецкага Саюза, а тры з іх – двойчы Героямі: ***І.Гусакоўскі, С.Шутаў, І.Якубоўскі*** (усе – камандзіры-танкісты).

У цяжкіх умовах ваеннага і пасляваеннага часу праводзіліся аднаўленчыя работы на прадпрыемствах і ў сельскай гаспадарцы. К 1950 году гэтыя работы, ў асноўным, былі закончаны, прамысловасць вобласці перасягнула даваенны аб'ём вытворчасці. У 1954 г. да Магілёўскай вобласці далучаны Асіповіцкі, Бабруйскі, Кіраўскі, і Клічаўскі раёны ***Бабруйскай вобласці*** (існавала з 20.09.1944 г. па 8.01.1954 г.).

8 ліпеня 1967 г. Магілёўская вобласць за актыўны ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне і поспехі ў аднаўленні і развіцці народнай гаспадаркі ўзнагароджана ***ордэнам Леніна***, а горад Магілёў 25 красавіка 1980 года – ***ордэнам Айчыннай вайны І ступені.***



Алейнікаў П.М.

Добра вядомы ў Беларусі і за яе межамі ўраджэнцы Магілёўшчыны, знакамітыя пісьменнікі і паэты ***А.Адамовіч, А.Куляшоў, А.Пысін,*** кінаакцёр ***П.Алейнікаў,*** кампазітар ***Э.Калманоўскі,*** кінарэжысёр ***В.Тураў*** і інш.

Зараз Магілёўшчына – край высокаразвітай індустрыі і сельскагаспадарчай вытворчасці. Асноўныя галіны прамысловасці – хімічная індустрыя, машынабудаванне і металаапрацоўка.

У вобласці працуе больш 250 прамысловых прадпрыемстваў, аб'яднанняў, акцыянерных таварыстваў, сканцэнтраваных у асноўным у Магілёве (выпрабляюць 45.2% прадукцыі рэгіёна) і Бабруйску (26.2%).



Алесь Адамовіч.

30% аб'ёмаў выпрабляемай ў вобласці прадукцыі прыпадае на два буйнейшых прадпрыемствы дамінуючай хімічнай і нафтахімічнай галіны–ААТ ***"Хімвалакно"*** (г. Магілёў, сінтэтычнае валакно) і ААТ ***"Белшына"*** (г. Бабруйск, аўтамабільныя шыны).

Дзякуючы мадэрнізацыі, расшырылі асартымент сваіх вырабаў РУП (рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства) ***"Бабруйскі машзавод",*** ААТ ***"Чырвоны харчавік"***, РУП ***"Магілёўтрансмаш"*** (універсальныя прычэпы ПІМ-40, пагрузчыкі, аўтамабільныя паўпрычэ- пы), РВУП "Магілёўскі завод ***"Строммашына"*** (абсталяванне для прадпрыемстваў будаўнічай індустрыі), ААТ ***"Тэхнапрыбор",*** прадпрыемствы лёгкай прамысловасці. Шырокім попытам карыстаецца прадукцыя РУП ***"Магілёўскі завод ліфтавага машынабудавання"***. На гэтым прадпрыемстве па індывідуальным заказам выпрабляюць ліфты павышанай камфортнасці з розным дызайнам кабін. ААТ ***"Стужка"*** (стужкаткацкая фабрыка) за высокую якасць прадукцыі было ўдастоена міжнароднай ўзнагароды "Еўрапейскі клас якасці" у намінацыі "Прадпрыемствы XXI веку".



Завод "Строммашына".

Магілёўшчына вырабляе ***восьмую частку*** прамысловай і сёмую сельскагаспадарчай прадукцыі рэспублікі. Яна размешчана на важных транспартных магістралях, якія злучаюць прамысловыя раёны Расіі, Украіны і Беларусі. Вобласць займае ***першае месца ў дзяржаве па выпрабу хімічных валокнаў, з'яўляецца адзіным вытворцам у рэспубліцы аўтамабільных шын, ліфтоў, электрарухавікоў і цэнтрабежных насосаў.*** На яе тэрыторыі

размешчаны больш 250 буйных і сярэдніх прамысловых прадпрыемстваў, працуюць 11 вышэйшых навучальных установ (6 дзяржаўных і 5 недзяржаўных), 21 сярэдне-спецыяльная і 34 прафесійна-тэхнічных навучальных установы, 526 агульнаадукацыйных школ (355-сярэдніх, 102-базавыя, 69-пачатковых), 8 гімназій, 5 ліцэяў, 2 каледжы, 7 школ-інтэрнатаў, 13 спецшкол, 13 вячэрніх (зменных) агульнаадукацыйных школ. Сфера аховы здароўя прадстаўлена 192 амбулаторна-паліклінічнымі і 88 стацыянарнымі бальнічнымі ўстановамі.

У аграпрамысловым комплексе вобласці занята больш 76 тыс.чалавек. Многія гаспадаркі ператварыліся ў сучасныя аграфірмы. Калгас ***"Зара"*** Магілёўскага раёна мае птушкафабрыку, два жывёлагадоўчых комплексы, цэх раслінаводства, цагельны завод, звераферму, мясакамбінат, сетку фірменнага гандлю.

За межамі вобласці вядомы сваёй прадукцыяй калгасы ***"Рассвет"*** імя К.П.Арлоўскага Кіраўскага, ***"Гігант"*** Бабруйскага, ***"Авангард"*** і ***"Камінтэрн"*** Магілёўскага раёнаў.

У Мсціслаўскім раёне з 1935 года працуе дзяржаўны конезавод № 120, дзе разводзяцца запражныя коні. Усе рэкорды па "падняцці" грузаў на тэрыторыі былога СССР належылі гэтай гаспадарцы. Завод разводзіць і верхавых коней для ўзброеных сіл Беларусі і маскоўскай міліцыі.

Важнае месца ў вобласці займае ***прадпрымальніцтва,*** у сферы дзейнасці якога налічваецца каля 2 тыс. камерцыйных структур, звыш 18 тыс. індывідуальных прадпрымальнікаў і 353 фермерскіх гаспадаркі. Тут працуе больш 34 тыс. чалавек (7,5 % занятых у народнай гаспадарцы вобласці).

На Магілёўшчыне зарэгістраваны 32 замежныя прадпрыемствы і 43 сумесных са статутным фондам 45 млн. даляраў ЗША. У інвестыцыях актыўны ўдзел прымаюць фірмы з ***Германіі, ЗША, Расіі, Польшчы, Вялікабрытаніі, Чэхіі, Літвы і Латвіі.***

Плённа працуюць у гэтым накірунку ЗАТ ***"Шклозавод "Ялізава"*** (Асіповіцкі р-н) - выпуск шклотары; сумесныя прадпрыемствы ў г. Магілёве: ***"Белпак"*** (ЗША)–выраб харчовых палімераў, ***"Сапатэкс"*** (Партугалія)–вытворчасць тканіны, ***"AGP"*** (ЗША)–вытворчасць запчастак для аўтамабіляў.

Магілёўская вобласць – адзін з буйнейшых культурных рэгіёнаў рэспублікі. Не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі добра вядомы народныя ансамблі танца ***"Беларусь"*** з Бабруйскага раёна, ***"Юнацтва"*** і ***"Рунь"*** з Бабруйска і Магілёва, ансамблі народнай музыкі і песні ***"Мілавіца"*** з Кіраўскага р-на, ***"Бліскавіца"*** са Шклова, ***"Верасень"*** з Горак, ***"Медуніца"*** з Магілёва. Паспяхова развіваецца фестывальны рух, які ахоплівае розныя жанры мастацтва і народнай творчасці. Візітоўкамі Магілёўшчыны сталі міжнародныя фестывалі эстраднай музыкі ***"Залаты шлягер"*** і хрысціянскай духоўнай музыкі ***"Магутны божа"***, камернай музыкі ў Мсціслаўлі, дзіцячай

творчасці ***"Залатая пчолка"*** у Клімавічах, Міжнародны плэнер па жывапісу імя В.К. Бялыніцкага-Бірулі.

Спартсмены Магілёўшчыны паспяхова ўдзельнічаюць у прэстыжных спаборніцтвах. Чэмпіёнамі і прызёрамі Алімпійскіх гульняў і Міжнародных спаборніцтваў у розныя гады былі ***С.Баітова*** (гімнастыка), ***А.Масяйкоў*** (веславанне на каноэ), ***А.Рыжанкоў*** і ***Н.Рыжанкова*** (біятлон), ***А.Марфель*** (стральба з лука), ***Л.Барысенка*** ( радыёспорт), ***С.Гарлуковіч*** ( футбол) і інш.

У кожным горадзе і раённым центры ёсць свой музей. Усяго на тэрыторыі вобласці дзейнічае 27 дзяржаўных (з філіяламі) і 136 школьных краязнаўчых музеяў якія маюць differentнабаковую накіраванасць і адлюстроўваюць асаблівасці традыцый і гістарычнага развіцця сваіх рэгіёнаў. Творча і плённа працуюць 3 тэатры і 628 бібліятэк.

# *АРХІТЭКТУРНАЯ СПАДЧЫНА МАГІЛЁВА.*

## (Пешаходная экскурсія)

Архітэктурная спадчына – невычарпальная крыніца творчай фантазіі пакаленняў, прыкладаў дасканаласці таленту народа. Нягледзячы на прайшоўшыя стагоддзі, велізарныя разбурэнні мінулых войнаў, а часам і мэтанакіраванае знішчэнне помнікаў у савецкі час, на магілёўскай зямлі захаваліся палацы, храмы, жылыя дамы, комплексы разнастайнай забудовы далёкага гістарычнага мінулага. Гэта матэрыялізаваны вопыт культуры народа, буйныя вехі ў яго летапісу, якія дапамагаюць нам сёння бачыць жыццё ў руху і сувязі часоў.

***Наша экскурсія пачынаецца ў парку імя М.Горкага*** (былая тэрыторыя замка, пазней - сад А.Дамбавецкага). Наогул, Магілёў адносіцца да тых беларускіх старажытных гарадоў, якія развіваліся вакол ***умацаванага замка.*** Абарончае будаўніцтва ў той час адыгрывала значную ролю ў жыцці горада. Менавіта ў крэпасным будаўніцтве развіваўся шэраг архітэктурных прынцыпаў і прыёмаў, якія выкарыстоўваліся пасля ў жыллёвым, культавым і грамадзянскім будаўніцтве.

Сёння звестак аб узнікненні ***магілёўскага замка,*** яго планіроўцы і забудове захавалася вельмі мала. У сучаснай гістарычнай і краязнаўчай літаратуры лічыцца, што магілёўскі замак быў закладзены ў 1267 годзе ( дата ўмоўная і спрэчная, бо летапіснай крыніцы з ёй не існуе) каля рыбацкага пасёлка і займаў зручнае стратэгічнае становішча. Размешчаны на высокай гары з крутымі схіламі, абкружаны Дняпром і яго прытокам Дубравенкай, ён умацоўваўся і штучнымі збудаваннямі. Замак і жылая забудова пасада раздзяляліся паміж сабой глыбокім ровам (паміж паркам і Савецкай плошчай). ***Апісання гэтага замка не захавалася.***



Будаўніцтва новага (1526 г.) замка.

Рэканструкцыя В .Камарова.

З 1526 года Магілёў стаў называцца горадам. “ Год 1526..... город Могилёв был заложен, а замок с волостью за несколько сот лет перед тем здесь был” – чытаем мы ў ***Магілёўскай хроніцы.*** У гэты час жылая забудова Магілёва займала невялікую тэрыторыю, якая складала ***Нагорскі пасад*** (пазнейшы Стары горад) і была абмежавана схіламі Дняпра, Дубравенкі і замкавым ровам. На працягу гэтага стагоддзя горад хутка расце як цэнтр разнастайнага рамяства, актыўных гандлёвых сувязей

з гарадамі Расіі, Украіны, Польшчы. Пашыраецца тэрыторыя пасада, узнікаюць пасяленні за Дняпром і Дубравенкай.

На пачатку XVII ст. тэрыторыя Магілёва дзялілася на 15 соцень. У межах Старога горада размяшчаліся сотні ***Астрожская*** і ***Нагорская.*** За яго межамі знаходзілася ***Ледзькаўская сотня***, а на правабярэжжы Дняпра ( у т.л. на Падміколлі) – ***Бярозская, Перахрысцінская*** і ***Грыўлянская***; за Дубравенкай – ***Каськаўская, Дабраслаўская, Трыснінская, Папінская*** і інш.; за Дняпром – ***Траецкая*** і ***Лупалаўская.***

Па інвентарнаму вопісу 1604 г. можна ўявіць выгляд драўляных умацаванняў замка. Адпаведна апісанням яны складаліся з ***драўляных сцен і вежаў***, якія ў плане ўяўлялі замкнёны пяцівугольнік. Вежы былі васьміграннныя, 3-х–4-х ярусныя, са шматлікімі сценкамі (некалькі радоў бярвенняў), што рабіла іх устойлівымі пры гарматных абстрэлах. У вежах размяшчаліся ***гарматы***, а таксама яны служылі дазорнымі пунктамі.

Паміж вежамі рабілі ***гародні*** – асобыя зрубы, якія прылягалі адзін да аднаго і былі засыпаны зямлёй і каменнямі. На гароднях рабіліся ***тэрасы*** – земляныя пляцоўкі для вядзення бою, якія агароджваліся ***драўлянымі сценамі з байніцамі*** і былі пакрыты двухсхільным дахам. Каб захаваць замак ад пажару, вежы і гародні звонку абмазвалі глінай.

Галоўная вежа Магілёўскага замка – ***вежа-брама***. Праз яе ажыццяўляўся асноўны ўезд у замак. Яна размяшчалася адразу ж за Гандлёвай плошчай. У ёй былі двайныя вароты з невялікімі дзвярамі. Да варот мацаваўся ***драўляны пад'ёмны мост*** на ланцугах. Другі ўезд у замак, праз вароты з пад'ёмным мастом, праходзіў ад сутоку Дняпра і Дубравенкі. З замка існавала ***два падземныя хады*** – адзін у бок Дняпра, другі – у бок Дубравенкі.

На замкавай тэрыторыі знаходзіліся жылыя і службовыя драўляныя будынкі – свірны, пякарня, лазня; цэйхгаўз і памяшканні для захоўвання пораху; царква, астрог і стражніцкая. Адным словам, тут знаходзілася ўсё неабходнае для жыцця і абароны. Жыхары доўгі час маглі жыць ізалявана ад наваколля.

Акрамя Магілёўскага ў той час былі вядомы ***Аршанскі, Полацкі, Гродзенскі, Барысаўскі і Свіслацкі замкі.*** Усе яны прызначаліся для абароны падпарадкаванай ім тэрыторыі.

У 1633 годзе Магілёўскі замак па невядомай прычыне згарэў і больш у сваім першапачатковым выглядзе не аднаўляўся.

Новы перыяд у замкавым будаўніцтве Магілёва пачынаецца ў XVII ст. Замест драўляных вежаў і гародняў узводзіліся ***земляныя насыпныя валы з бастыёнамі*** па тыпу заходнееўрапейскіх. Калі паўстала пагроза ваенных дзеянняў, кароль ***Уладзіслаў IV*** у грамаце ад 1633 г. загадаў усім гараджанам і жыхарам прадмесцяў Магілёва садзейнічаць хутчэйшаму ўзвядзенню вала. Зносіліся жылыя дамы гараджан усіх саслоўяў, якія траплялі ў паласу будаўніцтва, а ім адводзіліся новыя месцы для жылля.

У агульным выглядзе канструкцыі ўмацаванняў можна ўявіць паводле ***інвентарнага вопісу замка 1633 г.*** З боку Дняпра і Дубравенкі тэрыторыю замка абкружалі земляныя валы з бастыёнамі. З усіх бакоў замак быў агароджаны шчыльным 6-ці метровым драўляным частаколам (уезд праходзіў праз роў, па старым драўляным мосце). Для забеспячэння вадой да Дняпра быў зроблены праход, умацаваны драўлянымі сценамі і накрыты дахам.

Абарончая сістэма ўмацаванняў Магілёва складалася з ***трох паясоў***. ***Першы пояс – Замкавы вал*** - даўжынёй больш 600 м. абкружаў тэрыторыю замка. ***Другі пояс – Кругавы (або Бліжні) вал -*** ахопліваў Стары горад. Даўжыня яго складала каля 1450 м і пачынаўся ён ад замкавага рова. Такі ж роў з земляным валам аддзяляў Стары горад ад Новага (праходзіў на месцы сучаснага гарадскога тэатра, вул.Камсамольскай і плошчы Арджанікідзе).

Сістэма асноўных вуліц горада фарміравалася з улікам дарог са Шклова, Вільні, Быхава, Мсціслава. Яны з'яўляліся пачаткамі радыяльных вуліц, што сыходзіліся на Гандлёвай плошчы. У тых месцах, дзе гарадскія вуліцы праходзілі праз абарончы вал, ставіліся драўляныя або мураваныя брамы. У кругавым вале было ***4 брамы***: драўляная ***Ветраная*** на Ветранай вуліцы, мураваная ***Каралеўская*** на Шклоўскай вуліцы, мураваная ***Алейная*** адкрывала спуск да Дняпра, драўляная ***Дубровенская*** вяла да маста цераз Дубравенку.

***Трэці пояс – Палявы (або Дальні) вал -*** абкружаў Новы горад. Ён быў найбольш працяглым – 5240 м і з'яўляўся не замкнёным ланцугом, а перарываўся ярамі і рэкамі. Вал пачынаўся ад яра Дзебры, перасякаў Дубравенку, яе прыток Струшню і падыходзіў да Дняпра. Тут налічвалася 8 драўляных брам, прычым 3 з іх (Шклоўская, Віленская і Быхаўская) размяшчаліся на галоўных вуліцах такой жа назвы.

28 студзеня 1577 г. кароль Польшчы і Вялікі князь Літоўскі ***Стэфан (Стафан) Баторы*** падараваў Магілёву прывілей на поўнае самакіраванне па ***Магдэбургскаму праву.*** Магіляўчане атрымалі ***герб горада***, быў створаны выбарны орган гарадскога самакіравання – ***магістрат,*** а праз год пабудавана гарадская ***ратуша,*** дзе ён і размяшчаўся. Першая магілёўская ратуша была драўлянай і знаходзілася на вул. Ветранай (Ленінскай).

Праз 100 гадоў, прыкладна ў 1680-х гадах, на Гандлёвай плошчы, якая служыла ўжо не толькі месцам гандлю, але і месцам сходаў жыхароў горада, была пабудавана ***новая мураваная ратуша.*** З гэтага часу плошча становіцца асноўным адміністрацыйным і грамадскім цэнтрам Магілёва, вакол яе ўзводзяцца галоўныя культавыя збудаванні, а пазней і адміністрацыйныя. Роля замка як цэнтра паступова губляецца, яго старажытныя пабудовы з цягам часу прыйшлі ў заняпад і разбурыліся.

З канца XVIII ст. у Магілёве разгарнуліся вялікія горадабудаўнічыя работы па добраўпрадкаванню яго тэрыторыі. Распрацоўваліся планы рэгулярнай забудовы (першы ў 1778 г.). Да таго часу земляныя абарончыя

ўмацаванні страцілі сваё стратэгічнае значэнне і перашкаджалі далейшаму развіццю горада.

У 1809 г. быў скапаны Кругавы вал у цэнтры горада, засыпаны роў. У 1822-23 гг. галоўныя вуліцы Ветраная і Шклоўская атрымалі выгляд скразных магістраляў і праходзілі праз увесь горад. Былі паскопваны валы і ў іншых частках, вуліцы брукаваліся, дробныя кварталы аб’ядноўваліся ў больш буйныя. Магілёў развіваўся як суцэльны горадабудаўнічы арганізм, што адкрывала магчымасці для стварэння ансамблевай забудовы вуліц і плошчаў у ***стылі класіцызму***.

З магілёўскім замкам непарыўна звязана гісторыя былой ***Гандлёвай, Губернатарскай, Думскай,*** а цяпер ***Савецкай плошчы***. Як ужо адзначалася раней, яна была цэнтрам гаспадарчага жыцця горада. Тут некалі стаялі драўляныя і мураваныя крамы заможных купцоў, рамеснікаў, скупшчыкаў. Крамы былі збудаваны ў 26 гандлёвых радоў па найменнях тавараў: шавецкі, ганчарны, мясны, рыбны і г.д. Былі тут склады, вагавая, карчма, дом цэхавай брацii і іншыя неабходныя пабудовы. У цэнтры плошчы знаходзіўся ганебны слуп, каля якога каралі бізуном правініўшыхся гараджан.

Ад рынка пачыналіся ***Шклоўская*** (***Дняпроўскі пр-кт, Н.Ульянавай-Крупскай, Першамайская***) і ***Ветраная*** (***В.Садовая, Троцкага, Дзекабрыстаў, Ленінская***) вуліцы.

У XVI ст. Магілёў зрабіўся буйнейшым рамесным і гандлёвым цэнтрам Вялікага княства Літоўскага. З наданнем гораду Магдэбургскага права і пабудовай ратушы змяніла свой статус і плошча.



Схема Губернатарскай плошчы. **1** – дом губернатара; **2 -** губернскае праўленне; **3** - ратуша;**4** - дом віцэ-губернатара і двух саветнікаў; **5** - будынак ніжняга суда, урачэбнай управы і архіва.

Пасля далучэння ў 1772 годзе Магілёва да Расіі Гандлёвая плошча атрымала найменне ***Губернатарскай.*** Новае яе аблічча распрацоўвалі вядомыя рускія архітэктары ***М.Львоў і В.Стасаў.*** З плошчы зносяцца крамы і іншыя пабудовы, а па яе перыметру ўзводзяцца чатыры двухэтажныя будынкі ў стыле класіцызму: ***Губернатарскі дом, будынак губернскага праўлення, дом віцэ-губернатара і дом,*** дзе размясціўся ***земскі суд, урачэбная ўправа, архіў,*** а пазней ***акруговы суд*** (зараз тут абласны краязнаўчы музей). ***Губернатарскі дом*** стаяў на месцы сучаснага Вечнага агню, ***губернскае праўленне*** – злева ад яго і злучалася з ім аркай, ***дом віцэ-губернатара*** – на месцы жылога дома з рэстаранам “Zio PEPE” (гл. схему). Мураваныя гандлёвыя рады будуюцца паміж вул. Ветранай і валам. Так у

Магілёве склаўся адзін з першых ансамбляў, якія былі створаны ў беларускіх гарадах у стылі класіцызму.

Улічваючы, што з усяго комплексу захаваўся толькі будынак , у якім зараз размяшчаецца ***абласны краязнаўчы музей***, спынімся на яго архітэктуры падрабязней.

2-х павярховы мураваны дом капітальнымі сценамі быў падзелены на тры часткі з асобным уваходам для кожнай установы: ніжняга суда, урачэбнай управы, губернскага архіва. Архітэктурнае вырашэнне вельмі сціплае, у формах класіцызму: строгія прамавугольныя ваконныяя праёмы, прафіляваныя карнізы; прамавугольныя і лучковыя атыкі над карнізам па восі галоўных уваходаў. Пры рэканструкцыі пад акруговы суд у 1883 г. будынак набыў больш насычаную дэкаратыўную аздобу: былі зроблены трохвугольныя і лучковыя сандрыкі над вокнамі, руставаныя пілястры, ажурныя брылі на металічных калонках над уваходамі. Акрамя таго, потым ***надбудаваны 3-ці паверх***, над якім зроблены складаны атык па восі цэнтральнага ўвахода.

У XIX ст. Губернатарскую плошчу працягваюць добраўпарадкоўваць. Пасля вяртання ў 1812 г. з Францыі ў Магілёў штаба 1-й Рускай арміі ў цэнтры на плошчы перад будынкам губернскага праўлення начальнікам артылерыі генералам ***Яшвілі*** на ствале французскай трафейнай пушкі быў устаноўлены ***сонечны гадзіннік***. На працягу 60-х гадоў тут разбіваюць ***Беклямішаўскі сквер*** (назва ад прозвішча губернатара) у форме правільнага круга. У 1872 г. на месцы разбуранага замка закладваецца ***гарадскі сад з фантанамі***.


Панарама забудовы Губернатарскай плошчы з боку старажытнага замка.

У 1919 годзе плошча атрымала новую назву. У гонар 2-га губернскага з’езду Саветаў (праходзіў у будынку гарадской управы), абвясціўшага 15 снежня 1917 г. савецкую ўладу ў Магілёўскай губерні, яна стала называцца ***Савецкай.***

У ліпені 1920 г. на плошчы былі пахаваны 15 байцоў 35-га бронеатрада 16-й арміі (камандзір атрада магіляўчанін ***М.М.Грачоў***), якія загінулі ў баі з белапалякамі. Магілка знаходзілася каля парку, мела драўляную агароджу, па баках стаялі дзве старадаўнія пушкі. У перыяд акупацыі 1941- 44 гг. яна была знішчана немцамі, а пасля аднаўлена ў іншым месцы, супраць увахода ў музей, у выглядзе сціплай мармуровай пліты. Зараз магіла знаходзіцца ўжо ў

трэцім месцы, якое не мае ніякага дачынення да сапраўднага месца пахавання.

З 1926 года губернатарскі дом стаў ***Домам піянераў***, губернскае праўленне –***друкарняй***, будынкі гарадской управы – ***Домам Чырвонай Арміі***, акруговага суда – ***ваеннай казармай***, віцэ-губернатара – ***штабам вайсковай часці.***

Падчас нямецкай акупацыі 1941-44 гг. Савецкая плошча – месца пакарання смерцю патрыётаў-падпольшчыкаў. 17 лістапада 1941 г. тут былі павешаны ваенурачы ***У.Кузняцоў, А.Паршын*** і ўрач ***Ф.Пашанін,*** а 25 красавіка 1942 г. падпольшчыкі - афіцэры Чырвонай арміі – ***П.Пяхоцін, М.Мяцёлкін (Каровін), А.Ражкоў***. У будынку Дома Чырвонай Арміі ў немцаў размяшчаўся салдацкі клуб, у ратушы – пральня.

Плошча двойчы знаходзілася ў зоне жорсткіх баёў за горад, у 1941г. і ў 1944г. Не абмінула яе і бамбардзіроўка Магілёва савецкай авіяцыяй у 1943 г. Кучы абломкаў засталіся на месцы дамоў губернатара і губернскага праўлення, толькі каробка засталася ад дома віцэ-губернатара (знесены ў 1950-х гадах), часткова пацярпела ратуша і інш. збудаванні.

Пасля зносу руін у канцы 40-х гадоў на плошчы зрабілі скверы, паставілі скульптурную групу "Дружба" (трое мужчын), якая сімвалізавала дружбу трох рас. Да 1961 г. плошчу рэканструявалі. На ёй з'явіліся дзве жылыя пяціэтажкі, прыгожыя клумбы, газоны і скверы з лавачкамі. Яна зрабілася зручным месцам прагулак і адпачынку - "на валу" – у гаворцы магіляўчан. На месцы знесенай ратушы ўстанавілі атракцыённае кола агляду – "чортава кола".



Савецкая плошча.

У 1980-1982 гг. плошча перажыла яшчэ адну рэканструкцыю, пасля якой яна аказалася адзетай у бетон, мармур і граніт. Мемарыяльны комплекс "***Змагарам за Савецкую уладу***" (скульптар ***Л. Гумілеўскі,*** архітэктары ***К. Аляксееў, А. Іваноў***) быў адкрыты 10 ліпеня 1982 г. Ён уключае ў сябе бронзавую фігуру жанчыны, 5 стэл, брацкую магілу чырвонаармейцаў, загінуўшых у 1920 г. Сэнсавае і пластычнае ядро кампазіцыі – бронзавая фігура жанчыны (вышыня 7 м.) на гранітным пастаменце (вышыня 13 м.), якая сімвалізуе Перамогу, аднаўленне жыцця, вечны рух наперад, надае мемарыялу эпічна-аптымістычнае гучанне (у народзе атрымала назву "Бягучая ад лаўсана"). Каля падножжа скульптуры-манумента запалены ***Вечны агонь***. Перад скульптурай - абліцаваныя гранітам стэлы з бронзавымі барэльефамі на тэмы: ***"Кастрычнік",***

***“Калектывізацыя”, “Абарона Магілёва ў 1941 г.“, “Партызанскі рух”, “Пасляваеннае адраджэнне”.***



Гарадская ратуша (не захавалася).

Сведкам многіх падзей стала плошча, але занадта мала памятных месц засталося аб іх.

Адным з лепшых помнікаў грамадзянскай архітэктуры Магілёва, які размяшчаўся на плошчы, была мураваная ***гарадская ратуша*** (не захавалася). Узведзена яна ў 1679-1681 гг., будаўніцтва вялі мясцовыя майстры ***Феська, Ігнацій, Недасек, Васька, Андрэй і Грышка.*** Да мураванай ратушы было некалькі драўляных (з 1578 г.) у розных частках Старога горада, але яны часта гарэлі. У 1682 г. каля двухпавярховага прамавугольнага будынка ратушы пачалі ўзводзіць высокую муравануюю вежу (майстар ***Крузберг*** з Быхава). ”Узведзеная да сарака лакцей” вежа абвалілася, а з гэтай цэглы пабудавалі цэйхгаўз. К 1698 г. была пабудавана новая васьмігранная вежа вышынёй 46 м. (па іншых дадзеных 38 м.). Яна мела простыя і строгія формы, пазалачоныя флюгеры ўпрыгожвалі стройную пяціярусную вежу. На думку спецыялістаў магілёўская ратуша – лепшы твор грамадзянскай архітэктуры Беларусі XVII стагоддзя.

У 1773 г. ратуша была рэканструявана (зменена ўнутраная планіроўка, перабудавана вежа), ў будынку з’явіліся дэталі, характэрныя для архітэктуры XVIII ст. (шырокая лесвіца, абрамленні вокнаў і інш.). Архітэктура асноўнага корпуса вызначалася строгасцю, прастатой і была блізкая да архітэктуры жылых дамоў. Васьмігранная вежа вылучалася пластычнасцю і большай насычанасцю дэкаратыўнай аздобы. Ратуша з высокай вежай з’яўлялася галоўным архітэктурным акцэнтам горада і яе стройны сілуэт добра ўспрымаўся пры пад’ездзе да Магілёва з боку Дняпра.

Пасяджэнні магістрата праходзілі штотыднёва па чацвяргах і пачыналіся ў 18 гадзін па ратушнаму звону. У 1780 г. з вежы ратушы аглядалі горад руская імператрыца ***Кацярына ІІ*** і аўстрыйскі імператар ***Франц-Іосіф***. У 1858 г. на ёй ўстанавілі гадзіннік і пазней яна выкарыстоўвалася як пажарная вышка горада. У час знаходжання ў Магілёве Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага (1915-1918 гг.) у ратушы размяшчалася магутная па тых часах радыёстанцыя.

Пасля вызвалення горада Магілёва ў 1944 г. Камісія па ўстанаўленню страт, прычыненых нямецка-фашысцкімі акупантамі будынкам-помнікам, 22 сакавіка 1945 г. адзначала, што ўсе яны падлягаюць рэстаўрацыі, за выключэннем ***Спаскай царквы***, якая разрушана поўнасцю. Пад час вайны, як ужо адзначалася, ратуша была часткова пашкоджана і ў 1952 г. было

прынята рашэнне аб яе аднаўленні. Рашэннем гарвыканкама ад 11 верасня 1953 г. ратуша аб'яўлялася помнікам архітэктуры і назначаўся канчатковы тэрмін яе рэстаўрацыі. Аднак паспелі толькі ўмацаваць фундамент, адрамантаваць дах і адзець у будаўнічыя рыштаванні вежу. На досвітку, у ліпені 1957 г. ратушу ўзарвалі, а яе вежу завалілі з дапамогай трасоў і двух трактароў.

Напэўна, ***архітэктары П.Ахман, Г.Парсаданаў*** і ***Г.Раманенка***, якія рыхтавалі заключэнне-рэкамендацыю аб зносе ратушы, абапіраліся на дзяржаўны акт абследвання стану ўцалелых помнікаў дойлідства г. Магілёва ў 1944 г., дзе ў прыватнасці адзначалася: " Магілёўская ратуша, пабудаваная жыхарамі горада, мае від руін. Столь і падлога будынка разбураны. Сцены ў многіх месцах далі трэшчыны, унутраная тынкоўка абсыпалася, звонку багатыя ляпныя архітэктурныя дэталі пашкоджаны больш, чым напалову. Вельмі моцна пацярпела пяціярусная вежа ратушы, якая напамінае сабой званіцу Васіля Вялікага ў Маскве. Васьмігранныя сцены ратушы атрымалі больш дзесяці выбоін дыяметрам каля метра, астатняя паверхня яе сцен зрашэчана снараднымі асколкамі. Калі б не тоўстыя сцены, створаныя з вялікім запасам трываласці, ратуша не змагла б выстаяць. Разглядаючы яе знявечанае цела, мы бачым, як моцна і трывала ўмелі будаваць нашы дзяды". Ва ўсякім разе, у 1955 г. вышэйзгаданыя архітэктары зрабілі вывад, што "... аднаўленне ратушы патрабуе нічым не апраўданых вялікіх затрат сродкаў..., бо будынак прадстаўляе сабой руіны, якія немагчыма аднавіць".

Разам з тым, надзея на аднаўленне ратушы заўжды жыла ў магіляўчан. 23 мая 1992 г. адбылася закладка першага камня на старым месцы будучай ратушы і яго асвячэнне на ўрачыстым малебне. Гарадскія ўлады прынялі рашэнне аб яе адраджэнні і выкарыстанні для вясельных і развітальных рытуалаў. Але будоўля, як і ў савецкі час, не пайшла. Замена ўлады, фінансавыя цяжкасці, а ў выніку – парослая пустазеллем пляцоўка ў чаканні адукаванага, паважаючага і ўлюблёнага ў гісторыю свайго горада гаспадара.

Практычна побач з ратушай захаваўся ***жылы мураваны дом*** (вул Ленінская 3-а), пабудаваны ў канцы XVIII- пачатку XIX ст.ст. Прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак з падвалам, скошаным пляскатым вуглом паміж фасадамі, арыентаванымі ў бок Дняпра і Савецкай плошчы, гладкімі сценамі з прамавугольнымі ваконнымі праёмамі ў простых ліштвах. Паверхі падзяляе карнізны пояс, сцены завершаны развітым прафіляваным карнізам. Унутраная планіроўка анфіладнага тыпу. Помнік жылой ***архітэктуры класіцызму.***

***Ад ратушы пройдзем да перакіднога мосціка*** (арх. ***Э.Юшка***), які вядзе да спуску на Падміколле. Некалі тут праходзіла вуліца Падвальная (пад валам), якая вяла пад Старым горадам на Школішча, месца, дзе раней размяшчаўся "Горвадаканал", а цяпер - адзін з яго водазабораў. Якраз тут і знаходзілася ***першая ў Магілёве сінагога***. Час яе пабудовы не вядомы. Аднак

у прывілеі ***Жыгімонта ІІІ*** ад 1526 г., дзе ён патрабуе выселіць яўрэяў за гарадскі вал, указваецца і канкрэтнае месца – туды, дзе знаходзіцца іх малітоўная школа каля Дняпра. Гэта месца атрымала назву “жыдоўскае Школішча” ці проста “Школішча”.

***Драўляная сінагога***, пабудаваная тут, ***стала адной з самых вядомых ва Усходняй Еўропе***, прычым не сваёй архітэктурай, а ўнікальнымі роспісамі, зробленнымі, як мяркуецца, дзедам знакамітага мастака ***Марка Шагала.***

Найбольш поўнае, дакладнае і цікавае апісанне Магілёўскай сінагогі зрабіў мастак ***Э.Лісіцкі***, які ў 1916 г. разам са сваім сябрам ***І.Рыбаком*** здзейсніў падарожжа па гарадах і мястэчках Беларусі з мэтай выяўлення і фіксацыі помнікаў яўрэйскай даўніны. “Это было поистине нечто особенное…Стены, высеченные лесенкой, из дубовых брёвен. Над ними потолок, как обшитый деревом шатёр. Все заклёпки на поверхности – никакого обмана, никаких иллюзий… Интерьер синагоги расписан от спинок скамеек вдоль стен по всей их длине и до самой верхушки шатра. 4-х угольная на уровне пола синагога поднимается к 8-ми угольному потолку, имеющему вид шатра…

Эпицентром всего строения является потолок. На западной стороне над входом расположены гигантские львы, а под ними павлины. Львы держат две таблички с надписями, причём, на нижней мастер оставил память о себе. На треугольных…плоскостях шатра…расположены подводные и наземные хищники с добычей. Сверху, в небе, звёзды рассыпаются в виде цветов. Птица в воде хватает рыбу. На земле лиса несёт в зубах птицу. Медведь лезет на дерево в поисках мёда. Птицы несут в клювах змей. Летящие и бегущие фигуры в действительности являются людьми. Сквозь маски зверей и птиц они смотрят человеческими глазами.

Ещё выше в ряд расположены 12 знаков Зодиака в соприкасающихся кругах. Знаки Зодиака необычны, некоторые очень лаконичны и выразительны. Стрелец, например, одной рукой держит лук, другой - натягивает тетиву. Эта рука на Библии - твёрдая, карающая рука. В самом центре шатра – венчающий всё ***трёхглавый орёл***, смесь польского и русского орлов.

На восточной стороне над священной аркой – снова львы, но здесь они держат таблички с Законом. Свисающие с них жертвенные птицы охватывают священную арку. По бокам – 2 панорамы. Слева, на северной стене, - воображаемый образ чудища: проклятый город в когтях дракона, а также Древо Жизни. На другой, северо-западной стороне, - Иерусалим и Древо Познания…

На стенах изображены таблички с надписями, священные предметы из храма царя Соломона, орнаменты, различные живые существа. Богатство художественных форм кажется ненастоящим…Роспись невозможно охватить; она живёт и движется вследствие присущего ей специфического освещения. На всех 4-х стенах имеются окна, расположенные предельно высоко.

Солнце, перемещаясь по кругу, с каждым часом меняет характер освещения, создавая на стенах и особенно на покатых частях потолка различные световые эффекты. Таким образом, всё творение погружено в непрерывную игру света: краски, при всей их прозрачности, очень плотные: от самых «тяжелых» тонов – охры, свинцовых белил, киновари и зелёного, до « легчайших » - голубого и фиолетового».

Будынак гэтай сінагогі быў разбураны ў канцы 30-х гадоў XX ст. Захавалася толькі невялікая кірпічная пабудова на вул.Вялікай Грамадзянскай (былая В.Мяшчанская), якая належыць "Горвадаканалу". Па ўспамінах магілёўскіх яўрэяў, тут размяшчаўся адзін са шматлікіх магілёўскіх хедэраў – рэлігійных пачатковых школ, куды яны хадзілі на вучобу. Мяркуецца, што будынак адначасова выкарыстоўваўся і як малельны дом.

Высокі ўзровень эканамічнага патэнцыялу, шырокія ганлёвыя і культурныя сувязі, развіццё рамесніцтва ў XVII – XVIII ст.ст. садзейнічалі фарміраванню ў Магілёве высокаразвітай мастацкай культуры. Асабліва славіліся магілёўскія майстры гравюры па медзі, разьбы па дрэве, у манументальным жывапісе і архітэктуры. У іх творах праяўляліся своеасаблівыя традыцыі, мясцовыя прыёмы і формы, што гаворыць аб існаванні ***ў XVII-XVIII ст.ст. Магілёўскай школы дойлідства***. Найбольш значныя дасягненні былі ў будаўніцтве ***культавых мураваных храмаў*** з сінтэзам старажытнарускага крыжова-купальнага храма і 3-х нефавай базілікі, што характэрна для заходнееўрапейскага будаўніцтва.

Росквіт магілёўскай школы дойлідства супаў з развіццём архітэктуры ***беларускага барока***. Лепшыя помнікі архітэктуры перыяду барока ў Магілёве, якія існавалі да XX ст. - ***архітэктурныя комплексы праваслаўных манастыроў – Богаяўленскага, Спаскага, Мікалаеўскага,*** а таксама ***цэрквы Пакроўская і Успенская.***

***Праходзячы па вул.Ленінскай з боку Савецкай плошчы справа мы назіраем шэраг мураваных будынкаў XVIII – XIX ст.ст.***



Будынак гарадской управы (зараз на рэстаўрацыі).

Першы з іх (вул. Ленінская–1) пабудаваны з цэглы ў 2-й палове XIX ст. - ***будынак гарадской управы***. Доўгі час тут размяшчаўся Дом культуры будтрэста №12, зараз будынак на рэстаўрацыі, пасля якой плануецца размясціць тут гарадскі Дом шлюбу.

Складаецца ён з 2-х прамавугольных у плане частак: 3-х павярховай, якая тарцовым фасадам выходзіць на плошчу, і 2-х павярховай, якая падоўжаным фасадам выходзіць на вул. Ленінскую. Галоўны тарцовы фасад падзелены на 3 ярусы. Першы дэкарыраваны 4

масіўнымі руставанымі пілонамі, паміж якімі ў цэнтры – галоўны ўваход, а па баках – па 2 вузкіх паўцыркульных ваконных праёмы з ліштвамі і сандрыкамі. Трэці мае невялікія прамавугольныя ваконныя праёмы. Унутраная планіроўка анфіладная (у тарцовай частцы) і калідорная з двухбаковым размяшчэннем пакояў (у падоўжанай частцы). Будынак – прыклад грамадзянскай ***архітэктуры эклектыкі***. У будынку былой гарадской управы на першым паверсе размяшчаўся бакалейны магазін ***М.Іоффе***, а з боку двара – склад тытуню ***Д.Пеўзнера***.

Далей ідуць ***жылыя дамы № № 3, 5/1, 5/2,*** якія пабудаваны ў XIX ст. і ствараюць адзіны комплекс з домам № 1. Двухпавярховыя, прамавугольныя ў плане, галоўныя фасады вырашаны аднатыпна: гладкая сцяна падзелена прамавугольнымі ваконнымі праёмамі. Унутраная планіроўка ўсіх дамоў анфіладная. Прыклад ***эклектычнай архітэктуры.*** Да 1980-х гадоў будынкі выкарыстоўваліся пад жыллё, зараз яны на рэстаўрацыі.


Жылы дом. вул. Ленінская, 7.

***Дом № 7*** па ***вул. Ленінскай*** пабудаваны ў 1790 г. як жылы. Раней тут размяшчаўся гасцінны двор, а ў савецкі час - аптэкакіраўніцтва, склады, потым - дзіцячы прыёмнік-размеркавальнік УУС аблвыканкама, зараз знаходзіцца на рэстаўрацыі. Год пабудовы «1790» пазначаны лічбамі з тынкоўкі на франтоне - гэта самы стары ў горадзе дакладна датаваны такім чынам будынак.

Двухпавярховы Г-падобны будынак з закруглёнай вуглавой часткай. З боку галоўнага фасада знаходзіцца арачны праезд ва ўнутраны двор. Цэнтральная частка галоўнага фасада з мансардай вылучана трохвугольным франтонам *і* фрызам з трыгліфам. Паверхі аддзелены адзін ад другога карнізным пояском. Сцены прарэзаны прамавугольнымі ваконнымі праёмамі, абрамлёнымі на другім паверсе ліштвамі з замковым каменем. У вуглавой частцы дваровага фасада размешчаны ўваход у будынак, на першым паверсе невялікі вестыбюль з лесвіцай на другі паверх. Жылыя памяшканні размешчаны вакол вестыбюля і лесвічнай пляцоўкі другога паверха. Помнік ***архітэктуры класіцызму***.

***Калі мы павернемся спіной да дома № 7, то якраз у двары жылых дамоў*** ( Савецкая пл., 4 і вул. Першамайская, 1 ) ***мы маглі б назіраць адзін з буйнейшых праваслаўных манастыроў XVII –XVIII ст.ст. – Богаяўленскі*** (не захаваўся), у комплекс якога ўваходзілі цэрквы Богаяўленская і Іаана Багаслова, званіца, друкарня, крамы, школа, будынак шпіталя, дом настаяцеля манастыра, шэраг гаспадарчых пабудоў. Усё гэта было абкружана мураванай агароджай з уязной брамай.

Гісторыя манастыра пачынаецца з 1618 г. і звязана з дзейнасцю ***праваслаўнага магілёўскага брацтва***, якое было зацверджана ў 1588 г. пры ***Спаскім манастыры***. Калі ў 1618 г. па загаду ўніяцкага архіепіскапа ***І.Кунцэвіча*** Спаскі манастыр перайшоў да ўніятаў, брацтва вырашыла пабудаваць новую царкву ў імя Богаяўлення. З гэтай мэтай у княгіні ***Саламярэцкай*** купілі дом з пляцам на вул. Вялікай Шклоўскай (Першамайскай), а князь ***Я.Агінскі*** аформіў даравальны фундуш на гэту зямлю. Але з прычыны таго, што ў 1619 г. у горадзе былі закрыты ўсе праваслаўныя цэрквы, будаўніцтва Брацкага Богаяўленскага манастыра затрымалася. Толькі пасля 1632 г., калі ў Магілёве зноў былі адкрыты праваслаўныя цэрквы, з'явілася магчымасць пачаць будаўніцтва. У 1636 г. была пабудавана мураваная Богаяўленская царква, а пазней "цёплая" мураваная царква Іаана Багаслова. Праз 40 год кароль ***Ян Сабескі*** даў брацтву прывілей на адкрыццё пры манастыры друкарні і выданне кніг на беларускай, грэчаскай, польскай і лацінскай мовах. У ёй друкаваў кнігі славуты ***Спірыдон Собаль*** ("Буквар", 1637г.), працавалі вядомыя беларускія гравёры – ***Максім і Васіль Вашчанкі*** (бацька і сын), ***Ф.Ангілейка***.



Багаяўленскі сабор (не захаваўся).

Галоўны будынак манастыра – ***Богаяўленская царква*** - за час існавання неаднаразова перабудоўвалася. Да канца XVII ст. яна мела драўляны дах з дзвума вежамі галоўнага фасада. У 1700 г. была пакрыта бляхай і завершана пазалочаным купалам на высокім васьміграннным барабане. Інтэр'ер царквы быў багата аздоблены, сцены дэкарыраваны размалёўкай. Асаблівай прыгажосцю і высокім майстэрствам вылучаўся ***драўляны 4-ярусны іканастас*** у тэхніцы скразной беларускай разьбы, пакрыты пазалотай. Некаторыя абразы ў іканастасе XVII–XVIII ст.ст. выкананы мясцовым майстрам ***Афанасіем Пігарэвічам***, а сярэбраныя абклады да іх - магілёўскім чаканшчыкам ***Пятром Сліжыкам***. Па ўзору гэтага іканастаса быў выраблены такі ж для ***Мікалаеўскай царквы.***

У сваім пуцявым дзённіку царскі стольнік ***П.Талстой***, у сакавіку 1697 года, адзначаў: "У Магілёве манастыр набожны, называецца брацкім. Каля манастыра агароджа з каменя і царква ў ім саборная мураваная ж не малая, ладна збудаваная... Тая царква ўся ўпрыгожана цудоўным сцянным роспісам, іканастас разьбяны пазалочаны, вялікі, добрай работы".

У першай палове XIX ст. ***Богаяўленскі мужчынскі заштатны манастыр*** уключаў у сябе галоўную мураваную царкву з чатырма прастоламі, цёплую мураваную царкву ў імя ўсіх Святых, званіцу

мураваную, якая была самым высокім збудаваннем у горадзе і адзін са званоў на ёй важыў 320 пудоў.

Манастыр валодаў ворнай зямлёй і ляснымі дачамі, жылымі і агароднымі месцамі, сенакоснымі палосамі пры Дняпры. Усе ўгоддзі звычайна аддаваліся ў арэнду жыхарам. З 1798 г. пад адно кіраванне да яго быў прыпісаны ***Буйніцкі манастыр.***

***Галоўную святыню*** Богаяўленскага манастыра складалі ***частка мошчаў прападобнага Афанасія Афонскага,*** прынесеная з Афонскай гары (захоўваліся ў сярэбраным пазалочаным крыжы) і цудатворная ***Магілёва–Брацкая ікона Божай Маці*** (аб цудадзейнай сіле іконы гл. у раздзеле аб саборы Трох Свяціцеляў – Б.М.).

Богаяўленскі манастыр неаднаразова разбураўся і зноў аднаўляўся. У 1928 г. абедзве манастырскія цэрквы былі закрыты, а ў іх памяшканні размясціўся Цэнтральны гістарычны архіў БССР.

У час абароны горада ў 1941 г. будынкі царквы згарэлі. Але цалкам засталіся сцены і 4-х ярусная званіца. У 1945 г. камісія з упраўлення архітэктуры пры Савеце Міністраў БССР прызнала годнымі для захавання і рэстаўрацыі будынкі манастыра. Галоўнаму архітэктару горада было рэкамендавана ўстанавіць на іх ахоўныя дошкі, але пасля 1952 г. астаткі цэркваў, уцалелыя ў вайну пры фашыстах, былі па-варварску знішчаны нашымі сучаснікамі. І яшчэ да 1956 г. Богаяўленскі храм лічыўся ў спісе помнікаў архітэктуры БССР.


Спаская царква (не захавалася).

***Праходзячы далей па вул. Ленінскай з правага боку, на месцы будынка трэста № 12, знаходзіўся старэйшы архітэктурны комплекс горада – Спаскі манастыр***. Яго галоўны храм – драўляная ***Спаская царква***, вядомая з 1478 г., адыгрывала значную ролю ў жыцці гараджан, а Спас лічыўся заступнікам Магілёва і яго жыхароў. Пры царкве існавалі манашаскія келлі.

У 1594 г. пабудавана новая драўляная царква. Яна адзіная ў перыяд уніяцтва працавала для праваслаўных. У 1708 годзе згарэла і на працягу наступных 50 год прыхажане карысталіся часовай царквой, пабудаванай з дошак. Каля 1600 г. пры Спаскім манастыры была заснавана школа, дзе навучаліся дзеці членаў магілёўскага брацтва. Тут вывучалі царкоўна-славянскую, беларускую, польскую і рускую мовы, якія выкладалі ***Цімафей Грыбач, Паўла Сцяпенны, Спірыдон Собаль*** і інш. Школа дзейнічала да 1621 г., калі перайшла пад юрысдыкцыю ўніятаў ( да сяр. XVIII ст. ).

У 1740–1748 гг. пры падтрымцы рускай імператрыцы ***Анны Іаанаўны*** пачалося будаўніцтва мураванай ***Спаса–Праабражэнскай царквы***, ад якой пасля пажару 1748 г. засталіся толькі сцены.

З 1755 г. у Магілёў быў прызначаны новы епіскап – ***Георгій Каніскі,*** вядомы царкоўны і культурны дзеяч, які актыўна ўзяўся за аднаўленне царквы. Ён выклікаў з Вільні вядомага ў той час архітэктара ***Іагана Глаўбіца***, мастака ў сваёй справе, які будаваў палацы і кляштары не толькі ў Вільні, але і за яе межамі.

У 1762 г. будаўніцтва Спаса–Праабражэнскай царквы было закончана, яе накрылі металічным дахам. Пазней паміж царквой і ратушай узвялі мураваную званіцу, якая атрымала назву ***"астранамічная вежа"***, бо з яе ў час Г. Каніскага праводзіліся астранамічныя назіранні. Епіскап Георгій распарадзіўся ўстанавіць на купале званіцы Спаскага манастыра замест крыжа выяву ***Архангела Гаўрыіла*** з мячом у правай руцэ, які быў выраблены з медзі, пакрытай золатам. Гэта выява прастаяла на Спаскай званіцы больш паўвека, пакуль у 1825 г. не была заменена магілёўскім архіепіскапам ***Паўлам*** на крыж.

Архітэктурнае рашэнне храма з двухвежавай кампазіцыяй галоўнага фасада і дэкаратыўнай аздобай (яскравыя рысы творчасці І.Глаўбіца) - прыклад ***позняга віленскага барока.*** Пры ўзвядзенні будынка ён улічваў канкрэтныя ўмовы і тыя традыцыі, што ўжо існавалі ў культавым дойлідстве Магілёва, таму ў яго архітэктуры знайшлі адлюстраванне будаўнічыя прыёмы ***Богаяўленскага і Мікалаеўскага храмаў.*** Знутры інтэр'ер быў багата аздоблены, там знаходзіліся творы мясцовых майстроў – жывапісца ***Мірона Пігарэвіча*** і чаканшчыка ***Пятра Сліжыка***.

Храм размяшчаўся над Дняпроўскай кручай і галоўным фасадам быў арыентаваны ў бок ратушы. Яго сілуэт вылучаўся сярод жылой забудовы і ўспрымаўся з боку Дняпра на вялікай адлегласці. ***Спаса–Праабражэнская царква*** (да 1802 г. Кафедральны сабор) ***разам з Богаяўленскай і высокай вежай ратушы стваралі*** не толькі выразны сілуэт забудовы цэнтральнай часткі, але і ***твар усяго Магілёва***, асабліва з левабярэжжа Дняпра. Рэшткі Спаса–Праабражэнскага храма ўцалелі пад час вайны 1941–1945 гг. і маглі быць адноўлены, але як і іншыя хрысціянскія святыні былі знішчаны ў 50-я гады XX ст. Зараз на гэтым месцы знаходзіцца адміністрацыйны будынак.

На тэрыторыі Спаскага манастыра ў 1762 г. было пачата будаўніцтва мураванага палаца (праект І.Глаўбіца), якое было закончана ў 1785 г. і атрымала назву ***архірэйскі палац,*** як рэзідэнцыя праваслаўнага архіепіскапа ***Г.Каніскага,*** а пазней з 1797 г. – ***Афанасія Братаноўскага.***



Палац архіепіскапа Г .Каніскага.

Будынак добра захаваўся да нашага часу і з'яўляецца цікавым помнікам жыллёвай архітэктуры. Ён быў пастаўлены так, што разам са Спаса–Праабражэнскай царквой складаў адзіную панараму, якая раскрывалася як з боку Дняпра, так і з боку вул.Ленінскай (Ветранай),

адкуль адкрываўся галоўны падыход да палаца. Перпендыкулярна палацу, утвараючы выцягнуты дворык, былі размешчаны манастырскія келлі, якія ўтваралі архірэйскі двор ( не захаваліся ).

У плане палаца цэнтральнае месца займаюць вестыбюль з парадная трохмаршавай лесвіцай і арыентаваная ў бок Дняпра зала для прыёмаў. Астатнія пакоі першага паверха адводзіліся пад службы. На другім паверсе знаходзіліся спальня, кабінет і бібліятэка. Трэці, атыкавы паверх, быў прызначаны для гаспадарчых патрэб.

У манументальным строгім аб'ёме палаца і яго дэкаратыўнай аздобе сумяшчаюцца рысы ***барока і ранняга класіцызму***. Пластычнае рашэнне фасадаў з крывалінейным пераходам да бакавых рызалітаў, складаныя па рысунку ліштвы вокнаў, высокі ламаны дах – гэта элементы архітэктуры барока. Рызаліты і бакавыя фасады маюць больш строгае вырашэнне: абрамленне вокнаў тут спрошчана, а сцены па ўсёй вышыні пакрыты глыбокім рустам. Разнастайнасць прыёмаў дэкору фасадаў палаца не пазбавіла яго архітэктуру цэласнасці. У савецкі час выкарыстоўваўся як жылы дом, зараз перададзены Магілёўскай епархіі і ў ім плануецца размясціць ***музей Г.Каніскага і бібліятэку.***



Мемарыяльная дошка Г. Каніскаму

На будынку змешчана мемарыяльная дошка, на якой чытаем: "У гэтым доме жыў і працаваў у 1785–1795 гг. вядомы дзеяч культуры ўсходніх славян, асветнік, пісьменнік і палітык – архіепіскап ***Георгій Каніскі".***

"Георгій ёсць адзін з самых славутых дзеячаў мінулага стагоддзя. Жыццё яго належыць гісторыі,"– зазначыў ***А.С.Пушкін*** у нататках да выдання ў 1835 г. збору твораў Г.Каніскага, архіепіскапа беларускага, сорак год жыцця і дзейнасці якога звязаны з Магілёвам.

***Каніскі*** паходзіў з шляхецкай сям'і казацкага асяроддзя, так званых "новых людзей", якія пасля рэформ Пятра I атрымалі магчымасць рухацца наперад па службовай лесвіцы.

Нарадзіўся Рыгор Восіпавіч 20 лістапада 1717 года ў г. Нежыне на Чарнігаўшчыне. Пасля заканчэння палкавой школы 11-ці гадовым хлапчуком ён паступае ў ***Кіева–Магілянскую акадэмію,*** якая лічылася ў той час буйнейшым цэнтрам навукі і асветы ва ўсім славянскім свеце. Рыгор Каніскі вучыўся ў акадэміі ў час яе найвышэйшага росквіту, калі там выкладалі яе лепшыя выпускнікі ***Стэфан Каліноўскі, Міхась Казачынскі, Сімеон Татароўскі.*** Яны ўвасаблялі новы час, адзначаны пятроўскімі рэформамі. На гэты ж час прыпадае яго вучоба ў ***Ф.Пракаповіча*** і ***Г.Скаварады.***

Пасля заканчэння акадэміі ён трапляе ў лік выбраных выпускнікоў, якія штогод папаўнялі яе выкладчыцкі састаў. У 1744 г. Каніскі пастрыгаецца ў манахі Брацкага манастыра ў Кіеве і прымае ***духоўнае імя Георгій***. З ім ён і ўвайшоў у айчынную гісторыю.

Каля двух год малады іераманах старанна рыхтуецца да выкладчыцкай дзейнасці і ў 1745 г. становіцца прафесарам кафедры красамоўства акадэміі, дзе чытае распрацаваны ім арыгінальны курс паэтыкі. З 1751 г. ён - рэктар акадэміі, дзе зарэкамендаваў сябе прыхільнікам прагрэсіўнай навукі, выдатным прамоўцам і заўзятым, непрымірымым змагаром супраць Ватыкана і Брэсцкай уніі 1596 г. Каніскі цаніў прыродазнаўчыя навукі і ў некаторых пытаннях адыходзіў ад тэалогіі, высока ставіў вучэнні ***Каперніка, Галілея, Дэкарта,*** паважаў розум чалавека. Менавіта, з гэтым звязана тое, што ў Магілёве са званіцы Спаскай царквы ім рабіліся астранамічныя назіранні***. Каніскі выказваў думку, што беларусы павінны мець права гаварыць і пісаць на роднай мове, захоўваць свае нацыянальныя звычаі.***

Найбольш ярка ўсе яго якасці праявіліся ў перыяд знаходжання ў Беларусі, дзе ён здабыў сабе славу шырока вядомага грамадска–палітычнага дзеяча.

23 мая 1755 г. кароль ***Аўгуст III,*** нягледзячы на супраціўленне папы і полацкага мітрапаліта ***Грабніцкага,*** падараваў Каніскаму прывілей на “епископию Белорусскую, Мстиславскую, Оршанскую и Могилёвскую со всеми правами епископской власти и юрисдикции и с правом на владения разными местностями и угодьями”.

20 жніўня 1755 г. ён пасвячаецца ў епіскапскі сан Кіеўскім мітрапалітам ***Цімафеем Шчарбацкім***, а праз два месяцы прыязджае ў Магілёў. У той перыяд гэта была ***адзіная на тэрыторыі Беларусі і ўсёй Рэчы Паспалітай праваслаўная епархія***. Кіраўнік праваслаўнай царквы Георгій Каніскі аказваецца ў цэнтры палітычнай барацьбы і разгортвае актыўную грамадзянскую дзейнасць. Нягледзячы на праследаванні і пагрозы езуітаў, ён выступае з пропаведзямі, якія выкрываюць палітычныя матывы ўніяцкага духавенства ў Беларусі. Асноўную мэту сваёй дзейнасці ён бачыў ва ўзмацненні і абароне праваслаўнай веры, выкарыстоўваючы любыя сродкі, што натуральна, выклікала злосць езуітаў, якія неаднаразова рабілі замахі на яго жыццё. ***А.С.Пушкін*** даў наступную ацэнку дзейнасці Каніскага–прапаведніка: “Пропаведзі Георгія простыя і нават некалькі грубаватыя, як павучэнні старажытных мудрацоў, але шчырасць іх захапляючая. Палітычныя прамовы яго маюць вялікую вартасць”.



Г.Каніскі

Першай значнай справай, зробленай ім, было адкрыццё ў Магілёве духоўнай семінарыі па ўзору Кіеўскай, а пазней стварэнне пры архірэйскім доме ***друкарні,*** дзе між іншымі кнігамі быў аддрукаваны рукапіс выдатнага пісьменніка і асветніка ***Феафана Пракаповіча “Пра паэтычнае мастацтва”.*** Шмат сіл прыклаў Георгій для будаўніцтва ў 1756–62 гг. Спаскай царквы. З 1781 г. Каніскі ў многіх гарадах Беларускай епархіі, у тым ліку ў Быхаве, Мсціславе, Крычаве, адкрывае пры цэрквах школы для навучання дзяцей рускай пісьменнасці, правапісу і катэхізісу, для чаго надрукаваў шэраг навуковых прац, выдаў

мастацкія творы і вучэбныя дапаможнікі. Менавіта ў непарушнай сувязі з развіццём навукі, пашырэннем адукацыі бачыў ён грамадскі прагрэс і паслядоўна праводзіў свае ідэі ў жыццё. Імянным указам ***Кацярыны ІІ*** 23 верасня 1783 г. ***Г.Каніскі*** быў узведзены ў сан архіепіскапа Беларускага і члена Св. Сіноду.

Вось як сказаў ён аб сваім жыццёвым шляху на надгробным надпісу, які распарадзіўся ў 1793 годзе выгравіраваць на меднай дошцы і устанавіць пасля сваёй смерці над магілай:

***Колыбель- Нежин, Киев - мой учитель;***
***Я в тридцать восемь лет сделался Святитель.***
***Семнадцать лет боролся я с волками,***
***А двадцать два, как Пастырь,отдохнул с овцами,***
***За претерпенные труды и непогоду***
***Архиепископом и Членом стал Синоду.***
***Георгий именем, я из Конисских дому,***
***Коню бывал подобен почтовому.***
***Тут трупа моего зарыты кости***
***В год семисотый пятый девяностый.***

Памёр Св. Георгій Каніскі – архіепіскап Магілёўскі і Беларускі 13 лютага 1795 г. і быў пахаваны ў Спаса-Праабражэнскай царкве, якую некалі пабудаваў. Сёння месца знаходжання мошчаў Георгія невядома, бо царква ў савецкія гады была разбурана, а на яе месцы ўзведзены корпус будаўнічага трэста. Існуе меркаванне, што ў 1930-я гады ваяўнічымі бязбожнікамі гроб з целам святіцеля быў выкінуты з сабора.

5 жніўня 1993 года ў Ануфрыеўскай царкве Свята-Мікольскага манастыра ў Магілёве адбылося гістарычнае пасяджэнне Сінода Беларускай Праваслаўнай Царквы на чале з Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Мітрапалітам ***Філарэтам,*** на якім было вырашана ***прылічыць да ліку мясцовашануемых святых свяціцеля Георгія (Каніскага),*** архіепіскапа Магілёўскага і Беларускага. У той жа дзень, вечарам у Трохсвяціцельскім кафедральным саборы адбыўся чын кананізацыі свяціцеля ***Георгія Магілёўскага***.



Мемарыяльны крыж.

Крыж, які знаходзіцца на валу насупраць палаца архіепіскапа, адкрыты 6 жніўня 1993 г. на ўшанаванне памяці і азнаменаванне ***кананізацыі першага Магілёўскага святога.*** На ім мы чытаем словы Георгія: “Во что верую - то и исповедую”.

Кожны год 6 жніўня ў дзень праслаўлення свяціцеля ***Георгія Магілёўскага*** ў ліку святых за яго каласальную стваральную і асветніцкую дзейнасць ад Свята–Мікольскага жаночага манастыра сюды накіроўваецца ўрачысты хрэсны ход.

Магіляўчане могуць ганарыцца магчымасцю адшукаць сярод групы асветнікаў на помніку

"***Тысячагоддзя Расіі***" у Вялікім Ноўгарадзе барэльеф ***Св. Георгія Каніскага.*** На шматфігурным мануменце, пабудаваным у 1862 годзе ў Ноўгарадскім Крамлі, прадстаўлены 106 гістарычных асоб, якія найбольш вызначыліся за тысячу год існавання Расійскай дзяржавы. Архіепіскап Георгій знаходзіцца побач з асветнікамі славян, роўнаапостальнымі ***Кірылам і Мефодзіем, Нестарам-летапісцам і Феафанам Пракаповічам.***

У 80-я гады XVIII ст. да архірэйскага палаца быў далучаны комплекс ***магілёўскай духоўнай семінарыі*** (не захаваўся*)*. Будаўніцтва гэтай старэйшай на тэрыторыі Беларусі навучальнай установы звязана з дзейнасцю Г. Каніскага. Будынак семінарыі знаходзіўся паміж палацам і сучаснай вул. Болдзіна. Разбураны пад час апошняй вайны.

***Мураваны двухпавярховы жылы дом на архірэйскім двары***, пабудаваны ў сяр. XIX ст., захаваўся да цяперашняга часу (вул Ленінская, 13). Галоўным фасадам ён выходзіць на вуліцу. На першым паверсе ў ім знаходзіліся крамы, а на другім – спальня, гасціная зала. Зараз у ім размяшчаецца музей гісторыі г. Магілёва.



Уязныя вароты (арка) ў архірэйскі двор

Аднachасова каля гэтага дома, на адзінай восі з архірэйскім палацам былі пабудаваны ***ўязныя вароты*** – паўкругам размешчаныя мураваныя слупы, аб'яднаныя ажурнай агароджай (захаваліся). Другім бокам агароджа прымыкае да аднапавярховага дома (вул. Ленінская, 11), у ім размяшчаўся ***семінарскі інтэрнат***, а зараз - магазін "Дэкорум".

Захаваліся ***два двухпавярховыя мураваныя дамы***, пабудаваныя ў 1850-я гады (вул. Ленінская, 15, 17), якія раней належалі купцу ***Кітаеву,*** а потым семінарыі. Невялікія будынкі маюць высокае падвальнае памяшканне са скляпеністым перакрыццём. Лесвіцы на другі паверх раней знаходзіліся на галерэі дваровага фасада. Былі прыстасаваны для патрэб семінарыі і як жыллё для настаўнікаў і выхаванцаў. У доме № 15 размяшчаўся семінарскі архіў.

***Адсюль мы перамяшчаемся на вал і выходзім на сучасную плошчу Арджанікідзе*** (***Касцерня***)***.*** Плошча названа ў гонар дзяржаўнага і палітычнага дзеяча СССР ***Р.Арджанікідзе,*** які ў 1919 г. у якасці члена РВС 16-й арміі Заходняга фронту каля месяца працаваў у Магілёве.

Тут была ўскраіна Старога горада і другі пояс гарадскіх умацаванняў – глыбокі роў і вал, якія знесены толькі ў 1808 – 30-х гадах. Сучасную планіроўку плошча набыла ў 1959 годзе з пабудовай Дняпроўскага моста і

спуску да яго, створанага на месцы былой вул.Падвальнай і часткі скапанага вала.



Магілёўскі філіял Беларускага інстытута правазнаўства

Зараз на плошчы дамінуюць ***два сучасныя будынкі***, узведзеныя ў апошні час: ***11-ці павярховы інтэрнат педагагічнага каледжа*** (арх. ***Э.Юшка***) і ***5-ці павярховы будынак філіяла Беларускага інстытута правазнаўства*** (арх. ***А.Валовіч***).

Са старых пабудоў захаваўся толькі ***будынак былога Аляксандраўскага рэальнага вучылішча,*** названага так у гонар 25-ці годдзя праўлення ***Аляксандра II*** (цяпер у ім размяшчаецца Магілёўскі педагагічны каледж). Пабудаваны ён ў 1884-85 гг. па праекту губернскага інжынера ***У.С.Міляноўскага*** пры актыўнай падтрымцы губернатара ***А.С.Дамбавецкага***. У вучылішча прымаліся хлапчукі незалежна ад сацыяльнага паходжання і веравызнання. Атэстат вучылішча не даваў права яго выпускнікам паступаць ва універсітэт. У іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы яны маглі трапіць толькі пасля праверачных іспытаў.



Будынак былога Аляксандраўскага рэальнага вучылішча.

Будынак знаходзіцца на плошчы, на рагу вуліц Піянерскай (Малая Садовая) і Камсамольскай (Дваранская). 2-х павярховы дом з паўпадвальным паверхам быў пабудаваны з цэглы і галоўным фасадам арыентаваны ў бок Дняпра. У 1967 г. надбудавалі трэці і чацвёрты паверхі. У плане ён складанай формы, паўтарае вуглавую форму ўчастка і мае калідорную сістэму планіроўкі. Галоўны фасад у цэнтры быў вылучаны несапраўдным рызалітам з 2-ма пілястрамі па баках, якія завершаны над карнізам невысокімі шпілямі і атыкавай сценкай над ўсімі рызалітамі. Сцены рытмічна прарэзаны прамавугольнымі ваконнымі праёмамі з простымі ліштвамі,будынак завершаны карнізам. Помнік ***архітэктуры позняга класіцызму.*** На жаль, пасля перабудовы страціў свой першапачатковы выгляд і ўсе архітэктурныя дэталі фасадаў.

***На рагу вуліц К.Лібкнехта і К.Маркса спынімся каля будынка цяперашняга медвучылішча*** (былая цэнтральная школа павівальных бабак), заснаванага ў 1875 г. Пасля 1861 г. Магілёў стаў цэнтрам медыцынскай адукацыі. Пры актыўнай падтрымцы магілёўскага губернатара быў



Медыцынскае вучылішча.

распрацаваны праект адкрыцця ***Магілёўскай школы павітух***, і ў 1865 г. яна пачала сваю дзейнасць. Спачатку школа служыла для падрыхтоўкі сельскіх павітух з ліку сялянак толькі Магілёўскай губерні, а пазней была пераўтворана ў цэнтральную школу павітух для Магілёўскай, Мінскай і Віцебскай губерняў. Вопыт дзейнасці школы павітух быў выкарыстаны пры стварэнні ў 1875 г. Магілёўскай цэнтральнай фельчарскай школы, якая рыхтавала кваліфікаваных фельчараў з ліку асоб сялянскага паходжання. Па колькасці прадметаў і аб'ёму ведаў яна пераўзыходзіла такія ж установы Расійскай імперыі і служыла для іх узорам. ***Магілёў быў адзіным беларускім горадам, дзе існавалі дзве медыцынскія ўстановы такога ўзроўню.***

***Да медвучылішча прымыкаюць будынкі гарадской бальніцы*** (вул. Боткіна-2, былая Гваздоўка), пабудаваныя ў 1802 г. для бальніцы гарадской апекі, якая спачатку размяшчалася ў драўляным будынку. У 1864 г. зроблены два 2-х павярховыя мураваныя карпусы, а ў 1912 г. пабудаваны яшчэ адзін корпус – інфекцыйнага аддзялення. Была разлічана на 150 ложкаў, працавалі 4 урачы, 4 медсястры, 2 акушэры і 4 фельчары.

Тры мураваныя карпусы сіметрычна размешчаны вакол невялікай азелянёнай плошчы, два бакавыя 3-х павярховыя Е-падобныя ў плане будынкі галоўнымі фасадамі арыентаваны на лінію забудовы вуліцы Боткіна. Паміж 3-х павярховымі будынкамі размешчаны 2-х павярховы адміністрацыйны корпус. У пасляваенны час створаны новыя будынкі. Цяпер гэта буйная шматпрофільная лячэбная ўстанова. З 1973 г. – бальніца хуткай дапамогі.




Мемарыяльная дошка ваенурачам

На адміністрацыйным корпусе ў 1966 г. устаноўлена ***мемарыяльная дошка ваенурачам.*** У ліпені 1941 г. у бальніцы размяшчаўся шпіталь 172-й стр. дывізіі, якая абараняла Магілёў. Пасля захопу горада немцамі ўвесь медыцынскі персанал шпіталя на чале са ст. урачом 388-га стр. палка, начальнікам шпіталя ***У.П.Кузняцовым*** застаўся з параненымі. У шпіталі налічвалася каля ***4-х тыс. параненых.*** За адну ноч У.П.Кузняцоў разам з урачамі Ф.І.Пашанінам і А.І.Паршыным знішчылі гісторыі хвароб камандзіраў і палітработнікаў, выпісалі новыя, як на беспартыйных, радавых і

жыхароў, што пацярпелі ад бамбёжак. Урачы перапраўлялі вылечыўшыхся воінаў да партызан, але правакатар выдаў патрыётаў немцам і 17 лістапада 1941 г., пасля жорсткіх катаванняў, ***У. П. Кузняцоў, Ф. І. Пашанін*** і ***А. І. Паршын*** былі павешаны на Савецкай плошчы.

У 1976 г. на адміністрацыйным корпусе была ўстаноўлена ***мемарыяльная дошка падпольшчыкам.*** У снежні 1941 г. урач ***М.П.Куўшынаў*** стварыў у бальніцы падпольную антыфашысцкую арганізацыю, у якую ўваходзілі ўрачы ***С.В.Мармулеўскі, К.А.Улагіна, С.П.Мельнік*** і інш. Падпольшчыкі аказвалі медыцынскую дапамогу байцам Чырвонай арміі, якія засталіся ў горадзе, выдавалі фіктыўныя медыцынскія даведкі, каб выратаваць людзей ад вывазу ў Германію, забяспечвалі партызан медыкаментамі, праводзілі разведвальную работу. У маі 1943 г. члены групы былі арыштаваны і закатаваны ў гестапа. ***М.П.Куўшынаў*** пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені.

***Справа адкрываецца від на Падміколле, маляўнічую пойму Дняпра,*** якая ў вясенні разліў моцна затапліваецца і раней называлася ***"Балонне".*** Здаўна, пасля спаду вады, гэтыя месцы выкарыстоўваліся мясцовым насельніцтвам пад агароды. Зараз гэта санітарная зона аднаго з водазабораў гарадскога вадаправода. У старажытнасці тут, на незатапліваемай частцы заліўных лугоў, т.н. грыве, сфарміравалася ***Грыўлянская сотня,*** а затым і ***Пакроўскі пасад***, дзе да нашага часу поўнасцю захаваўся ***адзіны ва Усходняй Беларусі комплекс Мікалаеўскай царквы архітэктуры беларускага барока.*** Царква мае багатую і складаную гісторыю.

Упершыню яна ўпамінаецца ў інвентарах гарадоў Віцебска і Магілёва. Фрагментарна вядома, што першапачаткова царква была драўлянай і размяшчалася ў Старым горадзе (Нагорны пасад), 25 красавіка 1580 г. яна асвячона, а ў 1598 г. была абрабавана.

Па адной з версій, пры царкве, у святара ***Фёдара Сасіна*** ў 1607 г. некаторы час жыў і вучыў дзяцей грамаце ***Дзмітры Нагі,*** будучы ***Лжэдзмітрый ІІ,*** які потым адсюль прыбыў у Маскву як наследнік на царскі трон.

Заснаванне ***Свята-Мікольскага манастыра*** ў Магілёве звязана з гістарычнымі асобамі, меўшымі непасрэдныя адносіны да царкоўнага жыцця горада.. У красавіку 1636 г. Кіеўскі мітрапаліт ***Пётр Магіла*** атрымаў ад польскага караля ***Уладзіслава IV*** згоду на пабудову ў Грыўлянскай сотні Свята-Мікольскага храма з памяшканнямі "для особ духовных и чернцов ..."

У 1637 г., калі Магілёўскай епархіяй кіраваў епіскап ***Сільвестр Косаў***, грыўлянскія прыхаджане пабудавалі часовую ***Мікольскую царкву*** з жаночым манастыром пры ёй. А ў 1646 г. мяшчане Магілёва атрымалі каралеўскі прывілей "на строительство каменной (мурованой) Николаевской церкви на грунтах, купленных гривлянскими мещанами, не униатами".

Каралеўская грамата забяспечвала праваслаўным спакойнае існаванне царквы і манастыра ад насілля ўніятаў і замкавай адміністрацыі. Мяшчанам дазвалялася мець у год два каноны і дзве ярмаркі пры царкве "на зимнего и

весеннего Николу”. Копія гэтай граматы з пячаткай захоўвалася ў Мікольскім храме яшчэ ў 1848 г.

Будаўніцтва ***Мікольскага летняга мураванага сабору*** ў дайшоўшым да нас выглядзе пачалося толькі ў 1669 г. і закончана ў 1672 г., калі ён быў асвячоны. У ім былі збудаваны два прыдзелы: правы – у імя св. Іаана

Прадцечы (усекнавення яго галавы), левы – у імя св. Вялікамучаніка Дзмітрыя Салунскага.

У 1697 г. царскі стольнік ***П.А.Талстой***, у падарожных нататках адзначаў: “За городом – монастырь Николаевский, в нём живут инокини благочестивой греческой веры. В том монастыре церковь каменная, изрядного строения. Апреля в 5 день, в понедельник святой недели, был у обедни в Николаевском девичьем монастыре, там церковь каменная, иконостас великий, золочёный...”.

Свята-Мікольскі жаночы манастыр дзейнічаў з 1637 г. па 1719 г., затым ён быў пераtвораны ў мужчынскі і ў 1754 г. - зачынены. Пасля гэтага храм стаў прыходскім. Увогуле, манастыры тут дзейнічалі 117 год.

У сярэдзіне XVIII ст. сабор быў рэстаўрыраваны, а ў 1-й палове XIX ст. настаяцель храма пратаіерэй ***Яўфімій Бекарэвіч*** зрабіў у ім капітальны рамонт, і пасля сваёй смерці быў пахаваны ў храме. У XX ст. яго магіла была разбурана і разрабавана.

У свой час пры храме дзейнічалі 2-х класнае царкоўна-прыхадское вучылішча і багадзельня. На манастырскай тэрыторыі да гэтага часу знаходзіцца і зімняя царква 1793-96 гг. пабудовы, асвячоная ў імя св.Прападобнага Ануфрыя Вялікага ***(Ануфрыеўская царква).***

З 1901 г. у Мікалаеўскім саборы служыў свяшчэннік ***Міхаіл Ляшчынскі,*** які памёр ў 1934 г. (пахаваны на Мышакоўскіх могілках). Пасля яго смерці храм быў зачынены. У 1936–37 гг. тут размяшчалася перасыльная турма, а з 1946 г.- кніжная база. У 1954 - 55 гг. сцены і зводы храма былі атынкаваны цэментным растворам (сярод мясцовых жыхароў ходзіць легенда, што тынкоўка выраблялася будаўнікамі з дабаўленнем солі, каб раз і назаўжды знішчыць фрэскі XVII ст. - напамін “аб рэлігійным дурмане” для народа).

У 1972 -78 гг. часткова былі выяўлены і раскрыты раннія роспісы XVII ст. на зводзе купала і ў Алтарнай часцы. Гэта былі фрэскі, выкананыя па сухой тынкоўцы ў святле малінавых, залацістых і ізумрудна-зялёных таноў. З 1956 па 1990 гады рознымі арганізацыямі тут праводзіліся рэстаўрацыйныя работы, у выніку якіх будынак Мікольскай царквы прыйшоў у яшчэ большы заняпад.У савецкі час манастыр і храмы ў горадзе былі зачынены, перад калядамі у 1930 годзе з усіх цэркваў Магілёва знялі званы, а ў 1937 годзе перастала існаваць і Магілёўская епархія.

Але так не магло быць вечна, і 6 ліпеня 1989 г. па благаславенню Патрыярха ***Пімена*** і пастанове Св. Сінода Рускай Праваслаўнай Царквы Магілёўская епархія была адноўлена. Упраўляючым епархіяй быў прызначаны высокапраасвяшчэнны ***Максім*** (у міру ***Барыс Іванавіч Кроха), архіепіскап Тульскі і Белеўскі.***



Архіепіскап Максім

Пасля перадачы веруючым Магілёва комплекса Падміколля – былога жаночага манастыра, Св. Патрыярх ***Алексій II*** благаславіў аднаўленне і адраджэнне жаночага манастыра. Гістрычнай падзеяй для манастыра быў дзень 18 чэрвеня, калі Алексій II, разам з суправаждаючымі яго іерархамі наведаў манастыр, агледзеў аднаўляемыя храмы, сястрынскі корпус і перадаў сваё Першасвяціцельскае благаславенне першым насельнікам манастыра.

У 2002 г. уладыка ***Максім***, ***архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі***, памёр (пахаваны ў манастырскім двары), новым упраўляючым епархіяй прызначаны епіскап ***Сафроній.***

Сёння мы можам назіраць адрэстаўрыраваны ***архітэктурны комплекс***, які складаецца з мураваных будынкаў ***Мікалаеўскай*** і “цёплай“ (зімовай) ***Ануфрыеўскай цэркваў***, ***2-х павярховага жылога дома, званіцы.*** Абкружае



Свята-Мікольскі манастыр (комплекс)

тэрыторыю ***мураваная агароджа з уязной брамай.***



Мікалаеўская царква

***Мікалаеўская царква*** – 3-х нефавая, 3-х апсідная крыжова-купальная базіліка - характэрны прыклад беларускага барока і магілёўскай школы дойлідства. На нізкім светлавым васьмігранным барабане цыбулепадобны купал, які аб’ядноўвае абедзве часткі храма ў адзіную кампазіцыю. Дэкаратыўнае ўбранства ярусаў галоўнага фасада стварае ўражанне цэласнасці, разнастойнасці і багацця, надае помніку незвычайную прыгажосць. Ярусы маюць розную вышыню, што падкрэслівае імкненне будынка ўверх.

Унутраная прастора храма 2 радамі калон (па тры ў кожным) падзелена на 3 нефы. Барабан купала пры дапамозе ветразяў абапіраецца на 4 слупы. Інтэр'ер некалі быў багата аздоблены фрэскавым роспісам. Скляпенні купала ўпрыгожвалі фрэскавая кампазіцыя ***"Троіца новазапаветная"*** (XVIII ст.), а на ветразях – выявы 4-х апосталаў з сімваламі. Сцены паміж ваконнымі праёмамі размаляваны на 2-х узроўнях на біблейскія і евангельскія тэмы. Усе яны былі створаны ў 1-й палове XVIII ст. На жаль, аднавіць удалося толькі фрэскі на зводзе купала.

Самы выдатны мастацкі твор знакамітага храма – ***4-х ярусны іканастас,*** выкананы магілёўскімі майстрамі–разьбярамі і пазалотчыкамі ў XVII ст. у тэхніцы скразной драўлянай разьбы з пазалотай. Ён зараз поўнасцю адноўлены і адрэстаўрыраваны ў першапачатковым выглядзе. Па сваёй пабудове (яруснасць), формах (драўляныя калонкі, пакрытыя арнаментальнай разьбой вінаградных лоз - улюбёны матыў барока) і характару разьбы ён блізкі да іканастаса, выразанага для Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра ў Маскве беларускімі майстрамі ў 1683-85 гг.

Побач з галоўным храмам знаходзіцца невялікая, выкананая ў строгім класічным стылі ***Ануфрыеўская царква.*** Зімой Мікалаеўская царква не працавала, бо абагрэць такі вялікі будынак было немагчыма, і ўсе богаслужэнні праходзілі ў цёплай Ануфрыеўскай царкве.

Вугал агароджы ўвенчваецца невялікай ***часовенкай-званіцай,*** у якой некалі былі пахаваны святыя мошчы. У старой пабудове, да рэстаўрацыі, прамая сцяна ў адным месцы рабіла невялікі выгіб. Менавіта тут быў пахаваны святы і калі пракладвалі сцяну, на гэтым месцы спецыяльна зрабілі вугал, каб не пашкодзіць магілу (зараз сцяна спрамлена). Пазней астанкі выкапалі і перанеслі ў часовенку. Хаваць нябожчыкаў каля цэркваў з'яўляецца даўняй традыцыяй, бо лічылася, што яны хутчэй трапляюць у рай.

Сярод шануемых святынь манастыра знаходзіцца спіс аднаго з найбольш старажытных абразоў ***Магілёва-Брацкай Маці Божай***, куды ён быў перададзены з ***Барыса-Глебскай царквы.*** Адзінае адрозненне на ёй ад класічнага спісу–над галовамі Багародзіцы і дзіця Іісуса намаляваны кароны, якія ўказваюць на тое, што ікона каранавана каталіцкай царквой, шануецца і паважаецца каталіцкімі веруючымі. Сярод такіх ікон на Беларусі –***Бялыніцкая і Жыровіцкая***. Не так даўно абраз быў адрэстаўрыраваны і зараз уяўляе сабой яскравы прыклад высокапрафесійнага майстэрства ***магілёўскай іканапіснай школы.***



Ікона Божай Маці Баркалабаўскай

У саборы манастыра знаходзіцца адзін са спісаў цудатворнай іконы ***Божай Маці Баркалабаўскай.*** На гэтай іконе маецца вершаваны надпіс: ***"Въ Варкалабове стоить Богомати/ тамо источаеть реки Благодати сей дру-/ гій образъ какъ на месте зрети прибегай/ те къ ней, отцы и дети/ тамо въ молитвахъ успехъ***

***получають съ верою/ молясь за все то/ дознають".*** Гэта ікона, напісаная ў сярэдзіне - другой палове XVIII ст., зверху мела выявы ангелаў, карануючых Божую Маці (зараз яны часткова страчаны) і сярэбраны аклад (не захаваўся), выкананы ў 1781 годзе магілёўскім ювелірам ***П.Сліжыкам***.

У Ануфрыеўскай царкве манастыра маецца яшчэ адзін спіс ***Баркалабаўскай іконы,*** зроблены з цудатворнай іконы XVII ст. і набыты ў 1992 годзе. Перад ёй гараць тры лампады, атрыманыя ў дар з Грэцыі, з Фесалонікаў. Кожны дзень перад гэтай іконай, пасля Святой літургіі, здзяйсняецца малебен.

Імя ***Цара-пакутніка Мікалая II*** і яго трагічны лёс добра вядомы ў Магілёве. Тут ён знаходзіўся ў асабліва цяжкія для яго сакавіцкія дні 1917 г. пасля свайго адрачэння ад расійскага трону ў імя прадухілення кровапраліцця і братазабойчай грамадзянскай вайны. У Спаса-Праабражэнскім храме ён у апошні раз са слязамі на вачах прысутнічаў на Святой Літургіі. Адсюль пачаўся яго шлях на рускую Галгофу: узяцце пад стражу, заключэнне ў турму і пакутніцкая смерць у Екацярынбургу ў ноч на 17 ліпеня 1918 г.


Св.Мікалай II–пакутнік

14 жніўня 2000 г. у Храме Хрыста Збавіцеля ў Маскве на Архірэйскім саборы здзейснілася кананізацыя членаў імператарскай сям'і. У гэты ж дзень у Магілёве незвычайны выпадак дапамог знайсці ***парадны партрэт імператара Мікалая II ў поўны рост.*** Адшуканы ён быў у нішы сцяны старой часткі будынку па вул.Піянерскай, дзе цяпер размяшчаецца Магілёўскі філіял Беларускага камерцыйнага інстытута. У памяшканні, дзе трагічна скончыў жыццё самагубствам адзін з прадпрымальнікаў, праводзіўся рамонт. Майстры ўскрывалі акрываўленыя дошкі пола і сцен, за якімі і знайшлі тайнік. Хаця выява Мікалая II на партрэце і не была кананічнай, па просьбе ўладыкі Максіма партрэт быў перанесены ў манастыр, дзе знаходзіцца зараз ужо як шануемая прыхажанамі і паломнікамі ***ікона.***


Ікона Божай Маці Бялыніцкай

Захоўваецца ў саборы манастыра і адна з копій ***іконы Божай Маці Бялыніцкай***. Арыгінал цудатворнага абраза Божай Маці ( сёння лёс яго невядомы) знаходзіўся ў ***Бялыніцкім манастыры*** і калі ён быў праваслаўным, і калі часова належыў католікам. Кожны з паломнікаў, хто з верай прыходзіў у бялыніцкі храм, па сведках відавочцаў, атрымліваў збаўленне ад хваробы. У Магілёўскай епархіі існаваў звычай: перш, чым здзейсніць паломніцтва ў ***Кіева-Пячорскую Лаўру***, неабходна было наведаць Бялыніцкі манастыр і, атрымаўшы благаславенне, адпраўляцца ў шлях. ***Адзігітрыя Бялыніцкая*** для ўсходняга рэгіёну

Беларусі была такой жа шануемай святыняй, як ***Божая Маці Жыровіцкая*** для заходняга краю.

***Падняўшыся па крутой лесвіцы з Падміколля, пройдзем праз плошчу Арджанікідзе, вул.Камсамольскую (***былую ***Бульварную, Дваранскую) і павернем на вуліцу Ленінскую.*** Тут мы спынімся каля будынка, дзе зараз размяшчаецца дзіцяча-юнацкая спартыўная школа алімпійскага рэзерву (дом № 25), які быў пабудаваны для ***магілёўскага каталіцкага архібіскупа Станіслава Богуша–Сестранцэвіча.*** Пасля першага падзелу Польшчы ў 1772 г. для каталіцкага насельніцтва далучаных да Расіі абласцей у снежні 1773 г. было створана ***Беларускае каталіцкае біскупства*** з цэнтрам у Магілёве, якое ён па указу ***Кацярыны II*** і ўзначаліў.

***Богуш–Сестранцэвіч С.І.*** – царкоўны дзеяч, вучоны, літаратар, нарадзіўся ў 1731 г. у в.Занкі Свіслацкага р-на (дзядзька ***В.Дуніна-Марцінкевіча***). Вучыўся ён ва ўніверсітэтах Заходняй Еўропы і Лондана, скончыў Варшаўскую галоўную школу піяраў (1763 г.). З 1773 г. – біскуп, з 1782 г.- Магілёўскі архібіскуп. У Магілёве ім заснавана друкарня і каталіцкая духоўная семінарыя. У справе кіраўніцтва каталіцкімі царкоўнымі ўстановамі праводзіў палітыку ***Кацярыны II, Паўла I*** і ***Аляксандра I.*** На Магілёўшчыне яму належылі маёнткі Маляцічы, Буйнічы, Пячэрск, у Чэрыкаўскім павеце - вёскі Лапацічы, Мышкавічы, Бязводзіцы, у Магілёве – мэблевая фабрыка.



Богуш- Сестранцэвіч С.І.

У 1798 г. С.Богуш–Сестранцэвіч узводзіцца ў ранг мітрапаліта ўсіх рымска-каталіцкіх цэркваў Расійскай імперыі і па ўказу імператара ***Паўла I*** пераносіць сваю рэзідэнцыю ў Пецярбург. Перад ад’ездам ён адпусціў на волю ўсіх сваіх прыгонных з прамысловых прадпрыемстваў, кожнаму гаспадару падараваў каня, насенны матэрыял і невялікую грашовую дапамогу для набыцця лесу на будоўлю.

Першапачаткова рэзідэнцыя С.Богуша-Сестранцэвіча ў Магілёве ў 1774 г. размяшчалася ў прыходскім (фарным) касцёле. У 1780 г. у час знаходжання ў Магілёве Кацярына II прысутнічала 27 мая на ўрачыстым богаслужэнні ў кармеліцкім касцёле Успення Багародзіцы, якое вёў біскуп С.Богуш–Сестранцэвіч. Праз некаторы час пасля гэтага кармеліты былі выселены ў іншыя кляштары, а касцёл з 1783 г. аддадзены пад рэзідэнцыю архібіскупа і з той пары стаў называцца ***Станіславаўскім.***

Шырока вядомай у краі была ***друкарня*** пры каталіцкай кансісторыі, заснаваная па хадайніцтву Богуша-Сестранцэвіча. Першапачаткова яна размяшчалася ў 2-х павярховай прыбудове да касцёла кармелітаў, а затым - у загарадным палацы архібіскупа ў Пячэрску. Мела тры друкарскія станы, а ў 1776 г. атрымала дазвол друкаваць на рускай мове грамадзянскім шрыфтам.

Указам Кацярыны II ад 1780 г. друкарня абавязвалася выконваць функцыі ***Магілёўскай губернскай друкарні,*** якая была заснавана толькі ў 1833 г. Вядома больш 60 назваў выданняў, надрукаваных тут, сярод якіх: навучальныя - ***"Краткая французская грамматика"***; даведачная літаратура – ***"Белорусские календари", "Каталоги..."***; афіцыйныя выданні – ***"Трактат вечного мира и дружбы", "Учреждения для управления губернией"***; навуковыя працы і мастацкія творы – ***"О Западной Руси", "О происхождении сарматов и славян", "Гиция в Тавриде"*** Богуша-Сестранцэвіча, ***"Три книги о поэтическом искусстве"*** Ф.Пракаповіча і інш. ***Існуе меркаванне, што ў тыпаграфіі ўпершыню быў выкарыстаны рускі грамадзянскі шрыфт, дзякуючы чаму на Беларусі пачалося грамадзянскае кнігадрукаванне.***



Палац каталіцкага архіепіскапа.

***У канцы XVIII ст. на вул. Ветранай, на адной восі са Станіславаўскім касцёлам, быў пабудаваны палац архібіскупа***, куды і пераехаў Богуш–Сестранцэвіч. У сярэдзіне XIX ст. будынак палаца з зямлёй прададзены магілёўскаму яўрэю, ганароваму грамадзяніну горада ***Цукерману*** за 18 960 руб., які заснаваў тут ***сінагогу***, атрымаўшую пасля нязначнай перабудовы яго імя. У "Опыте описания Могилёвской губернии" ***А.С. Дамбавецкага*** аб гэтым будынку гаворыцца: "За Муравьёвским садом на правой стороне Большой Садовой встречаются: каменная еврейская синагога, отстроенная Цукерманом на месте великолепного дворца, принадлежавшего митрополиту римско-католической церкви Сестренцевичу".

Сёння мы можам назіраць тут двухпавярховы будынак з 2-ма невялікімі бакавымі крыламі, які тарцовым фасадам выходзіць на вул Ленінскую. Галоўны фасад палаца быў арыентаваны ў бок Дняпра, але цяпер ён закрыты для агляду 11-ці павярховым інтэрнатам вучылішча культуры. Першы паверх аздоблены рустам, другі – пілястрамі. У бакавых рызалітах ваконныя праёмы другога паверха – лучковыя. Перад будынкам размяшчаўся вялікі парадны двор, а з боку дваровага фасаду сад і карпусы духоўнай кансісторыі (не захаваліся).

На першым паверсе знаходзіліся службовыя і гаспадарчыя памяшканні, на другім – пакоі архібіскупа; у заходнім крыле - палацавая капліца, якая па вышыні займала абодва паверхі. Унутраная анфіладная планіроўка зменена. Цэнтральны вестыбюль - з трохмаршавай лесвіцай. Палац – помнік ***архітэктуры класіцызму***.

Нямала легенд і міфаў існуе аб ***выдатным помніку мастацтва і архітэктуры XVIII ст., былым кармеліцкім, а зараз кафедральным Станіславаўскім касцёле*** (вул.Камсамольская,4), ***які мы ўбачым за 5-ці павярховай "хрушчоўкай", калі на вул.Ленінскай павернемся спіной да палаца архібіскупа.***

На пачатку XVII ст. пачалося пранікненне каталіцызму ва Усходнюю Беларусь – пабудова храмаў, стварэнне кляштараў, адкрыццё каталіцкіх навучальных установ. У Магілёве з'яўляюцца манахі каталіцкіх ордэнаў – езуіты, бернардынцы, кармеліты.

У 1604 г. у горадзе быў пабудаваны мураваны ***фарны касцёл св. Казіміра*** (двор АТС па вул Болдзіна), а крыху пазней і драўляны ***кармеліцкі касцёл з манастыром.*** (У 1115 г. у Палесціне на гары Кармель быў заснаваны духоўны ордэн, з-за чаго яго манахі ўвайшлі ў гісторыю пад назвай ***кармелітаў.*** Герб ордэна – сабака з палаючым факелам у зубах.) Некалькі разоў касцёл цярпеў ад пажараў, але к канцу XVII ст. быў адноўлены і меў даволі прыстойны выгляд. У 1697 г. ***П.Талстой***, знаходзячыся ў Магілёве, ў падарожных нататках, адзначаў: "Того ж числа был я в Кармелитском костёле, тут сделаны двое дверей в алтаре. Между двух дверей сделан престол. В том же костёле ещё других пять престолов. Украшение святым иконам и убрание престолов хорошее". У 1708 г., падчас вялікіга пажару, учыненага па загаду ***Пятра I***, касцёл і манастыр згарэлі, але да 1730-х гг. зноў былі адбудаваны.

Пачатку пабудовы капітальнага мураванага касцёла папярэднічала цікавая, абвеяная легендай падзея. 22 снежня 1733 г. шляхціч маёнтка Любуж ***Зенковіч*** са слугамі зрабіў узброены напад на горад. Былі паранены многія гараджане, частка з іх памёрла. Пад'ехаўшы да ратушы, ён разагнаў людзей, што былі на рынку, а іх тавары – хлеб, крупу, пірагі – патаптаў конямі. Ратуючыся ад абуранага народа, Зенковіч схаваўся ў кармеліцкім манастыры, але раз'юшаны натоўп гараджан выцягнуў яго адтуль і забіў на рынку. Пры гэтым манастыр і касцёл былі акрываўлены, частка касцёльнага ўбранства расцягнута, а сам касцёл пацярпеў значныя разбурэнні. Каралеўская ўлада, у пакаранне за забойства шляхціча-католіка Зенковіча, загадала гараджанам узвесці на гэтым месцы кармеліцкі касцёл са сваіх разабраных мураваных дамоў. Прыкладаў ***"храмаў на крыві"*** дастаткова, і, напэўна, Станіславаўскі касцёл – адзін з іх.

Так гэта ці не, дакладна не вядома, але ў 1738-40 гг. на месцы драўлянага пачалося будаўніцтва ***мураванага касцёла Успення Багародзіцы*** (закончана ў 1752 г.), які ў асноўным, і захаваўся да нашых дзён. Як ужо адзначалася вышэй, у 1782 г., калі каталіцкім архібіскупам быў прызначаны С.Богуш–Сестранцэвіч, касцёл сталі называць ***Станіславаўскім кафедральным***, а пасля 1860 г. – ***Успенскім прыходскім касцёлам.*** Асвячэнне яго адбылося ў 1765 г. віленскім епіскапам ***Ф.Зянковічам,*** аб чым гаворыць надпіс на левым баку хароў. 13-ці гадовы разрыў паміж заканчэннем будаўніцтва касцёла і яго асвячэннем пайшоў на выкананне роспісаў і аддзелку інтэр'ера.


Станіславаўскі (кармеліцкі) касцёл. Сучасны выгляд.

Касцёл быў пабудаваны ў стылі заходнееўрапейскага барока, пра што сведчаць шматслойныя пілястры, складаныя карнізы, абрамленні вокнаў. У канцы XVIII ст. касцёл перабудаваны. Каб зрабіць яго больш выразным у архітэктурных адносінах, быў зменены галоўны фасад, да яго прыбудавалі 4-х калонны порцік. Ва ўсходняй частцы да касцёла далучылі некалькі жылых памяшканняў, а ў паўднёвай – памяшканні семінарыі і друкарні. Будынак уяўляе сабой трохнефавую шасціслуповую базіліку. Механічная прыбудова класічнага калоннага порціка надала касцёлу эклектычны характар.

Дэкаратыўнае аздабленне інтэр'ера вырашана ў стылі барока. Сцены ўпрыгожаны карынфскімі пілястрамі, цыліндрычныя скляпенні нефаў пакрыты фрэскавым жывапісам. Своеасаблівае спалучэнне жывапісу і архітэктуры надае інтэр'еру касцёла ўрачысты характар.

***Адметнасцю роспісаў з'яўляецца тое, што тут захаваўся адзін з найбольш поўных і прафесійных фрэскавых евангельскіх цыклаў на Беларусі.*** Фрэскавыя размалёўкі выканалі ў другой палове XVIII ст. магілёўскія мастакі ***А.Главацкі, Пётр, Лук'ян і Рыгор*** пад кіраўніцтвам доктара тэалогіі ***Паўла Піятроўскага***. У 1860-я гады фрэскі паднавіў мастак ***Фёрст.***

На цыліндрычных скляпеннях галоўнага нефа тры фрэскі на евангельскія сюжэты: ***"Ператварэнне", "Уручэнне ключоў Пятру", "Узнясенне Марыі".*** У кампазіцыю ўведзены выявы евангелістаў з сімваламі святых Іераніма, Аўгусціна, Клімента, алегарычных фігур Веры, Надзеі, Любові.

Па перыметру сцен паміж пілястрамі на паўночнай сцяне сюжэтныя кампазіцыі: ***"Уваскрасенне Лазара", "Святая Тэрэза", "Хрышчэнне"*** і ***памятны запіс.***

На паўднёвай сцяне - кампазіцыі з гісторыі кармеліцкага ордэна: ***"Паданне граматы каралём Жыгімонтам манахам-кармелітам",*** на другім плане адлюстравана ***архітэктурная панарама Магілёва.***

Скляпенні бакавых нефаў таксама ўпрыгожаны фрэскавым жывапісам: на паўночным – ***"Спас нерукатворны", "Святы Себасц'ян", "Страшны суд";*** на паўднёвым–***"Падарожжа", "Вылячэнне Іосіфа", "Аўтапартрэт".*** У прытворы на скляпеннях дзве кампазіцыі: ***"Каін, які забівае Авеля"*** і ***"Ахвяра Аўраама".***

Першапачатковыя фрэскавыя роспісы неаднаразова паднаўляліся пазней, і зараз ва ўнутраных размалёўках можна налічыць да ста чалавечых

фігур. Па сваіх мастацкіх якасцях роспісы касцёла неаднародныя. Кампазіцыі цэнтральнага нефа даволі моцна адрозніваюцца ад роспісаў бакавых нефаў. Да вартасцей роспісу трэба аднесці тое, што зроблены яны ў жывапіснай манеры, формы падкрэслены колерам, малюнак даволі лаканічны, няма дробных дэталяў. Прадуманая кампазіцыя, гарманічны каларыт пабудаваны на спалучэнні ружова-карычневых, блакітных і зялёных таноў. Усё аздабленне інтэр’ера цалкам падпарадкавана адзінаму каларыстычнаму рашэнню.

Роспісы касцёла былі зроблены менавіта для кармелітаў і адлюстроўваюць падзеі, звязаныя з гісторыяй і дзейнасцю гэтага ордэна, хаця ***не ўсе сюжэты сёння можна растлумачыць.*** У сувязі з гэтым, з усіх пералічаных фрэсак-сюжэтаў, больш падрабязна спынемся на найбольш вядомых і даследаваных, якія не выклікаюць спрэчак. На галоўным нефе, які нясе асноўную сэнсавую нагрузку, размешчаны тры кампазіцыі.


“Ператварэнне”.

Сцэна ***“Ператварэнне”*** прадстаўлена ў абрамленні складанай канфігурацыі, ў цэнтры якой – ***Хрыстос***, ад яго разыходзяцца промні святла, якія нібыта рассоўваюць аблокі ў бакі і ствараюць своеасаблівую кампазіцыю. Па левую руку ад Хрыста – ***Маісей,*** па правую – ***Ілля,*** абодва стаячыя на каленях. На самым версе фрэскі, сярод аблокаў, - ***Бог-бацька,*** які з распрасцёртымі рукамі прымае ***Ісуса.*** Сярод аблокаў відаць галовы анёлаў, унізе – тры апосталы. Містычнасць сцэны перададзена божым святлом, якое ідзе ад Ісуса і асвятляе ўсё навакол. Гэта сімвал неўміручасці душы і адраджэння, сімвал божай прыроды Хрыста, божага цуда. Адметна тое, што сцэна пададзена тэатралізавана, тыпова па ўзорах еўрапейскага барока, дзе ёсць гледачы – анёлы, якія назіраюць за падзеяй.


“Уручэнне ключоў Пятру”.

Пасля гэтай кампазіцыі ўвага гледача пераносіцца на сцэну ***“Уручэнне ключоў Пятру”.*** Галоўныя дзеючыя асобы тут прадстаўлены ў арачным праёме. ***Пётр*** апусціўся на адно калена на прыступках. Яго левая рука прыкладзена да сэрца, правую ён працягвае ***Хрысту.*** Вочы Пятра ўзняты ўгору, на твары яго – усхвалявана-напружаны выгляд. Пад нагамі Пятра сетка з рыбаю і вясло, як сімвал яго заняткаў і прызначэння царквы лавіць новыя душы і правільна іх накіроўваць, для чаго яна і створана.

Хрыстос са ззяннем вакол галавы, стоячы на прыступках, працягвае Пятру ключы, а другой рукой паказвае на ратонду на вяршыні гары на заднім плане - гэта сімвал новай царквы. Ад яе таксама адыходзіць ззянне. За спіной Хрыста бачна вежа – сімвал старой царквы.

Звяртае на сябе ўвагу дакладнасць жэстаў Пятра і Хрыста, прыгажосць і выверанасць іх рухаў. Тут выкарыстаны эфект тэатральнасці – асноўны са сродкаў уздзеяння на гледачоў, якія ў сцэне вельмі выразна і эмацыянальна рэагуюць на падзею: адзін з іх усхвалявана злажыў рукі перад сабой, нехта проста назірае ў захапленні, некаторыя, відаць, абмяркоўваюць падзею. І, наогул, ва ўсіх роспісах касцёла менавіта такія персанажы, дзякуючы разнастайнасці і жывасці рухаў, з'яўляюцца вельмі цікавымі. Сюжэт суправаджаюць фігуры Веры і Надзеі. Сімвал царквы, яе пачатак і аснова – чатыры евангелісты, постаці якіх нібы падтрымліваюць звод. "Уручэнне ключоў Пятру" – сімвал увасаблення божага слова на зямлі, якое будзе прапаведаваць і распаўсюджваць новая царква.

Апошняя кампазіцыя цэнтральнага нефа – ***"Узнясенне Марыі".*** Грандыёзная архітэктура стварае фон, на якім разгортваецца дзеянне. Уверсе, у аблоках – Марыя ў акружэнні анёлаў. Адзін з іх трымае лаўровы вянок, а другі ружу – сімвал Маці Божай. Гэту сцэну суправаджаюць алегорыі Любові і Разважлівасці. У ідэалагічным плане сцэна выражае пераход ад зямнога жыцця да жыцця нябеснага.

На паўночнай сцяне звяртае на сябе ўвагу фрэска **"*Святая Тэрэза*".** Тэрэза, будучы кармеліткай, заснавала жаночы манастыр і была вельмі паважанай асобай у пантэоне кармеліцкага ордэна. Сцэна выяўляе знакаміты сюжэт, які ў заходнееўрапейскім мастацтве носіць назву **"*Экстаз св.Тэрэзы*".** Менавіта момант кантакту з богам адлюстраваны на фрэсцы. За спіной Тэрэзы стаіць анёл, а ў арачным праёме відаць пейзаж, які стварае глыбіню і надае прастор.

На паўднёвай сцяне яшчэ тры кампазіцыі. Першай, пачынаючы ад алтара, знаходзіцца сцэна ***ўручэння папай булы для кармеліцкага ордэна.*** На заднім плане ў праёме дзвярэй відны манахі другіх ордэнаў, якія таксама, напэўна, прыйшлі да папы на аўдыенцыю.

Наступная сцэна – ***заручэнне св. Тэрэзы з богам.*** У цэнтры кампазіцыі група з трох фігур: ***Марыя*** злучае рукі ***Тэрэзы і Хрыста.*** Фонам для сцэны служаць аблокі, сярод якіх відаць анёлы. Удалечыні, у архітэктурным збудаванні рэнесанскага тыпу, на каленях перад раскрыжаваннем стаіць па пояс аголены чалавек, магчыма, нейкі святы.

Трэццяя сцяна выяўляе нам на фоне ***панарамы старажытнага Магілёва*** групу людзей. Лічыцца, што гэта кароль ***Жыгімонт*** падае манахам-кармелітам грамату на пабудову касцёла ў Магілёве.

Цікавасць выклікае дэкарацыя карніза і люнетаў цэнтральнага нефа. Акрамя тыпова барочных узораў тут змешчаны малюнкі з сімваламі Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага. У люнетах намаляваны нацюрморты: кветкі ў вазах  і садавіна ў кошыках.

У паўночным нефе трэба адзначыць бліжэйшую да алтара фрэску ***“Спас нерукатворны”.*** Гэты цуд звязаны з імем св. Веранікі, на хустцы якой Хрыстос пакінуў адбітак свайго твару. Вядома, што Спас з’яўляўся апекуном Магілёва, і такія сюжэты былі больш распаўсюджаны ў праваслаўным жывапісе. Напэўна, тут мы маем уплыў мясцовай магілёўскай традыцыі.

Уражвае ў гэтай частцы нефа і ***св.Ваўжанец,*** які быў спалены на рашотцы на адкрытым агні. Прадстаўлены момант, калі каты адпраўляюць яго на пакутніцкую смерць. Святы раскінуў рукі і ўзняў твар уверх, звяртаючыся да бога і просячы прыняць яго ахвяру.

З роспісаў паўднёвага нефа можна звярнуць увагу на сцэну ***смерці Іосіфа***. На фоне архітэктурнай нішы размешчана ложа, на якой ляжыць ***Іосіф.*** Да яго нахіліўся ***Хрыстос***, у галавах стаіць ***Марыя.*** Для таго, каб зрабіць уражанне прасторавай глыбіні, мастак выкарыстоўвае перспектыўныя скарачэнні ў афармленні фону.

Зразумела, каб дакладна распавядаць аб кампазіцыі сюжэтаў фрэсак, сувязях паміж імі, трэба грунтоўна вывучыць гісторыю карmeліцкага ордэна і тады незразумелыя зараз роспісы, магчыма, адкрыюць свой патаемны сэнс...

Пасля Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гг. і да 1947 г. касцёл дзейнічаў без рэгістрацыі. На ўсе просьбы аб афіцыйным дазволе на адкрыццё ўлады давалі адмоўны адказ: “Открывать костёл не будем, так как в течение 25 лет верующие обходились и без него”. У 1947 г. быў асуджаны ксёндз касцёла ***М.В.Малыніч***. Пасля вызвалення ён прыязджаў са Слуцка ў Магілёў, спыняўся ў дамах католікаў і выконваў царкоўныя абрады, за што неаднаразова папярэджваўся міліцыяй. За дамамі, дзе ён знаходзіўся, вялося назіранне. У 1957 г. яго затрымалі ў Магілёве і канфіскавалі ўсю маёмасць.

Касцёл быў закрыты ў 1956 г., у ім размясцілі Цэнтральны гістарычны архіў БССР, які ў 1960 г. быў пераведзены ў Мінск, а ў касцёл перавялі Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці.

За час знаходжання ў ім архіва была пашкоджана частка роспісаў і зламаны арган. У пачатку 1990-х гг. будынак касцёла зноў перададзены вернікам, а ў 1994 г. адрэстаўрыраваны і пачаў дзейнічаць.

***Зараз вяртаемся на вул. Ленінскую, дзе звернем увагу на захаваўшыеся мураваныя жылыя дамы* (№№ 4, 6, 8, 10 ) *другой паловы XIX ст.*** Яны з’яўляюцца адзіным комплексам забудовы, які галоўным фасадам вызодзіць на вул.Ленінскую. Будынкі трохпавярховыя ( №4 – 2-х павярховы), прамавугольныя ў плане. У дамах № 8 і № 10 праязныя аркі з цыліндрычнымі скляпеннямі. У афармленні фасадаў выкарыстаны рустоўка, карнізныя паяскі, прамавугольныя падваконныя нішы. На першых і другіх паверхах ваконныя праёмы прамавугольныя, на трэцім – арачныя з ліштвамі. Будынкі завершаны тонкапрафіляванымі карнізамі, у доме № 6 – карніз з сухарыкамі. Унутраная планіроўка і часткова знешняя ва ўсіх дамах зменена. Дамы – прыклад гарадскога шматкватэрнага жылля.

***Жылы дом № 22*** пабудаваны ў канцы XIX – пач. XX ст. Зараз на першым паверсе  аптэка, магазін, адміністрацыйныя ўстановы, на другім і трэцім – жыллё. Трохпавярховы Т-падобны ў плане будынак галоўным фасадам выходзіць на вул. Ленінскую. На першым і другім паверхах ваконныя праёмы прамавугольныя, на трэцім – паўцыркульныя з ліштвамі.



Мемарыяльная дошка праўдзістам.

На доме ў 1962 г. устаноўлена ***мемарыяльная дошка ў памяць аб дзейнасці падпольнай бібліятэкі групы праўдзістаў*** (арх. ***К.Аляксееў***). У 1912 г. у Магілёве адбыўся сход групы актывістаў “Правды”. На ім было выбрана бюро з 5 чалавек, а кіраўніком - ***А.І.Чарніцкі.*** Група арганізоўвала стачкі і мітынгі, стварала гурткі па вывучэнню марксізма, скамплектавала падпольную бібліятэку, якая размяшчалася ў падвале дома, дзе ў той час была сталярная майстэрня.

Пасля вайны (1941-45гг.) тут шмат год размяшчаліся магілёўскія марскі клуб і радыёклуб ДТСААФ.

На вуліцы да нашага часу захаваліся будынкі, у якіх да рэвалюцыі размяшчаліся  добра вядомыя ў горадзе магазіны: аптэкарскі ***А.Блоха,*** галантэрэйныя ***Р.Лур’е, Ш.Сорынсона*** і ***М.Шэндэровіча,*** вырабаў са скуры ***Х.Ромбаха*** і ***Л.Шапіро,*** мануфактурныя ***Е.Вільнера*** і ***Э.Пеўзнера,*** абутковы ***А.Гінзбурга*** і інш.



Настаўніцкі інстытут па вул. Ленінскай

***Прайшоўшы далей праз вул К. Лібкнехта (былую Пажарную), справа спынімся каля будынка былога настаўніцкага інстытута (***Ленінская, 35), які пабудаваны ў 1898 годзе. Дом належыў багатаму мясцоваму мільянеру Бабовіку, потым тут размяшчалася жаночая гімназія, з 1913 г.– настаўніцкі інстытут, з 1919 г. – інстытут народнай адукацыі, з 1930 г. –педагагічны інстытут, з 1998 г.- адзін з карпусоў дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова. Будынак быў значна пашкоджаны ў час Вялікай Айчыннай вайны (1941-45 гг.), у 1953 г. адноўлены. Пасля рамонту часткова змянілася ўнутраная planіроўка калідораў і дэкор галоўнага фасада. Цяпер гэта мураваны 3-х павярховы Г-падобны ў плане будынак. Галоўны фасад выцягнутай формы арыентаваны на вул.Ленінскую і падзелены 3-ма неглыбокімі рызалітамі, у кожным – парадны ўваход. Рызаліты завершаны невысокімі атыкамі з паўцыркульнымі франтонамі (першапачаткова былі невысокія вежы над бакавымі і шатровае завяршэнне над цэнтральнымі рызалітамі). Карнізныя паяскі падзяляюць

галоўны фасад на тры ярусы, якія адпавядаюць тром паверхам. Першы – цокаль, сцены яго аздоблены руставанымі пілястрамі. Рытм другога яруса ствараюць размешчаныя папарна арачныя вахонныя праёмы, якія падзелены пілястрамі з геаметрычным скульптурным арнаментам паўцыркульных арак, падваконных уставак. Паміж прамавугольнымі ваконнымі праёмамі 3-га яруса (паверха) размешчаны паўкруглыя карынфскія калонкі. Сцены завершаны шырокім карнізам. Усе дэкаратыўныя элементы фасада выкананы спосабам цаглянай муроўкі з выкарыстаннем лякальнай цэглы. Унутраная планіроўка калідорная з двухбаковым размяшчэннем памяшканняў. Помнік ***грамадзянскай архітэктуры, вырашаны ў эклектычным стылі.***

Наогул, гэты ўчастак вуліцы склаўся, у асноўным, у перыяд развіцця капіталізму, на стыку стагоддзяў. Архітэктурны стыль, характэрны для яго – ***эклектызм.*** Адметнай рысай ў гэты час з’яўлялася шчыльная забудова – вынік высокага кошту зямельных участкаў, больш рацыянальнае ўжыванне карыснай плошчы будынкаў, упрыгожванне фасадаў элементамі, запазычанымі з другіх стыляў, прымяненне новых будаўнічых матэрыялаў, як канструктыўных, так і аддзелачных. Знікае патрыятычны клопат аб архітэктурным адзінстве, узнікаюць збудаванні, не звязаныя між сабой ні ансамблем, ні адзін з другім. Выбар архітэктурных форм дыктуецца то недаўгавечнай модай, то капрызам уладальніка – жаданнем уразіць незвычайнасцю аддзелкі.

***Прайшоўшы далей па вул. Ленінскай, справа за агароджай, у глыбіні, назіраем акуратны 3-х павярховы будынак*** (дом № 37), ***дзе зараз размяшчаецца мастацкі музей В.К.Бялыніцкага-Бірулі.*** Дата яго пабудовы невядома, адны даследчыкі лічаць XVII ст., другія – XVIII ст. Вядома, што ў XVIII ст. ён належыў купцам ***Аношкам***. Менавіта, як самы лепшы з 2-х павярховых мураваных дамоў Магілёва, ён быў прадастаўлены для пражывання ў маі 1780 г. аўстрыйскаму імператару ***Іосіфу II*** падчас яго спаткання з рускай імператрыцай ***Кацярынай II.*** З 1815 г. і да ўстанаўлення Савецкай улады ў горадзе ў гэтым доме размяшчаўся Магілёўскі дваранскі дэпутацкі сход. У 1918 г. будынак быў перададзены створанай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя К. Маркса, а з 1982 г. у ім знаходзіцца мастацкі музей.


Дом купцоў Аношка

Сёння гэта помнік мураваных жылых будынкаў, што дзе-нідзе засталіся ў Беларусі. Ён часткова пацярпеў у гады апошняй вайны, у 1970-я гады рэканструяваны, пасля чаго ў ім надбудавалі 3-ці паверх і дах, якія не маюць нічога агульнага з грамадзянскай архітэктурай XVII-XVIII ст.ст. У плане гэта невялікі прамавугольны будынак. Цэнтр унутранай планіроўкі – драўляная лесвіца,

вакол якой на другім паверсе згрупіраваны былыя жылыя памяшканні з масіўным скляпеністым перакрыццём. Сцены прарэзаны прамавугольнымі ваконнымі праёмамі і дэкарыраваны прафіляванымі лапаткамі. Пры рэканструкцыі ў цэнтры галоўнага фасада зроблены лучковы ўваходны праём і невялікі балкон з металічнай ажурнай агароджай. Першы паверх і вялікі падвал пад ім маюць скляпеністае перакрыццё, другі – бэлечнае. Помнік ***архітэктуры барока.***



Інтэрнат МДУ імя А.А. Куляшова.

***Праходзячы далей па вуліцы, справа назіраем інтэрнат Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта*** (вул. Ленінская, 39). Будынак – помнік ***савецкай архітэктуры***, пабудаваны ў 1930-я гады, дзе зроблена спроба выкарыстання класічнай спадчыны. Чатырохпавярховы будынак складаецца з двух аб’ёмаў прамавугольнай формы, галоўны архітэктурны акцэнт – у месцы злучэння аб’ёмаў. Тут размешчаны галоўны ўваход з шырокай лесвіцай, над ім – балкон з металічнай агароджай. Фасады рытмічна члянёны прамавугольнымі ваконнымі праёмамі, завершаны карнізам. Сцяна першага паверха руставаная, астатнія - гладкія. Унутраная планіроўка калідорнага тыпу.



Будынак крэдытнага таварыства.

***Злева па вуліцы размяшчаецца цікавы будынак*** (дом № 36), узведзены ў пачатку XX ст. ***у стылі “мадэрн” для крэдытнага таварыства.*** Галоўны архітэктурны акцэнт – вуглавая частка будынку паміж двума фасадамі (зав.Мігая і вул.Ленінская). Плоскасць яе скошана, тут размяшчаецца галоўны ўваход. На другім паверсе - паўкруглы балкон з балюстрадай, які падтрымліваюць ***кансолі з паўфігурамі атлантаў.*** Заканчваецца скошаная частка атыкам складанага профілю з акном-люнетай у цэнтры. На галоўным фасадзе – 2 рызаліты, завершаныя мансардамі. Ваконныя праёмы на першым паверсе прамавугольныя, на другім – арачныя. У дэкаратыўным афармленні галоўнага фасада выкарыстаны прафіляваныя паяскі, шырокія лапаткі, ляпныя накладныя дэталі – гірлянды, разеткі і інш. Унутраная планіроўка зменена. Зараз у ім размяшчаецца магазін “Вяснянка”.

***Насупраць стаіць стары будынак класічнай гімназіі*** (вул. Ленінская, 41), які знаходзіцца на рэстаўрацыі. Пабудаваны ён у 1789 г. для народнага вучылішча, адной з першых на Беларусі свецкіх навучальных устаноў.


Будынак класічнай гімназіі

Вучылішча было 4-х класным (у чацвёртым класе выкладалася грамадзянская архітэктура). У 1809 г. яно было ператворана ў Магілёўскую мужчынскую гімназію.

Двухпавярховы, Г-падобны ў плане будынак галоўным фасадам выходзіць на чырвоную лінію забудовы вуліцы, паверхі аддзелены адзін ад аднаго карнізным паяском, сцены гладкія, рытмічна члянёны прамавугольнымі ваконнымі праёмамі з простымі ліштвамі. Пабудова выглядае некалькі суха і казённа. Унутраная планіроўка - калідорная, з двух бакоў размешчаны класныя памяшканні.

Пры ўваходзе знаходзіліся дзве літыя металічныя калоны, якія падтрымлівалі ажурныя чыгунныя рашоткі – дзве прамавугольныя бакавыя і трохвугольную цэнтральную з вензелем у крузе «МГ» («Мужчынская гімназія»), што ўтваралі своеасаблівы казырок над цэнтральным уваходам, які ўпрыгожваў агульны выгляд будынка. Ажурная агароджа знесена ў сярэдзіне 1950-х гадоў.

Гэта была першая мужчынская гімназія ў горадзе, пры якой у 1838 г. быў утвораны пансіён для навучэнцаў-дваран. Выпускнікі гімназіі атрымлівалі агульную адукацыю і падрыхтоўку для паступлення ва ўніверсітэт і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. Пасля рэканструкцыі будынка ў 1879 г. у ёй з’явіліся класы для малявання, зал гімнастыкі, фізічны кабінет, метэастанцыя, 2 бібліятэкі (фундаментальная і навучэнская). Па сёняшніх мерках гэта нармальна, але на той час такія ўмовы для навучання і абсталяванне было значным дасягненнем. Навучаліся ў ёй пераважна дзеці дваран, чыноўнікаў, духавенства, купецтва, зрэдку былі выхадцы і з мяшчан, рамеснікаў, заможных сялян.

У свой час тут вучыліся вядомыя не толькі на Беларусі, але і ў замежжы навукоўцы, пісьменнікі, палітычныя дзеячы: ***Грамыка М.А***. – беларускі пісьменнік і геолаг; ***Грум-Гржымайла К.І.*** – навуковец і практык у галіне медыцыны; ***Ісаеў Р.П.*** і ***Кавалік С.П.*** – адны з кіраўнікоў народніцкага руху ў Расіі ў канцы XIX ст. (гэта аб Каваліку гаварыў ***Аляксандр ІІ:*** ”Лепш я выпушчу на волю 10 рэвалюцыянераў, чым аднаго Каваліка”); ***Урончанка М.П.*** – географ, перакладчык, генерал-губернатар; ***Красцінскі М.М.*** – вядомы савецкі дыпламат, намеснік міністра замежных спраў, пасол у Германіі; ***Мігай С.І.*** – народны артыст РСФСР, оперны спявак Вялікага тэатра (яго імем у Магілёве названы завулак).


Мігай С.І.

Асаблівай увагі заслугоўваюць ураджэнцы Магілёўшчыны, якія тут вучыліся і ўнеслі значны ўклад у развіццё сусветнай культуры, навукі, а таксама ў вывучэнне роднага краю. На асобах ***Кіркора А. К., Лепяшынскага П. М., Судзілоўскага***

***М. К., Шміта О. Ю.*** і дырэктара гімназіі ***Фурсава М. В.*** (месца нараджэння не вядома) спынімся некалькі падрабязней.

***Кіркор Адам Ганоры Карлавіч*** (в. Слівіна Клімавіцкага павета, 1818 – 1886), этнограф, гісторык, археолаг, выдавец, грамадскі дзеяч, член-карэспандэнт імператарскага археалагічнага таварыства, член акадэміі ведаў у Кракаве. Вучыўся ў Магілёўскай і Віленскай гімназіях. Выдаваў літаратурна-навуковы альманах "Віленскі зборнік", рэдактар газеты "Віленскі веснік". Даследаваў і папулярызаваў беларускія старажытныя археалагічныя знаходкі, у сваіх галоўных працах ***"Літоўскае Палессе"***, ***"Беларускае Палессе"*** (Жывапісная Расія, 1882. т.3, ч. 1-2) і інш. адлюстраваў гістарычную і этнаграфічную своеасаблівасць беларускага народа, даў этнічную і бытавую характарыстыку тыпаў беларуса, адзначаў самастойнасць беларускай мовы.



Кіркор А.Г.

***Лепяшынскі Панцеляймон Мікалаевіч*** (в. Студзянец Касцюковічскага р-на, 1868 – 1944), дзеяч рэвалюцыйнага руху, публіцыст, пісьменнік, педагог, доктар гістарычных навук. У 1895 г. арыштаваны за рэвалюцыйную дзейнасць, сасланы разам з іншымі членамі "Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа" у Сібір. З 1903 г.- бальшавік, паплечнік ***У.І.Леніна,*** супрацоўнічаў у партыйных газетах. Пасля 1917 г. - на педагагічнай, навуковай і журналісцкай рабоце ў Петраградзе і Маскве. У 1918 г. заснаваў доследна-паказальную працоўную школу-камуну для беспрытульных дзяцей у в.Ліцвінавічы Кармянскага р-на, а затым разам з братам ***М.М.Лепяшынскім*** - у 1920 г. у в. Лемень Чэрыкайскага р-на. Школа-камуна праіснавала да 1924 г., пасля чаго была пераратворана ў школу сялянскай моладзі. Аўтар навуковых прац, успамінаў, мастацкіх твораў.

***Судзілоўскі Мікалай Канстанцінавіч*** (г. Магілёў, 1850-1930), унікальны, неўтаймаваны, энцыклапедычных ведаў чалавек, філосаф і прыродазнаўца, медык, дзеяч грамадска-палітычнага руху больш чым у дзесятку краін свету. Удзельнік аднаго з народніцкіх гурткоў гімназіі, з 1868 г. вучыўся ва ўніверсітэтах гг. Петярбурга і Кіева. У 1875 г. выехаў за мяжу, дзе пасля асабістага знаёмства з ***К.Марксам*** і ***Ф.Энгельсам*** прысвяціў сябе рэвалюцыйнай дзейнасці ( псеўданім ***доктар Русель***). У Бухарэсце скончыў медыцынскі факультэт універсітэта, доктар медыцынскіх навук. Разам з ***Хрыста Боцевым*** удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання балгар супраць турак. З 1887 г. – у Амерыцы, а праз пяць год лёс закінуў яго ужо на Гавайскія астравы, дзе стварыўшы палітычную партыю, ён выбіраецца ад яе ***прэзідэнтам***



Судзілоўскі М. К.

***Гавайскай Рэспубліке.*** З 1903 г. – у Кітаі, Японіі, на Філіпінскіх астравах. Вядомы, як аўтар прац па медыцыне, хіміі, філасофіі, сацыялогіі, геаграфіі.

***Шміт Отта Юльевіч*** (г. Магілёў, 1891 – 1956), матэматык, астраном і геафізік, даследчык Арктыкі. Пасля гімназіі скончыў у 1913 г. Кіеўскі ўніверсітэт. З 1932 г. начальнік Галоўнага ўпраўлення Паўночнага марскога шляху, у 1939–42 гг. віцэ-прэзідэнт Акадэміі Навук СССР, адначасова ***дырэктар Інстытута геаграфіі АН СССР***. Адзін з заснавальнікаў і ***галоўны рэдактар Вялікай Савецкай Энцыклапедыі (1924 -41гг.).*** Распрацаваў новую касмаганічную тэорыю паходжання Зямлі і планет Сонечнай сістэмы. Узначальваў палярныя экспедыцыі ў 1929–34 гг. і экспедыцыю на Паўночны полюс у 1937 г., акадэмік АН УССР і СССР, Герой Савецкага Саюза.


Шміт О. Ю.

***Фурсаў Мацвей Васільевіч*** ( ? – 1901), археолаг, краязнавец, педагог. Член-карэспандэнт Маскоўскага археалагічнага таварыства. Працаваў дырэктарам магілёўскай класічнай гімназіі і рэдактарам неафіцыйнай часткі “Могилевских губернских ведомостей”. Займаўся археалагічнымі раскопкамі ў басейне Дняпра. Разам з гісторыкам, археолагам, а пазней чыноўнікам па асобых даручэннях пры губернатары ***С.Ю.Чалоўскім*** склаў ***карту археалагічных помнікаў Магілёўскай губерні***. Адзін з аўтараў кнігі “Опыты описания Могилевской губернии...” (кн. 1 – 3. Могилев, 1882-84).


Дом № 40 па вул. Ленінскай

***Праходзім далей па вуліцы і злева перад намі паўстае прыгожы двухпавярховы жылы будынак*** (дом № 40)***, пабудаваны ў пач. ХХ ст. у стылі эклектыкі.*** На галоўным фасадзе, які выходзіць на вул. Ленінскую, - два сіметрычна размешчаныя ўваходы з лучковымі франтонамі і круглымі нішамі. Фасад багата аздоблены ляпнымі накладнымі дэталямі (маскаронамі) і дэкаратыўнымі элементамі, выкананымі цаглянай муроўкай з выкарыстаннем лякальнай цэглы. Паміж ваконнымімі праёмамі - пілястры, завершаныя рустам і фігурнымі ляпнымі картушамі. Маляўнічасць фасаду надае кантрастнае каларыстычнае вырашэнне: ляпныя дэкаратыўныя дэталі белага колеру вылучаюцца на чырвонай плоскасці цаглянай сцяны.

З канца 1920-х гадоў у жыллёвым будаўніцтве Беларусі быў узяты курс на будаўніцтва шматпавярховых дамоў для рабочых. Адным з першых у Магілёве з’явіўся ***3-х павярховы “Дом Будзённага”*** (вул. Піянерская, 34), ***які***



“Дом Будзённага”

***паўстае перад намі, калі мы павернем за магазін “Букініст”.*** Дом названы так, таму што быў здадзены ў эксплуатацыю “да дня нараджэння Маршала СССР С.М.Будзённага” і размяшчаўся на вул.Будзённага. Ён пабудаваны ў ***стылі канструктывізму*** і з’яўляўся адной з першых у савецкі перыяд спроб стварэння добраўпарадкаванага жылля.

***На невялікай плошчы знаходзіцца велічны кінатэатр “Радзіма”*** (арх. ***У.Вараксін***), пабудаваны ў 1939-1940 гг. У час апошняй вайны разбураны, у 1944 г. адноўлены, а ў 1972 г. рэканструяваны. Будынак замыкае перспектыву Камсамольскага скверу (Шклоўскі базар) з боку вул. Першамайскай. Кінатэатр стаў галоўнай дамінантай невялікай, але вельмі ўтульнай і цалкам забудаванай плошчы, якая ўтварылася тут у канцы 1950-х гг. Гэта адзін з нямногіх у горадзе закончаных ансамбляў і першых у беларускім савецкім дойлідстве будынкаў, дзе выкарыстаны ***прыёмы класічнай ордэрнай архітэктуры.*** У плане–форма выцягнутага прамавугольніка, галоўны фасад вырашаны ў выглядзе 4-х калоннага порціка. На прадольнай восі кампазіцыі паслядоўна быў размешчаны касавы вестыбюль, двухсветавое прасторнае фае і глядзельная зала на 550 месц. Зараз унутраная планіроўка часткова зменена. 29 кастрычніка 2003 года на галоўным фасадзе адкрыта ***мемарыяльная дошка*** ў гонар ураджэнца Магілёва, народнага артыста БССР і СССР ***Віктара Турава*** (арх. ***У.Кананаў***).



Кінатэатр “Радзіма”.

***Прайшоўшы далей па вул. Ленінскай спынімся каля будынка гарадскога банка*** (зараз філіял Галоўнага ўпраўлення Нацыянальнага банка). Дом пабудаваны ў 1904 – 06 гг. (арх. ***П.Камбураў*** ) як аддзяленне Маскоўскага міжнароднага банка. Першапачаткова ў комплекс уваходзілі два мураваныя жылыя будынкі і гаспадарчыя пабудовы, якія не захаваліся. Тэрыторыя была абкружана высокай мураванай сцяной. Будынак 2-х павярховы, прамавугольны ў плане. Галоўны фасад вылучаны шырокім рызалітам, які завяршаецца атыкам. Руставанаму першаму паверху проціпаўстаўлены гладкі



Будынак гарадскога банка.

другі, прасценкі якога дэкарыраваны карынфскімі пілястрамі. Ваконныяя праёмы прамавугольныя з дэкаратыўнымі сандрыкамі. Вокны другога паверха ў рызаліце паўцыркульныя. Плавіроўка паверхаў калідорнага тыпу, абапал калідораў – службовыя памяшканні. На другім паверсе ў цэнтры – аперацыйная зала. У архітэктуры будынка спалучаюцца ***рысы эклектыкі і стылю мадэрн.***



Дом Саветаў (на першым плане- знак “нулявы кіламетр”). Скульптар М.Кавалёў.

Далей з ***бульвара Леніна*** адкрываецца цэнтральная плошча горада – ***плошча імя Леніна*** (Сянная, Базарная). Яе ансамбль сфарміраваўся ў 1938 – 40 гг. і звязаны з жаданнем кіраўніцтва перанесці сталіцу Беларусі ў Магілёў. Менавіта таму ў забудове горада бралі ўдзел лепшыя архітэктары, якія працавалі ў той час у рэспубліцы: ***П.Абросімаў, М.Андросаў, В.Вараксін, А.Воінаў, І.Лангбард*** і інш. Плошча – прыклад аднаго з першых ансамбляў беларускай савецкай архітэктуры даваеннага часу. Ён уключае ў сябе ***Дом Саветаў, адміністрацыйны будынак, жылыя дамы*** на рагу вул. Першамайскай і пр-ту Міру. У 1950 – 60 гг. пабудаваны 5-ці павярховыя жылыя дамы ў паўднёвай і ўсходняй частках плошчы.

***Дом Саветаў*** (арх. ***І. Лангбард***) узведзены ў 1938 – 40 гг. і займае цэнтральнае месца. Галоўным фасадам ён выходзіць на плошчу, мае пірамідальны выгляд з рытмічным нарастаннем аб’ёмаў да цэнтра. Аб’ёмы завершаны высокімі парапетамі, на цэнтральным – барэльефная выява герба ўжо не існуючай краіны – БССР. Цэнтрам кампазіцыі з’яўляецца 8-мі павярховы аб’ём, злучаны з 7-павярховымі часткамі, што выступаюць на плошчу і паступова пераходзяць ў 5-павярховыя паўкруглыя карпусы, якія сваімі крыламі ўтвараюць шырокі курданёр перад будынкам. Рознавышыннасць будынкаў дома надае збудаванню рытмічны характар, што яшчэ больш узмацняецца строгім рытмам лапатак на ўсю вышыню будынка. Галоўны ўваход размешчаны ў цэнтры, тут знаходзіцца цэнтральны вестыбюль і сістэма лесвіц з ліфтамі.

У канцы 1990-х гг. замест неажыццёўленай пабудовы праекта І.Лангбарда (корпус з залай пасяджэнняў побач з галоўным корпусам) зроблена 7-мі павярховая прыбудова (арх. К.Аляксееў, Э.Юшка) з памяшканнямі для розных арганізацый, залай пасяджэнняў аблвыканкама і кафэ). Дом Саветаў – адзіная работа ***І.Лангбарда*** ў Магілёве, ён больш

вядомы сваімі работамі ў Мінску – ***Дом Урада, тэатр оперы і балета, Дом афіцэраў, будынак прэзідыўма Акадэміі Навук БССР.***

***Адміністрацыйны будынак*** (арх. ***П.Абросімаў***) пабудаваны ў 1938 – 41 гг. на супрацьлеглым ад Дома Саветаў паўднёвым баку плошчы для Народнага камісарыята ўнутраных спраў і дзяржбяспекі. З 1961 г. тут размяшчаецца галоўны корпус цяперашняга тэхнічнага ўніверсітэта. Аўтар выкарыстаў прыёмы ***класічнай ордэрнай архітэктуры.*** Першы паверх аздоблены руставанай тынкоўкай "пад камень" і вырашаны ў выглядзе цокаля для астатніх паверхаў, гладка атынкаваных. Будынак фланкуецца па баках двума рызалітамі з 6 карынфскімі калонамі. Сярэдняя частка ўпрыгожана пілястрамі карынфскага ордэра. Дом завершаны прафіляваным карнізам і атыкавай сценкай, у цэнтры якой над галоўным уваходам сярод барэльефных сцягоў - выява герба БССР. У 1970-я гады да галоўнага корпуса прыбудавалі спартыўна-клубны корпус, фасад якога аформлены лапаткамі і завершаны карнізам. Манументальны спакойны аб'ём з'яўляецца кантрастам дынамічным формам Дома Саветаў. Унутраная планіроўка – калідорная з двухбаковым размяшчэннем аўдыторый. Аўтар праекта будынка архітэктар ***П.В.Абросімаў,*** лаўрэат Сталінскай прэміі за стварэнне ў калектыве аўтараў праекта ***Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта на Вараб'ёвых( Ленінскіх) гарах у Маскве,*** аўтар ***будынку Савета Міністраў у Кіеве,*** шмат год працаваў старшынёй Саюза архітэктараў СССР.



Адміністрацыйны будынак.

На будынку ў 1977 г. устаноўлена ***мемарыяльная дошка ў гонар палка народнага апалчэння.*** Перад вайной тут размяшчалася Магілёўская міжкраявая школа НКУС – НКДБ. 25 чэрвеня 1941 г. з курсантаў школы былі створаны знішчальныя атрады супраць варожых парашутыстаў, шпіёнаў і дыверсантаў. 12 ліпеня ў будынку школы былі сфарміраваны 3 батальёны палка народнага апалчэння (работнікі НКУС заходніх абласцей рэспублікі, курсанты Магілёўскай школы міліцыі і работнікі мясцовай проціпаветранай абароны), якія прымаў актыўны ўдзел у абароне горада.

***Жылы дом*** (вул. Першамайская-42, дом "дзевяноста") пабудаваны ў 1938 – 40 гг. па праекту архітэктараў ***А.Воінава*** і ***А.Брэгмана***. Будынак 5-6 - павярховы з 7-павярховым вуглавым аб'ёмам. Сёмы паверх надбудаваны падчас капрамонту ў 1970-я гады. Вылучаецца манументальнасцю, цэласнасцю аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі. Пластыку фасадаў ствараюць глыбокія балконы-лоджыі. У дэкаратыўным вырашэнні фасадаў

выкарыстаны плоскія лапаткі, паміж імі - прамавугольныя ваконныя праёмы. Планіроўка ўсіх паверхаў зменена ў час капрамонту-перабудовы, закончанага ў 2003 годзе. Помнік ***жылой архітэктыры***.

На супрацьлеглым баку вуліцы знаходзіцца велічны і прыгожы ***храм Трох Свяціцеляў*** – помнік архітэктуры XX ст. У 1903 г. адбылася ўрачыстая закладка першага каменя новага храма ў імя трох свяціцеляў праваслаўнай царквы – ***Васіля Вялікага, Рыгора Багаслова, Іаана Златауста.*** Будучы сабор асвяцілі і ў гонар трох святых ён атрымаў сваю назву. Будаўніцтва



Храм Трох Свяціцецяляў.

праходзіла па праекту і пад наглядам надворнага саветніка, губернскага архітэктара ***П.Калніна.*** Сродкі збіраліся праз дабраахвотныя ахвяраванні ў

прыходскіх цэрквах, а таксама па падпісных лістах.

Будаўніцтва працягвалася 11 год і было закончана ў 1914 г. Храм, са сваімі стройнымі, строгімі формамі, стаў сапраўдным упрыгожаннем горада. Ён пабудаваны у форме крыжа і мае сем купалоў, над уваходам – званіца. Падчас знаходжання ў Магілёве Стаўкі, сабор наведваў цар ***Мікалай II.*** Дзейнічаў храм, з перапынкамі, да 1959 г., калі “раптам” рабочыя завода “Строммашына” запатрабавалі аддаць ім яго пад клуб. У 1961 г. царква, пабудаваная на народныя грошы, была зачынена, знеслі званіцу, купалы, крыжы. У памяшканні “загрымела” танцавальная духавая музыка, а потым дыскатэка “Рэзананс”.

Доўгім і цяжкім быў шлях прыхаджан да адкрыцця храма. Пасля аднаўлення Магілёўскай і Мсціслаўскай епархіі яе ўзначаліў масціты ***архіепіскап Максім,*** дзякуючы намаганням якога, пісьмам і просьбам веруючых, праз 30 год, 25 снежня 1989 г. храм быў зноў асвячоны і пачаў дзейнічаць. Настаяцелем сабора стаў свяшчэннік Свята-Крыжаўздзвіжанскага сабора (былой Барыса-Глебскай царквы) айцец ***Генадзь Пацэвіч***. За гады службы ў саборы ён зрабіў даволі многа пераўтварэнняў: былі адкрыты бібліятэка праваслаўнай літаратуры, чытальная зала, нядзельная школа, адноўлены званы, у 1995 годзе пабудаваны хрысцільны храм у памяць Свяціцеля Георгія Каніскага (арх. А.Юркавец). Арганізоўваліся паездкі прыхаджан у святыя месцы, у т.л. ***Жыровіцкі манастыр, Опціну пустынь, Пскова-Пячэрскі манастыр*** і інш.

Кожны год 12 лютага тут адзначаецца прастольнае Храмавае свята ў гонар памяці Трох Свяціцеляў. ***Сабор з’яўляецца кафедральным – галоўным храмам горада*** і найбольш наведваемым магіляўчанамі і гасцямі горада.

У Магілёве здаўна існаваў абраз ***Магілёва-Брацкай Маці Божай,*** які знік у час апошняй вайны. Яго копіі захаваліся ў калекцыі Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея, Мікольскай царкве, Свята-

Крыжаўздзвіжанскім саборы і кафедральным саборы Трох Свяціцеляў. Іканаграфічны тып гэтага абраза - ***Маці Божая Адзігітрыя***. Хрыстос сядзіць на левай руцэ Багародзіцы, яго ножкі разведзены ў бакі. У левай руцэ ён трымае скрутак, а правай, паднятай вертыкальна ўверх на ўзроўні грудзей, бласлаўляе.

Абраз гэтай іконы ў саборы з’яўляецца адной з найбольш шануемых святыняў. Згодна з легендарным паданнем ***цудатворная ікона Магілёва-Брацкай Маці Божай тройчы ратавала горад ад ворагаў.***



Ікона Магілёва-Брацкай Маці Божай

***У час аблогі горада войскам Радзівіла ў 1655 г.,*** яго жаўнеры пачалі рыць падкоп пад гарадскія ўмацаванні, каб з дапамогай пораху зрабіць пралом у сцяне. Гараджане заўзята маліліся богу аб збаўленні ад навалы, у тым ліку і старая ўдава–пякарка, якая малілася перад абразам св. Багародзіцы і, нарэшце, 19 сакавіка яна ўгледзела слёзы на вачах іконы . Жаўнеры ўзарвалі падведзеную міну, але няўдала: умацаванні засталіся некранутымі, а сярод штурмуючых было шмат забітых і параненых. Ікона Багародзіцы была абвешчана цудатворнай, і гэта святкавалі ў Магілёве штогод 19 сакавіка (па ст. стылю).

***Другі выпадак*** звязаны з паплечнікам ***Пятра І*** - князем ***Меншыкавым А.Д***. Аднойчы, стоячы на богаслужэнні ў Брацкай царкве перад абразам прасвятой Багародзіцы, князь пачаў абдумваць помсту гораду за пераможнае паўстанне гараджан супраць маскоўскага гарнізона ў 1661 г., як раптоўна зваліўся на падлогу. Пасля таго здарэння Меншыкаў стаў наведваць замест Брацкай царквы Спаскую і адмовіўся ад сваіх злых намераў у адносінах да Магілёва.

***Трэці выпадак*** звязаны са страшэнным пажарам, калі за некалькі гадзін у горадзе згарэла каля 600 дамоў. Агонь ужо амаль падабраўся да Брацкага Богаяўленскага манастыра, і тады веруючыя, ў апошняй надзеі на выратаванне, вынеслі цудатворную ікону на вуліцу і сталі маліцца. І як ад невядомай сілы полымя павярнула назад...

Людзі з рознымі хваробамі вось ужо чацвёрты век звяртаюцца да Багародзіцы, многія знаходзяць збаўленне і вылечваюцца. 14-ы год ***Магілёва-Брацкая ікона Божай Маці*** знаходзіцца ў храме справа ад цэнтральнага іканастаса ў прыгожай разной аправе. Кожны год 1 красавіка ў гонар іконы праходзіць святочнае богаслужэнне - гэта яе дзень.

**У *Свята-Мікольскім манастыры*** ёсць невялікая копія ***Магілёва-Брацкай іконы,*** якую перадаў хтосьці з прыхаджан. Адзінае адрозненне на ёй – над галовамі Багародзіцы і дзіця Ісуса намаляваны кароны, якія ўказваюць на тое, што ікона каранавана каталіцкай царквой, шануецца і паважаецца каталіцкімі веруючымі. Сярод такіх ікон на Беларусі – ***Бялыніцкая і Жыровіцкая.***

Праект забудовы ***Першамайскай вуліцы***, ***дзе мы зараз знаходзімся***, ў пасляваенны час распрацоўваўся Магілёўскім філіялам Белдзяржпраекта ў 1952 г. Вуліца вызвалялася ад грузавога руху, які накіроўваўся праз вул. Піянерскую (М.Садовая).

***Прайшоўшы праз падземны пераход, адкрыты 22 снежня 1988 года, пройдзем уздоўж жылога дома па вул.Першамайскай-40 да будынка*** былых ***Дваранскага і Сялянскага пазямельных банкаў*** (вул Міронава, 33). Пабудаваны ён ў 1914 г. (арх. ***А.Друкер*** ці ***П.Камбураў***) у ***стылі мадэрн***. Двухпавярховы будынак, Т-падобны ў плане. Галоўны фасад арыентаваны на вул. Першамайскую і мае асіметрычную кампазіцыю, якую падкрэсліваюць два бакавых рызаліты. Адзін з іх, у левай часцы, завершаны атыкам у выглядзе какошніка з ляпной разеткай у цэнтры, на якой некалі размяшчаўся ***герб Магілёўскай губерні.*** Другі, у правай частцы, вырашаны ў выглядзе невысокай двух'ярuснай вежы з вузкімі праёмамі, над якой узвышаецца шатровы купал, дзе раней знаходзіўся ***дзяржаўны герб Расійскай імперыі.*** Паміж рызалітамі – галоўны ўваход, на другім паверсе - балкон, над якім сценка дэкарыравана ляпным арнаментам. У дэкаратыўнай аздобе шырока выкарыстаны дэталі неарускага стылю: какошнікі, паўкалонкі з капітэлямі, разеткі, раслінны арнамент і інш.



Будынак былога Дваранска-
Сялянскага пазямельнага банка

Гэты будынак у свой час быў самым прыгожым у горадзе. Ён меў сваё вадзяное атапленне, кандыцыянеры, электрычнае асвятленне, тэлефон. На два банкі быў адзін дырэктар, але кожны з банкаў меў свой штат. На першым паверсе, ў памяшканнях з браніраванымі дзвярыма, захоўваліся грашовыя сродкі банкаў.

Дваранскі банк прадстаўляў памешчыкам грашовыя сумы пад залог памесцяў. У выпадку неплацёжаздольнасці заёмшчыка, закладзенае ім памесце пераходзіла ў маёмасць банка. Заможная частка сялянства, меўшая патрэбу ў павелічэнні сваіх зямельных надзелаў, звярталася ў сялянскі банк, які, прадастаўляючы пазыку, тут жа мог прадаць невыкупленыя памешчыкамі залогавыя землі і пабудовы. Часта некалькі сялянскіх гаспадарак, аб'яднаўшыся ў зямельнае таварыства, набывалі былыя залогавыя ўчасткі за наяўны разлік.

Пасля 1918 г. у будынку банка размяшчаўся фінансавы адзел губвыканкама, а праз год сюды пераехаў Магілёўскі дзяржаўны гістарычны музей. У 1929 г. цокальны паверх будынка быў часткова заняты архівам ЦК КП(б)Б. ***У незгараемыя сейфы былых банкаўскіх памяшканняў з музеяў***

***Мінска, Полацка, Віцебска і інш месц, якія аказаліся паблізу ад савецка-польскай мяжы, былі звезены каштоўнасці, што прадстаўлялі сабой нацыянальны набытак рэспублікі.*** З 1932 г. па 1941 г. тут размяшчаўся акруговы (затым абласны) камітэт партыі і партархіў. З пачаткам вайны рэліквіі са спецхранілішча бясследна зніклі пры эвакуацыі ці былі захоплены немцамі. Гэта таямніца не разгадана да нашага часу. Сярод тых каштоўнасцей знаходзіліся: ***залаты і сярэбраны ключы г.Магілёва; дзве сярэбраныя пячаткі г. Магілёва, дадзеныя яму з Магдэбургскім правам; крыж Ефрасінні Полацкай, абкладзены золатам і ўпрыгожаны каштоўнымі каменнямі; шыйныя залатыя каралі, 6 залатых блях-пласцін, некалькі залатых пярсцёнкаў*** – усё з раскопак Пампеі; ***булава Сігізмунда ІІІ сярэбраная*** і ***мноства іншых рэліквій-каштоўнасцей, спіс якіх склаў некалькі дзесяткаў найменняў.***

Пасля вызвалення горада ў 1944 г. у будынку зноў знаходзіліся партыйныя ўстановы, а з 1970-х па 1991 год - рэдакцыя газеты “Магілёўская праўда”. Сёння тут размяшчаецца мастацкі музей імя П.Масленікава.


Гарадскі дом культуры.

***На скрыжаванні вул. Першамайскай і вул. Крыленка спынімся каля 3-х павярховага будынку былога дваранскага сходу.*** Пабудаваны ён у другой палове XIX ст. у ***стылі мадэрн.*** Пасля 1917 г. тут размяшчаўся клуб, з 1972 года – гарадскі Дом культуры. Спачатку існавалі два асобныя мураваныя будынкі: 3-х павярховы і 2-павярховы, у пачатку XX ст. яны былі аб’яднаны ў адзін Г-падобны ў плане будынак, а на 2-павярховым надбудавалі 3-ці паверх. Тады ж быў зменены і дэкор фасада.

Галоўны фасад, арыентаваны на вул. Першамайскую, вылучаны двума рызалітамі з уваходамі. Рызаліты завершаны атыкамі з круглымі разеткамі. Сцены дэкарыраваны глыбокім рустам, аздоблены пілястрамі, паўкалонкамі. У рызалітах балконы з металічнай агароджай. Дэталі дэкору афарбаваны ў белы колер і кантрастна вылучаны на цёмна-чырвоным фоне сцен фасада. Унутраная планіроўка калідорная, на першым паверсе – актавая зала для пасяджэнняў і відовішчных мерапрыемстваў.

У 1905 г. тут працаваў ***гурток аматараў музычнага мастацтва,*** пераважна інтэлігенцыі 50-ці тысячнага Магілёва (выкладчыкі музыкі і спеваў, вакалісты, наогул, усе, хто валодаў ігрой на музычных інструментах).

15 чэрвеня 1919 г. у будынку клуба на ўрачыстым аб’яднаным пасяджэнні членаў павятовага і гарадскога саветаў дэпутатаў, прадстаўнікоў ад прафсаюзаў і чырвонаармейскіх часцей выступіў Старшыня Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта ***М.І.Калінін*** з заклікам да працоўных

згуртаваць сілы для разгрому ворага. Наведаў ён Магілёў на агітацыйным цягніку “ Кастрычніцкая рэвалюцыя”.

З 1944 па 1966 гады тут знаходзіўся т.зв. парткабінет абкама камуністычнай партыі.

***Далей спынімся каля жылога дома*** (вул.Першамайская, 32) насупраць гарадскога універмага. Тры такія 4-х і 5-ці павярховыя дамы былі ўзведзены на галоўнай вуліцы горада ў 1952-55 гг. і менавіта па іх выгляду можна меркаваць аб характары архітэктуры таго перыяду. Акрамя ўказанага 54-х кватэрнага дома (арх. ***А.Семяненка***), да іх належаць 143-кватэрны 5-ці павярховы жылы дом (арх. ***А.Рымінскі***) па вул. Першамайскай, 12, дзе зараз на першым паверсе знаходзяцца гастраном “Тэатральны” і атэлье “Абнавіце”, а таксама 50-ці кватэрны жылы дом (арх. ***Д.Саннікаў***), размешчаны насупраць.



Жылы дом, вул Першамайская, 32.




Жылы дом, вул Першамайская, 12.

У аснову праектаў гэтых жылых дамоў пакладзена секцыйная сістэма, на першым паверсе размяшчаюцца магазіны. Мастацкі бок іх архітэктуры не бездакорны, бо занадта вялікі адбітак мінулага наклала на будынкі спадчына. Уся ўвага засяроджана на вонкавым афармленні фасадаў.

Два дамы, што тарцамі выходзяць на Тэатральную плошчу, маюць складаную раскрапоўку і ўвенчаны вежамі ў раманскім стылі. На вежы аднаго з іх змешчаны ***адзін з нямногіх ў горадзе працуючы механічны гадзіннік.*** Лоджыі з калонамі, пышныя карнізы, балконы надаюць ім вабячы вока выгляд. Па рознаму можна адносіцца да іх архітэктуры, можна нават абвінаваціць архітэктараў у празмернасці, як гэта рабілася раней. Але ж гледзячы праз дзесяткі год, цяжка не пагадзіцца сёння, што ў параўнанні з “хрушчоўкамі” 1960-х і жалезабетоннымі “каробкамі” 1980-х гадоў - пабудовамі, у якіх мастацкі густ і стыль наогул адсутнічаюць, выйграюць па ўсіх параметрах. Менавіта яны з’яўляюцца аднымі з самых прыгожых дамоў на вул.Першамайскай і робяць яе аблічча адметным і пазнавальным.

***Да жылога 54-х кватэрнага дома*** (вул. Першамайская, 32***)*** прымыкае т.зв. ***“Дом імя Сталіна”***, пабудаваны ў 1939 г. да 60-годдзя з дня нараджэння “правадыра”. У 1948-м годзе адноўлены, а ў 1970-х гг. рэканструяваны. Менавіта тады ўсе жылыя памяшканні з першага паверха



“Дом Сталіна”

былі перанесены ў надбудаваны зверху жылы 5-ты паверх. Архітэктурнае аблічча будынка не пацярпела, бо ён зрабіўся па вышыні на адным узроўні з суседнім домам. На спецыяльна абсталяваным першым паверсе з таго часу размяшчаецца гарадская бібліятэка імя К.Маркса.

***Праходзячы далей па вуліцы, справа бачым 8-мі павярховы адміністрацыйны будынак*** , дзе раней размяшчаўся абкам КПБ, потым Дом юстыцыі, а зараз – ***Магілёўскі гарвыканкам*** (арх. ***А.Кучарэнка*** і ***Ю.Шпіт***). Дом пабудаваны ў 1973 г., размешчаны за 60 метраў ад праезжай часткі вуліцы і ўтварае, такім чынам, невялікую плошчу. З боку дваровага фасада да яго прымыкае 2-павярховая частка, дзе знаходзіцца вестыбюль, фае, зала пасяджэнняў на 350 месц, сталовая.



Магілёўскі гарвыканкам

Асноўным архітэктурным матывам галоўнага фасада з’яўляюцца пілоны на ўсю вышыню будынка: у цэнтральнай частцы фасада масіўныя ( да 1,2 м.), на бакавых – больш тонкія, у дэкаратыўнай аздобе выкарыстаны натуральны і штучны мармур, граніт. Галоўны ўваход вырашаны 3-ма манументальнымі парталамі, што падкрэслівае грамадскі характар будынка.



Будынак жаночай гімназіі (фота пач.XX ст.).

***Да сёняшняга дня захаваўся на рагу вул.Першамайскай і зав. Т.Карпінскай*** (дом № 24) ***будынак жаночай гімназіі*** (зараз тут размяшчаецца СШ №1), якая была адкрыта ў 1865 г. Першапачаткова яна знаходзілася ў часовым будынку за горадам на высокім беразе Дняпра на дачы ***Піпенберг*** (паміж сучаснымі заводам штучнага валакна імя Куйбышава і п. Буйнічы).

Будынак , які мы бачым, быў узведзены для гімназіі ў 1875 г., як аднапавярховы, пазней надбудаваны яшчэ два паверхі. Сцены першага паверха пакрыты рустам, другі і трэці – гладкія, па перыметры – шырокі прафіляваны карніз. Ваконныя праёмы прамавугольныя ў простых ліштвах, на другім і трэцім паверхах дэкарыраваны сандрыкамі. Будынак – прыклад ***архітэктуры позняга класіцызму.***

На доме - ***мемарыяльная дошка Карпінскай Т.Р.***, якая ўстаноўлена ў 1964 г. ***Таццяна Карпінская*** скончыла СШ №1, у Вялікую Айчынную вайну – член падпольнай групы ў Магілёве, у сакавіку 1943 г. немцы арыштавалі Карпінскіх (маці і дачку) і пасля жорсткіх катаванняў расстралялі. ***В.М.Карпінская*** (маці) пасмяротна ўзнагароджана ордэнам Леніна, ***Таццяна*** (пасмяротна) – ордэнам  Айчыннай Вайны I ступені. Імем Тані Карпінскай названы завулак у Магілёве і судна гандлёвага флоту.

СШ №1 г.Магілёва – месца вучобы ***Лорчанкі Леаніда Дзмітрыевіча,*** Героя Савецкага Саюза (1965 г.). Нарадзіўся ў 1923 г. у Магілёве. З пачатку вайны – у народным апалчэнні, потым член падпольнай групы на аўтарамонтным заводзе ў Магілёве. З красавіка 1943 г. – у 600-м партызанскім атрадзе. У баі з нямецкімі карнікамі 18.07.1943 г. паранены, калі скончыліся боепрыпасы, падарваў гранатай сябе і акружыўшых яго ворагаў. Пахаваны на могілках у в. Антонава Буда Бялыніцкага раёна.

У свой час гэту школу скончыла заслужаная артыстка РСФСР ***Тамара Талахадзе***, тут вучыўся двойчы Герой Савецкага Саюза, ураджэнец Магілёўшчыны, ***Іосіф Гусакоўскі.***


“Дом Леніна”.

Палітыка індустрыялізацыі і шырокае развіццё прамысловасці з канца 1920-х гг. выклікалі значнае павелічэнне гарадскога насельніцтва і неабходнасць узвядзення шматпавярховага буйнога жыллёвага фонду. ***Першым шматпавярховым секцыйным жылым домам у Магілёве*** з’яўляецца 3-4-х павярховы дом № 22 на вул.Першамайскай (гараджане-старажылы называюць яго ***“Домам Леніна”***), пабудаваны ў 1929-30 гг. па праекту інжынера ***Ульянава.*** Канструктыўную схему яго складаюць тры падоўжаныя нясучыя сцяны. Вакол кожнай лесвічнай пляцоўкі размешчаны дзве 4-х пакаёвыя кватэры. Плошча кухняў у сярэднім 7-8 кв. м., жылых пакояў – 13-17 кв. м. Яскравы ***прыклад архітэктуры савецкага канструктывізму 1920-х – 30-х гадоў.***

Да капрамонту ў 1970-х гг. зверху над парапетам быў надпіс у тынкоўцы “Дом імя Леніна”. Зараз тут на першым паверсе размяшчаюцца чыгуначныя касы папярэдняга продажу білетаў і рэстаран “Вікторыя”.

***На супрацьлеглым баку вуліцы перад намі паўстае вялікі жылы дом*** з прадпрыемствамі бытавога абслугоўвання (вул.Першамайская, 31), які ў народзе атрымаў назву ***“Кітайская сцяна”*** (у дасавецкі час на гэтым месцы размяшчаліся дом  паліцмейсцера і будынак кантрольнай палаты). Пабудаваны ён ў 1970-х гг. па праекту архітэктараў ***І.Фралова*** і ***Г.Борахава***, размешчаны ў 120 м ад лініі забудовы вуліцы, што ўтварае пешаходную зону, добраўпарадкаваную газонамі і дэкаратыўнымі басейнамі. Складаецца з некалькіх аб’емаў: першы 9-павярховы – галоўным падоўжаным фасадам


“Кітайская сцяна”.

выходзіць на вул. Першамайскую, другі 12-павярховы - злучаны з тарцом першага і выходзіць на вул.Будзённага (Шклоўскі зав.). Да галоўнага фасада далучаны два 2-павярховыя аб’ёмы – дзе зараз размяшчаюцца магазін “Еўраопт” і рэстаран “Габрава”. Жылыя паверхі вырашаны адзіным архітэктурным прыёмам – рознай даўжыні балконы з вертыкальнымі бакавымі перагародкамі надаюць галоўнаму фасаду аб’ёмнасць і цэласнасць. Сцены абліцаваны пліткай, што стварае насычаную гаму фасада. У апрацоўцы цокаля выкарыстаны граніт. У доме 228 кватэр, якія арыентаваны на абодва бакі дома, балконы - з боку галоўнага і дваровага фасадаў. Ліфты вынесены за габарыты дома ў спецыяльныя шахты. Жылы дом – прыклад ***савецкай архітэктуры 1970-х гадоў.***

***Каля былой гасцініцы “Дняпро”*** (з 2003 года тут размяшчаюцца офісы), ***мы проста абавязаны спыніцца*** і азірнуцца больш, чым на два стагоддзі назад. Менавіта тады на гэтым месцы стаяў цудоўны ***сабор Святога Іосіфа (***арх. ***Львоў М.А.***) - лепшы храм у Магілёве і ***адзін з першых у архітэктуры класіцызму на Беларусі*** (знішчаны ў 1938 г.). Храм з’яўляўся візітнай карткай Магілёўскай губерні, на фотаздымках і паштоўках, якія выпускаліся ў той час, абавязкова былі адлюстраваны Саборная плошча і сабор.

Будаўніцтва яго пачалося ў памяць сустрэчы ў Магілёве рускай імператрыцы ***Кацярыны ІІ*** і аўстрыйскага імператара ***Іосіфа ІІ***. У 1780 г. у горадзе ва ўрачыстых абставінах Кацярына ІІ і Іосіф ІІ заклалі першы камень фундамента сабора. Бытуе ***легенда***, што ў момант закладкі, калі імператрыца нахілілася, у яе абарвалася нітка караляў з каштоўнымі жамчужынамі. Жэмчуг рассыпаўся, і світа пачала збіраць яго, але Кацярына ІІ прамовіла: “Не трэба, няхай будучы будынак будзе такі прыгожы, як мае каралі”.


Іосіфаўскі сабор (фота пач.ХХ ст.).

Работы па яго ўзвядзенню працягваліся 18 год і закончыліся ўжо пасля смерці імператрыцы, пры ***Паўле І*** у 1798 г. За гэты час мяняліся будаўнікі-падрадчыкі, магілёўскі губернатар ***Пасек*** паспеў адбудаваць за кошт саборных сродкаў дачу ***Піпенберг*** (названа так ад імя яго сына Піпенкі), а храм, нягледзячы на яго мастацкія вартасці, заставаўся звычайнай царквой.

Бо не было сродкаў не толькі для набыцця неабходных службовых атрыбутаў, але і для падтрымання ў належным стане будынка, які паціху пачаў прыходзіць у заняпад. І толькі ў 1802 г. па патрабаванню губернатара і мясцовага епіскапа ***Анастасія*** новы храм стаў саборным, а праз пяць год – кафедральным. Такі ж храм, толькі ў імя ***св. Кацярыны,*** быў закладзены Іосіфам ІІ пасля яго вяртання на радзіму ў сталіцы Аўстрыі – Вене. Цікава, ці ўцалеў ён да нашых дзён і ці будаваўся наогул? На жаль, сёння нам гэта дакладна не вядома.

Архітэктура сабора была вырашана ў простых манументальных формах. Да квадратнага ў плане будынку з усходу далучалася паўцыліндрычная апсіда, а з захаду (з вул.Шклоўскай) размяшчаўся ўваход – выступаючы прытвор, вырашаны шасцікалонным дарычным порцікам з франтонам, бакавыя фасады мелі такія ж, толькі чатырохкалонныя порцікі. ***Найбольш цікавай, адметнай асаблівасцю будынка быў двайны купал***. Унутраная яго частка была прарэзана 12-цю арачнымі праёмамі па перыметру і круглым праёмам у цэнтры. Праз гэтыя праёмы прагледжваўся жывапіс на знешнім купале. Для падсветкі знешні купал меў 12 вакон-люкарнаў, праз якія дзённы свет падаў на жывапісныя карціны. Асабліва багата быў аздоблены ўнутраны інтэр'ер. Сцены, упрыгожаныя спаранымі іянічнымі калонамі, былі абліцаваны штучным мармурам.



Божая Маці з дзіцём.
Мастак У.Л.Баравікоўскі.

Інтэр'ер меў багаты роспіс, нішы са скульптурамі, рэльефныя медальёны, у іканастасе на медных дошках абразы: ***Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы, Іісус Хрыстос, Іосіф Абручнік, Архангел Міхаіл, Божая Маці, Вялікамучаніца Кацярына і Архангел Гаўрыіл.*** Усе гэтыя абразы былі напісаны малавядомым тады мастаком, а пазней знакамітым прафесарам жывапісу, партрэцістам ***Баравікоўскім У.Л***. Чатыры з іх ўцалелі і сёння знаходзяцца ў абласным краязнаўчым музеі. Лічаць, што на абразах у выглядзе святых і анёлаў былі намаляваны фаварыты Кацярыны ІІ і сама імператрыца.

***Галоўнымі святынямі сабора былі***: часціца ***Жыватворнага Крыжа Гасподня*** і часціцы ***мошчаў Св.Іосіфа Абручніка і Велікамучаніка Панцелеймона***, прынесеныя з Афонскай гары ў 1866 г.; ***ікона Казанскай Божай Маці***, падараваная сабору рускім імператарам ***Аляксандрам ІІІ*** у 1867 г.; сцягі Магілёўскага апалчэння, удзельнічаўшага ў Севастопальскай кампаніі.

Разам з праектам сабора архітэктар ***М.Львоў*** распрацаваў схему ансамбля ***Сабornай плошчы,*** якую пазней у 20-30-я гады ХІХ ст. развіў другі рускі архітэктар ***Стасаў В.П.*** у сувязі з будаўніцтвам ваеннага будынка – ***экзерцыргаўза,*** прамавугольнага выцягнутага на 100 м будынка з вялікай залай, вышынёй на два паверхі. Ён размяшчаўся на процілеглым ад сабора


Львоў М.А.

баку плошчы, адразу ж за ***аркай*** (захавалася) і агароджай. У 1870 г. будынак згарэў і больш не аднаўляўся.

***Манументальная мураваная брама*** (арка) пабудавана ў 1780 г. насупраць сабора на адной восі з ім. Прамавугольная сцяна з 2-ма выступамі-рызалітамі завершана шырокім прафіляваным карнізам і ламаным трохвугольным франтонам, па тарцах фланкіравана 2–ма карынфскімі калонамі. У цэнтры галоўнага фасада – вялікая паўцыркульная ніша. Прыкладнога значэння не мела, бо як адзначаў ***В.Стасаў*** "Мураваныя вароты, якія знаходзяцца насупраць царквы, нікуды не вядуць...". Напэўна, яна распрацоўвалася для дэкаратыўнага кампазіцыйнага афармлення плошчы.


Манументальная мураваная брама

У 1938-41 гг. арка служыла ўваходам у ***Магілёўскі цырк,*** рэстаўрыравана ў 1950-я гады, калі над яе нішай устанавілі барэльефы з сацыялістычнай сімволікай. Падчас святкавання 20-годдзя вызвалення г.Магілёва, у 1964 г. тут былі ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі ў гонар часцей і злучэнняў Чырвонай Арміі, вызваляўшых горад.

У час знаходжання ў Магілёве ***Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага*** (1915–1918 гг.) у саборы на службах неаднаразова прысутнічаў разам з сям'ёй цар ***Мікалай II.*** Тут кожны дзень на ранішніх службах маліліся за перамогу Расіі ў вайне. У савецкі час сабор дзейнічаў да 1929 г., калі "па ініцыятыве рабочых горада" быў зачынены. У храме з 1932 г. па 1937 г. дзейнічаў музей гісторыі рэлігіі і атэізма, дзе дэманстраваўся падвешаны пад купалам маятнік Фуко, які наглядна паказваў вярчэнне Зямлі вакол сваёй восі, а сам купал быў размаляваны пад зорнае неба. Дэманстраваліся тут і іншыя экспанаты: шкілет маманта, прылады працы каменнага веку, нумізматычная калекцыя і інш.

Дырэктар музея ***Мігулін І.С***., даведаўшыся аб намеры мясцовых улад разбурыць будынак, рознымі спосабамі спрабаваў затрымаць вываз экспанатаў з музея. У прыватнасці, ён паведаміў мясцоваму начальству, што пераезд музея нельга паскорыць з-за таго, што шкілет маманта вельмі цяжка разабраць і гэта патрабуе шмат часу, на што атрымаў адказ: калі яму загадаюць, то мамант з музея выйдзе сам. Аднак дырэктар працягваў змагацца і напісаў пісьмо ў Маскву ***Мікаяну А.І.*** аб тым, што сабор – архітэктурны і гістарычны помнік – разбураць катэгарычна нельга. Але ***ў 1938 г. храм узарвалі***, а праз тры дні з Масквы прыйшла тэлеграма аб забароне зносіць культавае збудаванне...

У двары сабора размяшчаўся невялічкі некропаль. Тут быў пахаваны ***М.Фурсаў*** – аўтар гістарычнага нарыса аб Верхнім Падняпроўі ў першым томе “Опытов описания Могилевской губернии...”, дырэктар Магілёўскай класічнай гімназіі.

***Гасцініца “Дняпро”*** пабудавана ў 1940 г. (арх. ***А.Воінаў***) на месцы разбуранага сабора (вул.Першамайская, 29), рэканструявана ў 1983 г. з разлікам на 305 месц. Як гасцініца зараз не дзейнічае, памяшканні здаюцца ў арэнду фірмам пад офісы. 5-ці павярховы будынак вырашаны ў строгіх формах, мае падоўжаны фасад з двума рызалітамі, што выступаюць па баках. Знешне фасад аформлены з дапамогай балконаў і лоджыяў, унутраная планіроўка калідорная, на першым паверсе - магазіны, казіно і іншыя ўстановы бытавога абслугоўвання.


Дом культуры швейнікаў (офіс аблдарбуда).

Насупраць, у глыбіні знаходзіцца былы будынак ***Дома культуры швейнікаў***, пабудаваны па тыпавому праекту ў 1954 г. Зараз у ім размяшчаецца офіс Магілёўскага аблдарбуда.

Галоўным фасадам ён выходзіць на невялікую плошчу з фантанам і ***бюстам двойчы Героя Савецкага Саюза Гусакоўскага І.І.***

***Гусакоўскі Іосіф Іракліевіч*** - нарадзіўся 25 снежня 1904 г. у в. Вародзькаў Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці. З 8 да 16 год пражываў у Магілёве. У 1928 г. пайшоў служыць добраахвотнікам у Чырвоную Армію. Прайшоў усю Вялікую Айчынную вайну, у канцы яе – палкоўнік, камандзір 44-й гв. танкавай брыгады. Вось што гаворыцца аб баявых дзеяннях 44-й гв. танкавай брыгады ў 10-м томе “Истории второй мировой войны: “Обогнав отступающие гитлеровские части бригада дерзкой атакой прорвала оборону противника. 30 января 1945 г. вышла в его тыл и через два дня захватила плацдарм на р.Одер. За проявленный героизм ***весь личный состав бригады был удостоен правительственных наград, 11 воинам присвоено звание Героя Советского Союза, а командир бригады полковник Гусаковский награждён второй медалью “Золотая Звезда”.*** (Першую атрымаў за Львоўска-Сандамірскую аперацыю ў 1944 г.)


Гусакоўскі І.І.

У мірны час ***Гусакоўскі І.І.*** – начальнік Галоўнага упраўлення кадраў Міністэрства абароны СССР, генерал арміі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны 16 савецкіх танкістаў сталі двойчы Героямі Савецкага Саюза. З іх трое – ураджэнцы Магілёўшчыны.

***Зараз пройдзем у сквер на вул.Першамайскай да надмагільнага помніка – месца пахавання Героя Савецкага Саюза Лазарэнкі І.С.***


Лазарэнка І.С.

***Лазарэнка Іван Сідаравіч*** – нарадзіўся ў 1895 г. у р.п. Валаконаўка Белгародскай вобл., генерал-маёр (1940). У 1941 г. – камандзір 42-й стр. дывізіі, з баямі адыходзіўшай ад Брэсцкай крэпасці праз Магілёўскую вобласць на ўсход. Захаваў дывізію і вывеў яе з акружэння. У 1944 г. ***Лазарэнка І.С.*** – камандзір 369-й Карачаўскай дывізіі. У час прарыву абароны праціўніка на Магілёўшчыне 23-25 чэрвеня 1944 г. дывізія фарсіравала рр. Проню, Басю і з баямі прасунулася на 25 км. 25 чэрвеня перадавы атрад палка, у якім рухаўся камдзіў, каля вв. Халмы – Драчкава Чавускага раёна трапіў у засаду. У скарацечным жорсткім баі камандзір дывізіі быў смяротна паранены асколкам нямецкага снарада. 21 ліпеня 1944 г. яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Спачатку быў пахаваны ў Крычаве, а пасля вайны перанесены ў Магілёў, дзе яго імем названы вуліца (былая Віленская) і гэты сквер.


Кінатэатр "Чырвоная Зорка".

***Злева ад помніка перад намі паўстае*** старэйшы ў горадзе ***кінатэатр "Чырвоная Зорка"***, пабудаваны ў 1909 г. (старая назва "Чары") і перабудаваны ў 1930 г. (інж. ***Э.Лосер***). У час апошняй вайны быў разбураны, у 1948 г. адноўлены, а ў 1954 г. рэканструяваны. Глядзельная зала на 526 месц. Будынак у плане - выцягнуты прамавугольнік з касавай залай і паўцыркульным вестыбюлем. У аснову архітэктурнай кампазіцыі пакладзены прынцып проціпастаўлення аб'ёмаў розных форм. Галоўны ўваход з боку тарцовага фасада выдзелены шырокай лесвіцай. Бакавыя фасады рытмічна падзелены прамавугольнымі ваконнымі праёмамі. Прыклад ***архітэктуры з выкарыстаннем элементаў канструктывізму.***

***Далей на Першамайскай вул. звернем увагу на старыя кварталы паміж вул. К.Лібкнехта, Камсамольскай і Лазарэнка,*** якія ў канцы XIX-пач.XX ст.ст. ўражвалі шматлікасцю гасцініц. На месцы сёняшніх гастранома "Тэатральнага", атэлье "Абнавіце" і насупраць іх знаходзіліся: у доме ***Каца*** - гасцініца "Лонданская", у доме ***Бако*** – "Маскоўская", ***Грубіна*** – "Арлоўская", ***Гінзбурга*** – "Эрмітаж". Наогул, амаль увесь цэнтр Старога горада быў забудаваны яўрэйскімі даходнымі дамамі, гасцініцамі і крамамі. (Гл. план рэканструкцыі І.Пушкіна, 2002г.).




1. Дом Граната – захаваўся, вугал вул. Першамайскай, 23 і вул.К.Лібкнехта, 2
2. Дом Грубіна – захаваўся, вугал вул.Першамайскай, 21 і вул.К.Лібкнехта,1
3. Дом Гісіна – захаваўся, вул. К. Лібкнехта,7
4.Дом Кагана – захаваўся, вул. К.Лібкнехта,9
5. Дом Берліна – захаваўся, вул. К. Лібкнехта, 11
6.Дом Каца – захаваўся, вул. К. Лібкнехта, 13
7. Дом Сімховіча – захаваўся, вул. Ленінская, 31
8. Дамы Махавера – захаваліся, вул. К. Лібкнехта,15 і вул. Ленінская, 22.
9. Дом. А.Магітсона (1884), Ц. Сыркіной – захаваўся, вул. Ленінская,20
10. Дом Ландау – захаваўся, вул.Ленінская,18
11. Дом Берштейна – захаваўся, вул. Ленінская,16
12. Дом К. Гофмана – не захаваўся
13. Дом Шафрая – не захаваўся
14. Дом Граната – не захаваўся
15. Дом Эдельмана – не захаваўся
16. Дом Берштэйна – не захаваўся
17. Дом Р.Брэслау, гасцініца “Брыстоль” – захаваўся, вугал вул.Ленінскай, 23 і вул. Камсамольская,12
18. Дом Аранзона (сяр.XIX ст.), А.Гурэвіча, гасцініца “Тульская” – захаваўся, вугал вул.Камсамольскай, 3 і вул.Ленінскай, 21
19. Яўрэйскае медыка-санітарнае таварыства – захаваўся, вул.Камсамольская, 6
20. Дом Вільнера – захаваўся, вул.Першамайская,11
21. Дом Мінахера – захаваўся, вул.Першамайская,13
22. Дом Лур’е – захаваўся, вул.Першамайская,15
23. Дом Ідэльсона – захаваўся, вул.Першамайская,17
24. Дом Ханіна – захаваўся, вул.Першамайская,19
25. Дом Сабалеўскага, друкарня Я. Падземскага (арандатары Шыфрын і Каган) – захаваўся, вул.Першамайская,19
26. Сінагога Цукермана ( з другой паловы XIX ст., да 1831 г. архіепіскапскі палац) – захаваўся, вул. Ленінская,25
27. Дом Гофмана – кінатэатр “Чары” – перабудаваны, будынак сучаснага кінатэатра “Чырвоная Зорка”
28. Дом Гінзбурга – не захаваўся
29. Дом Бако – не захаваўся
30. Дом Каца – не захаваўся
31. Дом Пасэ, гасцініца “Францыя” – не захаваўся

У архітэктуры жылых і грамадскіх будынкаў другой паловы XIX ст. у Магілёве намеціліся змены. З’явіліся новыя тыпы пабудоў – тэатр, чыгуначны вакзал, банкі, гасцініцы і інш.

Адным з самых значных збудаванняў гэтага часу з’яўляецца ***будынак гарадскога тэатра***, з якога пачалося фарміраванне ***Тэатральнай плошчы***. Думка аб тэатры ў Магілёве зарадзілася прыкладна год за 20 да пачатку яго будаўніцтва. У 1847 г. губернатар ***М.А.Гамалея*** неаднаразова настойваў у вышэйстаячых інстанцыях на неабходнасці існавання ў горадзе тэатра, аднак адсутнасць матэрыяльных сродкаў рабіла недасягальнай гэту мэту. І тады было вырашана сабраць сродкі праз народныя ахвяраванні. Вось вытрымка з тэксту запрашэнняў да ахвяраванняў, якія дасылаліся ва ўстановы горада і губерні, а таксама прыватным асобам у 1885 г.: “Отсутствие в Могилёве театра – существенной принадлежности всякого губернского города ощущается всеми горожанами. Спектакли, которые даются здесь приезжими труппами актёров, обыкновенно устраиваются кое-как в частном, вовсе неприспособленном доме и потому... не отвечают своему значению, а недостаток мест не даёт возможности посещать театральные зрелища беднейшему населению, которое таким образом лишено одного из полезнейших развлечений, которые могут служить и воспитательным средством. Вследствие этого построить, хотя бы скромное, но приличное здание постоянного театра представляется настоятельной необходимостью... Всякая добровольная лепта будет принята с признательностью и глубокой благодарностью.”



Драматычны тэатр (сучасны выгляд)

Праект будынка распрацаваў епархіяльны архітэктар ***П.Р.Камбураў***, будаўніцтва ажыццяўляў губернскі інжынер ***У.С.Мільяноўскі.*** Тэатр пачалі будаваць у 1886 г., калі па ўсёй губерні былі сабраны неабходныя сродкі. У 1888 г. будаўніцтва было скончана, а праз год адкрыты першы тэатральны сезон пастаяннай драматычнай трупы ***Дзергача.***

Месца для тэатра было выбрана ў цэнтры горада на скрыжаванні Дняпроўскага праспекта (вул.Першамайская) і вул. Дваранскай (вул.Камсамольская). Калісьці тут праходзіў роў з абаронным валам, які быў скапаны ў 1809 г. У канцы XIX ст. на яго месцы ўжо была плошча, а ўздоўж вуліцы Дваранскай  пасажаны Мураўёўскі сквер (назва ад імя тагачаснага губернатара Мураўёва). Размяшчэнне тэатра на плошчы ўпрыгожыла цэнтр горада. Але месца ў тэхнічных адносінах аказалася не зусім удалым: там, дзе раней праходзіў роў, патрабавалася закласці фундаменты глыбінёй да 15 аршын (прыкл. 10,6 метра) Гэта пацягнула перарасход сродкаў, вылучаных на будаўніцтва, таму тэхнічнае абсталяванне (жалезны занавес, сістэма пажарных лесвіц, водаправодных

труб і інш.) не было ажыццёўлена поўнасцю. З-за нізкай якасці мясцовай цэглы (слабая трываласць) давялося адмовіцца ад першапачатковага праекта 3-х павярховага будынка эліпсавіднай формы.

У выніку быў пабудаваны прамавугольны будынак з закруглёнай тарцовай сцяной. На галоўным фасадзе выступаюць два вежападобныя аб'ёмы і тамбур з балконам над ім пры ўваходзе, да якога вядзе лесвіца. Будынак не атынкаваны, дэкаратыўныя дэталі (да рэстаўрацыі ў 1990-х гг.) былі афарбаваны ў белы колер. У аздобе фасадаў выкарыстаны стылізаваныя элементы старажытнарускага дойлідства: абрамленне вокнаў у выглядзе какошнікаў, закамары, арнаментальныя пояскі. Глядзельная зала на 500 месц, яе інтэр'ер дэкарыраваны разьбой па дрэве. Размяшчэнне і канструкцыя ложаў былі зроблены па ўзору варшаўскага Малага тэатра. Унутраная мастацкая аздоба, жывапісныя і ляпныя работы выканаў мясцовы мастак ***Чарнышоў.*** Вакол залы размяшчаліся вестыбюль, фае, кулуары, службовыя і адміністрацыйныя памяшканні.

З цягам часу тэатр часткова рэканструяваўся. У 1912 г. замест былой веранды з тылавой часткі будынка, на якой для публікі ў выхадныя дні граў аркестр, былі прыбудаваны тры бетонныя сцяны. Плошча ўнутры расшырылася за кошт былых там некалькіх крамаў. Але ўсё ж з-за неякаснага будаўнічага матэрыялу тэатр паступова прыходзіў у заняпад (з'яўляліся трэшчыны ў сценах, прасядаў фундамент, асыпаўся фасад і інш.).

У 1985 г. Міністэрства культуры Беларусі прапанавала разбурыць тэатр, а на яго месцы пабудаваць новы, на што выдзеліла адпаведныя сродкі. Але на абарону старога тэатра паднялася грамадскасць, усё насельніцтва горада. І тэатр амаль на 15 год зачынілі на рэканструкцыю, пасля якой у 2000 г. ён быў уведзены ў строй. Пад час аднаўленчых работ бетонам быў умацаваны стары фундамент, структура залы засталася ранейшай, але з'явілася надстройка сцэнічнай каробкі. У глядзельнай зале на 330 месц адноўлены ўвесь ранейшы інтэр'ер – балконы з разьбой, губернатарская ложа, якую цяпер упрыгожвае герб Магілёва, на столі ляпныя ўпрыгажэнні. На даху тэатра, на невялічкай вежы, замацаваны металічны флюгер, адзіны ў горадзе з прарэзанай наскрозь лічбай «1888» - годам пабудовы тэатра.

У свой час у гэтым будынку выступалі ці працавалі знакамітая актрыса ***Вера Камісаржэўская,*** піяніст і кампазітар ***Сяргей Рахманінаў,*** першая народная артыстка Украіны ***Марыя Занькавецкая***, народныя артысты СССР і БССР ***Фёдар Шмакаў, Яўген Палосін, Мікалай Радзіёнаў, Сяргей Бульчык, Дзмітрый Арлоў***, заслужаны артыст і заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, рэжысёр ***Уладзімір Кумельскі.*** Піяністам працаваў ***Пятро Яцына*** (да 1964 г.), ураджэнец Магілёва, скульптар, імем якога названа адна з вуліц горада.

Адзін з першых беларускіх прафесійных кампазітараў ***Мікалай Чуркін***, пражываючы ў Магілёве, паставіў у 1924 годзе ў тэатры першую беларускую савецкую оперу ***"Вызваленне працы".*** Тут бывалі на спектаклях ***Янка Купала*** і ***Якуб Колас.***


Чуркін М.М.

З 1944 г. па 1953 г. у Магілёве не было сваёй трупы, тут у розны час працавалі і гастралявалі Гомельскі і Брэсцкі абласныя тэатры. У 1953 г. у Магілёве зноў створаны тэатр з пастаяннай трупай, які дзейнічае па сёняшні дзень. Яго творчай асновай сталі акцёры з расфарміраванага Пінскага тэатра. Ужо ў наш час тут працавалі і працуюць заслужаныя артысты БССР ***Ю.Гальперына, В.Кабатнікава, А.Рудакоў, З.Малчанава, Н.Федзяева, В.Гусеў, Р.Белацаркоўскі, З.Бурцава*** і інш.

Некалі на будынку тэатра (з 1975г.) была ***мемарыяльная дошка*** ў памяць аб тым, што 14 чэрвеня 1919 г. на Тэатральнай плошчы з балкона тэатра перад працоўнымі выступаў Старшыня Усерасійскага ЦВК ***М.І.Калінін*** з прызывамі да абароны сацыялістычнай Айчыны.

У архітэктуры цяжка распавядаць аб тым помніку ці будынку, які ўжо не існуе. Вось і ***зараз мы знаходзімся на паўднёва-заходняй часцы Тэатральнай плошчы, дзе раней стаяў прыгожы і стройны езуіцкі касцёл Св.Ксаверыя***, пазней перайменаваны ў ***Васкрасенскую царкву*** ( на месцы музея этнаграфіі і 8-павярховага жылога дома).


Васкрасенская царква (фота пач.ХХ ст.)

***Езуіты*** – члены манашаскага каталіцкага ордэна “Таварыства Ісуса”. Ордэн быў створаны ў 1534 г. па даручэнню Папы рымскага іспанскім дваранінам ***Ігнаціем Лаёлай*** для барацьбы з Рэфармацыяй і для ўмацавання каталіцызму. У другой палове XVII ст. езуіты з’явіліся ў Магілёве і ў в.Фашчаўка Магілёўскага раёна, дзе набылі зямлю для сваіх пабудоў. Першапачаткова ў Магілёве ў 1686 г. быў пабудаваны драўляны касцёл, а к канцу стагоддзя побач з ім – мураваны 2-павярховы будынак навучальнай установы – ***калегіўма.*** К 1725 г. драўляны касцёл быў знесены, а на яго месцы паўстаў прыгожы і велічны, багата аздоблены мураваны будынак ***касцёла Св.Ксаверыя.*** Пабудаваны ў ***стылі барока***, касцёл унутры быў упрыгожаны ляпнымі гірляндамі і жывапіснымі кампазіцыямі, размалёўкамі сцэн з жыцця і дзейнасці ордэна езуітаў, місіянераў і мясцовых народаў, прыроды і людзей.

Актыўную навучальную дзейнасць праводзілі езуіты ў ***калегіўме.*** Не толькі католікі, але і праваслаўныя бацькі з ахвотай аддавалі сюды сваіх дзяцей на вучобу, бо ведалі, што тут яны атрымаюць грунтоўныя і разнастайныя веды на высокім для таго часу ўзроўні. У калегіўме

выкладаліся філасофія, лацінская і грэчаская мовы, матэматыка, геаметрыя, астраномія, архітэктура, дзейнічалі тэатр навучэнцаў і музыкальная школа. Нават ***Кацярына II*** захаплялася сістэмай іх адукацыі і ў 1775 г. адзначала: “Трэба прызнацца, што гэтыя прайдзісветы – цудоўныя людзі. Нідзе яшчэ не змаглі арганізаваць нешта падобнае да іх школы, хоць і абрабавалі іх дзеля гэтага.”

У 1780 г. аўстрыйскі імператар ***Іосіф II,*** знаходзячыся ў Магілёве інкогніта пад імем графа Фалькенштэйна, наведаў касцёл св. Ксаверыя, дзе доўга маліўся, стоячы на каленях.

З пачаткам вайны 1812 г. касцёл адразу стаў на бок імператара ***Напалеона.*** На ўрачыстых малебнах пры богаслужэнні гучалі словы “ Спаси Господи люди твоя и спаси императора Французского короля Итальянского и возобновителя Польши Великого Наполеона...” .

У 1820 г. па загаду Расійскага цара ***Аляксандра I*** езуіты паўсюды былі выдалены з Расіі, у тым ліку і з Магілёва. Будынак калегіўма забралі пад штаб 1-й Рускай арміі, пазней у ім размяшчалася юнкерская школа. Пасля падаўлення ў 1825 г. снежаньскага паўстання Чарнігаўскага палка ў будынку школы праводзілі допыты кіраўнікоў паўстання Паўднёвага таварыства дзекабрыстаў ***С.Мураўёва-Апостала*** і ***М.Бястужава-Руміна***, якія разам з ***І.Пестэлем, К.Рылеевым*** і ***П.Кахоўскім*** былі пакараны смерцю ў 1826 г. ў Пецярбургу, а 17 афіцэраў – удзельнікаў паўстання - атрымалі па суду розныя тэрміны катаржных і прыгонных работ. Аб гэтай падзеі нагадвае сёння ***мемарыяльная дошка***, размешчаная ў 1986 г. на будынку былога музея дзекабрыстаў, а цяпер музея этнаграфіі (вул.Першамайская, 8).

У былым касцёле размясцілася вайсковая царква, будынак якой ў 1828 г. быў перададзены магілёўскай епархіі і пасля пераабсталявання (зменены ўнутраны інтэр’ер, надбудаваны шатровы купал) тут адчынілася прыходская ***Васкрасенская царква***, якая дзейнічала да 1930 г., калі была закрыта і прыстасавана пад склад. Падчас апошняй вайны будынак касцёла-царквы моцна пацярпеў і пазней быў знесены.

Былы дом калегіўма ў 1924 г. перададзены вайсковаму гарнізону, а ў 1929 г. – кравецка-сапожнай арцелі “1 Мая” і абутковай фабрыцы. Пазней тут некаторы час размяшчаўся абласны ваенны камісарыят, а ў канцы 1970-х гадоў рэшткі збудавання былі разбураны. Уцалела толькі частка сцяны і фундамента, на якім цяпер стаіць будынак музея этнаграфіі.

Толькі рэшткі сцен засталіся ад былога ***касцёла Св.Казіміра*** (***Фарнага***), які размяшчаўся ў двары цяперашніх АТС і “Белсаюздрука” на вул. Болдзіна. Гэта быў просты 1-нефавы будынак з драўляным купалам, пабудаваны ў 1604 г. Сцены ўнутры былі гладкімі, без архітэктурных упрыгожванняў. Пасля пажару 1810 г., калі ад яго засталіся толькі сцены, быў вельмі сціпла адноўлены і праіснаваў да 1932 г., калі быў зачынены. Да Фарнага касцёла прымыкала мураваная каплічка.

Сцены ***Фарнага касцёла*** сёння – гэта астаткі ***адзінага, самага старога ў Магілёве будынка*** пачатку XVII ст., з яго спецыяльнай цагельнай кладкай і



Касцёл Святога Казіміра

характэрнай для таго часу формай цэглы мясцовых майстроў. Акрамя таго, ***пад былым касцёлам знаходзяцца падземны ход і скляпенні, якія чакаюць разгадкі сваіх таямніц.***

***Цяпер вернемся на Савецкую плошчу.*** Пройдзем у яе заходнюю частку і спынімся за краязнаўчым музеем на краю вала. Перад намі раскінуўся маляўнічы былы ***Задубровенскі пасад,*** у якім сёння дамінуюць тры ***будынкі-помнікі: рамеснае вучылішча*** (зараз машынабудаўнічы каледж), ***Крыжаўздвіжанская царква*** і ***Свята-Крыжаўздзвіжанскі сабор*** (да 1986 года - Свята-Барыса-Глебская царква), ***жаночае епархіяльнае духоўнае вучылішча*** (зараз абласны ліцэй пры МДУ імя А.Куляшова).

***Будынак рамеснага вучылішча*** (на скрыжаванні вуліц Вароўскага і Пляханава, 11/23) пабудаваны ў 1903 г. з чырвонай цэглы, двухпавярховы, прамавугольны ў плане, на высокім цокале, неатынкаваны. Фасады вылучаны цэнтральным і бакавым рызалітамі, завершанымі ступенчатымі атыкамі і ўвенчанымі карнізам з сухарыкамі. Уваход са двара. Першы паверх дэкарыраваны рустам. Вокны першага паверха прамавугольныя з ліштвамі,

другога – паўцыркульныя з арачнымі абрамленнямі. У прасценках – дэкаратыўныя ўстаўкі з цэглы. Помнік ***эклектычнай архітэктуры.***



Будынак былога рамеснага вучылішча

У свой час першай і найбольш буйной яўрэйскай прафесійнай навучальнай установай было якраз гэта ***Магілёўскае яўрэйскае рамеснае вучылішча.*** У 1885 г. яўрэі Магілёўскай губерні стварылі гурток для садзейнічання яўрэйскім хлопчыкам, якія жадалі навучацца рамёствам. У 1889 г. было зацверджана Палажэнне аб рамесным вучылішчы пры магілёўскай талмуд-торы. У 1903 г. яно было ператворана ў самастойную навучальную ўстанову, якая ўтрымлівалася за кошт прыватных ахвяраванняў і субсідый агульнарасійскай яўрэйскай арганізацыі – ***Яўрэйскага каланізацыйнага таварыства.*** Рамеснае вучылішча рыхтавала спецыялістаў па апрацоўцы металу і дрэва, пры ім працавалі курсы для дарослых. Гэта вучылішча ў 1909 годзе закончыў адзін з будучых 26-ці бакінскіх камісараў, ураджэнец г.Чэрыкава ***Меер Басін.***

За Дубравенкай, над Быхаўскім рынкам знаходзяцца ***Крыжаўздзвіжанская царква*** і ***Свята-Крыжаўздзвіжанскі сабор*** (зав. Брусава, 2).



Крыжаўздвіжанская царква.

***Крыжаўздзвіжанская царква*** пабудавана ў XVII ст. з цэглы як аднапавярховы жылы дом, які ў XIX ст. быў перабудаваны пад царкву. Сцены яе ўпрыгожвалі цудоўныя жывапісныя дэкаратыўныя матывы: па сырой тынкоўцы былі прарысаваны раслінныя ўзоры на беларускія народныя матывы (не захаваліся, некалькі год таму назад замаляваны), характэрныя для мясцовай школы дойлідства.

***Свята-Крыжаўздзвіжанскі сабор*** - мураваны, пабудаваны ў 1869 г. побач з ***Крыжаўздзвіжанскай царквой.*** Пяцікупальнае збудаванне, у цэнтры якога купал на масіўным цыліндрычным барабане, а па баках 4 невялікія галоўкі. Абрамленне вокнаў, какошнікі, арнаментальны фрыз, руставаныя пілястры выкананы ў псеўдарускім стылі. Унутры 4-х крыжовыя слупы падтрымліваюць барабан купала. Пры ўваходзе 2 слупы, на якія апіраюцца хоры. Помнік ***архітэктуры эклектыкі.***



Свята-Крыжаўздзвіжанскі сабор

З прыходам Савецкай ўлады царква была зачынена і зноў пачала дзейнічаць ў 1941 г., пасля захопу Магілёва немцамі. Доўгія гады была адзінай у Магілёве дзеючай царквой. У 1970-я гады ў ёй выконваў святарскія абавязкі протаіерэй ***Міхаіл Кузменка,*** вядомы даследчык гісторыі Магілёўскай праваслаўнай епархіі ад гадоў яе утварэння да 1917 г.

Тут знаходзіцца шануемы прыхажанамі і вельмі цікавы па іканаграфіі адзін са спісаў ***Магілёва-Брацкай іконы Божай Маці,*** які можна аднесці да мясцовай інтэрпрэтацыі заходнееўрапейскіх сюжэтаў. На ім прадстаўлена сядзячая выява Багародзіцы, якая павернута ў левы бок. Абедзьвума рукамі яна падтрымоўвае дзіцяці-Хрыста, які стаіць на каленях Божай Маці і абдымае яе за шыю сваёй левай рукой. Галава Багародзіцы пакрыта чаканным галаўным уборам, які нагадвае хустку.

З вышыні вала скрозь кроны дрэў праглядваецца ***будынак былога жаночага епархіяльнага духоўнага вучылішча*** (вул. Вароўскага, 29), пабудаванага ў 1889-92 гг. (арх. ***П.Камбураў*** і ***М.Маркаў***). Трохпавярховы П-падобны ў

плане мураваны будынак стаіць на высокім цокале. Да цэнтральнай часткі далучаны больш кароткія бакавыя карпусы, якія ўтвараюць унутраны



Жаночае епархіальнае духоўнае вучылішча (фрагмент будынку).

дворык. У ім спачатку размяшчалася ***царква,*** злучаная з будынкам крытым пераходам. У бакавых крылах, якія маюць самастойныя ўваходы, знаходзіліся жылыя і гаспадарчыя памяшканні.

Галоўны фасад вырашаны ў простых формах: сцены, пакрытыя дэкаратыўным рустам, завершаны карнізным поясам з сухарыкамі. Вокны першага і трэцяга паверхаў прамавугольныя з ліштвамі, другога – лучковыя, упрыгожаныя сандрыкамі. Цэнтральная частка фасада вылучана рызалітам. Уваход аформлены лучковым сандрыкам. Унутраная планіроўка цэнтральнай часткі – калідорная з двухбаковым размяшчэннем пакояў. На першым паверсе – актавая зала. Помнік ***архітэктуры неакласіцызму.***

***Гісторыя магілёўскага епархіяльнага вучылішча*** пачынаецца ў 1835 - 63 гг., калі тут размяшчаўся прыют, правобраз вучылішча. У 1863 - 1914 гг. вучылішча знаходзіцца пры Буйніцкім манастыры і ў Магілёве. На працягу свайго існавання яно паступова перайшло ад падрыхтоўкі жонак свяшчэнна-царкоўнаслужыцеляў да падрыхтоўкі настаўніц пачатковых школ усіх тыпаў. Вучылішча было разлічана на 200 выхаванак.

У гады апошняй вайны тут размяшчаліся фашысцкае гестапа і турэмныя камеры. Пасля вайны шмат год у будынку знаходзілася абласная школа-інтэрнат № 1, а зараз размяшчаецца абласны ліцэй пры МДУ імя А.Куляшова.

У жыцці любога горада, як і ў біяграфіі чалавека, ёсць свае вехі, якія




Будынак чыгуначнага вакзала пасля рэканструкцыі

вызначаюць яго лёс. Сёння магіляўчане мараць бачыць свой горад утульным і чыстым, прыгожым і зручным для жыцця. Трэба зазначыць, што ў гэтым накірунку многае робіцца. Амаль паўсюдна ў горадзе на прыпынках устаноўлены павільёны з гандлёвымі кіёскамі, прыгожыя і сучасныя. Вядуцца работы па ўкладцы на тратуарах

мелкаштучнай пліткі. Добраўпарадкоўваюцца і азеляняюцца дваровыя тэрыторыі, зроблена падсветка найбольш цікавых у архітэктурных адносінах дамоў у цэнтры горада. Твар Магілёва – гэта яго ***Прывакзальная плошча.***

Пасля рэканструкцыі абноўлены будынкі вакзала, дапоўненыя сучаснымі прыгожымі канструкцыямі, што зрабіла плошчу асабліва элегантнай і індывідуальнай.

Добрая перспектыва чакае найбольш старажытную вуліцу горада – ***Ленінскую***, якая з цягам часу павінна стаць цудоўным месцам для спакойнага адпачынку магіляўчан. Ад ***Савецкай плошчы*** і да ***скверу імя 40 - год Перамогі*** яна стала пешаходнай.

Асноўным акцэнтам горадабудаўніцтва на пр-це Пушкіна стане будаўніцтва новага крытага ***Задняпроўскага рынку*** замест існуючых гарговых радоў. Плануецца, што новы рынак зойме тую ж плошчу, толькі стане вышэй на некалькі паверхаў. Пад адным дахам будуць знаходзіцца гандлёвыя рады і трохузроўневы паркінг для аўтамашын.

У цэнтры горада намечана будаўніцтва культурна-забаўляльных цэнтраў, рэканструкцыя ***Савецкай плошчы*** і аднаўленне на ранейшым месцы ***гарадской ратушы***.

Змяняюцца эпохі і архітэктурныя стылі. Але застаецца праца і талент тых людзей, рукамі якіх усё гэта стваралася. Стагоддзі пакінулі нам выдатныя творы дойлідаў альбо памяць аб іх. Пры рэканструкцыі Магілёва ўзнікаюць праблемы, звязаныя з аховай, рэстаўрацыяй і сучасным выкарыстаннем помнікаў архітэктуры. У нас ёсць цікавыя жыллёвыя, грамадскія і культавыя будынкі розных гістарычных перыядаў, яны вызначаюцца высокімі канструктыўна-планіровачнымі і мастацкімі якасцямі, а таму неабходны асаблівы клопат аб іх.

Сёння нам ёсць што паказаць у сваім горадзе, ёсць аб чым расказаць усім жадаючым і зацікаўленым, і мы з задавальненнем робім гэта.

## *Слоўнік*
### *архітэктурных тэрмінаў, якія сустракаюцца ў тэксце.*
### *(размяшчэнне па парадку ў тэксце)*

| | |
|---|---|
|  | ***Карніз*** — гарызантальны выступ на сцяне, які пдтрымлівае дах будынка і ахоўвае сцяну ад сцёку вады. Мае і дэкаратыўнае значэнне - у выглядзе складанай прафілёўкі, раскрапоўкі пілястрамі і лапаткамі. Характэрны для *стыляў барока, ракако, класіцызму*. |
|  | ***Атык*** — сценка над карнізам, якая завяршае будынак, у выглядзе балюстрады або раскрапаванай лапаткамі і пілястрамі глухой муроўкі са шчытамі, зубчыкамі і інш. Найбольш шырока выкарыстоўваўся ў *архітэктуры Адраджэння, барока і класіцызму*. |
|  | ***Сандрык*** — дэкаратыўная архітэктурная дэталь у выглядзе невялікага прафіляванага (прамавугольнага або выгнутага) карніза над аконным ці дзвярным праёмам на фасадзе будынка. Сустракаецца ў *стылі Рэнесансу* і інш. |
|  | ***Пілястра*** — плоскі вертыкальны прамавугольны ў плане выступ на сцяне або слупе, які паўтарае ўсе часткі і прапорцыі калоны архітэктурнага ордэра. |
|  | ***Ліштва*** — накладная, часам фігурная планка вакол аконнага ці дзвярнога праёма. Асноўныя сродкі аздобы: разьба розных відаў і накладныя прафіляваныя элементы. |
| | ***Анфілада*** — шэраг паслядоўна прылеглых адно да аднаго памяшканняў, дзвярныя праёмы якіх размешчаны на адной восі, таму пры адчыненых дзвярах ствараецца скразная перспектыва ўсіх інтэр'ераў, звязаных у адну архітэктурна-пластычную сістэму. |
|  | ***Крыжова-купальны храм*** — тып хрысціянскага храма. У класічным варыянце мае 4 злучаныя аркамі вертыкальныя апоры, на якія з дапамогай ветразяў апіраецца барабан, перакрыты купалам. Вуглавыя ячэйкі перакрываюцца больш нізкімі скляпеннямі ці купаламі. |
| | ***Ракако*** — архітэктурна-мастацкі стыль XVIII ст., які вылучаўся складанасцю форм і вычурным арнаментам (Францыя). |

| | |
|---|---|
|  | ***Базіліка*** — тып антычнага, потым сярэдневяковага будынка, прамавугольнага ў плане, падзеленага ўздож радамі калон на некалькі нефаў (частак). |
|  | ***Барока*** — вызначальны стыль у еўрапейскім мастацтве кан. XVI — сяр. XVIII ст. Для яго характэрны дынамічнасць кампазіцыі, кантрасты маштабаў, рытмаў, матэрыялаў і фактур, святло-ценевыя і колеравыя эфекты, крываліне́йнасць абрысаў, імкненне стварыць ілюзію бязмежнай прасторы. |
|  | ***Пілон*** — масіўныя слупы, якія служаць апорай арак, перакрыццяў, мастоў, падземных станцый метрапалітэна і інш., або якія стаяць абапал уваходаў ці ўездаў на тэрыторыі палацаў, паркаў і інш. |
|  | ***Арка*** — крывалінейнае перакрыццё праёма ў сцяне ці прасторы паміж 2-ма апорамі-слупамі, калонамі, пілонамі і інш. Найбольш пашыраны паўкруглыя ці паўцыркульныя аркі. Характэрны для *стылю Рэнесансу, барока, класіцызму.* |
|  | ***Мансарда*** — ад прозвішча архітэктара XVII ст. *Ф.Мансара*. Паддашак, памяшканне (пераважна жылое) на гарышчы, кожны схіл даху якога складаецца з 2-х частак — вехняй пакатай і ніжняй стромкай. |
| | ***Франтон*** — частка (звычайна ў выглядзе трохвугольніка) фасада будынка, порціка, каланады, абмежаваная схіламі даху і карнізам. |
|  | ***Фрыз*** — выяўленчая ці дэкаратыўная кампазіцыя ў выглядзе гарызантальнай паласы на верхняй частцы сцяны ўнутры ці звонку будынка, часам аформленая рэльефам, арнаментыкай. |
|  | ***Трыгліф*** — прамавугольная, крыху выцягнутая па вертыкалі пліта з некалькімі жалабкамі. Можа ўтвараць фрыз. |

| | |
|---|---|
|  | ***Барабан*** —цыліндрычная ці шматгранная (звычайна васьмерыковая) верхняя частка будынка, якая апіраецца на сцены, слупы, аркі, ветразі і завяршаецца купалам або шатром. Характэрны для *архітэктуры Адраджэння, барока і класіцызму.* |
|  | ***Іканастас*** — перагародка з абразамі і варотамі паміж асноўнай і алтарнай часткамі інтэр’ера праваслаўнага храма. |
|  | ***Рызаліт*** — частка будынка, якая выступае за лінію фасада на ўсю яго вышыню. Характэрны для *архітэктуры Адраджэння, барока* і *класіцызму* і інш. |
|  | ***Руст*** — спосаб апрацоўкі каменю або імітаванага пад камень матэрыялу, пры якім кожны камень ці яго імітацыя вылучаюцца кантам рознай формы. ***Рустоўка*** — рэльефная муроўка ці дэкаратыўная абліцоўка сцен будынка каменем з грубаабколатай ці выпуклай вонкавай паверхняй. |
|  | ***Скляпенне*** — нясучая прасторавая канструкцыя для перакрыцця ці пакрыцця збудаванняў, якая мае крывалінейную паверхню. Разнавіднасць скляпення - купал. |
|  | ***Галерэя*** — доўгае крытае светлае памяшканне, у якім звычайна адну вонкавую падоўжаную сцяну замяняе каланада або калідор з суцэльнымі аконнымі праёмамі на адным з падоўжаных бакоў будынка. |

| | |
|---|---|
|  | ***Шпіль*** — вертыкальнае востраканцовае завяршэнне будынкаў у выглядзе моцна выцягнутых конуса ці піраміды, часта ўвенчаных сімвалічнай фігурай, сцягам, флюгерам і інш. |
|  | ***Неф*** — прадаўгаватае памяшканне, частка інтэр'ера, абмежаваная з аднаго ці абодвух бакоў радам калон або слупоў. Падзялялася калонамі на галоўны - больш шырокі і высокі - неф і бакавыя нефы. |
|  | ***Апсіда*** — частка культавай пабудовы, паўкруглы ці прамавугольны ў плане выступ будынка з купалападобным верхам ва ўсходняй сцяне храма. У ёй знаходзіцца выява Збавіцеля ці Божай маці, а ў падножжы ставіцца кафедра епіскапа. |
|  | ***Купал*** — пукатае ў выглядзе паўшар'я пакрыццё будынкаў і збудаванняў, якое перакрывае круглыя, шматвугольныя, эліптычныя ў плане памяшканні. |
|  | ***Ярус*** — часткі збудавання, якія канструкцыйна паўтараюцца і размешчаны адна над другой. Звычайна падзяляюцца карнізамі і іншымі архітэктурнымі элементамі. |
|  | ***Ветразь*** — элемент купальнй канструкцыі, які забяспечвае пераход ад квадратнай падкупальнай прасторы да акружнасці купала ці яго барабана. Характэрны для *архітэктуры рэнесансу, барока, класіцызму* і інш. |
|  | ***Сабор*** — галоўны храм горада ці манастыра, дзе праводзіць богаслужэнне вышэйшая асоба (патрыярх, архіепіскап і інш.). ***Кафедральны сабор*** — галоўны храм у епархіі. |

| | |
|---|---|
| | ***Храм*** — культавае збудаванне, прызначанае для выканання рэлігійных абрадаў і грамадскага служэння богу. |
| | ***Царква*** (літар.–*Божы дом)* - культавы будынак, прызначаны для богаслужэння і выканання рэлігійных абрадаў у праваслаўных хрысціян. |
| | ***Манастыр*** — комплекс культавых, жылых будынкаў і дапаможных збудаванняў, размешчаных свабодна на мясцовасці ці згрупаваных у замкнёны ансамбль; месца дзе жывуць абшчыны манахаў ці манашак праваслаўнай веры.<br>***Кляштар*** — каталіцкі манастыр. |
|  | ***Порцік*** — галерэя (звычайна афармляе галоўны ўваход у будынак), якая ўтвараецца калонамі ці слупамі і завяршаецца франтонам ці атыкам. Былі пашыраны ў эпоху *антычнасці, Адраджэння, барока* і асабліва *класіцызму.* |
|  | ***Сухарыкі***— рад невялікіх прамавугольных выступаў (зубчыкаў) на карнізе ў *іанічным* і *карынфскім ордэрах*. |
|  | ***Цокаль*** — ніжняя частка вонкавай сцяны будынка, збудавання, помніка, якая ляжыць на фундаменце. |
|  | ***Карынфскі ордэр*** — адзін з трох асноўных грэчаскіх архітэктурных ордэраў. Больш насычаны варыянт ***іанічнага ордэра.*** Вызначаецца высокай капітэллю, упрыгожанай стылізаванымі лістамі і завіткамі, сухарыкамі. |
|  | ***Іанічны ордэр*** — ствол калоны аздоблены вертыкальнымі жалабкамі, мае круглы складаны профіль, капітэль з *валютамі,* якія прыкрываюць паўавал. |

| | |
|---|---|
|  | ***Дарычны ордэр.*** |
|   | ***Капітэль*** — пластычна вылучаная частка вертыкальнай апоры (слупа ці калоны) або пілястры. |
|  | ***Валюта*** — архітэктурны элемент у форме спіралепадобнага завітка з кружком у цэнтры. Могуць служыць для сувязі частак будынка, упрыгожання парталаў, дзвярэй, вокнаў. |
| | ***Муроўка*** — размяшчэнне камянёў, каменных блокаў, цэглы ў пэўнай сістэме, якая выяўляецца малюнкам швоў на паверхні сцяны. |
| | ***Лапатка*** — вертыкальны выступ на сцяне будынка, элемент рытму і дэкору фасада. |
|  | ***Балюстрада*** — невысокая агароджа лесвіц, тэрас, балконаў, галерэй, парапетаў і інш., якая складаецца з шэрагу фігурных слупкоў (балясаў), злучаных зверху гарызантальнай бэлькай або поручнямі. |
|  | ***Кансоль*** — выступ ў сцяне ці замураваная адным канцом у сцяне бэлька, якая падтрымлівае карніз, балкон, фігуру і інш. |

| | |
|---|---|
|  | ***Атлант*** — апора ў выглядзе мужчынскай статуі, што падтрымлівае перакрыцці будынка, балкона, порціка. |
|  | ***Люнет*** — арачны праём у скляпенні або сцяне, гарызантальна абмежаваны знізу. |
|  | ***Гірлянда*** — арнамент, узор у выглядзе перапляценняў кветак і зеляніны. Як дэкаратыўны элемент выкарыстоўвалася ў афармленні фасадаў будынкаў *архітэктуры Ренесансу, барока і класіцызму.* |
|  | ***Разетка*** — арнаментальны матыў у выглядзе стылізаванай распушчанай кветкі. |
|  | ***Картуш*** — упрыгожанне ў выглядзе дэкаратыўна акаймаванага шчыта, або паўразгорнутага скрутка, на якім адлюстраваны герб, эмблема, надпіс. |
| | ***Ордэр*** — спалучэнне нясучых і нясёных частак стоечна-бэлечнай канструкцыі (каркас), іх структура і мастацкая апрацоўка. |
|  | ***Замок (замковы камень)*** — клінападобныя камень ці цагліна ў вяршыне аркі або скляпення. |
|  | ***Курданёр*** — парадны паўраскрыты двор перад будынкам, утвораны асноўным будынкам і яго двума бакавымі крыламі. |

| | |
|---|---|
|  | ***Люкарна*** – невялікі аконны праём на даху, купальным пакрыцці франтона або шчыта будынка прызначана для частковага асвятлення падкупальнай прасторы і інш. памяшканняў. |
|  | ***Маскарон*** – дэкаратыўны рэльеф у выглядзе чалавечага твару або галавы жывёлы. |
|  | ***Какошнік*** — паўкруглая ці кілепадобная несапраўдная закамара, якая мае дэкаратыўнае значэнне. Характэрны для архітэктур другой паловы XIX — пач. XX ст.ст. псеўдарускага стылю. |
|  | ***Закамара*** — паўкруглае ці кілепадобнае завяршэнне часткі сцяны будынка паміж 2-ма лапаткамі, якое адпавядае форме ўнутранага скляпення. |
|  | ***Партал*** — архітэктурнае абрамленне дзвярнога праёма. |
| | ***Медальён*** — выяўленчая ці арнаментальная кампазіцыя (ляпны або разны рэльеф, размалёўка, мазаіка) у авальным або круглым абрамленні. |
| | ***Рэнесанс (Адраджэнне)*** — эпоха ў развіцці шэрагу краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, пераходная ад сярэдневяковай культуры да культуры новага часу. |

| | |
|---|---|
|  | ***Класіцызм*** — кірунак у еўрапейскай мастацкай культуры другой паловы XVII - пач. XIX ст.ст. Яго сутнасць - у кананізацыі антычнай класікі, як дасканалага ўзору для наследвання. |
| | ***Эклектызм*** — спалучэнне разнастайных мастацкіх элементаў. Узнікае ў перыяд заняпаду буйных мастацкіх кірункаў і выяўляецца ў неадпаведнасці матэрыяльнай асновы архітэктуры ў збудаванні, яго кампазіцыі. Напрыклад, пры запазычанні элементаў архітэктуры мінулых эпох сучасныя жылыя і грамадскія будынкі набываюць выгляд антычных храмаў, палацаў эпохі Адраджэння і інш. На аснове *эклектыкі* зарадзіўся стыль ***мадэрн.*** |

# *ЛІТАРАТУРА,*
## *выкарыстаная пры складанні тэксту экскурсіі.*


1. Агееў А.Р., Марзалюк І.А., Пушкін І.А. “Магілёўская даўніна ў пытаннях і адказах”.- Магілёў, 1997.-191с.: іл.

2. Агееў А.Р., Пушкін І.А. Магілёў на скражаванні.- Магілёў, 2000.

3. Архітэктура Беларусі: Энцыкл.давед. Мн.: БелЭн,1993.-620 с.: іл.

4. Барколабовская летопись. Под ред. Е.Р.Романова.- Вильна: Губ.тип, 1910.- 58с.

5. Барысенка М.С. Школьнае краязнаўства на Магілёўшчыне. Магілёў, 1997.-72с.

6. Барысенка М.С. “Пошук” і патрыятычнае выхаванне. Магілёў, 2000.- 87с.

7. Беларусь: Энцыкл. давед. Мн.: БелЭн,1995.-800с.: іл.

8. Бяспанскі С.І. Паданні Магілёва. //Ратуша.-1991.- №1.(сак.)

9. Грыгаровіч І.І. Беларуская іерархія.-Мн.: БелЭн, 1992.-102с.

10. Грыцкевіч А. Каталіцкі касцёл у Магілёве і на Магілёўшчыне ў XVII – XVIII ст.ст. //“Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва”: Зб.навук.прац.- Магілёў, 2001.-С.78.

11. Ермоленко В. Воспоминания графа П.А.Толстого (1645–1729) о Могилёве. //”Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва”: Зб.навук.прац.- Магілёў.-2001.-С.12.

12. Живописная Россия: Литов. и Бел. Полесье. Репринт. изд.1882.-Мн.: БелЭн,1993.-550с.: илл.

13. Записки игумена Ореста. //Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т.2. -Вильна, 1867.

14. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн.: БелСЭ,1986.-408с.: іл.

15. История Беларуси в документах и материалах. /Авт. сост. Кузнецов И.Н., Мазец В.Г.- Мн.: Амалфея, 2000.-672с.

16. Клімуць Л.Я. Пра роспісы касцёла Св. Станіслава. //”Гісторыя Беларускага Падняпроўя”: Матэрыялы навук. канф. 13-14 лістапада 1997г.- Магілёў, 1997.-С.168-175.

17. Кондратьева Л.Ф. Старая площадь. //V абласныя Магілёўскія краязнаўчыя чытанні (28 кастр. 1993 г.)- Магілёў, 1994.-С.45-54.

18. Копытин В.Ф. Свод памятников археологии чернобыльской зоны Могилёвской области.- Могилёв, 1998.-242с.

19. Копытина О.В. К истории открытия реального училиша в городе Могилёве. //V абласныя Магілёўскія краязнаўчыя чытанні (28 кастр.1993г.).- Магілёў, 1994.-С.74-77

20. Литин А. Синагоги Могилёва. //“Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва”: Зб.навук.прац.- Магілёў, 2001.-С.168-176

21. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі: 2-е выд., дап.- Мн.: ВП ”Экаперспектыва”, 1997.-486с.

22. Магілёўская хроніка Трафіма Раманавіча Сурты і Юрыя Трубніцкага //Полымя.- 1992.- № 7.-С.144-175.

23. Марзалюк І.А. Магілёўскае мінулае. // Ратуша.- 1994.- 2 снеж.

24. Могилёв: Энцикл.справ. Мн.: БелСЭ, 1990.-472с.: илл.

25. Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня. Мн.: ”Навука і тэхніка”, 1993.-414с.: іл.

26. Николаева Т. Икона, спасавшая город. //Могилёв. правда.-2003.-28 февр.

27. Опыт описания Могилёвской губернии. В 3-х кн. Кн. 2. /Под ред. А.С.Дембовецкого.-Могилёв на Днепре, 1884.-1002с.: илл.,карт.

28. Сидоренко Б.И. Древний Могилёв: Очерки истории города в XIV – XVII вв.- Мн., 1997.-150с.: илл.

29. Сидоренко Б.И. Могилёв в третьем тысячелетии. //Весн. Магілёва.- 2003.- 26 февр.

30. Смоліч А. Географія Беларусі.-4-е выд.- Мн.: Беларусь, 1993.-382с.: іл.

31 Страшко Е. Георгій Кониський в історико-культурному процесі України та Білорусі. //“Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва”: Зб.навук.прац.-Магілёў, 2001.

32. Сцяпанава Г. Георгій Каніскі. //Магілёўс. праўда.- 1982.- 3 крас.

33. Сычева Т.М. Из истории Могилёвских храмов. //Магілёўшчына. VII зб.- Магілёў,1997.-С.38-42.

34. Філіповіч І.І. Міфы і праўда аб Магілёве.- Магілёў,1993.-142с.: іл.

35. Чантурия В.А. Архитектурные памятники Белоруссии.- Мн.: Полымя,1982.-224с.: илл.

36. Чарняўская Т.І. Архітэктура Магілёва: З гіст. планіроўкі і забудовы горада.-Мн.: Навука і тэхніка,1973.-96с.: іл.

37. Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва.- Мн.: Навука і тэхніка,1993.-336с.: іл.

38. Щербакова Т.Ю. Краткий топонимический обзор Могилёва. //Магілёўшчына. VI вып.-Магілёў,1995.-С.131-136.

39. Яцкевіч З. Гістарычная спадчына. //Ратуша.-1991.-№1 (сак.).

40. Яцкевіч З. Забыты гонар, альбо з гісторыі адукацыі Магілёва. // Магілёўшчына. 5-ы вып.-Магілёў,1994.-С.31-37.

# *“ ЭКСКУРСІЯ – АГЛЯД ПА СТАРОМУ ГОРАДУ”*
## (Пешаходная экскурсія)

Магілёў размешчаны на абодвух берагах ракі ***Дняпро*** – першай па даўжыні і воднасці ракі Рэспублікі Беларусь. Сам горад і яго наваколле ляжаць на Аршанска-Магілёўскай узвышанай раўніне, раздзеленай ў цэнтральнай часцы глыбокай далінай Дняпра. Далін малых рэк, яроў і лагчын асабліва многа па правым беразе Дняпра паміж вёскамі Палыкавічы і Буйнічы.


Дняпро ў межах горада

Даліна Дняпра ў межах горада мае шырыню 3-5 км., а на поўдні ад яго – да 10 км. Шырыня рэчышча ў сярэднім 90 м., у асобных месцах ад 70 да 80 м. У горадзе ў Дняпро ўпадае дзве ракі: ***Дубравенка*** з прытокам ***р.Струшняй*** і ***Дзебра***. Дубравенка працякае па старой, добра распрацаванай даліне шырынёй да 150 м. Крутыя схілы карэннага берага гэтай ракі ўзнімаюцца на 18-20 м., іх перасякаюць шматлікія яры. Дзебра і Струшня ў межах горада таксама маюць крутыя схілы – у апошняй яны дасягаюць вышыні 25 м. (пры шырыні даліны 5-7 м.).

Азёры ў наваколлі Магілёва амаль адсутнічаюць. Самае большае па плошчы (каля 9 га) - возера ***Святое*** знаходзіцца на паўднёва-заходняй ускраіне горада. У зонах адпачынку пабудаваны штучныя вадаёмы: ***Пашкаўскі*** і ***Пячэрскі*** на р. Дубравенцы, ***Любужскі*** на р. Чорная і ***Вільчыцкі*** на р. Вільчанка. У 2003 годзе закончана будаўніцтва і добраўпарадкаванне новага возера на Дубравенцы побач з пр-там Міру і гасцініцай Магілёў, дзе ствараецца і новая зона для адпачынку гараджан.

***Наша экскурсія пачынаецца ў гістарычным цэнтры Магілёва, на былой Гандлёвай плошчы, каля ўвахода на тэрыторыю некалі існаваўшага замка***. Перш, чым павесці гаворку непасрэдна аб замку, неабходна спыніцца на паходжанні назвы ***“Магілёў”.*** На гэты конт існуе некалькі легенд і паданняў.

Найбольш вядомымі і распаўсюджанымі у літаратуры і сярод магіляўчан з’яўляюцца ***легенды аб разбойніку Машэку***. У адпаведнасці з імі на месцы, дзе стаіць Магілёў, у глыбокай старажытнасці, быў дрымучы непраходны лес. Жыхар сяла лесарубаў і сплаўшчыкаў лесу ***Машэка***, які быў ужо заручаны з нявестай ***Наталкай,*** сплаўляў лес да Кіева. А ў гэты час князь ***Мсціслаўскі,*** з роду Віцебскіх князёў, гвалтоўна схапіў яго нявесту і зрабіў сваёй жонкай. Пасля гэтага Машэка стаў атаманам разбойнікаў, якія бязлітасна рабавалі ўсіх гандляроў-купцоў, вазіўшых тавары па Дняпры. Па легендзе Машэка быў чалавекам незвычайнай сілы, мог з каранямі выдзіраць дрэвы, ён наводзіў жах сваімі разбоямі на акаляючыя сёлы. Аднак непрыступны і грозны для многіх, Машэка стаў ахвярай жаночага каварства.

Урэшце-рэшт, палюючы за князем, які нанёс яму крыўду, ён злавіў яго разам з жонкай, былой сваёй нявестай. Князя павесіў, а Наталку прывёз у свой стан. Але прывыкшая да раскошнага княжага жыцця, яна ноччу, у час сну, забіла Машэку нажом. Месца, дзе яго быццам бы пахавалі, атрымала назву ***"Магіла Льва".***

Па ***другой версіі,*** Машэка быў жорсткім і бязлітасным толькі з багацеямі, а ўсё нарабаванае раздаваў беднякам, якія яго багатварылі і ў знак удзячнасці насыпалі над яго магілай вялікі курган, які сталі называць ***"Магілай Льва".***

Пад уражаннем гэтай легенды ***Янка Купала*** ў 1913 г. напісаў аднайменную паэму, якая была надрукавана ў 1920 годзе (упершыню ў Магілеве паэт пабываў толькі ў 1926 г.) і змяшчала такія радкі:

***Над ёю часам дрэвы палі,***
***І горад вырас, як з зямлі,***
***Яго Магілёвам назвалі,***
***Бо йнакш прыдумаць не маглі...***

Гэта легенда аб Машэку, якім раней бацькі страшылі непаслухмяных дзяцей, была запісана і апублікавана ў XIX ст. магілёўскім краязнаўцам ***М.Падабедам*** і беларускім этнографам ***П.Шэйнам.***

Існуе яшчэ адна разбойніцкая легенда, якую згадвае магілёўскі летапісец ігумен ***Арэст.*** У сваіх "Запісках..." ён адзначае: "По преданию народному известно, что на оном месте, где ныне стоит город Могилёв, в глубокой древности…был стан разбойников, для искоренения коих тогдашним правительством населена жителями деревня и названа ***Могилка*** или ***Могилки,*** потому что место сие наполнено многими могилками побитых людей от разбойников, коих главный атаман назывался ***Могилою.*** Оная деревня Могилка стояла на берегу реки Днепра; место оное ныне населено одними евреями и называется жидовником; там и синагога и школа их стоит (пазней ***Школішча,*** зараз – гарвадаканал). По преданию же народному известно, что онага главнаго атамана разбойническаго Могилы другий товарищ назывался ***Гвоздем*** и имел жилище на том месте, где Богоугодное заведение (зараз гарадская бальніца), от чего место оное до сего времени от всех жителей Могилёвских называется ***Гвоздовкою***". Менавіта па назве вёскі Магілка ці ад імя атамана Магілы і пайшло найменне ***"Магілёў".***

І ўсё ж бліжэй да навуковага тлумачэння паходжанне назвы горада ў ***"Баркулабаўскім летапісу"***: "...место Могилёв заселили люди прихожие..., которые сели за Дубровною, то Буйничане и Голынчане селяне, а также из Радивонкович. Бо первей было село Радивонковичи, а потом Буйничи – старые сёла, давние... Лето 1526 больший замок зароблен, и принято много горы Могилы, на которой теперя замок Могилёв стоит, по на ***горце Могиле, назван Могилёв***".

З'яўленне першых пасяленцаў славян у гэтых месцах адносіцца да IX-XI стагоддзяў. На змену народам племяннога саюза ***балтаў*** сюды прыйшлі славянскія плямёны ***дрыгавічоў*** і ***радзімічаў***, якія каланізавалі сучасную

Магілёўшчыну. Пачалося падзенне ***язычніцтва*** і распаўсюджванне ***хрысціянства***. У выбары месца пасялення людзей тут, як і ў большасці старажытных гарадоў, асноўную ролю адыгралі рэкі. Былы замак знаходзіўся на тэрыторыі сучаснага гарадскога парка імя М.Горкага, куды мы і пяройдзем.

***З высокага вала*** добра бачна неглыбокая звілістая рачулка ***Дубравенка,*** якая ўпадае ў ***Дняпро.*** У старадаўнія часы на яе берагах шумелі густыя цяністыя лясы і дубровы, ад якіх яна і атрымала сваю назву. Рэчка была намнога шырэй і паўнаводней, што рабіла яе значнай воднай перашкодай. На правым беразе Дняпра ўжо існаваў шэраг сельскіх паселішчаў, якія ў XII-XIII ст.ст. дасягнулі свайго росквіту. Заняткі іх былі традыцыйныя: рыбалоўства, бортніцтва, паляванне. Менавіта тут, пры ўпадзенні Дубравенкі ў Дняпро, на ***гары Магіла***, і паўстала паселішча, якое першапачаткова не было ўмацавана. Гэтаму садзейнічалі і прыродныя ўмовы. З боку Дняпра і Дубравенкі паселішча было абаронена высокімі крутымі схіламі, якія спускаліся да вады, а з боку Гандлёвай плошчы – глыбокім ровам. У канцы XI-XII ст.ст. пляцоўка паселішча была абнесена магутным ***земляным валам,*** які па меры неабходнасці падсыпаўся і паднаўляўся. Пазней, магчыма, былі зроблены драўляныя ўмацаванні. Дакладных звестак аб тым, калі быў заложаны Магілёў, у гісторыі няма. Па адной з версій, як згадваецца ў ***Магілёўскай хронікі*** Т.Сурты і Ю.Трубніцкага, ***закладка першага магілёўскага замка адбылася ў 1267 г.*** (сёння гэта афіцыйная дата заснавання Магілёва). К гэтаму часу Магілёў быў ужо цэнтрам феадальнай вотчыны, у якім жыў княжы “муж” – баярын разам са сваімі людзьмі. У замку былі не толькі воіны, але і іх сем’і, слугі і рамеснікі. Не выключана, што ў гэты час замак выконваў таксама функцыі памежнай крэпасці. Апісання гэтага замка, на жаль, не захавалася і лёс яго не вядомы.



Магілёў у XII – XIII ст.ст. Рэканструкцыя В.Камарова.

Першая палова XIII ст. была для Магілёва змрочнай. Археалагічныя крыніцы сведчаць, што ў гэты час ***магілёўскі замак зведаў штурм мангола-татараў***, быў спалены і разрабаваны. Слой пажарышча аддзяляе напластанні першай паловы XIII ст. ад пазнейшых культурных слаёў. У гэтым слоі знойдзены тыповыя мангольскія наканечнікі стрэлаў і пасечаныя рубячай зброяй косткі. Вядома, што беларускія землі пазбеглі мангола-татарскага прыгнёту, аднак некаторыя атрады манголаў дайшлі да асобных гарадоў паўднёва-усходняй Беларусі і разрабавалі іх. Магілёў падзяліў чорны лёс ***Гомеля***, спаленага ў гэты ж час.

Пэўную ролю ў развіцці магілёўскіх пасяленняў і замка адыграў вялікі водны шлях ***“з вараг у грэкі”,*** які звязваў краіны Скандынавіі з

Міжземнамор'ем. Дняпроўскі ўчастак гэтага шляху быў "галоўнай вуліцай" Старажытнарускай дзяржавы. Можна сабе ўявіць, колькі тавараў, каштоўнасцей, іншых багаццяў прайшло па гэтаму шляху за некалькі стагоддзяў і якіх гістарычных дзеячоў, ад князя ***Алега*** да апошняга расійскага імператара ***Мікалая II***, бачыў дняпроўскі замкавы холм за прайшоўшае тысячагоддзе.

Наогул, значэнне ракі ў жыцці нашых далёкіх продкаў немагчыма перабольшыць. Як слушна адзначыў рускі гісторык ***В.В.Ключэўскі,*** чалавек "на реке живал с ней душа в душу. Он любил свою реку, никакой другой стихии своей страны не говорил в песне таких ласковых слов – и было за что. При переселениях река указывала ему путь, при поселении – она его неизменная соседка: он жался к ней, на её берегу…ставил своё жильё, село или деревню. В продолжение значительной части... года она кормила его, для торговца – готовая линия и зимняя ледяная дорога. Не грозила ни бурями, ни подводными камнями: только вовремя поворачивай руль при постоянных капризных извилинах реки, да помни мели, перекаты".

К пачатку XV ст. Магілёў усё больш набываў вядомасць за кошт свайго знаходжання на ***гандлёвых шляхах.*** У 1407 г. тут быў заключаны гандлёвы дагавор паміж полацкімі і рыжскімі купцамі, што дае высновы лічыць Магілёў гандлёвым асяродкам, які меў ужо сваю мытню. У другой палове гэтага стагоддзя горад трывала замацаваў за сабой статус валаснога цэнтра. Гандлёвае жыццё магіляўчанам значна аблягчала наяўнасць шэрагу водных і сухапутных шляхоў, якія звязвалі горад з іншымі гандлёвымі цэнтрамі Княства. Сухапутныя шляхі выбіраліся часцей, бо карыстанне рэкамі для транпартыроўкі тавара было больш рызыкоўным і небяспечным. Гандляр мог ўбачыць перад сабой ланцуг, нацягнуты над паверхняй ракі мытнікам ці рабаўнікамі, абмінуць які без уплаты падатку было немагчыма.

Наогул, ***пра Магілёў XIII ст. звестак*** захавалася ***вельмі мала.*** Нягледзячы на тое, што асноўная хваля мангола-татарскага нашэсця мінула, вынікі яго адчуваліся і на Верхнім Дняпры. Парушыўся тавараабмен, апусцелі традыцыйныя гандлёвыя шляхі, археалагічныя раскопкі сведчаць пра малаінтэнсіўнае жыццё горада-пасялення. Паступова адбываецца засяленне Старога горада (ад Савецкай плошчы да Тэатральнага сквера) і Падміколля. Фрагментарна вядома, што ў гэты час ён уваходзіў у склад Віцебскага княства, а з XVI ст.- Вялікіга княства Літоўскага і належыў па чарзе польскай каралеве ***Ядвізе***, вялікаму князю ***Свідрыгайлу,*** жонцы караля і вялікага князя Аляксандра Казіміравіча **-** ***Алене Іванаўне***. У 1514 г. разам з замкам і воласцю перададзены ва ўтрыманне пану ***Юрыю Зяновічу***, а потым стаў цэнтрам сталовай эканоміі.

Толькі з XVI ст. пачынаецца хуткі эканамічны рост Магілёва, павялічваецца колькасць яго насельніцтва. Парубежнае палажэнне горада і пазнейшая страта ВКЛ Смаленска садзейнічалі таму, што каралеўская ўлада княства вымушана была пачаць замкавае будаўніцтва. Ужо ў чэрвені 1520 г. смаленскі намеснік ***Іван Шуйскі*** паведамляў у Маскву, што "...из Смоленска были казаки в могилёвских местах, ...их государь король свою украину велел

укрепить и гораздо ...”. К 1523 г. у магілёўскім замку ўжо размяшчаўся гарнізон з 300 наёмных “драбаў” пад камандаваннем ***Шторца.*** У 1526 г., як паведамляе ***Баркулабаўскі летапіс,*** у Магілёве “... большой замок зароблен и принято много горы Могилы, на которой теперя замок Могилёв стоит”. Гэтую дату называе і ***Магілёўская хроніка.*** Новыя ўмацаванні ў Магілёве ператварылі яго ў магутную крэпасць на верхнім Дняпры і разам з будаўніцтвам і ўмацаваннем замкаў у другіх дняпроўскіх гарадах дазволілі да 30-х гадоў XVI ст. аб’яднаць старыя і новыя крэпасці ў адзіны ланцуг, што ў значнай ступені перашкаджала наступальным дзеянням і прасоўванню маскоўскага войска ў цэнтральныя раёны ВКЛ.



Знешні выгляд Магілёўскага замка.
(Рэканструкцыя па інвентару 1604 г.
І. І. Філіповіча. Мастак Н. В. Малчанаў).

Месцам для ***новага замка*** была выбрана зручная ў тактычных адносінах пляцоўка на месцы старога (XIII ст.) замка пры зліцці Дубравенкі з Дняпром, з высокімі і стромкімі схіламі, плошчай больш за 1 га. (апісанне замка гл. у раздзеле “Архітэктурная спадчына Магілёва”). Абавязкі па ўзвядзенню замкавых умацаванняў выконвалі гараджане і жыхары воласці. На сценах і вежах размяшчаліся баявыя пляцоўкі, з якіх у час штурму на галовы непрыяцеля скідваліся камні, бярвенні, выліваласяя гарачая смала.

Перад замкам, у падножжы гары Магіла, каля ўпадзення Дубравенкі ў Дняпро, знаходзіўся бровар для варкі піва і гарэлкі, саладоўня і баня. Зараз на гэтым месцы пабудавана аўтазаправачная станцыя.

***20 лютага 1561 г.***Магілёву паводле ўстаўной граматы ***Жыгімонта ІІ Аўгуста*** дадзена права на абмежаванае самакіраванне – ***войтаўства (Малое Магдэбургскае права),*** згодна з якім гараджане вызваляліся ад нясення аднолькавых з сялянамі воласці павіннасцей, але заставаліся залежнымі ад замкавай адміністрацыі. ***Войт*** прызначаўся каралём, а яму ў дапамогу, з ліку найбольш заможных і уплывовых гараджан, выбіраліся ***4 сотнікі***. У межах сваіх “соцень” яны назіралі за выкананнем устаноўленнага парадку і дакладвалі аб усіх парушэннях войту і замкавай адміністрацыі. Па рашэнню войтаўства гараджане працавалі на гарадскіх і замкавых умацаваннях, пабудавалі вадзяны млын на Дубравенцы, выдзялялі з свайго ліку і ўтрымлівалі чатырох вартавых для замка. Кожны жыхар горада абавязаны быў “для обороны земское в час небеспечности от неприятеля иметь различное вооружение…, от гаковницы до рогатины, согласно своих возможностей”. Ім дазваляўся ўезд у каралеўскую пушчу на адлегласць 2-х міль ад горада для нарыхтоўкі дроў і дрэва для пабудоў. У мэтах ажыўлення гандлю яны маглі скупляць у сёлах воласці тавары для продажу на гарадскім рынку. Сельскія і гарадскія землі былі вымераны і падзелены на валокі (21,3 га) і моргі (0,71 га), за якія была ўстаноўлена цвёрдая аплата на карысць ***замкавай адміністрацыі.***

***11 ліпеня 1569 г.*** на сейме ў Любліне быў падпісаны акт аб'яднання Вялікага княства Літоўскага і Польшчы ў адну агульную федэратыўную дзяржаву – ***Рэч Паспалітую*** на чале з польскім каралём ***(Люблінская унія).*** З гэтага часу ВКЛ з пражываўшым на яго тэрыторыі беларускім насельніцтвам перастала існаваць як самастойная дзяржава. Засталася толькі ранейшая яго назва.



Стэфан Баторы.

У 1576 г. польскім каралём быў абраны ***Стэфан (Стафан) Баторы***, які, улічваючы шматлікія скаргі магілёўскіх гараджан на прыгнёт і беззаконне, учыняемыя з боку замкавай адміністрацыі, сваім прывілеем ад ***28 студзеня 1577 г. надаў Магілёву Вялікае Магдэбургскае права.***

Магдэбургскае права ўпершыню склалася ў XIII ст. у нямецкім горадзе ***Магдэбургу.*** Адпаведнымі актамі яно рэгулявала эканамічныя і маёмасныя правы, грамадска-палітычнае жыццё і саслоўнае палажэнне насельніцтва. ***Сутнасць Магдэбургскага права – поўнае юрыдычнае і фактычнае самакіраванне.*** Горад і яго насельніцтва выводзіліся з адміністрацыйнага і судзебнага падпарадкавання замкавай ці іншай адміністрацыі. Выбраны з свайго асяродку орган гарадскога і судзебнага кіравання – ***магістрат*** у сваіх дзеяннях і рашэннях быў падпарадкаваны толькі каралю. На чале магістрата стаяў прызначаны каралём ***войт,*** якому ў дапамогу зацвярджаўся намеснік – ***лендвойт,*** выбраны з мясцовых гараджан. На Магілёўшчыне Магдэбургскае права атрымалі ***Чавусы*** (1634 г.), ***Мсціслаў*** (1636 г.), ***Чэрыкаў*** ( 1641 г.), а таксама ***Быхаў, Бабруйск, Крычаў.***

У адпаведнасці з правам на самакіраванне Магілёў атрымаў і герб. Наогул, за сваю гісторыю абласны цэнтр меў ***3 гербы***. Па прывілею ад 28 студзеня 1577 г. караля Польскага і вялікага князя Літоўскага Стэфана



Герб Магілёва 1661 г.

Баторыя на самакіраванне Магілёву быў пажалаваны ***першы афіцыйны герб – "у блакітным полі вежа мураваная высока выведзеная".*** Пячаткай з падобнай выявай і подпісам "Печать места Могилёвского" завяраліся дакументы гарадской канцылярыі пры магістраце, яна ж ставілася на вырабы мясцовых рамеснікаў як своеасаблівы "знак якасці".

***Другі герб*** Магілёў атрымаў па грамаце караля Яна Казіміра 9 чэрвеня 1661 г. –***"у блакітным полі тры сярэбраныя вежы, у адкрытых варотах сярэдняй – рыцар, узброены мячом, зверху над варотамі, на круглым чырвоным шчыце – узброены коннік з мячом і шчытом".*** Гэты варыянт герба, як паказала гісторыя, стаў сёння сапраўдным гарадскім сімвалам, звычным і пазнаваемым.

Пасля далучэння ўсходняй часткі тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі ў 1772 годзе выява "Пагоні" (коннік) у магілёўскім гербе была заменена двухгаловым арлом. Але ў такім выглядзе герб праіснаваў параўнальна нядоўга. 16 жніўня 1781 г. быў "высочайше утверждён" новы ***магілёўскі герб – "у верхняй частцы шчыта палавіна Расійскага герба, у знак таго, што гэта Намесніцтва далучана да Імперыі Расійскай. У ніжняй – стары герб: коннік на кані ў чырвоным полі".***



Герб Магілёва
1781 года

У 1990-х гг. ***Магілёўскі гарвыканкам*** узнавіў і ***зацвердзіў герб 1661 г.***, бо вядома, чым старажытней герб, тым багацей закладзены ў ім інфармацыйны і духоўны патэнцыял.

У інтарэсах далейшага развіцця гандлю горад абавязаны быў пабудаваць лаўкі і каморы для захавання тавараў, а таксама "гасціны дом" для прыезжых купецкіх людзей. З налогавых паступленняў гараджане абавязаны былі ўзвесці ратушу і школу, утрымліваць у належным стане масты, дарогі, гарадскія ўмацаванні, а ў час ваеннай небяспекі "другие замковые и городские работы полнити". Усе пражываючыя ў горадзе княжыцкія, шляхецкія, духоўныя і свецкія саслоўі, купецкі і рамесніцкі люд у прадмесцях, у выпадку ўвядзення вярхоўнай уладай падаткаў, абавязаны былі выконваць іх нароўні з усімі другімі месцічамі "безо всякого сопротивления и отговорок". Магілёўскі летапісец ***Трафім Сурта*** наконт гэтай падзеі запісаў: " В этом 1578 году город Могилёв начал судиться правом Магдэбургским, которое и теперь употребляем". Пасяджэнні магістрата адбываліся ў ратушы, куды яго члены збіраліся па ратушнаму звону. Права на самакіраванне значна ажывіла жыццё гараджан. У гэты час гарадскія кварталы ўзнікаюць за Дняпром і Дубравенкай. Каля гарадской брамы ў Старым горадзе ў 1578 годзе будуецца першая драўляная ратуша, а на гарадскіх вуліцах з'яўляецца каменны брук.

У 1633 г. ***Магілёўскі замак*** моцна пацярпеў ад пажару і амаль цалкам ***згарэў***. Новы ўладальнік Магілёва гетман ВКЛ ***Крыштоф II Радзівіл*** загадаў замест былых драўляных замкавых сцен і вежаў з боку Дняпра, Дубравенкі і Гандлёвай плошчы зрабіць ***агароджу з*** тоўстых, завостраных зверху ***6-мятровых бярвенняў.*** Знутры размяшчаліся памосты для абаронцаў замка, а таксама байніцы для ніжняга і сярэдняга бою. Былі пабудаваны новыя жылыя, службовыя і падсобныя памяшканні, замак працягваў служыць апорным і абарончым пунктам, у тым ліку і як цэнтр забеспячэння войск Рэчы Паспалітай порахам і боепрыпасамі ў вайне з рускімі войскамі за авалоданне Смаленскам.

Гарнізон складаўся з 8 пушкароў падатнага насельніцтва сёл. Яны абавязаны былі, разам з жыхарамі, абараняць замак падчас небяспекі, утрымліваць у спраўным стане замкавае ўзбраенне, парахавы пограб і

адліваць кулі. За гэта іх зямельныя надзелы вызваляліся ад падаткавага абкладання.



Кацярына I. Партрэт 1717 г. Ж.М. Нацье.

Па легендзе, у 1706 г. у Магілёўскім замку знаходзілася ўзятая ў палон служанка марыенбургскага пастыра ***Марыя Скаўронская,*** будучая жонка Пятра I і ***імператрыца Кацярына I.*** У час Паўночнай вайны 1706-1708 гг.у замку бывалі многія вядомыя рускія ваеначальнікі і дзяржаўныя дзеячы, сярод якіх ***Меншыкаў, Брус, Баўэр, Галаўнін, Рэпнін, Даўгарукі*** і інш.

З другой паловы XVII ст. замак страчвае сваё абарончае значэнне і да сярэдзіны XVIII ст. застаецца адміністрацыйна-гаспадарчым цэнтрам Магілёўскай каралеўскай сталовай эканоміі, пасля чаго паступова прыходзіць у заняпад, на яго тэрыторыі з'яўляюцца агароды жыхароў. Пасля першага падзелу Польшчы ў 1772 г. Магілёў і навакольныя землі ўвайшлі ў склад Расіі. Замак страціў былое сваё адміністрацыйнае значэнне, а размешчаныя на яго тэрыторыі старыя трухлявыя пабудовы згарэлі падчас пажару 1778 г. Да сярэдзіны XIX ст. тут яшчэ захоўваліся земляныя ўмацаванні. У 1872 г. ***на былым замчышчы*** па ініцыятыве губернатара А.Дамбавецкага ***быў закладзены гарадскі парк,*** які да рэвалюцыі 1917 г. насіў яго імя.

У час будаўніцтва новага ўезда ў старую частку горада (ранейшы знаходзіўся на месцы цяперашняй лесвіцы – спуску з Савецкай плошчы на вул.Чалюскінцаў) у 1950-х гадах частка замкавай тэрыторыі з боку Дняпра і вусця Дубравенкі была зрыта.

З былой паўнаводнай і судаходнай (баржы даходзілі да цяперашняга Палаца школьнікаў) ***р.Дубравенкай*** звязана і блізкая да нас ***трагічная старонка з гісторыі горада***. Падчас баёў за горад у ліпені 1941 г. нашы войскі ўзарвалі чыгуначны мост праз Дубравенку. Заняўшыя горад немцы ўзнаўляць мост не сталі, а паклалі пад насып чыгункі жалезабетонную трубу, пусціўшы праз яе раку. Летам сячэнне трубы для пропуску вады было дастаткова, але ў канцы сакавіка 1942 г., калі рака выйшла з берагоў і забіла павадкавым смеццем трубу, ад чыгуначнага насыпу да Пячэрска ўтварылася вялізнае возера. Пясчаны насып не вытрымаў ціску вады і 10 красавіка бурлівы вал вышынёй 4-5 м., змятаючы ўсё на сваім шляху – людзей, жывёлу, дамы – панёс вірлівым вадаваротам па рэчышчы ракі ўсё гэта ў Дняпро. Ад маста каля Быхаўскага рынку і мураванага будынку лазні, у якой знаходзіліся людзі, не засталося і следа. Наогул, амаль усе дамы па берагах ракі былі знесены патокам вады, а некалькі з іх занесены і пастаўлены высока на адхіле яе правага берага. Па ўспамінах відавочцаў здарэння, ***тут загінула некалькі соцен чалавек***, у тым ліку аўтамашына з немцамі.

***Да парку прымыкае былая Гандлёвая плошча***, узнікненне якой у Магілёве адносіцца к пачатку XIII ст. Па дадзеных 1604 г. плошча "этого

торгового пляца была моргов три и прутов двадцать (26 485 кв.м.), на котором пляцу мещане к великой небеспечности замка, почти под его стены вместо шанцев свои лавки числом 240 побудовали…” (падрабязна аб Гандлёвай плошчы гл. у раздзеле “Архітэктурная спадчына Магілёва”).

Знаходзячыся на скрыжаванні водных і сухапутных шляхоў, Магілёў шмат цярпеў у час войнаў. ***Лівонская вайна*** (1558-1583), уцягнуўшая ў сябе ўсе буйныя дзяржавы Усходняй і Паўночнай Еўропы, ***не абышла бокам і Магілёў.*** На яе заключным этапе горад на кароткі час аказаўся ў цэнтры ўвагі праціборствуючых бакоў.



Магілёў 27 чэрвеня 1581 г. Рэканструкцыя В.Камарова.

У чэрвені 1581 г. рускія войскі ўвайшлі ў межы Вялікага княства Літоўскага. Войска ўключала ў сябе стральцоў, казакаў, татар, агульная колькасць якіх па розных дадзеных складала ад 20 да 45 тысяч чалавек. Сярод казакоў у гэтым паходзе, на чале волжскай казацкай флаціліі, ўдзельнічаў і ***Ермак Цімафеевіч–будучы заваёўнік Сібіры.*** Частка казакоў са стральцамі знаходзілася ў стругах, а частка іх, разам з татарскай конніцай, рухалася берагам. Флацілія ішла ўперадзе войска, артылерыйскімі залпамі ачышчаючы бераг і забяспечваючы пераправу галоўным сілам.

27 чэрвеня 1581 г. казацкая флацілія з’явілася пад сценамі Магілёва, а за ёю на берагах Дняпра і коннае войска. Магілёўскі войт ***Марцін Стравінскі*** вырашыў даць бой перад гарадскімі ўмацаваннямі. Тры кавалерыйскія роты спрабавалі адбіць націск казакоў, але з падходам іх дапамогі былі адціснуты за гарадскія сцены. Рускае войска пачало разбураць гарадскія прадмесці. “ ...сожгли предместья, за Дубровной ... также сожгли 6 домов, в посаде над Днепром, который называют слободой, тоже сожгли до 100 домов”, - пісаў Стравінскі пазней каралю.

На працягу дня казакі, татары і стральцы штурмавалі гарадскія ўмацаванні, аднак узяць ні замка, ні ўмацаваную частку горада не змаглі. Рускія “… целый день … нападая со всею силою, стараясь прорваться к городскому укреплению, желая сжечь острог, от чего мы их с Божьей помощью удерживали огнём из замка и из острога и не допускали до этого … так, что с помощью Божьей и счастьем Вашего Королевского Величества, спаливши в … предместье несколько сот домов, людям не причинили никакого вреда …, а потерпели большой урон в своих людях, как от огня из замка, так и из городского острога, в тот же день при заходе солнца поспешно удалились из города к деревне … Баторке, в полутора милях от города лежащей на берегу Днепра, а там … тотчас же сделали для главных воевод несколько плотов, сами все пошли вплавь и в ту же ночь …переправились через Днепр и в час уже дня распустили людей в

окрестности и начали жечь деревни, направляясь к Радомлю и Мстиславлю …”, - працягваў Стравінскі ў тым жа пісьме.

У выніку баявых дзеянняў ***Магілёў быў разбураны,*** частка дамоў спалена. Рускія войскі панеслі значныя страты і вымушаны былі адысці.

Дасталося гораду і падчас рабаўнічых казацка-сялянскіх войнаў. У 1588 г. сюды наведаўся атаман ***Мацюша Гультай***, які захапіў горад і добра пажывіўся тут, прычыніўшы жыхарам “многия обиды и убытки”.

У снежні 1595 г. Магілёў занялі прышоўшыя з Запарожскай Сечы казакі атамана ***Севярына Налівайкі,*** якія 2 тыдні рабавалі і разбуралі яго. Калі казакі, якія размяшчаліся на гары ***Ільінка,*** даведаліся, што да горада падыходзіць 18-ці тысячнае войска рэчыцкага старасты ***Буйвіда,*** яны падпалілі горад і пакінулі яго. Пасля бою на Буйніцкім полі казацкае войска (1500–2000 чал.) было рассеяна і адышло на поўдзень. У 1596 г. Севярын Нілівайка быў выдадзены здраднікам, а 21 красавіка 1597 г. пакараны смерцю ў Варшаве. Падчас знаходжання ў Магілёве казакі спалілі большую частку горада, у т.л. цэрквы ***Іллі-прарока, Успення Багародзіцы, Раства Багародзіцы, Св.Мікалая, Узнясення Хрыстова, Св.Троіцы, Козьмы*** і ***Дзям’яна,*** разрабавалі “домы и маетности шляхетские”, крамы багатых купцоў, разбурылі гарадскую турму.

Разам з тым, нягледзячы на ўсе гэтыя знясільваючыя гараджан катаклізмы, Магілёў перажываў эканамічны ўздым. ***У XVII ст.*** у выніку далейшага развіцця гандлю і рамеснай вытворчасці ***горад стаў адным з буйнейшых у Вялікім княстве Літоўскім***. Рамеснікі Магілёва мелі каля 40 розных спецыяльнасцей: кавалі, гарбары, ювеліры, слесары, шубнікі, мяснікі, фарбавальшчыкі, саладоўнікі, пушкары і інш. Калі ў 1577 г. у горадзе налічвалася 1261 дом, 6500 жыхароў і 157 крам, то ў 1640 г. ужо 2211 дамоў, 15000 жыхароў і 400 крам.

На ***гарадскім рынку***, ***на месцы якога мы зараз знаходзімся,*** віраваў гандаль, якім пераважна займаліся купцы (да 30% гарадскога насельніцтва). На плошчы каля 2-х гектараў размяшчаліся драўляныя і мураваныя лаўкі заможных рамеснікаў і купцоў. Лаўкі былі пабудаваны ў гандлёвых радах па найменням тавараў. Тут можна было купіць усё, у чым мелі патрэбу гараджане. У гандлёвы дзень – пятніцу – сяляне з навакольных вёсак везлі на рынак мёд, мяса, сала, зерне, агародніну, дровы, смалу, пяньку і інш. тавары. Два разы ў год, на ***св.Іллю ў ліпені*** і на ***св.Стэфана Баторыя ў лістападзе***, ладзіліся ***гарадскія кірмашы.***


Герб Магілёўскага купецкага брацтва.

У 1636 г. было створана ***купецкае брацтва,*** з дапамогай якога найбольш заможныя купцы хацелі дасягнуць пануючага становішча на рынку. У гэты час яны гандлявалі больш як з 60-ю гарадамі. Магілёўскія купцы мелі свае крамы ў ***Шклове, Бабры, Талачыне, Бабруйску, Крычаве, Гомелі*** і інш. месцах, а

праз Балтыйскія порты гандлявалі з краінамі ***Заходняй Еўропы,*** дзе мелі свае кватэры і факторыі. Падтрымліваўся гандаль з ***Малдавіяй і Канстанцінопалем.*** Асноўная частка рамеснікаў аб'ядналася ў ***рамесныя цэхі,*** якія вялі барацьбу супраць канкурэнтаў, не ўваходзіўшых у гэтыя арганізацыі.



Паўстанне рамеснікаў Магілёва ў 1606 г.
З карціны М.І. Манасзона і М.З. Беляніцкага

У 1606-1610 гг. у горадзе адбыліся ***паўстанні рамеснікаў і гарадской беднаты*** супраць злоўжыванняў і хабарніцтва членаў магістрата. Паўстаўшыя гараджане (паўстанне пачалося на Гандлёвай плошчы ў 1606 г. на чале з ***С.Мітковічам***) замест заможных людзей выбралі ў склад магістрата людзей свайго асяроддзя, якія раней падвяргаліся пакаранням з боку ўлад. Як адзначаецца ў ***"Живописной России"***: "... жители взбунтовались против своего магистрата, завладели вечевым колоколом и стали управлять самовольно (амаль 4 гады – Б.М.). Войтом был тогда ***Ярош Волович.*** Он жаловался королю, по велению которого, после произведённого следствия, казнены пять человек зачинщиков ... 23 июля (1610 г.) на Ильинской горе". Маёмасць усіх асуджаных была канфіскавана.

Галоўную частку насельніцтва горада складалі ***мяшчане.*** Двор месціча ўключаў у сябе хату, надворныя пабудовы, вароты з брамай. Дом звычайна падзяляўся на чыстую палавіну – святліцу і рабочую хату з каморай. На падворку стаялі свіран, хлявы, павеці і абавязкова баня. Усе будынкі былі драўляныя, таму ў Магілёве неаднаразова здараліся знішчальныя пажары. Каля дома знаходзіўся агарод і сад. Звычайна на ўскраіне горада большасць гараджан мела другі агарод ці луг. Пры першай магчымасці кожная сям'я імкнулася прыдбаць дадатковы кавалак зямлі, "бо яна не гарыць і не тоне", як казалі магіляўчане. Дом, агарод, сенажаці, жывёла, рамесныя прылады працы былі галоўным багаццем мяшчан.

Натуральна, што ў вядзенні гаспадаркі не абыходзілася без асаблівасцей і павер'яў. Большасць мяшчан не трымала каней, бо лічылі, што ***"зімой конь каня з'есць".*** Меркавалі, што больш выгадна купіць каня ў Чавусах ці Шклове, адпрацаваць на ім лета, а восенню прадаць. Мяшчане трымалі кароў, частку малака прадавалі, пры гэтым у малако дабаўлялі вады, інакш карова "не будзе здарова". Існавала таксама павер'е, што залішняя хвала спажыўцом малака магла ссурочыць жывёліну. Кожны гаспадар меў пад павеццю сані, калёсы, збрую, а ў падполлі - бочкі , кадкі, цэбры і інш.

Нельга не адзначыць вялікую ***ашчаднасць і нават скупасць магіляўчан***. Яны заўсёды прыхоўвалі грошы на чорны дзень. Прадаўшы тавар ніколі не гаварылі яго сапраўдны кошт, заўсёды яго памяншалі, розніцу прыхоўвалі. Здаралася, што пасля смерці каго-небудзь з гаспадароў у хаце, ў розных

месцах, знаходзілі прыхаваныя грошы, іншы раз – у латках старога адзення, якое было выкінута ці аддадзена жабракам. У выніку часта здараліся смешныя выпадкі. У ***адной бабулі*** скралі частку рэчаў і адзення. Раніцай прапажа была выяўлена і злодзея знайшлі. Але ніякіх каштоўных рэчаў у яго не было. Аднак жанчына, убачыўшы старую куртку са шматлікімі латкамі, вельмі ўзрадавалася і, к вялікаму здзіўленню акружаючых, дастала з-пад латы грошы.

***Другая гараджанка*** запрасіла ў дом жабрака, каб пакарміць яго. Убачыўшы, што той без галаўнога ўбора, аддала яму старую шапку мужа. На вуліцы жабрака сустрэў гаспадар і пазнаў сваю шапку. “Дзе ты ўзяў гэту шапку?”–спытаў ён жабрака. “Твая гаспадыня падаравала”,–адказаў старац. “Вось дурная баба – кажа гаспадар – летам дорыць зімовую шапку, на лепей маю”. Ён аддае жабраку свой новы картуз і паспешна забірае старую шапку. Вярнуўшыся дамоў, збівае жонку за тое, што яна раздае яго рэчы. Гаспадыня апраўдваецца, што шапка старая і нічога не каштуе. У адказ муж раздзірае шапку і, на здзіўленне жонкі, дастае з яе грошы.

Жыццёвыя звычаі гараджан рэгуляваліся царкоўнымі канонамі і прадпісаннямі, якія строга і старанна выконваліся. У вялікі пост, напрыклад, магілёўскія мяшчане адпраўляліся на ***багамолле ў Кіеў.*** Група з 15–20 чалавек дабіралася туды за тыдзень і гавела ў ***Кіева-Пячэрскай лаўры***. Там багамольцы набывалі царкоўныя кнігі, абразы, крыжы. У горадзе цяжка было знайці сям’ю, якая б не ўдзельнічала ў такіх вандроўках. Мяшчане пасціліся вельмі строга, нават у часы халерных эпідэмій у Магілёве, калі духавенства дазваляла спажываць мясную ежу. “Лепш памру, але не нарушу святога посту”, – гаварылі яны.

У час святаў па вуліцах горада на Гандлёвую плошчу ішлі калоны рамеснікаў з кожнага цэха. Вельмі шырока святкавалі ***Вадохрышча, Каляды, Вербную нядзелю, Радаўніцу, Святы Спас, Дзяды*** восеньскія і інш. Святы праводзіліся багата. Перад кожным з іх абавязкова падмяталіся вуліцы і падтрымлівалася чысціня ў хатах. ***І праваслаўныя, і рыма-каталіцкія святы былі агульнагарадскімі***, на працягу іх забаранялася працаваць.

Зусім іншыя адносіны былі да людзей, што сталі на шлях ***злачынства*** – крадзяжу і забойства. Следства вялося жорстка, шырока ўжываліся катаванні. Звычайна катавалі пры дапамозе раскалёнай жалезнай “шыны”. Прычым, неістотнай была сама скрадзеная сума альбо каштоўнасць рэчы. На “муку” бралі нават злодзея, скраўшага кажух. ***Смяротная кара чакала практычна ўсіх злачынцаў, якія пакваліліся на чужую ўласнасць***. Забойцам адсякалі галаву ў ганебнага слупа побач з ратушай. Аднаму з іх у 1651 г. спачатку адсеклі руку і прыбілі яе да слупа, а толькі потым адсеклі галаву. Калі горад ахутвала ноч, гараджане не рызыкавалі выходзіць з дому. Толькі гарадскія вартавыя хадзілі ў гэты час па ціхіх вуліцах. Увечары імкнуліся не адчыняць на грук дзверы. Былі пільнымі, бо ноч – час для злодзеяў ды “штукарстваў д’ябальскіх”.

Сур’ёзнай справай у месцічаў было ***вяселле.*** Хлопцу, які збіраўся жаніцца, будавалі двор, дзяўчыне збіралі пасаг. Рабілі гэта для таго, каб

маладыя адразу станавіліся на ўласную гаспадарку. Да жаніцьбы бацькі маладых складалі шлюбны кантракт, дзе агаворвалі ўсе пытанні вяселля і далейшага жыцця маладых. Даследчыкі мінулага вылучылі ***агульныя рысы магілёўскіх мяшчан – набожнасць, працалюбівасць, ашчаднасць, п'янства, недахоп адукацыі***. Вельмі абразлівым у іх асяроддзі было слова “гультай”.

У сувязі з Брэсцкай царкоўнай уніяй 1596 г., якая аб'яднала праваслаўную і каталіцкую царквы, на Беларусі абвастрылася рэлігійна-палітычная барацьба. Своеасаблівай яе формай былі ***праваслаўныя брацтвы***, куды ўваходзілі пераважна рамеснікі, гандляры, а таксама духавенства і шляхта.

***Брацтва кушняроў Магілёва, створанае ў 1589 г., было адным з першых на Беларусі.*** Вядомы брацтвы пры цэрквах Святога Спаса, Ушэсця, Праабражэнскай, Богаяўленскай і Крыжаўздвіжанскай. Статут брацтваў прадугледжваў збор узносаў, сумеснае святкаванне Каляд, адпраўленне набажэнстваў 4 разы на тыдзень, раздачу міласціны, аказанне дапамогі абяднелым “братчыкам”, стварэнне школ. У Магілёве першая брацкая школа ўзнікла ў 1590-я гады і размяшчалася ў Богаяўленскім манастыры, а з сярэдзіны XVIII ст. была пераўтворана ў духоўную семінарыю.



Герб Магілёўскіх седляроў і шубнікаў

Пасля 1772 г., калі Магілёў увайшоў у склад Расіі, плошча стала адміністрацыйным цэнтрам горада і атрымала назву ***Губернатарскай.*** На ёй былі пабудаваны 4 новыя адміністрацыйныя будынкі ( гл. раздзел “Архітэктурная спадчына Магілёва”), да нашых дзен захаваліся толькі два – цяперашні краязнаўчы музей ( кан. XVIII ст.) і дом былой губернскай управы ( другая палова XIX ст.) – зараз на рэстаўрацыі. Гэтыя будынкі, як і ўся плошча, непарыўна звязаны з падзеямі Першай Сусветнай вайны, рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай (1941-45 гг.) войнаў.



Мікалай II (у цэнтры) з прадстаўнікамі Антанты. Стаўка 1915 г.

У час Першай Сусветнай вайны, ў сувязі з перамяшчэннем баявых дзеянняў на ўсход, з Баранавіч у Магілёў была перанесена ***Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання рускай арміі.*** 7 жніўня 1915 г. сюды прыбыў поезд галоўнакамандуючага - вялікага князя ***Мікалая Мікалаевіча Раманава*** са штабам, а з 23 жніўня г.г. абавязкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве прыняў на сябе імператар ***Мікалай II.*** Стаўка размясцілася на Губернатарскай плошчы ў наступным парадку. У будынку губернскага

праўлення (не захавалася) размясцілася ўпраўленне генерал-кватэрмайстра па аператыўных пытаннях, дзе пражывалі начальнік Генеральнага штаба генерал ***М.В.Аляксееў*** і вышэйшыя афіцэры штаба. Тут жа знаходзіўся і рабочы кабінет цара.

Дом губернатара (не захаваўся) заняў ***імператар***. Разам з ім размясціўся міністр імператарскага двара граф ***Фрэдэрыкс.*** У будынку цяперашняга краязнаўчага музея размяшчаліся ўпраўленне дзяжурнага генерала, начальнік ваенных шляхоў зносін, ваенна-марское ўпраўленне і камендант галоўнай кватэры, якому падпарадкоўваліся ўсе ваеннаслужачыя ў раёне Стаўкі і ўстановы сувязі.

Для аховы Стаўкі кожны дзень выкарыстоўвалася каля 1500 чалавек. Акрамя гэтага, была створана другая лінія аховы ў 20 км. ад горада, дзе размяшчаліся вайсковыя часці. Для прыкрыцця Стаўкі ад нямецкіх самалётаў – "цэпелінаў" - на будынках былі ўстаноўлены вышкі для стральбы з кулямётаў.

Адметнасцю жыцця горада ў гэты час было і тое, што тут знаходзіліся ваенныя прадстаўнікі ўсіх саюзных дзяржаў: ***Англіі, Францыі, Італіі, Бельгіі, Японіі.*** На вуліцах горада можна было бачыць элегантных ваенных у розных, нязвыклых для вока гараджаніна, формах, што выклікала значную цікавасць з іх боку. У сваёй кнізе "Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве 1915 – 1918 гг." ***М.Бяляўская*** на падставе асабістых уражанняў і ўспамінаў расказвае: "При Николае Николаевиче Ставка была лагерем, деловым и строгим. С первых же дней приезда Государя она внешне потеряла этот облик. Сразу всё изменилось. Приехала оперетка ..., театр был до отказу набит дамами и ставочными офицерами ... Приехали Великие князья, которых раньше не было, а если и были, то незаметно работали в штабе. Теперь на улицах Могилёва то и дело можно было видеть Царицу, наследника, князей: Дмитрия Павловича, Бориса Владимировича и других лиц Царского Дома и свиты. Место Ставки – ***Могилёв приобрёл вид резиденции царской семьи***, и война отходила на второй план, забывалась ..."



Карнілаў Л.Г.

Зима 1917 г. была незвычайна снежнай і суровай. Баявыя дзеянні прыпыніліся. Салдаты галадалі, пачалася эпідэмія. Армія страціла каля 100 тысяч забітымі і памёршымі. У такім стане яе і застала ***Лютаўская рэвалюцыя.*** Відавочца гэтых падзей у Магілёве М. Бяляўская працягвае: "Началась великая русская революция ... В Могилёве было иначе. Все эти дни ярко светило весеннее солнце, текли ручьи и весёлая толпа наполняла улицы, радуясь наступлению весны. Переворота ждали давно, но когда он наступил, то никто этому не поверил ...Но уже ночью этого дня ***Государь*** выехал в Петербург (дзе на ст.Дно 2 сакавіка 1917 г. адрокся ад трона – Б.М.) и ***вернулся в Могилёв из Пскова уже не Императором Всероссийским, а полковником***

***Романовым”***. Тут ён развітаўся са штабам Стаўкі, маці Марыяй Фёдараўнай, якая была ў Магілёве праездам з Кіева, вялікімі князямі і 8 сакавіка выехаў у Царскае сяло (г. Пушкін), дзе быў арыштаваны.



Духонін М.М.

Летам 1917 г. Вярхоўным Галоўнакамандуючым быў ужо генерал ***Л.Г. Карнілаў***, які узначаліў узброены мяцеж супраць урада ***А.Ф. Керанскага.*** Аднак хутка мяцеж быў ліквідаваны, а яго кіраўнікоў - ***Л.Г. Карнілава, генералаў Дзянікіна, Лукомскага, Маркава, Раманоўскага*** – арыштавалі і ўзялі пад варту ў Магілёве, дзе яны знаходзіліся спачатку ў гасцініцы “Метраполь”, а потым былі перавезены ў Быхаўскую крэпасць.

Начальнікам штаба Стаўкі і выконваючым абавязкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага стаў генерал ***М.М. Духонін***. Раніцай 26 кастрычніка 1917 г. у Магілёве стала вядома аб перамозе пралетарскай рэвалюцыі ў Петраградзе. М. М. Духонін адмовіўся прызнаць Савет Народных Камісараў, за што быў адхілены ад пасады. “Большевитский переворот никого в Могилёве не поразил – распавядае далей відавочца. – Многие даже как будто обрадовались, решив, что это начало конца революции. Мало кто из обывателей слышал до революции имя ***Ленина*** и знал программу большевистской партии ... В Могилёв шли большевики во главе с ***Крыленко*** ... Духонин предполагал на автомобилях выехать в Киев и перенести туда верховное командование, но Георгиевский батальон задержал уже нагруженные автомобили.



Крыленка М.В.

В тот же день было собрано общее собрание всех чинов Ставки ... Он (Духонин) обрисовал общее положение, сказал, что по его мнению сопротивление невозможно и что он сам до последней минуты останется на посту ... (У гэты ж час па яго загаду былі вызвалены з Быхаўскай турмы Л.Г. Карнілаў і інш. генералы – Б.М.) На следующий день в Могилёв пришли большевики во главе с главнокомандующим ***Крыленко.*** На вокзале, несмотря на защиту Крыленко, толпа красноармейцев подняла на штыки генерала ***Духонина.*** Его изуродованный труп распяли в товарном вагоне, прибив руки гвоздями. В рот трупа вложили окурок, и вся чернь ходила смотреть на поруганное тело генерала Духонина, плюя ему в лицо и осыпая страшными ругательствами. В таком виде нашла его и жена, которая, узнав об убийстве мужа, приехала на вокзал ... ( пазней гроб з целам М.М.Духоніна быў перапраўлены ў Кіеў – Б.М.) Все увидели, что пришла страшная сила, сила нечеловеческая, и что нельзя жить так, как жили до сих пор. Могилёвцы заперлись по квартирам, закрыв ставни и опустив шторы. Даже в домах стали говорить шепотом. А разъярённые матросы и красноармейцы из петербургских рабочих ходили по городу, стреляя по окнам и наводя ужас и на без того уже перепуганного обывателя.

Вскоре фронт придвинулся к Могилёву, и Ставка во главе с Крыленко переехала в Орёл. В Могилёве во главе большевистской власти стал прапорщик ***Гольман.*** Начались аресты ...”


Ваенны санітар Сяргей Ясенін

Пад час знаходжання Стаўкі ў Магілёве тут кароткі час служыў і ***Сяргей Ясенін.*** Рускі паэт-лірык, знаўца народнай мовы і душы, у 1915 годзе быў прызваны ў армію, дзе атрымаў спецыяльнасць санітара і быў прызначаны ваенным санітарам асабістага поезда яе вялікасці імператрыцы ***Аляксандры Фёдараўны***. 5 красавіка 1916 г. у складзе вялікай світы імператрыцы Ясенін прыбыў у Магілёў. Праз некаторы час, не жадаючы пісаць “вернападданіцкіх вершаў”, ён дэзерціраваў. Каля двух месяцаў дабіраўся Ясенін да радзімы (в. Канстанцінава Разанскай губерні), дзе ціхенька адседжваўся, бо яму пагражаў ваенны трыбунал. Толькі пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года ён пераехаў у Маскву, а потым у Петраград. Існуе меркаванне, што Ясенін падчас знаходжання ў Магілёве пазнаёміўся з магіляўчанкай ***Надзеяй Вольпін*** і паміж імі завязаўся раман. Пазней Н. Вольпін стала вядомай літаратурнай перакладчыцай Дж. Голсуорсі, Р.Уэлса, Конан Дойля.


Польскі корпус у Магілёве.

12 сакавіка 1918 г. у горад увайшоў польскі корпус генерала ***Доўбар–Мусніцкага***, а 25 мая – германскія войскі. ***На працягу амаль 8-месяцаў магіляўчане жылі адначасова ў двух дзяржавах.*** Мяжа акупацыйнай зоны ў 1918 годзе праходзіла па Дняпру. На правым беразе былі польскія жаўнеры (пазней салдаты германскага кайзера), а на левым (Лупалава) дзейнічала савецкая ўлада. 31 кастрычніка, паводле Брэсцкага дагавора, нямецкія войскі пакінулі Магілёў, і яго занялі часці Чырвонай Арміі.

Пасля пачатку савецка-польскай вайны ў 1920 г. Магілёў зноў становіцца прыфрантавым горадам. У цяперашнім будынку краязнаўчага музея размясціўся штаб 16-й арміі.

Па чарговай мабілізацыі з ліку магіляўчан быў сфарміраваны ***35-ы бронеатрад 16-й арміі.***4 чэрвеня 1920 г. атрад на 5 бронемашынах выехаў на разведку па Бабруйскай шашы і спыніўся на ноч у раёне в.Цейкавічы Бабруйскага павета. Даведаўшыся аб распалажэнні атрада, польскія легіянеры на досвітку 5 чэрвеня акружылі яго, забілі вартавых і напалі на

бронеатрад. Камандзір атрада ***Грачоў М.М***. загадаў прабівацца з акружэння боем. Экіпажы падбітых бронемашын М.М.Грачова і В.М.Усава, у якіх скончыўся боезапас, уступілі ў рукапашны бой. У жорсткім і няроўным баі загінулі Грачоў, Усаў, кулямётчыкі Пакроўскі, Бальцэвіч і інш. З 19 байцоў атрада ў жывых засталіся толькі цяжка параненыя Пятроў і Недабітаў.

За мужнасць і гераізм у гэтым баі камандзір атрада ***М.М.Грачоў***, камандзір бронемашыны ***В.М.Усаў***, вадзіцелі ***Л.І.Альбаў*** і ***М.М.Філатаў*** па загаду Рэўваенсавета рэспублікі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга. 7 чэрвеня 1920 г. Губернатарская плошча была запоўнена гараджанамі, чырвонаармейцамі і камандзірамі мясцовага гарнізона, работнікамі штаба 16-й арміі. Тысячы людзей сабраліся сюды, каб праводзіць у апошні шлях воінаў-герояў ***35-га бронеатрада***, загінуўшых у баі. Цяпер на брацкай магіле ўстаноўлены надмагільны помнік у выглядзе масіўнага прамавугольніка з чорнага паліраванага граніту, які размешчаны на шырокай пліце.



Помнік 35-му бронеатраду.

***А зараз па Архірэйскаму валу, міма былых ратушы*** (не захавалася), ***Спаскага манастыра*** (не захаваўся) і ***палаца архіепіскапа*** (гл. раздзел “Архітэктурная спадчына Магілёва”) ***пройдзем на плошчу Арджанікідзе*** (былая Касцерня, па адной з версій Самусева гара), дзе ў 1661 г. былі ***пахаваны салдаты рускага гарнізона***, перабітага магілёўскімі мяшчанамі. Каб зразумець, што адбылося тут у час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654 – 1667 гг.) звернемся да ***“Записок игумена Ореста”***. “Город Могилёв покорён под Российскую державу в 1654 году. (24 жніўня 1654 г. магілёўскія жыхары сумесна з магістратам дабраахвотна здалі горад, сустрэўшы войскі рускіх ваявод Ваейкова і Паклонскага з іконамі. – Б.М.). Для удержания его навсегда во владении Российском и для защиты от нашествия на оный Поляков, в нём находилось в течение семи лет Российское войско, которое, стоя на квартирах, причиняло жителям могилёвским розныя обиды, за каковыя, хотя Могилёвские мещане неоднократно жаловались Российским воеводам, Горчакову и Полуектову, жившим тогда в Могилёве, но не получая от них удовлетворения, вышли, наконец, из терпения и учинили тайный заговор избить всё Российское войско, находившееся в Могилёве. ***Для совершения заговора*** они назначили первое число Февраля 1661 года. Перед оным числом (по секретному повелению магистрата) ночью тайно Могилёвские жители повынимали кремни из ружей русских солдат, в них квартировавших; поутру же 1-го числа Февраля магистрацкие чиновники и почетнейшие горожане, собравшись в Ратушу со скрытыми под одеждою мечами, ожидали определённого времени в готовности к начатию избиения.

Российские солдаты, не зная таковага заговора, учинённага мещанами на изгубление их, ходя по рынку толпами начали по обыкновению своему

нахально орать и хватать калачи продажные, - мещане нарочито громко закричали, по заговору с членами магистратскими; на таковой крик бургомистр ***Пора-Леонович***, с катовским мечем выбежав из ратуши, перекрестившись, крикнул: пора! пора! Вдруг зазвонили в вечевой ратушный и на братской колоколы на тревогу, и бургомистр Пора-Леонович с товарищами первый начал пред ратушею на рынке катовским большим мечем рубить Российских солдат; а мещане, послышавши колокольный тревожный звон, по всему городу, по всем домам и улицам, нечаянно нападши, кололи, резали бердышами, топорами, молотами, и чем кто мог, убивали Русских солдат без всякой пощады ... Во время сей битвы много ранено и несколько убито мещан Могилёвских.

По избиении Российского войска, мещане, воевод и чиновников, оковав в железа, посадили в тюрьму; а убитых, ободравши с них платья, погребли нагих, некоторых на горе Самусевой (место то до нынешнего времени называется Костернею по той причине, что на том месте множество было костей человеческих и поставлена была каплица ...); других погребли близ ***Покровской богадельни*** (у р-не Мікалаеўскай царквы – Б.М.) а иных, в других местах, где можно было погребсти ... войт ***Пётр Казанович***, бургомистр ***Иосиф Пора-Леонович*** и ***Василий Леошкевич*** ... для препровождения и доставления в Варшаву Российских двух воевод, ***Семёна Савича Горчакова, Матвея Андреевича Полиевктова*** и головы стрелецкого ***Семёна Ивановича Чекина*** ... окованных в железа, сами лично отправились из Могилёва и благополучно доставили. ... Король и вся Речь Посполитая весьма довольны были таковым отважным поступком Могилёвских горожан, и за таковую победу... заслужили столь великое благоволение, что все прежде бывшие их преступления против Короля и Речи Посполитой преданы вечному забвению. Чиновников же магистратских король всех пожаловал дворянами и дворянскими преимуществами ... А ревностный и первейший зачинщик и предводитель онага поражения Россиян бургомистр Леонович в данной королём ***Яном Казимиром*** дворянской привилегии наименован не Леоновичем, но ***Пора-Леоновичем*** по той причине, что он ... крикнувши “пора! пора!”, начал бой и возбудил всех сограждан своих к храбрости и мужеству ...

Тогож 1661 года, июня 9 дня. Дана в Варшаве ... королём яном Казимиром привилегия жителям Могилёва ... за убиение ими ... Московских воинов и взятия в плен двух воевод ..., ***и уравнен город Могилёв во всех правах и преимуществах, свободах, выгодах* и *вольностях со столичным Литовским городом Вильнею,*** каковаго права и преимущества другие города Польского королевства, кроме Могилёва, ни один не имел”. Гэтым жа прывілеем ***горад атрымаў новы герб*** (гл.вышэй).

Колькасць загінуўшага рускага гарнізона, па розных дадзеных, вызначаецца ад 1110 да 7000 чалавек.

Падчас гэтай вайны здарыўся ў горадзе яшчэ адзін трагічны выпадак, аб якім памяталі праз стагоддзі нават у наш час. Напэўна і ён адыграў сваю ролю ў негатыўных адносінах да рускага гарнізона з боку магілёўскіх

мяшчан, значную колькасць якіх складалі яўрэі. ”По занятии Могилёва в 1654 г. царь ***Алексей Михайлович*** велел всех евреев выгнать из города, а дома их конфисковать. Несмотря на это, значительная их часть оставалась в Могилёве. Начальствовавший над войском в Могилёве ***Константин Поклонский*** принудил всех оставшихся удалиться за город, на сборный пункт, близ деревни Тарасовки ..., обещая прислать им туда провожатых. Вместо провожатых Поклонския явился сам с отрядом. Все Евреи, без различия пола и возраста, были изрублены, а трупы их ограблены. Евреи попрятали своё золото и розныя драгоценности в хлебе и в волосах Евреек. В прежнее время, могилёвские Евреи ежегодно в день избиения выходили толпами на это место и там молились за погибших в тот день своих единоверцев” – гаворыцца ў ***“Живописной России”.***

Ваенныя дзеянні нанеслі Магілёву значныя страты, скарацілася колькасць насельніцтва, затрымалася развіццё рамеснай вытворчасці. Аднак, як і ў большасці выпадкаў, магіляўчан выручаў гандаль. Менавіта гандаль з рускімі гарадамі, Рыгай, Украінай,, а таксама нямецкімі месцамі Лейпцыгам, Кёнігсбергам, Данцыгам садзейнічаў ажыўленню гаспадарчага развіцця горада. Кушняры і футроўшчыкі працавалі пераважна на сыравіне, якую прывозілі з рускіх гарадоў. Магілёўскія купцы свабодна гандлявалі ў Смаленску, Маскве і інш. гарадах. Развіццю эканомікі і росту горада спрыяла таксама адсутнасць у ім засілля феадалаў, якое прадухіліла рашучая барацьба ***магілёўскіх мяшчан, вызначаўшыхся сваім вольналюбівым і непакорлівым характарам.***

Звычайнай з’явай у Магілёве быў гандаль рускімі жанчынамі – ***“паланянкамі-маскоўкамі”***. Пакупнікамі такога тавару з’яўляліся заможныя мяшчане, якія і самі неаднаразова ездзілі за дабычай у непрыяцельскую Маскоўскую зямлю і памежныя пасяленні. Выкарыстоўваліся паланянкі ў якасці работніц у дамах сваіх гаспадароў, падчас прыжываючы ад іх дзяцей. Так, казак Сарнацкі прызнаў перад магістратам, што паланянку маскоўскую Феню, “которую достал за границею в земле неприятельской, под Смоленском”, прадаў мешчаніну магілёўскаму Багдановічу за капу грошаў. Гэту палонніцу Багдановіч мог трымаць у сябе да дзевяці год, пасля чаго яна павінна была быць адпушчана і служыць каму захоча. Другі мешчанін Есковіч, які “полонянку московскую Соломониду, достал за границей …” прадаў магілёўскаму мешчаніну Бутаку за 2 капы грошаў.

Да канца XVII ст. Магілёў стаў буйным горадам Беларусі з насельніцтвам у 15 тыс. чалавек і 3 тыс. дамоў. Каралі, жадаючы забяспечыць сабе вернасць магіляўчан, надалі гораду шмат усялякіх прывілееў, якія спрыялі яшчэ большаму яго росту і ўзбагачэнню. У гэты час горад упрыгожвалі 4 праваслаўныя манастыры і 2 каталіцкіх кляштары, 13 цэркваў і 2 касцёлы. ***Стары горад і замак былі абнесены абарончымі рвамі, валамі і сценамі, якія для ўезда сюды адчынялі 11 брамаў***. Брамы мелі прыгожы архітэктурны выгляд, звонку і знутры былі мастацка аздоблены. Старажытнейшая з іх – ***Алейная -*** размяшчалася непадалёку ад ратушы і звязвала гарадскі рынак з Падміколлем, а самая прыгожая – ***Каралеўская -***

абкладзеная чорным мармурам, выездам на пад'ёмны мост  давала пачатак вуліцы Вялікай Шклоўскай і размяшчалася каля сучаснай Тэатральнай плошчы.

Горад у гэты час – ***сталіца Магілёўскай праваслаўнай епархіі***. У ім дзве калегіі: пры Спаскім манастыры – праваслаўная, пры езуіцкім кляштары – каталіцкая. У Брацкім Богаяўленскім манастыры з 1616 г. дзейнічала друкарня, дзе працаваў знакаміты друкар і асветнік з сям'і магілёўскага бургамістра ***Спірыдон Собаль***, які ў 1631 годзе выдаў у Оршы "Буквар славянскай мовы". Сучасныя даследчыкі лічаць, што слова ***"Буквар"*** упершыню стаў ужываць менавіта наш зямляк С.Собаль. Да гэтага падобныя навучальныя кнігі зваліся "Алфавіт" і інш.



Буквар Спірыдона Собаля.

З 1690 г. па 1708 г. у друкарні выдаваліся царкоўныя,навучальныя і палемічныя творы, у т.л. "Псалтыр", "Часаслоў", "Евангелле вучыцельнае", "Неба новае" І. Галятоўскага і інш.

Пэўнага росквіту дасягнула архітэктура, малярства, графіка і іншыя віды мастацтва. Магілёўскія дойліды ***Іван, Феська*** і ***Недасек*** толькі што завяршылі пабудову ***новай ратушы*** з арыгінальнай шматяруснай вежай. На беразе Дняпра ў Падміколлі для Свята-Мікольскага манастыра ў стылі беларускага барока пабудавана новая царква, а комплекс Богаяўленскага манастыра ўзбагаціўся мастацкай званіцай з гадзіннікам. Як і ва ўсёй Беларусі, тут квітнела праслаўленае далёка за яе межамі разьбярства па дрэву, т. зв. "беларуская рэзь".  Цудам гэтага віду мастацтва быў ***іканастас*** новай Мікалаеўскай царквы. Тады ж перажывала росквіт і магілёўская школа іканапісу са стылізацыяй у ім беларускіх краявідаў і нацыянальнага арнаменту на вопратцы святых; у графіцы – мастацтва гравюры па дрэве і медзі, у якім гравёры і друкары ***Максім Вашчанка*** з сынам ***Васілём, Фёдар Ангілейка, Мікіта Антушкевіч*** і інш. стварылі магілёўскую школу кніжных гравюр, якімі аздаблялі выданні магілёўскай брацкай і слуцкай друкарняў.

Знешні выгляд Магілёва , яго багацце и ўзровень развіцця мастацтваў адзначалі і замежныя падарожнікі. Чэх ***Бернгард Танер*** у 1678 г. заўважыў, што Магілёў складаецца з дамоў "упрыгожанных чымсці падобным на абразы, мастацкія і цудоўныя".

Царскі стольнік ***П.Талстой*** у 1697 г. у сваіх падарожных нататках адзначаў: "… Горад Магілёў вялікі і пасады каля яго вялікія. У пасадах мноства садоў. А ўвесь ён шмат большы за Смаленск... На пасадзе шмат багатых мяшчанскіх дамоў мураваных і шмат добрай будовы драўляных... Вуліцы брукаваныя дзікім каменем. Шмат гандлёвых радоў, а ў іх поўна ўсялякага тавару". Знаходзячыся ў царкве Богаяўленскага брацкага манастыра на святочнай літургіі ён быў уражаны яе прыгажосцю. "Усе сенцы


Талстой П.А.

распісаныя выдатным насценным роспісам. Іканастас – разьбяны, пазалочаны, вялікі ... Святыя абразы пры слупах таксама прыгожага пісьма і аздобленыя ў багатыя аправы... На вялікім тыдні іканастас і ўсе абразы былі завешаны вішнёвай крашанінай. А па ёй добрым пісьмом, жыва намаляваныя пакуты Хрыста”.

Ішлі гады за гадамі. Магілёў жыў сваім кіпучым жыццём. Аднак яго далейшаму развіццю зноў перашкодзіла вайна. Цяжкія разбурэнні і адкрытае рабаўніцтва выпалі на лёс горада падчас ***Паўночнай вайны*** (1700-1721 гг.) ***паміж рускімі і шведамі***. Яе выклікала жаданне Расіі захапіць Прыбалтыку, якая належыла Швецыі, каб прарубіць “вакно ў Еўропу”. Тэрыторыя Усходняй Беларусі стала адным з галоўных тэатраў ваенных дзеянняў. Праз Магілёў праходзілі асноўныя сілы як рускай, так і шведскай армій. У сакавіку – ліпені 1708 г. у горадзе і наваколлях знаходзіліся рускія войскі. У ліпені г.г. ён быў заняты войскамі Карла XII, а ў верасні – зноў рускімі. Зразумела, што і адны, і другія жадалі атрымаць ад гараджан як мага болей каштоўнасцей, харчавання, зброі, падвод, фуражу.

Даволі падрабязна падзеі гэтай вайны ў Магілёве апісаны ў Магілёўскіх летапісах (***Магілёўскай хронiцы, “Запісках ігумена Арэста”***), а таму нічога не выдумляючы, звернемся да іх кароткага вольнага пераказу.


Меншыкаў А.Д.

... Рускія войскі, адступаючы перад шведамі, каціліся на ўсход. Сярод іх была і кавалерыя генерал-паручыка ***А.Д.Меншыкава*** ... “Сакавіка 14 дня расійскі князь Аляксандр Меншыкаў з вялікай помпай уехаў у Магілёў і ў замак Магілёўскі з мноствам караванаў на вярблюдах, мулах і драбантах... Сам ён затрымаўся ў замку, а афіцэры ягоныя – у дамах пачэснейшых магілёўскіх купцоў і мяшчанаў.

Магілёўскія магістрацкія сябры, ведаючы, што Меншыкаў – чалавек люты і на Магілёў нялітасцівы, у намеры схіліць яго на міласць, хадзілі да яго з хлебам-соллю, дарагімі прысмакамі, вiном і цукрам; завезлі яму бочку вугорскага віна, падаравалі вялікую пасудзіну з крышталю, апраўленага ў серабро, гданскае працы...

Назаўтра зранку Меншыкаў прыслаў у ратушу свайго сакратара з загадам, каб магістрат штодня дастаўляў князю рознае пітво і харчовыя прадукты. Хоць Магілёў ад войскаў і военачальнікаў ужо быў даведзены да крайняй беднасці, аднак вымаганыя фуражы і прадукты змушаны быў збіраць, як на ўтрыманне самой асобы князя, гэтак і яго службы, на ягоныя балі і банкеты. ...князь Меншыкаў, жывучы ў Магілёве на такім поўным і раскошным меставым утрыманні, замест удзячнасці хацеў адпомсціць

Магілёву за забіцьцё магілёўскімі мяшчанамі ў 1661 годзе расійскага гарнізону, шукаў спосабаў, як бы схіліць на гэта цара Пятра Аляксеевіча, каб Магілёў вырубіць".

7 чэрвеня 1708 г. з-пад Мінска шведы пачалі наступленне, 3 ліпеня г.г. у ***баі пад Галоўчынам*** яны разбілі рускае войска і 7 ліпеня без бою ўвайшлі ў Магілёў. Як толькі прыбыў шведскі кароль, хадзіў да яго магістрат прасіць аб міласці, але той адказаў: "Паколькі давалі вы правіянт маскалям, патрэбна каб далі мне". Захопнікі падзялілі Магілёў на 15 кварталаў, кожны з якіх павінен быў штодзённа пастаўляць па 312 пудоў хлеба і 960 гарнцаў (3 тыс. л.) піва. Яны рабавалі цэрквы, манастыры і кляштары, вывезлі з горада больш за 9 пудоў серабра, з якога ў сваім лагеры білі манету і на працягу 6-тыднёвага знаходжання адабралі ў насельніцтва горада амаль усе запасы харчавання.

Шведы да апошняга абрабавалі ***Буйніцкі манастыр***, разагналі ўсіх яго насельнікаў. А старадаўнюю драўляную царкву ***Успення*** разабралі і гэтым зрубам наслалі масты, што былі на ўзгор'і. "А калі аднаго часу шведскі кароль аб'язджаў войска і фарпосты і ехаў адным мастом..., то каралеўскі конь... ні ў якім разе не хацеў пускацца праз мост. Кароль, вельмі гэтаму здзівіўшыся, прыгледзеўся да маста і, убачыўшы на ім дзве дошкі, загадаў іх перавярнуць. Аж на адной дошцы быў абраз ***Спаса,*** а на другой - ***Багародзіцы***, абодва абразы з разабранай Буйніцкай царквы. Ён загадаў адставіць іх ў бок, і ў гэты ж час конь пайшоў праз мост". Шведскі кароль быў малады, гадоў трыццаці, росту высокага, грузны, твар меў васпаваты, доўгі нос і падстрыжаную ножніцамі шавялюру. У пачатку жніўня ***Карл XII*** з войскам пакінуў Магілёў.


Карл XII

Хоць і быў абабраны Магілёў шведскай арміяй, але дамы, крамы, цэрквы і іншыя пабудовы засталіся цэлымі і непашкоджанымі. Па выхадзе-ж шведаў, расійскі цар ***Пётр І***, будучы незадаволеным магілёўскімі жыхарамі за тое, што яны давалі шведскай арміі правіянт і грашовыя кантрыбуцыі, загадаў татарскаму і калмыцкаму палкам ***"выжечь город Могилёв".*** На досвітку 8 верасня 1708 г. татары і калмыкі акружылі горад, пазапіралі брамы і ўдарылі ў барабаны. Узрушаныя такой неспадзяванасцю, жыхары збегліся на трывогу і пачалі прасіць літасці, хаця б на адну гадзіну, каб паспець хоць што-небудзь вынесці са сваіх дамоў... Перад тым, як падпаліць горад, татары і калмыкі разрабавалі купецкія крамы, на вуліцах з мяшчан здзіралі вопратку, па дамах шукалі грошы, займалі і рабавалі цэрквы. І толькі пасля гэтага Магілёў быў падпалены. Загарэліся замак, ратуша, крамы,


Пётр I

кафедральная Спаская, Брацкая і Васкрасенская цэрквы, касцёлы, пасля чаго падпальшчыкі кінуліся на прадмесце, дзе спачатку разрабавалі багацейшыя дамы і Мікалаеўскую царкву, а потым падпалілі іх. Падчас гэтага гвалту пачуліся крыкі: “Масква места вырэзвае!...”, і перапалоханыя месцічы, пакінуўшы ў полымі свае дамы, схапіўшы малых дзетак, рынуліся наўцёк з горада, куды хто мог ... Далей у “Магілёўскай хроніцы” распавядаецца: “У гэты час набожны і акамянелы люд мусіў выплакаць апошнія слёзы, бачачы, як аздобленыя божыя святыні..., цэрквы паціху, разгарэўшыся ў агні, валяцца на зямлю, царкоўныя купалы, адрамантаваныя з немалымі выдаткамі, гараць, а бляхі ад агню лётаюць па паветры як птушкі, званы самі звоняць, гаспадарскія дамы без аніякага паратунку ў тлю абарочваюцца...” У народнай памяці з таго часу засталася прыказка: ***“Стуль маскалі, а стуль швяды: дзе падзецца ад такой бяды”.***

Гэтая вайна зламала Магілёў. Пасля яе горад апусцеў, значная частка жыхароў перабралася ў іншыя месцы і ўжо не змог ён паправіцца і дасягнуць былога росквіту. Пэўную ролю ў яго заняпадзе пасля вайны адыграла і супадзенне акалічнасцей. Прарубленае Пятром І ***“акно ў Еўропу”*** змяніла гандлёвы шлях таварапатоку з Расіі, які цяпер абмінаў Магілёў і ішоў у краіны Прыбалтыкі і Заходняй Еўропы напрамую. Гандаль ужо не мог быць галоўным вырашальным фактарам у аднаўленні дабрабыту жыхароў і развіцці горада, як гэта было раней пасля такіх жа спусташальных войнаў.

Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) ***Магілёў увайшоў у склад Расіі*** і стаў цэнтрам магілёўскай правінцыі (да 1775 г.) і Магілёўскай губерні, з 1778 г. – Магілёўскага намесніцтва, з 1796 г. – павета Беларускай, з 1802 г. – Магілёўскай губерняў. У 1775 г. ***горад*** быў ***пазбаўлены Магдэбургскага права***, а з прадстаўнікоў гарадскіх саслоўяў пачала выбірацца ***дума.***У гэты ж час распрацоўваецца ***першы рэгулярны план забудовы горада*** як губернскага цэнтра, у т.л. вуліц Ленінскай і Першамайскай.

***Зараз з плошчы Арджанікідзе пройдзем на вул. Ленінскую да былой харальнай (галоўнай) сінагогі Цукермана*** (цяпер ДЮСШ алімпійскага рэзерву). Спачатку гэты дом пабудаваны як палац каталіцкага епіскапа ***С.Богуша-Сестранцэвіча***, але пасля паўстання 1831 г. ***беларуская магілёўская каталіцкая епархія*** была зачынена і прымусова пераведзена ў Пецярбург. У канцы 1850-х гадоў ганаровы грамадзянін горада ***Цукерман,*** выкупіў будынак і пераабсталяваў яго пад сінагогу.

Наогул, у Магілёве яўрэі з’явіліся ў XVI ст., але ужо ў пачатку XVII ст., паводле каралеўскіх грамат, ім забаранялася сяліцца ў горадзе, а гараджанам здаваць для іх ў наём будынкі. Каралеўская грамата за 1626 г. дазваляла адводзіць у Магілёве яўрэям зямлю за замкам для будаўніцтва дамоў, крам, ставіць півварні і лазні, але толькі на той вуліцы, дзе ёсць іх малітоўная школа – ***Школішчы***. Пасля правядзення ***Кацярынай ІІ*** у 1794 г. ***“мяжы аседласці”,*** за якой яўрэям забаранялася жыць (Віцебск – Мсціслаў – Гомель) пачалося інтэнсіўнае павелічэнне яўрэйскага насельніцтва на Беларусі, асабліва пасля перасялення яго з сельскай мясцовасці ў гарады.

Калі ў 1783 г. у Магілёве жыло каля 7000 хрысціян і ***2 500 іудзеяў***, то ў 1867 г. хрысціян было 13000, ***а іудзеяў каля 22 000.*** У горадзе ва ўласнасці яўрэяў знаходзіліся ўсе свечачныя заводы і прыватныя друкарні, большасць гасцініц, фатамайстэрняў, кнігарняў, крам і кантор аптовага гандлю. Нягледзячы на забарону ў 1783 г. яўрэям гнаць гарэлку, к сярэдзіне XIX ст. выраб спіртнога ў Магілёве знаходзіўся менавіта ў іх руках. Як адзначалі сучаснікі, "без удзелу яўрэяў амаль немагчыма нічога ні прадаць, ні купіць, наняць прыслугу, набыць крэдытныя бумагі, ні нават купіць дом і вясковыя прадукты". Не выпадкова, што мясцовыя кірмашы праходзілі па серадах, пятніцах і нядзелях. З наступленнем ***свята шабата*** (ст.-яўр. - субота) гандлёвае жыццё ў горадзе спынялася. У гэты дзень яўрэі не працавалі, нават чай у самавары гатавала хрысціянская прыслуга. Хрысціянам даводзілася падпарадкоўвацца рытму жыцця, заведзенаму яўрэямі, і запасацца прадуктамі харчавання на суботу, калі ўсе яўрэйскія лаўкі зачыняліся.

Традыцыйныя ***абвінавачванні*** ў адрас ***яўрэяў*** з боку гараджан-хрысціян ахоплівалі вельмі шырокі спектр: ад шынкарства да адвільвання ад рэкруцкай павіннасці і ад ліхвярства да падлізвання. Сучаснікі адзначалі, што яўрэі падкупляюць гарадскіх чыноўнікаў, выкручваюцца, лёгка пазбягаюць адказнасці па тых справах, дзе папросту пападаюцца хрысціяне.

Для простага насельніцтва яўрэі ў асноўным заставаліся народам чужым, які жыве па сваіх законах і звычаях, тым больш, што рэлігія яго так доўга асуджалася царквой. Існаваў і моцны бар'ер, які ў значнай ступені падрыхтоўваўся самімі яўрэямі, як умова нацыянальнага захавання. Безупыннае супрацьстаянне з мяшчанамі прыводзіла да ***яўрэйскіх пагромаў***. Так, у 1904 г. салдаты, мабілізаваныя на вайну з Японіяй, учынілі ў Магілёве пагром. У выніку яго было забіта і згвалтавана некалькі чалавек, знішчана і разрабавана значная колькасць маёмасці, што належала яўрэям горада.

Мясцовае яўрэйскае насельніцтва падпарадкоўвалася нацыянальнаму органу ўпраўлення - ***кагалу***, які пасля рэформы 1844 г. быў перайменаваны ў ***яўрэйскую абшчыну***. У паўсядзённым жыцці ад астатніх гараджан яўрэі адрозніваліся адзеннем і знешнім выглядам. ***Мужчыны*** заўсёды насілі вузкі чорны балахон, шырокі чорны пояс, белыя ці сінія панчохі да каленяў, чорныя скураныя туфлі, на галаве чорны каўпак. Галаву галілі, пакідаючы на скронях валасы – пейсы, якія спадалі да плячэй. Бароды ніколі не галілі. ***Яўрэйкі*** насілі featureознакаляровыя сукенкі без таліі, на галаве вялікія хусткі, павязаныя накшталт чалмы, шыю упрыгожвалі ніткамі жэмчугу, на ногі абувалі туфлі, якія ў час хадзьбы ляпалі па пятках. Замужнія жанчыны, як і мужчыны, галілі галаву і насілі парыкі. Яўрэйскі хлопчык лічыўся паўналетнім у 13, а дзяўчынка–у 12 гадоў. У шлюб хлопцы звычайна ўступалі ў 18, дзяўчаты – у 16 гадоў. Маладыя год жылі ў бацькоў нявесты, а пасля гэтага будавалі свой дом.

Дамы яўрэі не агароджвалі, у двары нічога не расло. Уваход у дом рабіўся пасярод яго, ацяпляўся дом рускай печчу, драўляную падлогу ў доме мылі толькі два разы ў год (вясной і восенню).Больш заможныя сем'і трымалі кароў, бяднейшыя – коз.

Яўрэі верылі ў многія ***прыкметы.*** Ведаючы пра гэта, жартаўнікі, праваслаўныя ці каталікі, часта насміхаліся над імі. Так, калі некалькі яўрэяў ехалі на калёсах, жартаўнік услых пачынаў іх лічыць. Яўрэі мітусіліся, спрытнейшыя хаваліся, бо верылі, калі той, хто лічыць, назаве правільную лічбу, хто-небудзь з падарожнікаў хутка памрэ.

Нягледзячы на тое, што яўрэі былі пазбаўлены права на вышэйшую адукацыю і дзяржаўнае кіраўніцтва, яны, як ужо адзначалася вышэй, практычна цалкам утрымлівалі ў сваіх руках аптовы гандаль, піцейныя ўстановы і вытворчасць алкаголю, добра ведалі рыначную кан’юнктуру.



Мемарыяльная дошка

***Праходзячы каля вучылішча культуры па вул.Камсамольскай звернем увагу на гэты будынак.*** Пабудаваны ён прыблізна ў 60-я гады XIX ст. У час 1-й Сусветнай вайны тут знаходзілася гасцініца “Брыстоль”, дзе пражываў генералітэт Стаўкі ***Мікалая II***. У 1928 г. пасля аб’яднання Бабруйскай і Віцебскай палітшкол тут быў адкрыты палітыка-асветніцкі тэхнікум. Некалькі пазней сюды была пераведзена і Мінская палітшкола. У гады акупацыі (1941-1944 гг.) ў сценах будынку была створана і дзейнічала ***падпольная група “Непакораныя”.*** Пасля вызвалення горада і да сёняшняга часу вучылішча культуры (да 1990 г. – культурна-асветнае вучылішча імя Н.К.Крупскай) падрыхтавала каля 14 тыс. спецыялістаў у галіне культуры і адукацыі. Сярод выпускнікоў вучылішча папулярная спявачка ***Іна Афанасьева***, аўтар-выканаўца ***Аляксандр Баль***, плённа працуюць педагогі-мастакі, 7 з якіх з’яўляюцца членамі Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь.

***А цяпер перамесцімся на вул. К. Лібкнехта*** (Паштовая, Пажарная) і ***спынімся каля старых, мураваных будынкаў XIX ст.***, ***дзе сёння размяшчаецца пажарная часць МНС***, а ў 1820-х гадах знаходзілася ***паштовая станцыя з гасцініцай*** (заезны двор). Менавіта тады тут спыняўся па дарозе з Пецярбурга ў Кішынёў, а праз чатыры гады на зваротным шляху з Адэсы ў Міхайлаўскае Пскоўскай губерні, вялікі рускі паэт і пісьменнік ***Аляксандр Сяргеевіч Пушкін*** (1799-1837). Яго імем у горадзе названы праспект і пастаўлены помнік.

Вядома, што ў 1820 г. цар ***Мікалай I,*** якому вельмі не падабалася вольнадумства паэта, пад выглядам службовага перамяшчэння паслаў яго на поўдзень Расіі. Захавалася падарожная Пушкіна, якую ён прад’яўляў на паштовых станцыях: ”11.05.1820 г. праязджаў праз Магілёў па Шклоўскай вуліцы, спыняўся ў заезным двары ...”, а потым праз Буйнічы, Быхаў, Рагачоў маршрут праходзіў па левабярэжжы Дняпра...

Але паўднёвае сонца яшчэ больш ускаламуціла нораў паэта, і ў 1824 г. ён, па указанню цара, быў высланы ў родавы маёнтак Міхайлаўскае пад

нагляд паліцыі. Зваротны шлях яго зноў пралягаў праз Магілёў. Па ўспамінах сучасніка і добра знаёмага А.С.Пушкіна – ***А.Распопава*** (пляменнік ***Я.А.Энгельгардта*** – дырэктара Царскасельскага ліцэя), які ў той час служыў у Магілёве, паэт прыбыў у горад вечарам 6 жніўня 1824 г. і спыніўся на пошце. Афіцэры мясцовага гарнізона, а ў гэты час тут знаходзіўся штаб 1-й Рускай арміі, даведаўшыся аб знакамітым падарожніку, прыбылі на паштовую станцыю, дзе і пачалася гулянка, якую ужо ноччу працягнулі на кватэры А. Распопава. ”Вячэрні пір” працягваўся да 4-х гадзін раніцы, пасля чаго вясёлая кампанія праводзіла Пушкіна на пошту. У час гэтай сустрэчы Пушкін чытаў вершы, якія сачыняў тут жа, і захопленая кампанія захацела азнаменаваць сустрэчу, зрабіўшы свайму куміру ***ванну з шампанскага,*** ад чаго паэт адмовіўся. Знаходзячыся пад царскай апалай, Пушкін не мог затрымлівацца на станцыях, указаных яму ў падарожнай, больш, чым гэта патрабавала адзнака ў дакуменце альбо змена каней і кароткі адпачынак... А таму ужо раніцай, а 5-й гадзіне 7 жніўня Аляксандр Сяргеевіч вымушаны быў ехаць далей. Потым ён не раз успамінаў і расказваў сябрам, як яго прымалі ў Магілёве. Наш зямляк, паэт ***Пятро Прыходзька*** ў вершы “Пушкін ў Магілёве” пісаў:



Пушкін А.С.

***Ён вышаў на бераг, да самага вала,***
***І слухаў бурлівыя хвалі Дняпра.***
***Усю ноч з ім тады Беларусь размаўляла,***
***Пакуль не ўзышла маладая зара.***

***Далей наш шлях ляжыць на вул. Першамайскую*** (Шклоўскую, Дняпроўскі праспект) ***да манументальнай брамы (аркі) насупраць гасцініцы “Дняпро”.*** Некалі на месцы гасцініцы стаяў цудоўны і прыгожы ***Іосіфаўскі сабор*** (гл. раздзел “Архітэктурная спадчына Магілёва” –Б.М.), пабудаваны ў гонар сустрэчы ў Магілёве імператрыцы ***Кацярыны ІІ*** і аўстрыйскага імператара ***Іосіфа ІІ***. У 1780 г., на момант сустрэчы двух імператараў , Магілёў перажываў далёка не лепшы перыяд сваёй гісторыі. У 1772 г. горад атрымаў статус губернскага цэнтра, а з 1778 г. – цэнтра асобнага Магілёўскага намесніцтва. Перад прыездам каранаваных асоб тут пражывала каля 8000 жыхароў, тады як у пачатку XVIII ст. іх было больш за 20 000.Доўгі час адбіваліся вынікі пятроўскага пажару 1708 г. і толькі к 30-м гадам XIX ст. горад аднавіў былую колькасць насельніцтва і заняў былыя межы.

У гэты час Кацярына ІІ і Іосіф ІІ дамовіліся аб сустрэчы ў Магілёве з мэтай палітычнага абмеркавання пазіцый у адносінах да Турцыі і далейшым лёсе Рэчы Паспалітай. Акрамя таго, расійская імператрыца мела намер больш падрабязна азнаёміцца з палажэннем і жыццём насельніцтва ў нядаўна далучаных да Расіі губернях.

Было дамоўлена час і месца сустрэчы трымаць у сакрэце, папярэдне аб гэтым ведалі толькі генерал-губернатары. Па шляху праезду імператрыцы адрамантавалі дарогі і паштовыя станцыі, пры якіх пабудавалі асобныя пуцявыя палацы з утрыманнем у іх неабходнай колькасці коней і ямшчыкоў для імператрыцы і яе світы. Царскі поезд суправаджалі да 45 прыдворных саноўнікаў, артысты тэатра, вакальная і інструментальная капэлы. Для сустрэчы поезда на кожнай станцыі былі прызначаны асобы з мясцовай адміністрацыі.

Спецыяльна для сустрэчы ***ў Магілёве рыхтаваліся вайсковыя манеўры.*** Дзеля гэтага быў сабраны корпус з лепшых палкоў: першага кірасірскага, двух гусарскіх, аднаго драгунскага, пяці пяхотных, пяцідзесяці гармат палявой артылерыі і двух палкоў данскіх казакоў. Ужо за месяц да прыезду імператрыцы ў горад пачалі з'язджацца міністры, частка двара, значная колькасць іншаземцаў, усё дваранства Магілёўскай і Полацкай губерняў. Па свайму мнагалюддзю Магілёў стаў больш нагадваць сталіцу, чым губернскі цэнтр. Спецыяльна для размяшчэння імператрыцы быў пабудаваны драўляны палац (на месцы цяперашняга сквера каля "Чырвонай зоркі").

20 мая 1780 г. імператрыца ***Кацярына ІІ*** са світай выехала з Пецярбурга ў Магілёў. Аўстрыйскі імператар ***Іосіф ІІ*** прыбыў у Магілёў 21 мая ***інкогніта,*** пад імем графа ***Фалькенштэйна.*** "Афіцэр у зялёным гарнізонным мундзіры, росту сярэдняга, твару нямецкага, зачэсаны ў адну пуклю з касой" – такім ён прадстаў перад гараджанамі. Графу была адведзена кватэра ў лепшым на той час у горадзе доме купца ***Аношкі*** ( зараз музей В.К. Бялыніцкага-Бірулі). 22 жніўня ў 7 гадзін раніцы імператар пешшу хадзіў маліцца ў касцёл езуітаў, потым з вежы ратушы аглядаў горад. Сваёй маці ён пісаў у той час: " ...горад пабудаваны кепска, драўляныя дамы, гразныя вуліцы. Я жыву ў аднаго польскага купца". Імператар Іосіф падараваў гаспадару дома, дзе жыў, партрэты – свой і маці, якія захоўваліся ў Магілёўскім музеі і зніклі з пачаткам вайны ў ліпені 1941 г.

24 мая ў 8 гадзін раніцы пад калакольны звон і гарматныя стрэлы з гарадскога валу ў горад уехала кавалькада карэт з ***Кацярынай ІІ і яе світай.*** Яшчэ за горадам, каля пабудаванай размаляванай трыўмфальнай драўлянай брамы, шэсце сустракалі ўсе службовыя асобы – ад губернатара да канцылярскага служыцеля, а члены магістрата паднеслі імператрыцы ключы ад горада – залаты і сярэбраны, якія пазней яна з удзячнасцю вярнула гораду (ключы захоўваліся ў Магілёўскім музеі, адкуль зніклі падчас эвакуацыі ў 1941 г.- Б.М.). Далей шэсце, ахоўваемае эскадронам кірасір, накіравалася ў саборную ***Спаса-Праабражэнскую царкву,*** дзе ***Георгій Каніскі*** правёў неардынарную пропаведзь, якая расчуліла і да глыбіні душы уразіла Кацярыну. "Оставим астрономам доказывать, что земля вокруг солнца вращается: наше солнце


Кацярына ІІ.

вокруг нас ходит, чтобы мы благополучно почивали» - гаварыў у прыватнасци ён. Сучаснікі адзначалі набожнасць і маральную чысціню, з якой Кацярына падыходзіла да алтара, прымала таямніцы веры, клала на сябе поўны крыж і схілялася так нізка, як дазваляла чалавечае цела.

Урачысты малебен, які праводзіў ***С.Богуш-Сестранцэвіч***, адбыўся і ў ***кармеліцкім касцёле.*** Тут імператрыца прысутнічала разам з графам Фалькенштэйнам (Іосіфам II). Богаслужэнне праходзіла ў суправаджэнні вакальнай і інструментальнай імператарскіх капел і касцёльнага аргана. Гэта наведванне сыграла фатальную ролю для манахаў кармеліцкага кляштара. Багаты барочны ўнутраны інтэр’ер будынка, яго добрыя акустычныя якасці і фундаментальнасць так спадабаліся імператрыцы, што яна загадала перасяліць манахаў у іншыя кляштары, а Богушу-Сестранцэвічу заснаваць тут сваю архіепіскапскую кафедру.

У гэтыя дні Магілёў бачыў прадстаўніка Іосіфа II пры расійскім імператарскім двары графа ***Кабенцэля,*** графаў ***Румянцава*** і ***Чарнышова,*** князёў ***Пацёмкіна, Галіцына, Нарышкіна*** і інш. Сем дзён у горадзе праходзілі сустрэчы, перагаворы, поруч з якімі адбываліся тэатральныя прадстаўленні, танцы, а на левабярэжжы Дняпра – ваенныя манеўры. Відавочна пазней ***Г.Дабрынін*** адзначаў: “А евреи воздвигнули среди площади, между фестонами из ельника и пирамидами, оркестр с надписью со входа: ***торжествуем, якоже во время Соломона,*** где и играли на разных инструментах, попеременно почти денно и ночно”.

Усе дамы ў горадзе былі заняты прыезжымі вяльможамі і дваранамі, а ў прыёмны дзень **“*адных толькі карэт стаяла да трохсот*”.**

30 мая Кацярына з Іосіфам у знак свайго візіту ў горадзе, ***каля*** драўлянай ***царквы Уваскрасення Хрыстова,*** залажылі першы камень ***царквы св. Іосіфа,*** якая пазней стала кафедральным саборам. Пасля свайго прыезду на радзіму аўстрыйскі імператар таксама у гонар гэтай сустрэчы, у Вене, быццам бы пабудаваў такі ж ***сабор св. Кацярыны***.

У гэты дзень пасля абеду імператрыца з імператарам пры гарматнай стральбе і калакольным звоне тым жа шляхам выехалі з Магілёва і праз Шклоў, Оршу, Дуброўна накіраваліся ў Смаленскае намесніцтва. У кастрычніку месяцы г.г. Кацярына пісала: “Свидание в Могилёве имело полнейший успех; однажды мы смеялись и шутили пять часов сряду, и я ему Иосифу сказала: между тем, как вся Европа хочет знать, о чем мы говорим , вот как мы забавляемся”.

Вынікам перагавораў у Магілёве стала заключэнне руска-аўстрыйскага саюзнага дагавору 1781 г., які прадугледжваў узаемадапамогу супраць Турцыі, а у 1783 г. ужо адбылося далучэнне Крыма да Расіі і заснаванне Севастополя.

Перад ад’ездам імператрыца падаравала: ***гораду і губерні*** – значныя сумы грошаў (45 758 руб.), ***Георгію Каніскаму*** – крыж с каштоўнымі каменнямі і тысячу рублёў грошай, ***С.Богушу-Сестранцэвічу*** – табакерку з алмазамі; атрымалі падарункі і генерал-губернатар з жонкай. Святлейшы князь ***Р.Пацёмкін*** падараваў магілёўскім праваслаўным цэрквам на званы

трафейныя турэцкія гарматы вагой 111 пудоў, якія да 1812 г. праляжалі ў двары Спаскай царквы, адкуль былі забраны французамі ў час акупацыі горада.

Значная і ўрачыстая падзея ў рэлігійным жыцці горада і Іосіфаўскага сабора адбылася ў 1910 годзе. ***Магілёў аказаўся на шляху перанясення святых мошчаў св.Еўфрасінні Полацкай з Кіеўскіх пячор у Полацк.*** З Кіева да Оршы рака з мошчамі перавозілася на параходзе па Дняпру. У час знаходжання мошчаў Еўфрасінні Полацкай у горадзе на працягу трох дзен (30 красавіка- 2 мая 1910 года) адбываліся ўрачыстасці, у якіх прымала ўдзел вялікая колькасць веруючых – святароў, губернскага ураду, простага люду. Узбярэжжа Дняпра было ўпрыгожана сцягамі. На казённай пасажырскай прыстані (па цячэнню ніжэй Дняпроўскага маста) вылучалася багата аздобленая арка з надпісам «Гряди во славу Божию Преподобная Мати», гербам Магілёўскай губерні і дзяржаўнымі расійскімі сцягамі. Падобныя аркі былі зроблены ў пачатку і ў канцы Дняпроўскага спуску, які пачынаўся каля прыстані і цягнуўся ўгару да ратушы і Васкрасенскай царквы. Каля ***Іосіфаўскага кафедральнага сабора мураваная брама*** была аздоблена іглiцай з электрычнымі лямпачкамі, а аркі насупраць яе ўпрыгожвалі гірлянды і гербы. Каля саборнай званіцы вёўся гандаль абразамі Прэпадобнай Еўфрасінні і раздавалі рэлігійныя брашуры.


Рака з мошчамі
св. Еўфрасінні Полацкай.

Прыбыўшая на параходзе “Галавачоў” у суправаджэнні суднаў “Смаленск” і “Гомель” рака са святымі мошчамі з урачыстай працэсіяй у 15-20 тыс.чалавек была перанесена ў ***Іосіфаўскі сабор.*** Спачатку адбылося набажэнства на вуліцы, а потым пачалася ўсяночная. Да мошчаў выстраілася чарга багамольцаў, якіх падпускалі невялікімі гуртамі. На наступны дзень адбыўся крыжовы ход вакол сабору.Каля мошчаў бесперапынна знаходзіліся два святары і чатыры манахіні Спаса-Еўфрасінеўскага манастыра. Усю наступную ноч просты люд прыкладаўся да святыні, працягваўся гандаль абразамі, брашурамі, свечкамі.

2 мая, пад гукі званоў, спевы і музыку рака з мошчамі была вынесена з сабору і ўрачыстая працэсія рушыла да прыстані, дзе святыню передалі на параход “Галавачоў”... . Некалькі кіламетраў натоўп народу суправаджаў параходы па берагах Дняпра. Па падліках сведкаў, у Магілёве за тры дні пабывала больш за 75 000 жыхароў і багамольцаў з навакольных сёл і гарадоў.

***Спыніўшыся на Тэатральнай плошчы*** звернем увагу на былую ***вул. Княжацкую*** (назва паходзіла ад бліжэйшай да горада па гэтаму шляху в. Княжыцы), пазней ***Віленскую*** (ад старадаўняга гандлёвага і паштовага шляху з Магілёва ў Вільню) і сучасную ***вул. Лазарэнкі.*** Гэта вуліца праходзіла праз

узгорыстую мясцовасць, прарэзваемую рэчкай Дубравенкай.У канцы яе знаходзіліся гарадскія мураваныя казармы, а за мастом праз Дубравенку - мураваная сінагога. Іншых жа казённых ці грамадскіх будынкаў тут не было, жылыя дамы гараджан былі пераважна драўляныя. Пры выездзе з гораду на гэтай вуліцы знаходзіліся могілкі: Рыма-каталіцкія, Лютэранскія і праваслаўныя Васкрасенскія.

Менавіта на ёй пачыналі разгортвацца ***падзеі Айчыннай вайны 1812 г.*** у нашым горадзе. Вестка аб пераправе Напалеона праз Нёман даволі хутка дакацілася да Магілёва, аднак гараджане аднесліся да яе спакойна-разважліва, бо горад знаходзіўся ў далечыні ад дзяржаўнай мяжы. 29 чэрвеня па гораду разнеслася навіна, што французскія войскі занялі Мінск і набліжаюцца да Магілёва. Адначасова гараджанам стала вядома і аб урачыстай сустрэчы мінскім дваранствам і чыноўніцтвам войскаў ***Л.Н. Даву.*** У Магілёве з’явіліся сем’і рускіх чыноўнікаў і праваслаўнага духавенства – бежанцаў з занятых французамі морадоў. Дваранства і каталіцкае духавенства трыўмфавалі, а яўрэі, як народ практычны і асцярожны ў адносінах з уладамі, захоўвалі знешні спакой, іх багатая шматвякавая гісторыя мабыць падказвала ім, што “усё перамелецца”. Пагалоска аб скорым прыходзе “нясметнай раці рознародных і рознаплямённых полчышч пад сцягамі Напалеона” нагнала страх на праваслаўную частку гарадскога насельніцтва: некаторыя, больш заможныя жыхары, пачалі выязджаць з горада з усёй маёмасцю, а тыя, што засталіся, пастараліся захаваць найбольш каштоўныя рэчы ў цэрквах ці закапалі іх у зямлю. Магілёўскі губернатар граф ***Д.А.Талстой,*** не давяраючы чуткам, жадаючы папярэдзіць панікёрскі настрой жыхароў, забараніў чыноўнікам і духавенству пакідаць горад, паставіўшы варту на масту праз Дняпро. Скрытна ад гараджан, у суправаджэнні канвоя, былі адпраўлены арыштанты і хворыя ніжнія чыны.

Для арганізацыі абароны горада, да падыходу з Бабруйска арміі генерала ***П.І.Баграціёна,*** у губернатара меўся падышоўшы з Барысава ***атрад у 400 чал. А.І.Грэсера і гарнізонны батальён унутранай варты каля 300 чал***. (у асноўным інваліды) палкоўніка ***А.А.Колена***. 7 ліпеня атрад А.І.Грэсера размясціўся біваком на Віленскім полі каля р. Струшні і ў гэты ж дзень стала вядома, што французы па Віленскаму тракту падышлі да горада і спыніліся на начлег у м. Княжыцы. Захоплены ў палон французскі кірасір падцвердзіў падыход перадавога кавалерыйскага атрада, за якім ідзе ўвесь корпус Л.Н. Даву.

Гарнізонны батальён выступіў са сваіх казарм, што размяшчаліся на Лупалаве, да Віленскай брамы, вылучыўшы каравулы ля Шклоўскай брамы і Лупалаўскага маста праз Дняпро, асобны пост ахоўваў харчовыя магазіны каля Быхаўскай заставы. Раніцай 8 ліпеня ўдалечыні паказаліся адступаючыя рускія раз’езды, а праз некалькі хвілін з боку Княжыцаў па дарозе с лесу выехалі французскія раз’езды, якія рыссю набліжаліся да Віленскай заставы.Салдаты гарнізоннага батальёна і атрада А.І.Грэсера, парастаўленыя пад прыкрыццём землянога вала Віленскай заставы, падпусцілі французаў на адлегласць 200 крокаў і далі дружны залп са стрэльбаў, а таксама зарадзілі і

стрэлілі з нейкай адзінай адкапанай, заржавеўшай гарматы, “застрашыўшы як жыхароў, так і непрыяцеля”. Да 7 французаў было забіта, а астатнія, збянтэжаныя, хутка адступілі да лесу, дзе спыніліся, ацэньваючы сілы праціўніка і чакаючы падыходу сваёй пяхоты. ***У адрозненні ад іншых гарадоў Беларусі, Магілёў сустрэў французаў не ўрачыстасцямі, а залпам батальёна аховы горада.***

Выстрэлы вымусілі французскае войска пастроіцца ў баявы парадак і пасля падыходу 5-ці батальёнаў 25-га лінейнага палка 5-й пяхотнай дывізіі графа ***Ж.Д.Кампана*** пачаць арганізаванае наступленне. У баявым страі яны выйшлі з лесу, і страляючы на хаду, накіраваліся да Віленскай брамы. Інваліды пачалі несці страты, частка французскай пяхоты рушыла ў абход правага фланга батальёна да Шклоўскай брамы, а другая кінулася ў штыкавую атаку. Імклівым націскам французы змялі нешматлікіх абаронцаў, якія пачалі, адстрэліваючыся залпамі ад насядаўшага праціўніка, паспешна адступаць паўз р.Струшня найкарацейшым шляхам на поўдзень, мінуючы цэнтр горада, да Быхаўскай заставы і плавучага маста праз Дняпро. Разам з батальёнам адыходзіў і атрад А.І.Грэсера. Каравулы каля Шклоўскай брамы і харчовага магазіна ля Быхаўскай заставы былі забіты.

Азадачаныя французы, асцярожна ўступіўшы ў горад, рассыпаліся па вуліцах, страляючы з ружжаў у адступаючых салдат, перабілі варту ў Лупалаўскага маста, а некалькіх параненых салдат саштурхнулі ў раку, дзе яны і патанулі. Французы захапілі мост, вялікую колькасць коней і буйной рагатай жывёлы, значныя склады правіянту, бо ніхто не прадбачыў такога хуткага заняцця горада.


Баграціён П.І.

Калі войска генерала ***П.І.Баграціёна*** , якое павінна было абараняць Магілёў, толькі выходзіла з Бабруйскай крэпасці, французскі корпус маршала ***Л.Н.Даву*** 8 ліпеня 1812 г. ужо ўступіў у горад. Заможныя гараджане, вышэйшыя чыноўнікі, у т.л. губернатар ***Д.А. Талстой*** і віцэ-губернатар ***Юсупаў,*** пакінулі горад, прычым губернатару прыйшлося ўцякаць ад пагоні французскай кавалерыі пешшу. Убачыўшы, што экіпаж даганяюць французы, ён пакінуў яго і ляснымі сцежкамі выйшаў да Дашкаўкі. Высланыя ў дагон французы вярнулі частку збеглых чыноўнікаў і гараджан і пасадзілі іх у склеп пад кармеліцкім касцёлам.

Зыход ***Салтанаўскай бітвы*** 11 ліпеня 1812 г. канчаткова ўсталяваў уладу французаў у горадзе. У гэты дзень, з раніцы да позняй ночы, у Магілёве чулі бесперапынную гарматную пальбу і ружэйныя стрэлы. Густы дым запаўняў месца бітвы і пранікаў у горад. На другі дзень мяшчане з фурманкамі былі высланы да Салтанаўкі для ўборкі трупаў забітых французскіх і расійскіх салдат. На гарадской плошчы былі сабраны рускія ваеннапалонныя і параненыя. Да 5 тыс. чал. параненых французаў,

прывезеных у горад пасля Салтанаўскай бітвы, занялі шпіталі, будынкі дзяржаўных устаноў, гімназіі, часткова губернатарскі дом.

А у гэты час каля Шклоўскай брамы прадстаўнікі магілёўскага дваранства начале з быхаўскім павятовым маршалкам ***П.С.Крогерам*** сустракалі маршала Л.Н.Даву са світаю. У прывітальнай прамове П.С.Крогер не скупіўся на кампліменты, пры праходзе французаў праз браму ён стрэліў з пісталета і закрычаў: “Віват, Напалеон!” і падаў Л.Н.Даву “маленькі хлеб”, які гарадскі галава купіў у яўрэяў “па загаду і нават пад прымусам некалькімі аплявухамі ад Крогера”. На белым хлебе прадстаўнікі гарадскога магістрата галава ***Рыгор Груша,*** бургамістр ***Іван Пушкарэвіч*** і інш. паднеслі маршалу залаты і сярэбраны ключы ад горада. Былы прыстаў Магілёўскай губерні ***Вікенцій Батура*** на кані сустракаў уваходзячых у горад французаў і з паслужлівасцю расказаў ім “аб усім, што ёсць у горадзе, хто выехаў, што адбывалася”.

У першы дзень знаходжання ў горадзе Л.Н.Даву распарадзіўся прызначыць з жыхароў кантрыбуцыю: хлеб, ялавічыну і грошы. Цікава, што вызначаная гарадской камісіяй самакіравання на чале з ***Д.Венцлавовічам*** колькасць прыпасаў дастаўлялася спачатку не толькі бясспрэчна, але і з вялікім лішкам, што дазволіла французам без выдаткаў сабраць у губерні 7-дзённы запас правіянту для ўсяго корпуса, які налічваў ***80 тыс. чал..*** Праз некалькі дзён выганы каля кавалерыйскіх бівакоў запоўніліся статкамі рагатай жывёлы і авечак, а ў хлебапякарні, прыладжаныя ў бліжэйшых дамах, былі прывезены мяшкі пшаніцы і жытняй мукі, пшано і гарох. Асноўная частка французскіх войскаў размяшчалася бівакамі за Віленскай заставай, частка - ў кватэрах і Лупалаўскіх казармах, а кірасіры – на гарадскіх сенажацях на Падміколлі.


Даву Л.Н.

13 ліпеня камісія даслала магілёўскаму ***архіепіскапу Варлааму*** адносіну аб прывядзенні паствы да прысягі на вернасць Напалеону. На наступны дзень Варлаам з кансісторскімі чынамі наведаў Л.Н.Даву, а потым разам “з усім народам” у кафедральным ***Іосіфаўскім саборы*** прынёс прысягу на вернасць і паслушэнства Напалеону, адслужыў літургію і малебен з упамінаннем імя імператара Напалеона і яго супругі. У гэты ж дзень прыхаджане рымска-каталіцкіх касцёлаў і яўрэйскіх сінагог таксама прысягнулі на вернасць французскаму імператару.

***Гэта быў адзіны выпадак падчас вайны, калі праваслаўны архіепіскап ад імя ўсёй паствы епархіі прысягнуў непрыяцелю*** (тым самым стаў яўным клятвапарушальнікам) і на працягу 4-месячнай акупацыі горада строга прытрымліваўся ўсіх прадпісанняў акупацыйных улад.

***Варлаам (Рыгор) Шышацкі*** нарадзіўся ў 1750 г. на Украіне, вучыўся ў Пераяслаўскай семінарыі, Кіева-Магілянскай акадэміі. Як “пярвейшы па поспехах” студэнт акадэміі Рыгор Шышацкі быў пасланы для далейшай



Варлаам Шышацкі.

адукацыі ў Рым. Але з-за ваенных дзеянняў у Італіі вымушаны быў вярнуцца дадому. Як чалавек таленавіты, ён хутка рухаўся па царкоўнай службовай лесвіцы і ***з 1808 г. стаў архіепіскапам Магілёўскім і Віцебскім.*** Варлаам меў высокую багаслоўскую эрудыцыю, бліскучыя педагагічныя і адміністрацыйныя здольнасці. Але адна памылка – прысяга Напалеону - перакрэсліла цудоўную біяграфію. Сам уладыка, ужо пад следствам, сцвярджаў, што душу сваю паклаў, намагаючыся абараніць паству ад ворагу, і дзякуючы гэтаму “...к Божьим храмам ... Французская рука не прикоснулась, и весь православный народ с его духовенством не терпел за веру, и никакого ни от кого оскорбления не учинено”. Зразумела, што гэтыя аргументы не былі прыняты ўладамі і сінодскім указам ад 1 мая 1813 г. Варлаам быў пазбаўлены архірэйства, свяшчэнства, ордэна Св. Ганны 1 ступені і сасланы ў Ноўгарад-Северскі першакласны Спаса-Праабражэнскі манастыр, дзе, будучы простым паслушнікам-манахам, паступова аслеп, а ў верасні 1821 г. памёр.



Ю. Панятоўскі.

У другой палове ліпеня 1812 г. 1-ы ўзорны корпус Л.Н.Даву пакінуў Магілёў, а яму на змену прыйшоў 5-ы польскі корпус ***Ю.Панятоўскага***. Апошні сабраў губернскую канферэнцыю шляхты, якая прыняла рашэнне далучыцца да Польшчы. Летапіс ігумена ***Арэста*** адзначае, што ў горадзе ў гэты час адзначаўся патрыятычны ўздым. Зноў стала модным старажытнае адзенне: кунтышы з вылетамі, канфедэраткі ... Святочна адзначаліся перамогі Напалеона пад Смаленскам, Барадзіно, уваход у Маскву, дзень нараджэння імператара Францыі.

Дзякуючы намаганням заўзятых прыхільнікаў французаў ***П.С.Крогера, Д.Венцлавовіча*** і інш. з шляхцічаў і месцічаў, у Магілёве была сфарміравана ***“народная гвардыя”*** колькасцю каля 400 чал. на чале з магілёўскім камендантам палкоўнікам ***Рамінскім,*** які вызначаўся тым, што праяўляў баявы імпэт, з захапленнем адсякаючы па адной галаве ў двухгаловых расійскіх арлоў на губернскіх урадавых будынках і нават намагаўся гарматным выстралам збіць двухгаловага арла з высокага шпіля ратушы. Мабілізаваная большай часткай насільна, “гвардыя” спрабавала падтрымліваць парадак у горадзе, але яна вылучалася нізкімі баявымі якасцямі, і пры першай жа вестцы аб набліжэнні казакоў усё новае войска разбеглася, а сам камандзір быў заколаты казакамі каля Княжыцаў.

У кастрычніку 1812 г. Напалеон выступіў з Масквы. Пачалося адступленне вялікай арміі. Магілёў быў буйнейшым апорным пунктам напалеонаўскіх войскаў на поўдні Беларусі. Тут размяшчалася трэцяя, пасля Вільні і Мінска, буйная прадуктовая база французаў (10-ці дзённы запас

правіянта для 100 тыс. арміі), знаходзіўся шпіталь з вялікім запасам медыкаментаў і перавязачных сродкаў. Усведамляючы важнае значэнне Магілёва для поспеху расійскага наступлення, ***М.І.Кутузаў*** са сваім штабам распрацавалі план баявой аперацыі па хуткаму вызваленню горада, але план гэты не спатрэбіўся, бо галоўны шлях адступлення французскай арміі і наступлення рускай праходзіў значна паўночней Магілёва.

У 10 гадзін раніцы 10 лістапада польская брыгада, якая знаходзілася ў горадзе, шпарка выступіла да Княжыцаў. Для абароны горада, забяспячэння адыходу і злучэння іншых атрадаў з брыгадай застаўся толькі эскадрон 15-га кавалерыйскага палка. Перад бегствам з горада палякі пачалі рабаваць купецкія крамы, аднак, дзякуючы ўгаворам П.С.Крогера і Любавецкага, спынілі разбой. І, як адзначаецца ў ***Магілёўскай хроніцы,*** “Магілёў, застаўшыся на свабодзе, прабыў трое сутак у спакойным абсалютным самакіраванні да ўступлення рускіх казакоў з егерамі пад кіраўніцтвам генерала графа ***Ажароўскага***”.



Ажароўскі А.П.

Партызанскі атрад генерал-ад’ютанта графа ***А.П.Ажароўскага***, даведаўшыся ад засланых у Магілёў яўрэяў пра слабасць гарнізона, вырашыў ісці на горад, не чакаючы злучэння з атрадам палкоўніка ***Д.В.Давыдава***. 12 лістапада, у 19 гадзін, Магілёў без бою быў заняты рускім войскам, якому ў якасці трафеяў дасталіся армейскія склады з 34 тыс. куляў правіянту і фуражу, а ў архіерэйскім доме – шмат французскіхківераў, ранцаў, ружжаў і інш. прадметаў амуніцыі.

У вызваленым Магілёве амаль не заўважалася наступстваў знішчальнай вайны і слядоў знаходжання тут напалеонаўскіх войск. Рускія афіцэры, уступіўшы ў горад, са здзіўленнем гаварылі: “Город Могилёв благополучно весь уцелел, да и нет благополучнейшего города из всех городов, забранных неприятелем, как Могилёв, а нашу - то матушку Москву неприятель деревнею сделал”. Большасць з іх прычынай гэтага лічылі тое, што “ ...игумены... с Крестом и Евангелием пали на колени перед Наполеоном и присягнули ему”, аднак “что город защищали, то хорошо, да худо, что они подданными Наполеоновыми стали”.

У сярэдзіне снежня 1812 г. з прыбыццём губернатара ***Д.А.Талстога*** паступова ўзнавілася дзейнасць мясцовых органаў адміністрацыі. Неразбураны Магілёў стаў зборным месцам для адпачынку адстаўшых часцей рускай арміі, праходзячых каманд, апалчэнскіх атрадаў.

***У паўднёвай частцы Тэатральнай плошчы знаходзіцца будынак, дзе сёння размяшчаецца музей этнаграфіі*** (вул. Першамайская, 8). Гісторыя яго непарыўна звязана з дзейнасцю ў Магілёве ў XVII – XVIII ст.ст. ***езуітаў*** (гл. раздзел “Архітэктурная спадчына Магілёва”) і ***дзекабрыстскім рухам XIX ст.,*** аб чым сведчыць надпіс на ***мемарыяльнай дошцы:*** “Здесь в здании

штаба 1-й армии в январе 1826 года проходили первые допросы героев декабристского движения, руководителей восстания Черниговского полка ***С.И.Муравьёва-Апостола, М.П.Бестужева-Рюмина***, которые вместе с ***П.И.Пестелем, К.Ф.Рылеевым, П.Г.Каховским*** были казнены в Петербурге 13 июля 1826 г. В феврале-марте здесь же проходил судебный процесс над офицерами-черниговцами".

Пасля падаўлення ў снежні 1825 г. паўстання на Сенацкай плошчы ў Пецярбургу і выступлення Чарнігаўскага палка ў Тульчыне царскі ўрад распачаў жорсткія рэпрэсіі. Для суда над афіцэрамі і дваранамі, якія мелі дачыненне да дзекабрыстаў, апрача вярхоўнага крымінальнага суда пад кіраўніцтвам самаго цара, былі створаны яшчэ і ваенныя суды. Адзін з такіх судоў засядаў у Магілёве, у штабе 1-й Рускай арміі.

У пачатку 1826 г. праз наш горад былі праканваіраваны з поўдня Расіі 44 афіцэры па падазрэнні ў садзейнічанні руху дзекабрыстаў. Частку з іх дапытвалі ў Магілёве, а частку без допыту накіравалі ў Пецярбург, у т.л. палкоўніка ***П.І.Пестэля***- кіраўніка "Паўднёвага таварыства дзекабрыстаў" і сыноў генерал-лейтэнанта ***М.М. Раеўскага*** (героя бітвы пад Салтанаўкай) – ***Мікалая і Аляксандра***.



Бястужаў-Румін М.П.



Мураўёў-Апостал М.І.

У Магілёве для допытаў у штабе 1-й рускай арміі пакінулі членаў "Паўднёвага таварыства", кіраўнікоў паўстання Чарнігаўскага палка падпаручыка ***М.П.Бястужава-Руміна*** і палкоўніка ***С.І.Мураўёва-Апостала*** (удзельніка вызвалення Магілёва ад французаў у лістападзе 1812 г.), які быў паранены ў час паўстання і ў кандалах прывезены ў Магілёў. Абое пазней прыгавораны да смяротнай кары праз павешанне.

Акрамя таго, па патрабаванню следства, у горад былі дастаўлены падпалкоўнік у адстаўцы ***М.І.Мураўёў-Апостал*** (брат Сяргея), дзекабрысты палкоўнік ***А.Мураўёў***, капітан ***Фурман,*** падпаручык ***Вадкоўскі*** і інш. Усе яны былі прыгавораны ды розных мер пакарання.

У ходзе следства была выяўлена ***Магілёўская ўправа "Паўночнага таварыства"***, якую ўзначальвалі ад'ютанты галоўнакамандуючага 1-й Рускай арміі ***Ф.В.Остэна-Сакена.*** Сярод іх паручык лейб-гвардыі кірасірскага палка ***П.П.Цітоў*** і капітан гвардзейскага Ізмайлаўскага палка ***У.А.Мусін-Пушкін***. Галоўнымі задачамі ўправы было паралізаваць дзеянні камандавання 1-й арміі ў момант выступлення тайнага таварыства, а затым дабівацца прыняцця Канстытуцыі, падобнай да амерыканскіх штатаў. Членамі арганізацыі былі штабротмістр лейб-гвардыі коннага палка ***Ф.Л.Брэверн,*** падпалкоўнік кватэрмайстарскай часці ***А.М.Гвоздзеў*** і паручык

часці ***А.А.Жамчужнікаў***. Пасля ўстанаўлення ролі змоўшчыкаў, тут жа ў штабе 1-й арміі, Цітоў і Мусін-Пушкін былі арыштаваны і адпраўлены ў Пецярбург, дзе ўтрымліваліся ў казематах Петрапаўлаўскай крэпасці.



Мураўёў-Апостал С.І.

Паколькі дзейнасць магілёўскіх дзекабрыстаў практычна нічым не праявілася і аб іх дзеяннях у галоўнай кватэры ў Магілёве кіраўнікі Паўночнага і Паўднёвага таварыстваў амаль нічога не ведалі, то ні Брэверн, ні Гвоздзеў, ні Жамчужнікаў арыштаваны не былі. Але сакрэтны нагляд за імі са шматмесячнымі данясеннямі быў установлены.

15 лютага 1826 г. кіраўнікам Магілёўскай управы быў абʼяўлены прыгавор: ***П.П.Цітова -*** пасля дадатковага 3-х месячнага ўтрыманняў крэпасці перавялі служыць у Омскі гарнізонны полк, пазней ён удзельнічаў у руска-турэцкай вайне і , атрымаўшы манаршую міласць, выйшаў у адстаўку; ***У.А.Мусіна-Пушкіна*** адправілі ў Фінляндыю, дзе ён служыў у Пятроўскім пяхотным палку, потым выйшаў у адстаўку і пасяліўся ў Маскве.



Мусін-Пушкін У.А.

Наогул, на ўтрыманні і допытах у сценах будынка пабывала каля 70 дзекабрыстаў. Такая вось ***трагічная і сумная слава гэтага месца, дарэчы, адзінага ў Беларусі.***

Сёння ў гэтым будынку размяшчаецца ***музей этнаграфіі,*** які быў адчынены ў 1999 годзе. Экспазіцыя яго мае назву ***“Зямлі роднай кругавод”***. У ёй прадстаўлены гіторыка-этнаграфічны рэгіён Падняпроўе, як частка этнічнай тэрыторыі, якая вылучаецца паводле комплексу этнакультурных прыкмет: асаблівасцей этнічнай гісторыі, характару рассялення, гаспадарчых заняткаў і прылад працы, народнай архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, традыцыйнага адзення, фальклору.




У аснову экспазіцыі пакладзены ***гадавы рух сонца і асноўныя абрадавыя святы беларусаў,*** якія вельмі цесна перапляліся з паўсядзённым жыццём насельніцтва. Ручнікі, народныя строі, керамічныя вырабы падабраны па тэрытарыяльнай прыналежнасці і паказваюць адметнасць розных частак Магілёўскага Падняпроўя. Святы зімова-вяснавога цыкла прадстаўлены матэрыяламі цэнтральных раёнаў (Магілёўскі, Быхаўскі, Слаўгарадскі, Шклоўскі). Матэрыялы паўночных раёнаў (Горацкі, Мсціслаўскі) іллюструюць абрады летняга цыкла. Восень, як самая багатая пара года, адлюстравана ў абрадавых і сямейных святах усходніх раёнаў Магілёўшчыны (Клімавіцкі, Касцюковіцкі, Хоцімскі, Краснапольскі).

Ручнікі і народныя строі гэтага рэгіёну вылучаюцца багатым дэкорам і сакавітасцю фарбаў.

Скласці поўнае ўражанне пра быт Магілёўскага Падняпроўя дапамагаюць унікальныя фотаздымкі, зробленыя з негатываў XIX стагоддзя, якія захоўваюцца ў фондах музея.

***На процілеглым ад музея баку Першамайскай вуліцы, спынімся каля мемарыяльнай дошкі Спірыдону Собалю,*** вядомаму беларускаму кнігадрукару і асветніку. Амаль усё сваё жыццё ён працаваў на Магілёўшчыне ў друкарнях  Куцеінскага (каля Оршы) і Буйніцкага манастыроў, а ў апошнія гады – у друкарні Магілёўскага богаяўленскага брацтва.



Мемарыяльная дошка Спірыдону Собалю.

Дата нараджэння Спірыдона Багданавіча Собаля невядома. Лічаць, што ён нарадзіўся ў апошняй чвэрці 16 ст. у сям'і бургамістра Магілёва. Яго бацька, Багдан Ігнатавіч Собаль, быў гандляром і членам Магілёўскага купецкага брацтва. У Магілёўскай хроніцы гаворыцца аб тым, што Б.І.Собаль быў адным з кіраўнікоў праваслаўных гараджан, якія ў 1618 г. не пусцілі ў горад уніяцкага архіепіскапа ***Іасафата Кунцэвіча*** з яго світай, што прыбылі сюды, каб укараніць уніяцтва.

Да таго часу Спірыдон Собаль скончыў Магілёўскую брацкую школу і дасканала авалодаў друкарскай справай у друкарні Кіева-Пячэрскай лаўры, куды яго ў свой час накіравала богаяўленскае брацтва. З пачатку XVII ст. ён працаваў настаўнікам , потым рэктарам Магілёўскай брацкай школы. Пасля суда над непакорнымі магіляўчанамі ў 1619 г. (барацьба з уніяцтвам) былі закрыты не толькі праваслаўныя цэрквы і манастыры, але і друкарня богаяўленскага брацтва. З 1624 г. С.Собаль выкладаў у Кіеўскай брацкай школе і Кіева-Магілянскай акадэміі, а ў 1628 г. адкрыў друкарню ў Кіеве, дзе выдаваў кнігі маральна-павучальнага і рэлігійнага зместу.

У родныя мясціны ён вярнуўся ў 1630 г. па просьбе праваслаўнага магната ***Б.Статкевіча,*** які выдзеліў сродкі для стварэння друкарні ў ***Куцеінскім мужчынскім манастыры*** ў Оршы. Праз год С.Собаль выдаў у Куцеінскай друкарні кірыліцай кнігі літургічнага характару – ***"Брашна духоўнае", "Малітвы паўсядзённыя", "Буквар".*** Гэтыя выданні мелі вялікае значэнне ў пашырэнні асветы не толькі на Беларусі, але і на Украіне, у Літве. Так, у "Буквары" С.Собаля вырашаліся адразу дзве задачы – навучанне маладога пакалення і выхаванне яго ў духу праваслаўя.

Потым з Куцейна ён пераязджае ў ***Буйніцкі манастыр***, дзе з фундацыі таго ж Б. Статкевіча адкрывае друкарню і выдае ***"Псалтыр"***, а ў пачатку 1636 г. С.Собаль па запрашэнні кураўнікоў Магілёўскага богаяўленскага брацтва пераехаў з Буйніч у ***Магілёў*** і адразу ж узяўся за стварэнне ***Магілёўскай брацкай друкарні,*** дзе ўжо ў канцы 1636 г. выдаў ***"Буквар" ("Букварь языка словеньска").*** Магілёўскі "Буквар" С.Собаля – унікальная

кніга, адзіны яе экзэмпляр зберагаецца ў Маскоўскім гістарычным музеі. Кніга нямала падарожнічала па Еўропе, пабывала ў руках англічан і немцаў, пра што сведчаць рукапісныя паметкі на яе старонках.

У 1638 г. у Магілёўскай брацкай друкарні С. Собаль выдаў ***"Тэстамент"*** – вучэбны дапаможнік, які ўключаў заданні славеснага характару для трэніроўкі розуму, кемлівасці, волі. У далейшым ён марыў стварыць школу для навучання юнакоў і дзяўчат грэчаскай і лацінскай мовам.


Пётр Магіла – мітрапаліт Кіеўскі
.

З дакументаў таго часу вядома, што С. Собаль быў "рэктарам і наглядальнікам школ магілёўскіх і кіеўскіх". У 1639 г. у пасланні рускаму цару ён пісаў : "Дзяржаўцу і вялікаму князю ўсея Русі, ***самадзержцу Міхаілу Фёдаравічу*** б'е чалом іншаземец, падданы вялікага караля ***Уладзіслава IV*** Собаль Спірыдон – рэктар і наглядальнік школ магілёўскіх і кіеўскіх, цяпер жа друкар пісаній праваслаўных і верны слуга мітрапаліта ***Пятра Магілы*** ..."

Пазней ён звяртаўся да цара з прапановай адкрыць друкарню ў Маскве і стварыць школу для "юных падлеткаў". Аднак цар яго прапанову не прыняў, бо лічыў, што беларускі друкар сваімі кнігамі мог пасеяць толькі ерась і смуту сярод праваслаўных расіян.

Памёр С.Собаль каля 1645 г., пакінуўшы ў спадчыну людзям каля 20-ці падрыхтаваных ім і надрукаваных кніг, якія маюць важнае значэнне для вывучэння гісторыі выдавецкай справы Беларусі і Украіны.

***Далей наш шлях ляжыць праз алею Герояў Савецкага Саюза – ураджэнцаў Магілёўскай вобласці на ўсходні бок Савецкай плошчы.*** Перад намі раскінуўся маляўнічы пейзаж па берагах Дняпра. Злева ад аўтамабільнага маста праз раку, пабудаванага ў 1956 г., вышэй па цячэнню ад старога драўлянага маста, на правым беразе знаходзіцца заліўная пойма Дняпра, якая называлася ***"Балонне",*** а на працілеглым беразе, справа ад


Разліў Дяпра ў Падміколлі. Сучасны выгляд

маста – ***"Траечча".*** У XIX і да сяр. XX ст. у гэтых месцах размяшчаліся дзесяткі жылых дамоў гараджан з гаспадарчымі пабудовамі, агародамі і садамі, якія кожны год вясной, у час паводкі, заліваліся вадой. Як адзначаецца ў ***"Опыте описания Могилёвской губернии...":*** "... огороды, покрытые летом сочной зеленью огурцов, лука и капусты, представляют из себя весною Венецианские лагуны, по которым снуют взад и вперёд Могилёвские

гондолы…”. Затаплівалася да сотні дамоў, але шкоды ад гэтага не было ніякай. Пастаянная стыхійная выпадковасць не засмучала жыхароў, а з гадамі выпрацавала ў іх прывычку прымаць меры перасцярогі: дамы будаваліся на высокіх слупах. Падлога і печ таксама размяшчаліся значна вышэй ад паверхні. Прамежак паміж слупамі ад фундамента печы да падлогі заставаўся адкрытым для таго каб, калі спадзе вада, хата хутчэй прасыхала. Кожны гаспадар меў невялікую лодку, якая пастаянна знаходзілася каля дзвярэй хаты. Падчас разліву жыхары не пакідалі сваіх дамоў і жылі ў іх. Як толькі вада пакрывала падлогу, яны знімалі з гарышча запасныя лагі, дошкі і насцілалі на пастаяннай падлозе, другую часовую.

У кожным доме рабіліся нары для пасцелі, маёмасці і інш., на якіх пастаянна знаходзіліся малыя дзеці –“фараоны”, як жартаўліва называлі іх дарослыя. Часта дзеці правальваліся ў ваду скрозь рассунутыя дошкі часовай падлогі, але як казалі старажылы, ніхто з іх не хварэў прастудай у час разліву ракі.

Разам з людзьмі ў затопленых дамах заставалася і хатняя жывёла, якая размяшчалася на падмостках. Сабакі забіраліся на дахі дамоў, куры і індзейкі – на гарышча, а качкам і гусям было поўнае раздолле. Жыхары падтрымлівалі зносіны паміж сабой і горадам на лодках, якімі па-майстэрску кіравалі нават малыя дзеці, а суседзі наведвалі адзін аднаго перабіраючыся па дахах і гарышчах пабудоў, па платах і насцілах з досак.

***Самай прыгожай і добраўпарадкаванай была цэнтральная частка горада.*** Яна складалася як з мураваных, так і драўляных пабудоў. Вуліцы ў цэнтры, у большасці, былі прамыя і правільныя, чыстата іх залежала ад пары года. Амаль усе яны мелі маставую і драўляныя тратуары, а дзве галоўныя вуліцы- Вялікая Садовая і Дняпроўскі праспект- мелі маставую і напалову былі брукаваныя. Тыя з іх, што ляжалі бліжэй да яроў, звілістыя і вузкія, амаль заўседы былі гразныя, а вясной і восенню непраходныя.


Былыя даходныя дамы па вул. Першамайскай.

Часта жыхары аб’ядноўваліся па некалькі чалавек і сумесныі намаганнямі будавалі каменны 2–3-павярховы дом. Такі ***“даходны дом”,*** пры наяўнасці сродкаў, мог пабудаваць любы гараджанін, а кватэры здаваліся ўнаём жыльцам ці ў арэнду дзяржаве. Падобных дамоў у горадзе было даволі многа і называліся яны па прозвішчу ўладальніка (***Бабовіка, Блоха, Берхіна*** і інш).

У архітэктурным плане некалькі такіх дамоў складалі замкнуты квартал з унутраным дворыкам і выходзіўшай на вуліцу аркай з варотамі, якія на ноч зачыняліся на замок. Абслугоўваў такі дворык дворнік, якога наймалі жыльцы. Падбіраўся ён строга па дзелавых якасцях з адстаўных ніжніх

чыноў паліцыі ці арміі, меў пры доме "вугал" і нагрудную бляху з нумарам. Акрамя ўборкі займаўся мелкім рамонтам і аховай, атрымліваў за гэта жалаванне, а па святах – і на "гарэлку".

Гараджане, чые даходы былі больш сціплымі, будаваліся на тагачасных ускраінах, дзе кошт зямельнага ўчастка быў ніжэйшым.

***Спыніўшыся на валу за будынкам цяперашняга краязнаўчага музея*** і ўглядаючыся ў маляўнічы пейзаж былога ***Задубровенскага пасада,*** паспрабуем уявіць сабе, што было тут больш 100 гадоў таму назад.

Ля падножжа Дальняга валу, на ***вуліцы Быхаўскай***, у мураваным ***будынку цяперашняй вайсковай часці***, па чарзе размяшчаліся ваенны шпіталь, правіянцкі магазін, турэмны замак, а пасля 1880 г. – склад піваварнага завода Лекерта.



Вул. Быхаўская (пач 20-га ст.).

На левым баку маста праз Дубравенку, пры самым вусці ракі, знаходзіўся ***драўляны млын 1858 года пабудовы***. Прама ад моста ў напрамку Быхаўскай вуліцы размяшчаўся мураваны ***будынак духоўнага вучылішча***, крыху аддалёны ў двор ад лініі вуліцы. Некалі гэта быў дом Альдэкана – дзяжурнага генерала 1-й Рускай арміі, штаб якой знаходзіўся ў Магілёве да 1829 г. Будынак на гары быў скрыты атуляючымі яго садамі.

Па валу ў накірунку ад Быхаўскай брамы да Дняпра пабудовы знікалі, мясціны станавіліся зусім глухія, але надзвычай жывапісныя: па правы бок вала цягнуліся бясконцыя сады, густа парослыя пладовымі дрэвамі і хутчэй падобныя на лясы, па левы бок – глыбокія абрывістыя яры з даволі высокімі конусападобнымі берагамі, якія спускаліся да Дняпра. За валам знаходзіліся Малое і Вялікае Завалле (сучасныя вуліцы Мянжынскага і Леванеўскага), дзе размяшчаўся выключна "прыватны сектар". Вуліца Быхаўская заўсёды была добра вядома тым, што на ёй месціцца ***Быхаўскі рынак,*** які карыстаецца ў жыхароў горада і наваколля вялікай папулярнасцю і ў наш час.

За гады Савецкай улады Магілёў, як і многія іншыя гарады, набыў устойлівую ***"адметнасць" у мікратапаніміцы.*** У першыя гады пасля рэвалюцыі з вялікай колькасцю мікратапонімаў развіталіся без жалю: вул. ***Дваранская, Жандарская, Мяшчанская, Ганжэева канава*** і інш. У побыт трывала ўваходзілі савецкія імёны – ***Леніна, Маркса, Лібкнехта, Піянерская, Камсамольская.*** Зразумела, што не абыходзілася без хібаў, паспешлівасці і неразважлівасці, перавёрнутага разумення патрыятызму, ды і проста ўгодніцтва, чынашанавання. Але асабліва пацярпеў горад пасля глабальнага перайменавання ў 1938 г. Адразу некалькі дзесяткаў вуліц зніклі з карты Магілёва, сярод іх ***Малое Завалле*** (вул. Мянжынскага), ***Вялікае Завалле*** (вул. Леванеўскага), ***Ільінская, Успенская*** і інш. Асноўная маса

назваў znівеліравалася так, што яны ніякім чынам не былі звязаны з Беларуссю, Магілёўшчынай, іх гісторыяй і людзьмі. На жаль, ***такое палажэнне ў горадзе захавалася да нашага часу,*** тыя ж некалькі вуліц, якія перайменавалі ў апошнія гады, тапанімічную карціну горада практычна не закранулі. У апошні час Магілёў набывае рысы еўрапейскага горада, а ***“рэкламы” даўніны як не было ў савецкі час, так няма і зараз.*** Мы забыліся пра сваю цікавейшую многавекавую гісторыю, якая магла б быць адлюстравана ў памятных збудаваннях, знаках і назвах вуліц.




***На самай старажытнай плошчы горада размяшчаецца абласны краязнаўчы музей.*** Музейная справа ў Магілёве бярэ свой пачатак з 1867 г., калі быў заснаваны губернскі музей. У 1941 г. ён згарэў, фондавыя калекцыі амаль цалкам зніклі пры эвакуацыі. Новая краязнаўчая экспазіцыя была пабудавана ў 1967 г. і праіснавала 10 год. У 1990-97 гг. былі распрацаваны і пабудаваны сучасныя экспазіцыі ў 23 залах, агульнай плошчай 1500 кв.м.. Зараз ў музеі больш за 240 тыс. адзінак захавання, частка з якіх прадстаўлена ў экспазіцыях чатырох раздзелаў музея.

***“Археалогія і старажытная гісторыя”.*** Тысячагоддзі пакінулі свой след на берагах старога Дняпра. Гэта больш за 2000 помнікаў археалогіі – паселішчы, грунтовыя магільнікі і курганы. Экспазіцыя адлюстроўвае матэрыяльную культуру і гаспадарчую дзейнасць чалавека ***ад палеаліту*** (старажытнакаменнага веку) ***да сярэдневякоўя.*** Экспануюцца крамянёвыя і каменныя прылады (наканечнікі стрэл, разцы, скрабкі, сякеры), жалезныя рэчы (зброя, нажы, шылы, крэсівы), ляпны і ганчарны посуд, упрыгожанні і інш. Прадстаўлены дыярамы “Рыбалоўства”, “Ганчарства”, рэканструкцыі гарадзішча Нікадзімава, грунтовага і курганнага пахаванняў.

***“Гісторыя дасавецкага часу”.*** У гэтым раздзеле гістарычнаму мінуламу прысвечаны шэсць экспазіцыйных залаў. Тут, па калекцыйных матэрыялах, можна даведацца пра жыццё старажытнага Мсціслава XII ст., пераход ад язычніцтва да хрысціянства, станаўленне і развіццё сярэдневяковага Магілёва ў межах Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, трагічныя падзеі на Магілёўшчыне ў Паўночнай вайне (1708 г.) і нашэсце арміі Напалеона ў 1812 г.

Асобая зала распавядае пра дзейнасць царскай Стаўкі расійскай арміі падчас 1-й Сусветнай вайны і знаходжанне ў ёй апошняга расійскага імператара Мікалая II у 1915-1917 гг.

***“Савецкі пярыяд”.*** Пераломным рэвалюцыйным падзеям, трагічнаму і гераічнаму часу 1920-1930-х гг. прысвечана экспазіцыя “Магілёўшчына ў гады рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва”. Карнілаўскі мяцеж, ліквідацыя бальшавікамі контррэвалюцыйнай Стаўкі, нямецкая і польская

акупацыя краю пад час грамадзянскай вайны, будаўніцтва новых заводаў, стварэнне калгасаў – тэмы, якія раскрываюцца з дапамогай дакументаў, фотаздымкаў, адзення, зброі і ўзнагарод.

Экспазіцыя Вялікай Айчыннай вайны (1941-1945гг.) паказвае ўсю трагедыю і мужнасць людзей, здолеўшых у неверагодна цяжкіх умовах фашысцкай агрэсіі выстаяць і перамагчы. Гераізм абаронцаў Магілёва, барацьбу партызан і падпольшчыкаў з ворагам, вызваленне горада паказваюць наведвальнікам дыярамы “Бой на Буйніцкім полі 12 ліпеня 1941г.”, “Зямлянка”, “Штурм Магілёва 28 чэрвеня 1944 г.”, а таксама шматлікія калекцыі той эпохі.

***“Прырода краю”.*** Экспазіцыя раздзела прыроды дае яскравае ўяўленне аб прыродных багаццях вобласці. Вялікае месца тут адведзена асноўным прыродным ландшафтам краю: балотам, лугам, лясам, вадаёмам, якія прадстаўлены ў адзінстве расліннага і жывёльнага свету. Багатая інфармацыйная крыніца аб мясцовай прыродзе пададзена ў выглядзе дыярам, біягруп, калекцый жывёл, схем, табліц, фотаздымкаў.

Акрамя абласнога краязнаўчага і этнаграфічнага музеяў ў Магілёве працуюць: ***музей гісторыі Магілёва*** (вул.Ленінская, 11), ***мастацкія музеі імя В.Бялыніцкага-Бірулі*** (вул.Ленінская, 37) і ***імя П.Масленікава*** (вул.Міронава, 33), ***выставачная зала абласнога аддзялення Беларускага саюза мастакоў*** (вул.Болдзіна, 1).

## *Л І Т А Т А Т У Р А,*
## *выкарыстаная пры складанні тэксту экскурсіі.*


1. Агееў А.Р., Марзалюк І.А., Пушкін І.А. “Магілёўская даўніна ў пытаннях і адказах”.- Магілёў,1997.-191с.: іл.

2. Агееў А.Р. Магілёўшчына пад час вайны 1812 г. //Магілёўская даўніна.-1995.-№ 3.- С.51.

3. Бабкова Т.Г. Ён першым надрукаваў падручнік пад назвай “Буквар”. //“Гісторыя Беларускага Падняпроўя”. Матэрыялы навук. канф.13-14 лістап. 1997 г.- Магілёў,1999.-С.97.

4. Баркалабовская летопись. Под ред. Е.Р.Романова. Вильна: Губ.тип, 1910.-58с.

5. Барысенка М.С. Школьнае краязнаўства на Магілёўшчыне.- Магілёў, 1997.-72с.

6. Барысенка М.С. Да гісторыі школьнага краязнаўства на Магілёўшчыне. //Магілёўская даўніна.-1994.- № 9.- С.87.

7. Беларусь. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995.

8. Бяспанскі С.І. З побыту гараджан. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.- Мн.,1998.- С.114.

9. Бяспанскі С.І. Да побыта Маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча ў Магілёве ў 1655 г. //Магілёўшчына. V вып.- Магілёў,1994.- С.38.

10. Бяспанскі С.І. Магілёў сустракае каранаваных асоб. //Магілёўшчына. III вып. Магілёў,1992.- С.52.

11. Бяспанскі С.І. Магілёўскія гістарычныя паданні. //Паведамленні 2-й абласной краязнаўчай канферэнцыі (29 кастр. 1991 г.).- Магілёў,1992.- С.53.

12. Гардзееў Б.П. Сяргей Ясенін у Магілёве. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.- Мн., 1998.- С.102.

13. Гардзееў Б.П. Пушкін у Магілёве. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.- Мн.,1998.- С.104.

14. Гардзееў Б. П. Аляксандр Дамбавецкі. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.-Мн.,1998.- С.108.

15. Гардзееў Б.П. Яго Магілёвам назвалі, бо йнакш прыдумаць не маглі. //Магілёўс. праўда.-1993.- 14 снеж.

16. Грыгаровіч І. І. Беларуская іерархія.-Мн.: БелЭн,1992.-102с.

17. Грыцкевіч А. Каталіцкі касцёл у Магілёве і на Магілёўшчыне ў XVII-XVIII ст.ст. //Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: Зб. навук. прац.- Магілёў, 2001.- С.78.

18. ”Дневник” Фёдора Евлашевского о положении в Центральной Белоруссии в 1564 – 1604 гг. – действиях отрядов С.Наливайко в Белоруссии. //История Белоруссии в документах и материалах.- Мн.,2000.- С.83.

19. Елинская М. Современная городская геральдика Могилёвской области. //”Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснае”: Зб. навук. прац.-Магілёў, 2003.

20. Ерашэвіч А. Магілёў у час вайны 1812 г. // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: Зб. навук. прац.- Магілёў, 2001.-С.124.

21. Ермоленко В. Воспоминания графа П.А.Толстого (1645-1729) о Могилёве.// Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: Зб. навук. прац.- Магілёў, 2001.- С.12.

22. Живописная Россия. Литов. и Бел. Полесье. Репринт.изд.1882.-Мн.: БелЭн, 1993.-550с.: илл.

23. Записки игумена Ореста. //"Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси". Том 2.- Вильна, 1867.

24. Заремский В. К. Могилёвская почта в 19 веке. //Магілёўская даўніна.- 1991.- № 9.- С.52

25. Захарова М. Рекреационный потенциал бассейна р. Днепр в пределах города Могилёва и окрестностей. // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: Зб. навук. прац.- Магілёў, 2003.

26. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць.- Мн.: БелСЭ,1986.-408с.: іл.

27. Іофе Э. Р. Яўрэі Магілёва ў XVI-пач. XX ст. //Магілёўская даўніна.- 1999.- №7.- С.13.

28. Калубовіч Я.Т. Магілёў у Паўночную вайну. //Магілёўская даўніна.- 1994.- №2.- С.61.

29. Кандрусевіч А. Спірыдон Собаль. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.- Мн., 1998.- С.80.

30. Карэлін У., Мельнікаў М. Абразы Маці Божай на Магілёўшчыне. //"Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць": Зб. навук. прац.- Магілёў, 2003.- С.37-38.

31. Клімуць Л.Я. Пра роспісы касцёла св. Станіслава. //Гісторыя Беларускага Падняпроўя: Матэрыялы навук. канф. 13-14 лістап. 1997 г..- Магілёў, 1999.- С.97.

32. Касмылёў В.С. Лютаўскае (1661 г.) паўстанне ў Магілёве. //Магілёўская даўніна.-1999.- №7.- С.13.

33. Катлярчук А. Карл XII у гісторыі і паданнях Магілёва. // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: Зб. навук. прац.- Магілёў, 2001.- С.95.

34. Кондратьева Л.Ф. Могилёв. Вехи развития за 50 лет (1944-1994). //Магілёўшчына. VII зборнік.- Магілёў, 1997.- С.98.

35. Кондратьева Л.Ф. Старая площадь. //V абласныя краязнаўчыя чытанні (28 кастр. 1993 г.).- Магілёў, 1994.- С.45.

36. Копытин В.Ф. К истории краеведческого изучения Могилёвщины. //Могилёвщина.- Магілёў, 1991.- С.67.

37. Копытина О.В. К истории открытия реального училища в г. Могилёве. //V абласныя краязнаўчыя чытанні (28 кастр. 1993 г.).- Магілёў, 1994.- С.74.

38. Кучинская Е. Гибель генерала Духонина. //Весн. Магілёва.-1995.-13 крас.

39. Литин А. Синагоги Могилёва. //Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: Зб. навук. прац.- Магілёў, 2001.- С.124.

40. Лысенка М. На крутым павароце гісторыі. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.- Мн.,1998.- С.165.

41. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі.-2-е выд.,дап.- Мн.:ВП”Экаперспектыва”.-1997.-486с.

42. Магілёўская хроніка Трафіма Раманавіча Сурты і Юры Трубніцкага. //Полымя. 1992.- №7.- С.144-175.

43. Маразевіч В.Л. Палітыка царызму на далучаных землях Беларусі ў канцы XVIII- пач. XIX ст.ст. //Магілёўская даўніна.- 1995.- №3.- С.21.

44. Марзалюк І.А. Да старажытнай гісторыі Магілёва. //Магілёўская даўніна.- 1994.- №2.- С.34.

45. Марзалюк І. А. Умацаванні Магілёўскага замка. //Магілёўшчына. V вып.- Магілёў, 1994.- С.20.

46. Марзалюк І. А. Да пытання аб узнікненні і этапах засялення тэрыторыі г. Магілёва ў святле новых археалагічных даследванняў. //Прыдняпроўе. Паведамленні абласной навуковай краязнаўчай канферэнцыі (28 кастр. 1992 г.).- Магілёў, 1993.- С.31.

47. Марзалюк І.А. Магілёўскае мінулае. //Ратуша.- 1994.- 25 лістап.-2 снеж.

48. Могилёв. Энцикл. справ.- Мн.: БелСЭ, 1990.-472с.: илл.

49. Могилевский Свято-Никольский женский монастырь.- Могилев-на-Днепре, 2003.

50. Названия улиц Могилёва. //Весн. Магілёва.- 1999.- 25 лют.

51. Ножнікаў. М. Як імя тваё, вуліца? //Магілёўс. праўда.- 1989.- 20 студз.

52. Ножников Н. Весьма фундаментальный юбилей. //Весн. Магілёва.- 2003.- 14 мая.

53. Опыт описания Могилёвской губернии. В 3-х кн.. Кн.2. /Под ред. А.С.Дембовецкого.- Могилёв-на-Днепре, 1884.-1002с.: илл.,карт.

54. Папялышка Дз.М., Шаўчэнка С.П. Яўрэі ў Магілёве. //Магілёўская даўніна.-1994.- №4.- С.70.

55. Піскун Ю. А.,Церашчатава В. В. Магілёўская школа іканапісу. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.- Мн., 1998.- С.75.

56. Православные монастыри Беларуси. Вып.5.- Минск: “Четыре четверти”, 2003.

57. Пушкин И. Прогулка по центру города – взгляд из настоящего. //История Могилёвского еврейства: документы и люди. В 2-х кн. Кн.1. /Сост. А.Литин.- Мн., 2002.- С.166-171.

58. Рыбакова С.Б. Иосифовский собор. //Магілёўшчына”. IV вып.- Магілёў,1993.- С.59.

59. Сидоренко Б.И. Могилёв в войне Великого княжества Литовского и Московского государства 1534 – 1537 гг. // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: Зб. навук. прац.- Магілёў, 2001.- С.42.

60. Сідарэнка Б.І. Найстаражытнейшыя звесткі пра Магілёў. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.-Мн.,1998.- С.27.

61. Сідарэнка Б.І. У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.- Мн., 1998.-С.33-89.

62.Сідарэнка Б. І. У складзе Расійскай імперыі. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.- Мн.,1998.- С.91.

63. Сідарэнка Б.І. Аўстрыйскі дыпламат Аўгусцін Мейерберг (1622-1688) аб Магілёве сяр. XVII ст. //Прыдняпроўе. Паведамленні абл. навук. краязн. канф. 28 кастр. 1992 г.- Магілёў, 1993.- С.35.
64. Сидоренко Б.И. Могилёв в годы Ливонской войны (1558-1583 гг.). // V абласныя краязнаўчыя чытанні (28 кастр. 1993 г.).- Магілёў, 1994.- С.28-39.
65. Сидоренко Б.И. Древний Могилёв: Очерки истории города в XIV-XVII вв.- Мн., 1997.- 150с.: илл.
66. Сидоренко Б.И. На извозчике – по Днепровскому... . //Могилёв. правда.- 2002.- 25 янв.
67. Сидоренко Б.И. Машека не был Робин Гудом. //Могилёв. правда.- 2002.- 22 нояб.
68. Сидоренко Б.И. Екатерина II в Могилёве вершила судьбы мира. //Могилёв. правда.- 2003.- 3 янв.
69. Сидоренко Б.И. Только 10 городских чиновников… . //Могилёв. правда.- 2003.- 25 июля.
70. Скворцов И. Ставка. //Весн. Магілёва.- 1997.- 6, 11 лют.
71. Смоліч А. Географія Беларусі: 4-е выд.- Мн.: Беларусь, 1993.-382с.: іл.
72. Соболевская О. Страницы жизни еврейской общины Могилёва в XIX – нач.XX вв. //Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: Зб. навук. прац.-Магілёў, 2001.- С.24.
73. Справка отдела охраны памятников архитектуры Управления по делам архитектуры при СНК БССР о разрушении и разграблении гитлеровскими оккупантами исторических памятников архитектуры на территории Белоруссии в 1941-1944 гг. //История Беларуси в документах и материалах.- Мн., 2001.- С.575.
74. Стаўка ў Магілёве. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.- Мн., 1998.- С.165.
75. Суздалева Л.Ф. К вопросу о синантропной флоре Могилёва и окрестностей. // Гісторыя Беларускага Падняпроўя: Матэрыялы навук. канф. 13-14 лістап. 1997 г.- Магілёў, 1999.- С.168.
76. Тарасава М.А. Аб Магілёўскай управе Паўночнага таварыства дзекабрыстаў. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.- Мн., 1998.- С.99.
77. Філіповіч І.І. “Міфы і праўда аб Магілёве”. Магілёў,1993.- 142с.: іл.
78 Филипович И.И. Предместье Луполово. //Магілёўшчына. V вып.- Магілёў, 1994.- С.62.
79. Фридман А. Записки о евреях… .//Магілёўская даўніна.- 1991.- №9.- С.67.
80. Щербакова С.В. Белорусский историк. //Паведамленні 2-й абласной краязнаўчай канферэнцыі (29 кастр. 1991 г.).- Магілёў, 1992.- С.53.
81. Ярохін А.П. Летапісец ігумен Арэст. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.-Мн., 1998.- С.108.
82. Яцкевіч З. Магілёўскія масты. //Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.-Мн., 1998.- С.123.

## ***АБАРОНА МАГІЛЁВА Ў 1941-м ГОДЗЕ.***

**(Аўтобусная экскурсія)**

Наша экскурсія пачынаецца на ***Савецкай плошчы***, месцы, дзе праходзілі жорсткія баі ў апошні дзень абароны горада – 25 ліпеня 1941 г. У гэты час быў ужо ўзарваны мост праз Дняпро і застаўшыеся ў жывых абаронцы горада сцякаліся да будынка 11-й школы, дзе размяшчаўся штаб 172-й стр. дывізіі, каб ноччу прарвацца з акружэння ці загінуць...

Падчас экскурсіі мы наведаем найбольш знакамітыя, паважаемыя і шануемыя магіляўчанамі і гасцямі горада месцы, звязаныя з геараічнай абаронай Магілёва ў ліпені 1941 г.

Першы аб'ект у нашым маршруце – ***"Зямлянка"***, куды мы і праедзем.

«Казалось, было холодно цветам
И от росы они слегка поблекли.
Зарю, что шла по травам и кустам,
Обшарили немецкие бинокли.
Такою всё дышало тишиной,
Что вся земля ещё спала, казалось.
Кто знал, что между миром и войной
Каких-то пять минут осталось?"

**С.Щипачев.**

Раніца 22 чэрвеня 1941 г. на заходняй граніцы пачалася громам кананады, палаючымі сёламі і гарадамі, шматлікімі чалавечымі ахвярамі. Крывавы след самай жорсткай і бязлітаснай вайны за ўсе часы чалавецтва пакаціўся па абшарах Савецкага Саюза.

Прайшло больш 60-ці год з пачатку другой сусветнай (1939-1945 гг.) і Вялікай Айчыннай (1941 – 1945 гг.) войнаў. Усё далей у глыбіню гісторыі адыходзіць час найвялікшых выпрабаванняў для нашага народа, і чым далей, тым яскравей паўстае перад намі ўвесь гераізм і трагізм гэтай вайны. Менавіта ў ёй сутыкнуліся дзве сістэмы, дзве супрацьлеглыя ідэалогіі, якія ўцягнулі ў барацьбу мільёны людзей. Нам, сёняшнім, пашчасціла, што воля і мужнасць воінаў Чырвонай Арміі і народаў кааліцыі сталі неадольнай перашкодай на шляху гітлераўскага фашызму.



Канстанцін Сіманаў.

Некалі ***Э.Хэмінгуэй*** абраніў фразу: падчас войнаў і рэвалюцый кнігі не пішуцца. Падзеі ліпеня 1941 г. пад Магілёвам сталі выключэннем. І адбылося гэта дзякуючы ***пісьменніку Канстанціну Сіманаву,*** які занатаваў, захаваў і данёс да нас праўду аб самых трагічных першапачатковых днях Вялікай Айчыннай вайны. Па волі лёсу ён аказаўся відавочцам упартай Магілёўскай бітвы, і як уніклівы летапісец перадаў у сваіх артыкулах і "Дзённіках ..." увесь яе жорсткі драматызм, веліч і славу.

На пачатку вайны асабліва ў складаным

становішчы аказаліся войскі Заходнягя фронту пад камандаваннем генерала арміі ***Д.Р.Паўлава.*** 29 чэрвеня 1941 г. 2-я і 3-я танкавыя групы армій “Цэнтр” вермахта ў раёне ўсходней Мінска замкнулі кальцо акружэння галоўных сіл Заходняга фронту Чырвонай Арміі. З 44 дывізій, якія фронт налічваў у пачатку вайны, 24 былі разгромлены, а астатнія знаходзіліся ў акружэнні ці адступалі, абяскроўленыя і дэмаралізаваныя, страціўшыя тэхніку і артылерыю...

З канца чэрвеня Галоўнае камандаванне Чырвонай Арміі пачало разгортваць войскі 2-га стратэгічнага эшалона па рэках Заходняя Дзвіна і Дняпро з задачай трывала абараняць рубеж і не дапусціць прарыву ворга на Маскву, бо гэта былі апошнія буйныя водныя перашкоды на шляху немцаў да сталіцы. З глыбіні краіны сюды падцягваліся вайсковыя злучэнні, але рабілася гэта, за рэдкім выключэннем, разрознена і неарганізавана, а таму заняць устойлівую абарону на Дняпроўскім рубяжы нашы часці не змаглі.




Схема абароны Магілёва.

Выключэннем стаў Магілёўскі абарончы раён. Ужо праз 4 дні пасля пачатку вайны гораду наканавана было стаць важным цэнтрам абароны ад насядаўшага ворага. 25 чэрвеня 1941 г. штаб Заходняга фронту і кіраўніцтва рэспублікі пераехалі з Мінска ў Магілёў. Грозны подых вайны ўжо апаліў горад – у гэты дзень варожая авіяцыя бамбіла чыгуначны вузел і мясакамбінат.

Перад вайной у горадзе налічвалася больш 46 буйных прамысловых прадпрыемстваў з 13 тыс. чалавек, працаваўшых на іх. Найбольш вядомымі з іх былі аўтарамонтны ***завод імя С.Кірава, фабрыка штучнага валакна імя В.Куйбышава, швейная фабрыка імя М.Валадарскага, трубаліцейны завод*** і інш. У Магілёве пражывала каля 100 тыс. чалавек, дзейнічалі педагагічны інстытут, чатыры тэхнікумы, тэхнічнае вучылішча, дзевяць сярэдніх і шэсць пачатковых школ, у якіх было 15 тыс. навучэнцаў, існавалі фабрычна-заводскае навучанне, калгасная школа, савпартшкола. Працавалі драматычны тэатр, два кінатэатры, 13 бібліятэк.

З пачаткам вайны ў Магілёве разгарнулася вялікая работа па мабілізацыі гараджан на барацьбу з наступаўшымі нямецкімі вайскамі. На прадпрыемствах і ва ўстановах прайшлі сходы і мітынгі, дзе былі вылучаны патрыятычныя лозунгі: ***“Айчына ў небяспецы!”, “Усе на барацьбу з ворагам!”, “Абаронім родны Магілёў!”.*** Мужнасць, гераізм і самаахвярнасць ва ўсе часы былі актуальнымі для кожнага пакалення, і абарона Магілёва – яскравы прыклад, дзе ўсе гэтыя якасці зліліся разам, дзе чырвонаармеец і апалчэнец, нярэдка з адной вінтоўкай у руках, згуртаваныя ідэяй патрыятызму, змагаліся да апошняга.



Магіляўчане на будаўніцтве абарончых збудаванняў.

Пехацінцы і артылерысты, рабочыя і студэнты выйшлі на ўскраіны горада, да берагоў Дняпра для будаўніцтва абарончага поясу вакол Магілёва. У кароткі тэрмін вакол горада была створана лінія ўмацаванняў у 25 км., выкапаны процітанкавы роў, акопы, траншэі. Другая лінія абароны стваралася непасрэдна ў горадзе. Дарогі з Мінска і Бабруйска на Магілёў былі прыкрыты сістэмай процітанкавай абароны. На найбольш верагодных накірунках танкавых атак ствараліся мінныя палі і вызначаліся зоны загараджальнага агню.

Органы ўлады прымалі тэрміновыя меры да эвакуацыі ў глыбіню краіны насельніцтва, прамысловага абсталявання, іншай маёмасці. У гэтыя дні з горада было вывезена 935 вагонаў з матэрыяльнымі каштоўнасцямі. У тыл эвакуіраваліся выхаванцы дзіцячых дамоў, тысячы кваліфікаваных рабочых і гараджан.

Аператыўна былі створаны і актыўна дзейнічалі ***атрады апалчэнцаў*** шоўкавай фабрыкі, трубаліцейнага, аўтарамонтнага, скуранога і цагельнага заводаў. Гарадскі штаб народнага апалчэння кіраваў паўсядзённай дзейнасцю падраздзяленняў, у якіх вывучалася баявое ўзбраенне і інш. падрыхтоўка да схватак з ворагам. На заводах апалчэнцы неслі ахову прадпрыемстваў, папярэджвалі варожыя дыверсіі, эвакуіравалі заводскае абсталяванне.Падраздзяленні апалчэнцаў тушылі пажары, ліквідавалі аварыі пасля налётаў фашысцкай авіяцыі, разам з міліцыяй падтрымлівалі ў горадзе парадак, дапамагалі мабілізоўваць насельніцтва на будаўніцтва абарончых збудаванняў.



Шапашнікаў Б.М.

Значную ролю ў мабілізацыі магіляўчан на абарону свайго горада адыграла абласная газета ***“Камунар Магілёўшчыны”***, пазней ***“За Радзіму!”,*** ў якой друкаваліся матэрыялы, заклікаўшыя працоўных і воінаў Чырвонай Арміі да гераічнай, самаахвярнай абароны горада, дапамагала лепш зразумець абставіны і абавязак кожнага ў цяжкі для Радзімы час.

Зараз мы паварочваем на ***Чавускае шасэ.*** Тут у лесе, злева ад старой чавускай дарогі (зараз справа) ў канцы чэрвеня 1941 г. размяшчаўся штаб Заходняга фронту, у якім працавалі ў той час Маршал Савецкага Саюза, начальнік Генеральнага Штаба РККА ***Б.М.Шапашнікаў***, які прыбыў у Беларусь у першыя дні вайны, і прадстаўнік Стаўкі Галоўнага камандавання Маршал Савецкага Саюза ***К.Я.Варашылаў***, які знаходзіўся ў Магілёве ў штабе Заходняга фронту з 27 чэрвеня па 1 ліпеня 1941 г.

## *“З Я М Л Я Н К А “*







У гэтым месцы вы бачыце адну з зямлянак (стылізаваная пабудова 1982 года) у якіх размяшчаўся ***штаб Заходняга фронту***. Тут у штабе, 1 ліпеня 1941 года адбылася нарада прадстаўнікоў Стаўкі Маршалаў Савецкага Саюза ***К.Я.Варашылава*** і ***Б.М.Шапашнікава***, новага камандуючага Заходнім фронтам ***А.І.Яроменкі*** з удзелам сакратара КП(б)Б ***П.К.Панамарэнкі,*** 1-га сакратара Магілёўскага абкама КПБ ***І.М.Макарава***, старшыні аблвыканкама ***М.Ф.Церахава,*** 1-га сакратара абкама ЛКСМБ ***Ф.А.Сурганава.*** На ёй былі распрацаваны канкрэтныя меры па ўмацаванню абароны г.Магілёва, разгледжаны пытанні, звязаныя з кіраўніцтвам баявымі дзеяннямі на дальніх падыходах да Дняпроўскага рубяжа. У гэты ж час у штабе фронту ***фарміраваліся дыверсійныя групы*** і накіроўваліся ў тыл ворага. Па сведчанні К. Варашылава, адсюль, у тыл ворага было накіравана некалькі дзесяткаў буйных і дробных дыверсійных груп. Аб становішчы ў р-не цяперашняй зямлянкі добра бачна з успамінаў начальніка штаба 4-й арміі палкоўніка ***Л.М.Сандалава***: “...в момент нашего приезда здесь было многолюдно и шумно. Лес был разбит на отдельные участки для каждого управления и отдела. На деревьях висели телефоны внутренней связи, под деревьями стояли столы с разложенными на них картами и папками. На всех участках красноармейцы строили землянки”.



Варашылаў К.Я.

Разам з тым, штаб фронту меў сувязь толькі з Масквой ды 4-й арміяй, становішча ж большасці часцей было невядома. За адыходзячымі войскамі імкліва наступалі буйныя танкавыя і механізаваныя сілы праціўніка. Многія з нашых падраздзяленняў апынуліся ў акружэнні, трапілі ў гіганцкія “катлы”, створаныя нямецкімі танкавымі клінамі.

Распрацаваны ў штабе Заходняга фронту ***план абароны Дняпроўскага рубяжа*** прадугледжваў арганізацыю ўпартага супраціўлення ворагу, стрымліванне і вымотванне яго на дальніх подступах да Магілёва. Гэту задачу павінен быў вырашаць 61-ы стр.



Сандалаў Л.М.

корпус пад камандаваннем генерал-маёра ***Бакуніна Ф.А***. у складзе 110-й (камандзір - палкоўнік ***Хлебцаў В.А***.) і 172-й (камандзір -генерал-маёр ***Раманаў М.Ц***.) стр. дывізій, а таксама пазней увайшоўшых у склад корпуса 137-й (камандзір - палкоўнік ***Грышын І.Ц***.) і 53-й (камандзір - палкоўнік ***Канавалаў Ф.П***.) стр. дывізій. Непасрэдна Магілёў абаранялі 110-я і 172-я стр. дывізіі ў наступным складзе:

***110-я стр. дывізія***– 394-ы стр.полк–камандзір палкоўнік ***Слепакураў Я.С.***

411-ы -“- - -“- падпалкоўнік ***Чысцякоў Я.П.***
425-ы -“- - -“- палкоўнік ***Пшанічнікаў А.С.***
601-ы гаўбічна-артылерыйскі полк -палкоўнік ***Якушаў***
355-ы лёгка-артылерыйскі полк - маёр ***Качарук Ф.С.***

***172-я стр. дывізія:***

388-ы стр. полк - камандзір палкоўнік ***Куцепаў С.Ф.***
514-ы -“- - -“- палкоўнік ***Боніч С.А.***
747-ы -“- - -“- падпалкоўнік ***Шчаглоў А.У.***
493-ы гаўбічна-артылерыйскі полк - палкоўнік ***Жывалуп І.Ф.***
340-ы лёгка-артылерыйскі полк - палкоўнік ***Мазалаў І.С.,***

а таксама падраздзяленні ***20-га механізаванага корпуса*** (без матчасці), асобныя дывізіёны і батальёны гэтых злучэнняў. Разам з воінамі рэгулярных часцей Чырвонай Арміі змагаліся і дабраахвотнікі-магіляўчане з атрадаў народнага апалчэння.


Хейнц Гудэрыян (у цэнтры).

Магілёў аказаўся на вастрыі наступлення ***2-й танкавай групы*** генерал - палкоўніка ***Х.Гудэрыяна***. На ўчастку Шклоў – Магілёў – Быхаў наступалі: 24-ы танкавы корпус (генерал ***фон Гейр***), 46-ы танкавы корпус (генерал ***фон Фіцінгоф***) і 47-ы танкавы корпус (генерал ***фон Лемельзен***), сярод якіх былі адборныя дывізіі СС “Рэйх” і гвардзейскі батальён “Вялікая Германія”. Усяго на гэтым участку да Дняпра падыходзілі 9 танкавых і матарызаваных дывізій, следам за імі, адстаўшы на 4-5 дзён ішлі пяхотныя дывізіі 4-й арміі фельдмаршала ***фон Клюге.***

Нягледзячы на значную перавагу ў сілах (у абаронцаў горада наогул не было танкаў і авіяцыі), нямецкія войскі не змаглі ўзяць Магілёў пакуль апошнія абаронцы не пакінулі яго. 23 дні працягвалася бітва на Дняпры, амаль увесь гэты час лунаў чырвоны сцяг над старажытнай магілёўскай ратушай. Каля двух дзесяткаў тысяч ворагаў і некалькі соцен іх танкаў закончылі свой “паход на Усход” каля сцен Магілёва.

## *“ЗАДНЯПРОЎЕ“*

Зараз ад ***“Зямлянкі”*** мы праедзем да аўтамабільнага ***кальца-развязкі ля мясакамбіната.***

У гэтым раёне на ўсходнім беразе Дняпра участак абароны на лініі ***Масток – Любуж – Грабянёва*** займалі ***425-ы стралковы, 601–ы гаўбічна-артылерыйскі (гап)***, ***355-ы лёгка-артылерыйскі (лап) палкі*** 110-й стр. дывізіі і ***747-ы стралковы (сп) полк*** 172-й стр. дывізіі



Шчаглоў А.У.

Асноўны цяжар барацьбы, пасля фарсіравання немцамі Дняпра, выпаў тут на 747-ы сп падпалкоўніка ***Шчаглова А.У***. і падтрымліваючы яго 601-ы гап палкоўніка ***Якушава***. Менавіта яны займалі асноўную лінію абароны (10 км.) амаль ад Любужа да Грабянёва. На пазіцыях палка былі выкапаны акопы, хады зносін, пабудаваны дзоты, устаноўлены процітанкавыя надаўбні і мінныя палі. На лясных дарогах створаны завалы, на высокіх дрэвах абсталяваны назіральныя пункты.

З першых дзён абароны падраздзяленні палка праводзілі разведвальныя баі. 10 ліпеня, каля в.Нядашава з’явіўся передавы дэсант праціўніка на матацыклах, узброены буйнакаліберными кулямётамі. Немцы сутыкнуліся з баявой аховай, якой камандаваў малодшы лейтэнант ***Каралёў.*** Ворагі не чакалі засады і былі расстраляны ва ўпор, невялікай частцы іх удалася выратавацца бегствам.

Пасля фарсіравання Дняпра ***10 ліпеня*** ў р-не в.Следзюкі Быхаўскага р-на значныя сілы вораг сканцэнтраваў каля в.Сідаравічы для забеспячэння пераправы сваіх асноўных сіл і далейшага наступлення па Гомельскай шашы на Магілёў.



Златаўстаўскі Г.І.

Па загаду ***камандуючага 13-й*** арміяй для ліквідацыі прарыву камандзір 747-га палка падпалкоўнік ***Шчаглоў*** сфарміраваў узмоцнены атрад у складзе 1-га батальёна палка з процітанкавымі гарматамі двух батарэй 2-га дывізіёна 601-га гап і дывізіёна 493-га гап. Атрад на чале з начальнікам штаба палка маёрам ***Златаўстаўскім Г.І.*** выступіў 10 ліпеня і к 22-00 заняў баявы парадак.

Бой пачаўся з раніцы 11 ліпеня артылерыйскім налётам па нямецкай мотапяхоце. Затым падняліся ў атаку нашы байцы і вораг адступіў да Дняпра, пакінуўшы дзясяткі забітых і каля 30 згарэўшых аўтамашын. Аднак, перагрупіраваўшыся і ўмацаваўшы сілы, немцы да канца дня адцяснілі і акружылі зводны атрад. Нашы воіны праявілі цуды гераізму. Загінуў палітрук ***Склярэнка,*** першым падняўшы сваю роту у атаку. Загінулі байцы разліку адной з гармат.

Застаўшыся адзін, паранены баец гэтага разліку ***Баранкоў*** працягваў бой.На падмогу яму падаспеў ***Смірноў*** з сувязнымі. Цаной нечалавечых намаганняў яны выкацілі з укрыцця гармату і ва ўпор пачалі расстрэльваць нямецкія танкі. Паранены маёр ***Златаўстаўскі*** працягваў кіраваць боем. У гэтым баі батарэя капітана ***Трафімава*** падпаліла 3 танкі, курсанты палкавой школы падбілі яшчэ 3.

На другі дзень немцы пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі накіравалі на храбрацоў да 40 танкаў і да палка пяхоты. 10 варожых машын прарваліся на стыку рот. Барацьбу з імі завязалі знішчальнікі танкаў, узброеныя гранатамі і бутэлькамі з запальнай вадкасцю. Батарэя лейтэнанта ***Касарукава*** трапнымі выстраламі падбіла 4 танкі.

Кожны, нават самы маленькі эпізод бою быў поўны гераізму. У разгар бою параніла і кантузіла палітрука кулямётнай роты ***Бардуна,*** які апрытомнеўшы, убачыў змоўкнуўшы кулямёт. Пераадолеўшы боль ён падпоўз да яго. Усяго 40 крокаў не дабеглі фашысты да прыціхшай пазіцыі, калі іх сустрэў свінцовы лівень. Бардун быў яшчэ раз цяжка паранены. Сабраўшыся з сіламі, ён змог кінуць 3 гранаты, апошняя з якіх, кінутая ўжо абяссіленай рукой, упала зусім блізка. Разам з набегшымі фашыстамі загінуў і адважны воін.

Баец ***Крылоў*** змог захапіць нямецкую бронемашыну, уварваўся на ёй у распалажэнне ворага, знішчыў гармату, прыслугу да яе і вёў бой да апошняга патрона.

Падчас гэтых двухдзённых баёў большая частка атрада маёра ***Златаўстаўскага Г.І.*** загінула, ***прапаў без вестак ён сам***, а ўцалеўшыя байцы і камандзіры адышлі на асноўную лінію абароны да Магілёва.



Сібіракоў В.В.

У час абароны горада ўвесь полк мужна змагаўся на пазіцыях. Асабліва пагражальнае становішча склалася, калі немцам удалося адціснуць падраздзяленні палка да Лупалава. Абарону на гэтым участку трымаў 2-гі батальён пад камандаваннем капітана ***Сібіракова В. В.*** Завязаўся жорсткі бой. На гэтым накірунку наступалі палкі 2-х нямецкіх пяхотных дывізій – 78-й і 23-й. Ім удалося адціснуць нашы часці яшчэ бліжэй да горада. Камандзір палка ***Шчаглоў А.У.*** загадаў контратакаваць ворага і выбіць яго з Лупалава. Уся прыданая палку артылерыя падтрымлівала контратаку. Удар быў раптоўным і скончыўся рукапашнай схваткай. Немцы не вытрымалі і пачалі адступаць. Але затым, перагрупіраваўшыся, зноў абрушыліся на пазіцыі 2-га батальёна. У гэтым баі выключны гераізм праявіў камандзір кулямётнай роты ***Зінакоў.***

Лупалава некалькі разоў пераходзіла з рук у рукі, але панёсшы значныя страты 2-гі батальён капітана ***Сібіракова*** вымушаны быў пакінуць гэты раён і адыходзіць у лясы за Любуж.

Да 25 ліпеня праціўнік сціснуў кола акружэння. Немцы ярамі і лашчынамі, праз палі пшаніцы на левым беразе Дняпра прасачыліся ў тыл

747-га сп і адрэзалі яго ад асноўных сіл дывізіі. Загад камандзіра дывізіі генерал-маёра ***Раманава М.Ц***. – у крытычнай сітуацыі прабівацца да маста праз Дняпро – воіны палка выканаць не змаглі. У гэтыя ж суткі астаткі палка, сабраўшыся ў лясах каля Любужа, адышлі да в.Сухары Магілёўскага раёна, дзе злучыліся з падраздзяленнямі 61-га стр.корпуса і выходзілі з акружэння пад кіраўніцтвам камандзіра корпуса генерал-маёра ***Бакуніна Ф.А.***



Бакунін Ф.А.

Мужнасцю і гераізмам пры абароне горада на левым беразе Дняпра вызначыліся і воіны 20-га механізаванага корпуса генерал-маёра ***Ведзянеева М.Д.*** Часці корпуса, з баямі адступаючы ад Мінска, страцілі амаль усю тэхніку, акрамя артылерыі, і ваявалі ў пешым страі. 51-ы танкавы полк пад камандаваннем нашага зямляка падпалкоўніка ***Якубоўскага І.І.*** (пазней двойчы Герой Сав.Саюза, Маршал Савецкага Саюза, нам. міністра абароны СССР) змагаўся за чыгуначную станцыю Лупалава, захапіў пантонны парк, прызначаны немцамі для фарсіравання Дняпра і вялікую колькасць іншай ваеннай маёмасці, якая была знішчана.



Якубоўскі І.І. (курсант)

Пра выхад з акружэння гэтай ***Задняпроўскай групы*** да нядаўняга часу не было вядома амаль нічога, акрамя кароценькіх успамінаў удзельнікаў баёў. А яна ж была самым шматлікім злучэннем абаронцаў горада і налічвала па нямецкіх дадзеных (бо нашых не захавалася) каля 9 тыс. воінаў Чырвонай Арміі і мела 60 гармат, баявую тэхніку, аўтамашыны, коней і інш. Гэта былі часці 61-га стр. і 20-га механізаванага карпусоў сабраныя з астаткаў 5-ці нашых дывізій.

Сканцэнтраваўшыся ў лясных масівах ля в. Сухары на берагах р. Расты, войскі ў ноч з 25 на 26 ліпеня 1941 г. рушылі на поўдзень, каб потым павярнуць на Чавусы. Але шлях ім ужо быў перакрыты 78-й пяхотнай, а пазней і асобнымі часцямі 23-й пяхотнай дывізій вермахта. Пасля жорсткіх двухдзённых баёў у р-не ***в.в.Благавічы – Машок - Цемналессе-Самулкі ў Чавускім раёне*** злучэнне перастала існаваць.



Воранаў І.В.

Падчас прарыву з акружэння пад Благавічамі загінуў камісар 61-га стр. корпуса ***Воранаў І.В.***, начальнік палітаддзела корпуса ***Турбінін А.І.***, камісар ***Навасельцаў*** і інш. Наогул жа, у гэтых баях загінула 2500 нашых воінаў і 5300 было ўзята ў палон. Зараз на месцы гэтага прарыву ля шашы Магілёў – Чавусы ў в. Самулкі ўстаноўлены ***мемарыяльны помнік*** у выглядзе гарматы і стэлы з надпісам: ***“Воінам 61-га стр. корпуса, абараняўшым Магілёўскі рубеж у ліпені 1941 г., здзейсніўшым прарыў і выхад з акружэння ў Чавускім раёне па лініі в.в. Самулкі – Цемналессе – Удоўск – Машок – Благавічы”.***

Далей мы праедзем на праспект Шміта, да мемарыяльнага комплекса на месцы былога канцэнтрацыйнага лагера для нашых ваеннапалонных.

## *“БЫЛЫ АЭРАДРОМ. МЕМАРЫЯЛЬНЫ КОМПЛЕКС НА ПРАСПЕКЦЕ ШМІТА”*

У дні абароны горада гэты раён абараняў 3-ці батальён капітана ***Сакалова*** 747-га сп, а пасля яго смерці падраздзяленнем камандаваў нач.штаба батальёна, ст.лейтэнант ***Свінароў.***

Да вайны і ў ліпені 1941 г. на Лупалаве размяшчаўся ***ваенны аэрадром***, які абслугоўваў ***268-ы батальён аэрадромнага абслугоўвання***. З 25 па 30 чэрвеня 1941 г. на аэрадроме базіраваўся ***313-й асобны разведвальна-бамбардзіровачны авіяполк (арбп), пазней штурмавы-авіяцыйны полк (шап).*** 25 чэрвеня полк удзельнічаў у масіраваным бомбавым удары (адным з першых у вайне) па буйному прамысловаму цэнтру Германіі – ***Гамбургу.*** Для выканання гэтага задання быў створаны зводны атрад – 100 лепшых экіпажаў бабмардзіроўшчыкаў на чале з камандзірам 1-й эскадрыллі маёрам ***Цітовым.*** Гэты налёт на Гамбург 25 чэрвеня 1941 г. ашаламіў нямецкае вярхоўнае камандаванне сваёй раптоўнасцю. Адбылася бамбардзіроўка ноччу з даволі дакладным пападаннем у прамысловыя аб’екты, у сувязі з чым германскі друк доўга каменціраваў ***“двухтысячны налёт рускіх на Гамбург”.***

Пад Магілёвам гэты полк праводзіў разведку, наносіў удары па пераправах і калонах варожых войск. З аэрадрома былі здзейснены сотні баявых вылетаў у раён Слуцка, Глуска, Старых Дарог, Бабруйска, Беразіно і Бялыніч - усюды, дзе заўважалася вялікая колькасць варожых войск і тэхнікі.

У першыя дні вайны у раёне ***Беласток–Ваўкавыск*** апынуліся ў акружэнні больш за 350 тыс. нашых байцоў і камандзіраў, з якімі поўнасцю адсутнічала сувязь. Як бачна з апісання баявога шляху 313-га шап, па загаду ***Варашылава К.Я.*** і ***Шапашнікава Б.М.*** лётчыкі палка на працягу некалькіх дзён устанавілі месцазнаходжанне акружаных часцей і сувязь з імі. Для арганізацыі вываду воінскіх часцей з акружэння, з аэрадрома ***Магілёў*** на самалётах да іх былі дастаўлены камандзіры штаба Заходняга фронту на чале з нам. камандуючага генерал-лейтэнантам ***Болдзіным І.В.*** Аднак, у выніку, вывесці з акружэння яны змаглі толькі нязначную частку нашых войск, 1654 чырвонаармейца. Рабілася гэта аперацыя па загаду ***Сталіна І.В.*** і адказваць за яе неўдачу прышлося ***Болдзіну І.В.*** За ўсю вайну ён атрымаў толькі чарговае вайсковае званне генерал-палкоўніка ў 1944 г. Пачынаў вайну нам.камандуючага фронтам і закончыў яе на той жа пасадзе, так і не атрымаўшы звання Героя Савецкага Саюза. Такога ў гады вайны не было ні з адным савецкім генералам.



Болдзін І.В.

Важную ролю ў штурмоўцы наземных калон нямецкіх войск у раёне Магілёва адыграла эскадрылля штурмавікоў “ІЛ-2” вопытнага лётчыка, ст. лейтэнанта ***Замаруева І.В.***, якая прыбыла ў Магілёў і ўвайшла ў склад 313-га арбп ў пачатку ліпеня 1941 г.



Замаруеў І.В.

Шквалам куль, снарадаў і бомб накрывалі штурмавікі дарогі, па якіх рухаліся немцы. Адзін, другі, трэці заход... . Ад калоны застаюцца толькі трупы і раскіданыя абломкі тэхнікі. У адзін з баёў над Магілёвам быў збіты, страціў самалёт, але пешшу вярнуўся з-пад Быхава ў свой полк і працягваў геройскі ваяваць.

На жаль, штурмуючы калоны ворага на палях і дарогах Заходняга фронту, ён 18 снежня 1941 г. загінуў. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях пад Магілёвам і на падыходах да Масквы, 25 студзеня 1942 г. Указам ПВС СССР ***Замаруеву Івану Васільевічу*** прысвоена ***званне Героя Савецкага Саюза (пасмяротна).***

У небе над Магілёвам вызначыўся і камандзір звяна ст. лейтэнант ***Цярохін М.В.***. 7 ліпеня 1941 г., калі вялікая група нямецкіх бамбардзіроўшчыкаў “Хейнкель” рухалася бамбіць Магілёў, у паветра было паднята звяно Цярохіна. Як толькі варожыя самалёты вынырнулі з аблокаў, нашы знішчальнікі абрушыліся на ворага. Цярохін хутка зайшоў у хвост “Хейнкелю” і, нягледзячы на шквальны агонь нямецкага стралка, прашыў бамбардзіроўшчык чэргамі з кулямёта. Варожы самалёт урэзаўся ў зямлю. У гэтым баі лётчыкі звяна падбілі яшчэ два нямецкіх самалёты. Калі на аэрадроме механік агледзеў машыну Цярохіна, у ёй аказаліся разбітымі 2 цыліндры ў маторы і 60 прабоін у фюзеляжы і крылах, былі пашкоджаны вінт і ўпраўленне.



Лётчыкі – удзельнікі абароны Магілёва
(у цэнтры - Цярохін М.В.)

На другі дзень, 8 ліпеня 1941 г., над горадам з’явілася новая хваля бамбардзіроўшчыкаў, ужо “Ю-88”. На аэрадроме ў гэты час знаходзілася дзевяць нашых знішчальнікаў “І-16”, шэсць з іх уступілі ў бой з нямецкімі знішчальнікамі прыкрыцця, а ст.лейтэнант Цярохін М.В. павёў сваіх вядомых на галаўное звяно бамбардзіроўшчыкаў. Аднак у гэты дзень яму не шанцавала, бліжэйшы да Цярохіна “юнкерс”, які ён паліваў агнём свайго кулямёта, ніяк не хацеў гарэць. Растраціўшы боезапас, лётчык вырашыў тараніць ворага. Ён падышоў да варожага бамбардзіроўшчыка ушчыльную і вінтом свайго “І-16” сekануў “юнкерсу” хвастовае апярэнне. Нямецкі бамбардзіроўшчык перайшоў у некіруемае падзенне.

Вось тут і здарылася тое, што можна ўбачыць раз у жыцці. “Юнкерсы” ішлі ў вельмі шчыльным страі. Пратаранены Цярохіным бамбардзіроўшчык ударыў крылом свайго вядучага. Той рэзка адвярнуў у лева і сутыкнуўся з левым вядомым. Так, па успамінах сведка-відавочцы, лётчыка-знішчальніка ***М.Дзевятаева***, які ўдзельнічаў у гэтым баі, усё галаўное звяно “Ю-88” і ўпала на зямлю.

Але бой Мікалая Цярохіна на гэтым не закончыўся. Ён спускаўся на парашуце ў акружэнні збітых ім нямецкіх лётчыкаў, якія таксама прызямляліся на парашутах. Экіпаж аднаго з “юнкерсаў” страляў у нашага лётчыка. Цярохін адстрэльваўся. Прызямліліся яны на полі, у некалькіх кіламетрах ад аэрадрома. Да месца прызямлення паспелі падбегчы калгаснікі. Яны абяззброілі немцаў і звязалі ўсіх адной вяроўкай, канец якой далі ў рукі Цярохіну. Так ён і з’явіўся на КП дывізіі – з пісталетам у адной руцэ і з вяроўкай, якой былі звязаны палонныя немцы, - у другой...

За гэтыя подзвігі ў небе над нашым горадам ***Мікалай Васільевіч Цярохін*** быў узнагароджаны ***ордэнам Леніна.*** Восенню 1941 г. усе франты абляцеў верш ***К.Сіманава*** “Сакрэт перамогі”, апублікаваны ў “Красной звезде”. Ён быў прысвечаны М. Цярохіну. Паэт пісаў:

“Есть такие ребята,
Любимые сыновья,
Когда они учатся в школе,
Школа им – как семья,
Когда начинают работать,
Их любит родной завод,
Когда они вырастают,
Их узнаёт народ…
Был ***Николай Терёхин***
Одним из таких ребят,
Которым легче погибнуть,
Чем отступить назад”.


Дзевятаеў М.П. успамінае...

Актыўны удзел у абароне горада прымаў і згаданы вышэй, легендарны ***Міхаіл Пятровіч Дзевятаеў,*** які у першай палове ліпеня 1941 года збіў тут свой “юнкерс”. За геройскія баявыя дзеянні ў раёне Магілёва ён, разам з групай лётчыкаў, быў вызваны ў Маскву і ўзнагароджаны ***ордэнам Чырвонага Сцяга***.

Пазней, у 1944 годзе, лётчык параненым трапіў у нямецкі палон, адкуль разам з 10-цю вязнямі канцлагера здзейсніў дзёрзкі ўцёк на варожым самалёце. За гэты адважны ўчынак ст.лейтэнанту ***Дзевятаеву М.П***. Указам ПВС СССР ад 15 жніўня 1957 года было прысвоена

***званне Героя Савецкага Саюза***.

Немцы разумелі значэнне авіяцыі для абароны Дняпроўскага рубяжа, а таму неаднаразова прадпрымалі спробы захапіць аэрадром. 3-му батальёну 747-га стр. палка ў канцы абароны па некалькі разоў у дзень прыходзілася ўступаць у рукапашны бой з ворагам. 22 ліпеня 78-й нямецкай пяхотнай дывізіі масіраваным ударам уздоўж усходняга берага Дняпра ўдалося рассячы абарону Магілёва і захапіць аэрадром. Баі перанесліся да ст. Лупалава і да маста праз Дняпро.



Канцлагер для савецкіх ваеннапалонных

Калі горад быў пакінуты часцямі Чырвонай Арміі, на былым полі аэрадрома фашысты ў жніўні 1941 г. стварылі ***Лупалаўскі лагер смерці (шталаг № 813),*** для ваеннапалонных радавога і сяржантскага саставу Чырвонай Арміі. Акупіраваўшы Магілёў, фашысты ўсіх ваеннапалонных (у тым ліку і мірных грамадзян) сагналі ў Казіміраўку. Камандзіраў і камісараў, якіх змаглі выявіць, расстралялі, пасля гэтага астатніх накіравалі ў Ермалавічы на калгасны двор. Праз 5 дзён, адпусціўшы ўсіх неваеннаабязаных, ваеннапалонных адправілі ў Магілёў, ва ўжо абсталяваны лагер на Лупалаве. Восенню 1941 г. тут ужо знаходзіліся дзесяткі тысяч чалавек.



Мемарыяльны комплекс на месцы Лупалаўскага лагера смерці

Большая частка вязняў утрымлівалася пад адкрытым небам, сярод іх панаваў тыф. Лагер быў абнесены калючай провалакай, па якой ішоў электрычны ток. Ваеннапалонных групамі вадзілі на работу, аслабеўшых па дарозе прыстрэльвалі. Кожныя суткі памiралі дзясяткі і сотні чалавек. За час існавання лагера ( да вясны 1943 г.) памёрла ад хвароб і было расстраляна, па розных звестках, ***ад 40 да 80 тыс. чалавек.***

Многія вязні лагера былі выратаваны жыхарамі Магілёва, якія, асабліва ў першыя месяцы існавання лагера, прыходзілі да аховы і выкуплялі ваеннапалонных ці “пазнавалі” ў іх сваякоў і забіралі з дазволу вартавых. Пазней частка зняволеных была выратавана падпольшчыкамі горада, якія, абслугоўваючы

лагер, вывозілі ваеннапалонных пад відам памёршых і перапраўлялі іх у партызанскія атрады. Па адной з версій тут нейкі час знаходзіўся былы камандзір 172–й дывізіі генерал-маёр ***Раманаў М.Ц.***

Зараз на тэрыторыі Лупалаўскага лагера смерці, на брацкіх могілках у гонар тых, хто загінуў за свабоду Радзімы, згарэў у полымі Вялікай Айчыннай вайны, пабудаваны ***мемарыяльны комплекс*** і гарыць вечны агонь (арх. ***М.Янчык***).

## ***“Б У Й Н І Ц К А Е   П О Л Е “***

За полем поле, як за словам слова
У спеве аб свяшчэнным, дарагім
Есць Барадзінскае, ёсць поле Кулікова
І гэтае, вядомае не ўсім.
О поле бою, Буйніцкае поле,
Вясною, летам, восенню сырой
Выносіш ты ў разгорнутым прыполе
Мінулае – з каменнем і жарствой.

***Аляксей Пысін***

Наступны прыпынак экскурсіі – знакамітае ***Буйніцкае поле.*** Калі мы заглянем у гісторыю, то ніяк не зможам мінуць падзею, якая адбылася тут у 1595 г. Умела арганізаваная абарона двух тысяч украінскіх казакоў і сялян пад кіраўніцтвам ***С.Налівайкі*** прымусіла панесці значныя страты і не дазволіла дасягнуць перавагі 18-ці тысячнае польска-літоўскае войска на чале з ***К.Буйвідам***. Бітва грымела на працягу ўсяго дня, пасля чаго, як адзначае аўтар ***Баркалабаўскай хронікі,*** “тепер же Литва от козаковъ отступивши до Могилева...” і далей “Литва за казаками гналася ажъ до Рогачёва но ничого злого не вчинили казакамъ”. З таго часу засталося ў беларусаў шмат песень і паданняў пра смелых казакоў, іх атамана і увогуле, пра казацка-сялянскія паўстанні. Буйніцкае ж поле стала гераічным і легендарным.

Праславіў Буйнічы і першадрукар ***Спірыдон Собаль***, які ў друкарні Буйніцкага манастыра ў 1635 г. выпусціў у свет кнігу ***“Псалтир блаженного пророка и царя Давида”.***

З 1797 па 1801 гг. тут меў прытулак стаўленік Кацярыны II, з 1782 г. магілёўскі архібіскуп, а пазней архібіскуп усіх каталіцкіх цэркваў (касцёлаў) Расійскай імперыі, вучоны і пісьменнік – ***С.І.Богуш-Сестранцэвіч***, які пры ***Паўле I*** (1796-1801) трапіў у няміласць.

Пад час абароны Магілёва ў ліпені 1941 г. на Буйніцкім полі адбылася адна з найбольш жорсткіх бітваў з танкавымі часцямі вермахта.

У пачатку ліпеня 1941 г. пасля таго, як камандуючы Заходнім фронтам генерал арміі ***Паўлаў Д.Г.*** быў арыштаваны, фронтам з Магілёва некалькі дзён камандаваў генерал-лейтэнант ***Яроменка А.І.*** Менавіта ён, як ніхто іншы, ведаў што тут адбывалася і па праву падраздзяляў падзеі абароны горада на 3 этапы:

- першы працягваўся з ***3 па 10 ліпеня 1941 г.,*** калі адыходзячыя часці 13-й арміі і карпусоў, заняўшы абарону на Дняпроўскім рубяжы, вялі напружаныя разведвальныя баі на дальніх і бліжніх подступах да горада. Перадавыя атрады на выгадных рубяжах, у 20–50 км. наперадзе ад асноўнай лініі абароны, сустракалі праціўніка і нечаканымі ўдарамі вымушалі яго разгортвацца ў баявы парадак і тым самым замаруджвалі прасоўванне немцаў, выйгравалі час, неабходны для стварэння абарончага рубяжа па Дняпру і канцэнтрацыі войск Чырвонай Арміі, падыходзячых з тыла;


Паўлаў Д.Г.

- з ***10 па 16 ліпеня*** ўпартыя баі праходзілі ўжо ў перадполлі, на асноўнай паласе абароны перад Магілёвам і на ўсходнім беразе Дняпра ў раёнах фарсіравання ворагам ракі. На гэтым этапе нашы войскі прадпрымалі шматлікія контратакі з мэтай ліквідаваць гэтыя плацдармы на флангах 61-га стр. корпуса ў р-не Шклова і Быхава. Важнейшым вынікам баёў гэтага этапу было вымотванне і знішчэнне жывой сілы ворага і яго тэхнікі;

- з ***16 па 26 ліпеня*** працягваўся трэці этап абароны, калі войскі, гераічна абараняўшыя Магілёў, апынуліся ў поўным акружэнні. Злучэнні 61-га стр.корпуса былі акружаны і расчленены ворагам. 172–я стр.дывізія і 394-ы

стр.полк 110-й дывізіі аказаліся адрэзанымі ад астатніх сіл корпуса на заходнім беразе Дняпра.

Зараз мы праязджаем па ***вул. Чалюскінцаў.*** За мяжой горада яна пераходзіць у Бабруйскае шасэ на якім 3 ліпеня, у 50 км ад Магілёва, адбыліся ***першыя баі*** з наступаўшымі нямецкімі часцямі, якія лічацца пачаткам гераічнай абароны Магілёва.

3-4 ліпеня баі з перадавымі атрадамі 24-га і 46-га танкавых карпусоў 2-й групы генерала ***Х.Гудэрыяна*** разгарнуліся на р.Друць ля в.Чачэвічы і на р.Вослiўка ў раёне Бялынiч.

На р.Друць у розны час уступілі у бой рота лейтэнанта ***Ларыёнава А.П.*** і разведвальны батальён капітана ***Мяцельскага М.В.*** 172-й стр.дывізіі, якія падбілі 5 танкаў і знішчылі дзесяткі ворагаў. Адзін з гэтых танкаў, узарваны разам з мастом праз р.Друць у Чачэвічах, праляжаўшы на дне ракі 55 год, быў падняты і ўстаноўлены ў 1996 г. на мемарыяле “Буйніцкае поле”.



Хігрын Б.Л.

Стрымліваючыя баі ў раёне Бялыніч вялі батальён ст.лейтэнанта ***Ваўчка А.П.,*** артылерыйскі гаўбічны дывізіён капітана ***Хігрына Б.Л.,*** атрымаўшага за гэты бой званне Героя Савецкага Саюза (пасмяротна), і 7-я паветрана-дэсантная брыгада 4-га пав.-дэсантнага корпуса. Значную колькасць танкаў і іншай тэхнікі, сотні салдатаў страціў вораг, перш чым яму ўдалося адціснуць нашы часці да Магілёва. Жорсткія баі разгарнуліся за кожную лагчыну, за кожную палявую дарогу, за кожнае больш-менш зручнае месца. Рубяжамі абароны былі балоцістыя берагі рэк Восліўка, Вабіч, Лахва, на якіх сотні ворагаў знайшлі свае магілы.

10 ліпеня немцы ўшчыльную наблізіліся да асноўнай лініі абароны горада. Мы пад'язджаем зараз да ***мемарыяльнага комплекса "Буйніцкае поле"*** - поля салдацкай славы. На ім здзейснілі бессмяротны подзвіг воіны 388-га стралковага і 340-га лёгка-артылерыйскага палкоў, 174-га асобнага знішчальнага процітанкавага дывізіёна, атрад народнага апалчэння шоўкавай фабрыкі і іншыя падраздзяленні, абараняўшыя Магілёў ад нямецкіх танкавых і матарызаваных часцей.

Абаронай на гэтым участку кіраваў камандзір 388-га стр.палка палкоўнік ***Куцепаў С.Ф.*** Таленавіты камандзір, па вызначэнню ***К.Сіманава,*** ён "...был способен на очень многое, останется он жить под Могилёвом".



Куцепаў С.Ф.

***Сямён Фёдаравіч Куцепаў*** нарадзіўся ў 1896 г. у Тульскай вобласці, у 1915 г. скончыў камерцыйнае вучылішча і быў прызваны ў армію. Закончыўшы Аляксееўскае ваеннае вучылішча ў званні падпаручыка ваяваў з немцамі на Паўднёва-Заходнім фронце. З 1918 г. у Чырвонай Арміі. Служыў начальнікам страявога аддзела дывізіі, нач.штаба палка. У 1939 г., калі ў Тульскай вобласці быў сфарміраваны 388-ы стр.полк, Куцепаў С.Ф. быў прызначаны яго камандзірам. У 1940 г. удзельнічаў у савецка-фінскай вайне, а за мужную абарону горада Магілёва ў ліпені 1941 г. Указам ПВС СССР ад 9 жніўня 1941 г. быў узнагароджаны ***ордэнам Чырвонага Сцягу***, яго імем названа вуліца ў Задняпроўі.

Для абароны Магілёва полк у складзе 172-й стр. дывізіі прыбыў з Тульскай вобласці ў канцы чэрвеня 1941 г. Настойлівы, энергічны і валявы камандзір С.Ф.Куцепаў здолеў згуртаваць вакол сябе асабовы састаў палка, выпрацаваць высокія баявыя якасці ў воінаў, якія ў поўнай меры праявіліся пры абароне нашага горада.

Пад кіраўніцтвам Куцепава С.Ф., тут, на рубяжы р.Дняпро – Бабруйская шаша – чыгункі на Жлобін і Асіповічы – в.Цішоўка, была створана глыбокаэшаланіраваная абарона. На працягу 12 дзён полк падрыхтаваў 2 лініі акопаў поўнага профілю, злучаных траншэямі. Перад пярэднім краем былі

абсталяваны суцэльныя процітанкавыя мінныя палі і драцяныя загароды. Акрамя таго, мінныя палі былі зроблены і ўнутры абароны на верагодных накірунках прарыву танкаў праціўніка. Прадумана была арганізавана і сістэма агню артылерыі і стралковай зброі. Да 10 ліпеня ўвесь полк закапаўся ў зямлю. Куцепаў С.Ф гаварыў прыехаўшым да яго ў полк франтавым карэспандэнтам ***К.Сіманаву*** і ***П.Трошкіну***: “...у мяне тут дваццаць кіламетраў акопаў і хадоў зносін выкапана. Гэта дакладна. Калі пяхота вырашыла не адыходзіць і закапалася, то ніякія танкі нічога з ёй зрабіць не змогуць, можаце мне паверыць”.

Да 10 ліпеня разведатрады, передавыя падраздзяленні дывізіі і 388-га стр.палка вялі жорсткія баі з перадавымі часцямі праціўніка, які паступова адціскаў іх на асноўныя пазіцыі абароны палка. У ходзе гэтых баёў немцы зразумелі, што горад ім давядзецца браць штурмам. Разведчыкамі палка было высветлена, што на паўднёва-заходнім накірунку дзейнічаюць часці 35-га і 36-га танкавых палкоў 3-й танкавай дывізіі генерала ***Модэля***.

10 ліпеня немцы, рыхтуючыся да наступлення на Магілёў, сканцэнтравалі ў лясах ля вв.Дашкаўка і Салтанаўка буйную танкавую групоўку. Даведаўшыся аб гэтым, камандаванне 172-й стр.дывізіі вырашыла апярэдзіць нямецкіх танкістаў і правяло артылерыйскі агнявы налёт па скапленню варожых танкаў, у выніку чаго немцам былі нанесены значныя страты.

А ў ноч з 10 на 11 ліпеня конны атрад знішчальнікаў танкаў на чале з ***Філімонавым,*** пад пакровам цемры, прайшоўшы праз нашы мінныя загароды, хутка рушыў у распалажэнне ворага. У поўнач смельчакі напалі на варожую ахову і закідалі нямецкія танкі гранатамі і бутэлькамі з запальнай вадкасцю. Магутныя выбухі ўскалыхнулі зямлю. Атрад з нязначнымі стратамі вярнуўся ў горад.

Астаткі ночы прайшлі ў цішыні. Аднак гэта была грозная цішыня, за якой згадваўся цяжкі бой і вялікія страты. І ў батальёне капітана ***Гаўрушына,*** асядлаўшага Бабруйскую шашу, і ў 1-м батальёне маёра ***Волкава,*** займаўшага правы фланг абароны ў р-не в. Цішоўка, якая знаходзіцца справа ад нас, байцы рыхтаваліся да маючага адбыцца бою. Такая ж работа кіпела і ў батальёне капітана ***Абрамава,*** іншых падраздзяленнях, якія складалі 2-гі эшалон абароны палка.


Мазалаў І.С.

Артылерысты 340-га лёгка-артылерыйскага палка палкоўніка ***Мазалава І.С.*** і 174-га асобнага знішчальнага процітанкавага артылерыйскага дывізёна капітана ***Уласава І.*** у апошні раз аглядалі асноўныя і запасныя пазіцыі гармат, звяралі арыенціры.

Раніцай ***11 ліпеня*** зямля здрыганулася ад грохату выбухаў. Хваля за хваляй заходзілі нямецкія бамбардзіроўшчыкі на пазіцыі палка, перадавыя часці якога знаходзілася каля ***Цвінтэра*** (п.Буйнічы) і ўтрымлівала танканебяспечны стары шлях на Дашкаўку-Быхаў. Пасля бамбардзіроўкі пачаўся іх артылерыйскі

абстрэл. Пыль і дым стаялі суцэльнай сцяной над нашай абаронай. З назіральных пунктаў далажылі, што, разгарнуўшыся ў баявы парадак, да пазіцый набліжаюцца варожыя танкі. За імі густымі ланцугамі рухалася пяхота.

Напэўна, нямецкае камандаванне палічыла, што дзеяннямі авіяцыі і артылерыі нашы абарончыя ўмацаванні знішчаны, а баявы дух абаронцаў падаўлены. У адкрытых люках танкаў былі бачны галовы афіцэраў, бяспечна, з закатанымі да лакцей рукавамі мундзіраў, ішлі нямецкія салдаты. Артылерыя 340-га лап адкрыла загараджальны агонь. Некалькі танкаў загарэлася, аднак грымучая лавіна нястрымна працягвала каціцца наперад.

Дзесьці за паўкіламетра да пазіцый уверх узнялася чырвоная ракета і тут жа ў бой уступіла сістэма агню процітанкавай і стралковай зброі. Адзін за другім застываюць на полі бою танкі, падняўшы ў неба замоўкшыя гарматы і пускаючы чорныя аблокі дыму. Пяхота таксама панесла значныя страты і залягла. Але ўцалелыя танкі ўжо падыходзілі да пярэдняга краю, падмінаючы драцяныя загароды, за якімі размяшчаліся мінныя палі. Яшчэ некалькі танкаў падарвалася на мінах. Пяхота зноў паднялася ў атаку, але агонь кулямётаў і мінамётаў вымусіў кінуцца яе наўцёкі. Адышлі ў лес і застаўшыеся танкі. Перад нашымі пазіцыямі засталося каля 300 забітых немцаў і 20 застыўшых танкаў. Частка з іх, страціўшы ход, ператварылася ў агнявыя кропкі, якія працягвалі непакоіць абаронцаў.



Штабная нямецкая машына, падбітая пад Буйнічамі.

Каманда гранатамётчыкаў на чале з лейтэнантам ***Гусейнавым*** з флангаў атакавала падбітыя танкі і падпаліла іх. Гранатамётчыкі дабілі 10 танкаў і захапілі ў палон 20 варожых танкістаў.

Вечарам бой заціх. Ноччу нямецкія танкі былі падарваны, адноўлена парушаная сістэма абароны, папоўнены боепрыпасы і адпраўлены ў шпіталь параненыя. Усім было зразумела, што немцы, збянтэжаныя няўдалым наступленнем, працягнуць упарты штурм, каб зламаць супраціўленне абаронцаў горада.

У падраздзяленнях з захапленнем расказвалі аб шматлікіх героях мінулага бою. Расказвалі аб камандзіры кулямётнага разліку ***Цубко.*** Цяжка паранены, ён сам лёг за кулямёт, калі загінулі байцы разліку, і працягваў агнём знішчаць ворагаў, якія падбіраліся да пярэдняга краю. Ён моцна сышоў крывёю і страціў прытомнасць, але атака была адбіта.

Дзень ***12 ліпеня*** зноў пачаўся жорсткай бамбардзіроўкай. Палкоўнік ***Куцепаў С.Ф***. і камандзір 340-га лап палкоўнік ***Мазалаў І.С.*** вынеслі свае назіральныя пункты на вышыню за чыгуначнай станцыяй Буйнічы. Адсюль цудоўна праглядвалася вялікае поле і пасёлак Векер.

Перадавыя назіральнікі данеслі, што ў бярозавым гаі сканцэнтравалася вялікая група нямецкіх танкаў. Мазалаў, са згоды Куцепава, даў каманду батарэям правесці папераджальны артылерыйскі налёт. Назіральнікі даносілі, што снарады дакладна знаходзяць цэль. Загарэлася каля 10 танкаў, але больш за 70 з іх выйшлі на ўзлесак і пачалі абстрэльваць пазіцыі палка з гармат і кулямётаў. Праз некаторы час танкі, разгарнуўшыся ў баявы парадак, пайшлі ў наступленне.

Адна з груп танкаў, страляючы на хаду, пайшла ўздоўж чыгуначнай дарогі Магілёў – Гомель, якая праходзіць злева ад нас. Тут, ля чыгуначнага насыпу, у хмызняку прытаілася батарэя 76-мм палкавых гармат. Прамой наводкай, ва ўпор, гарматы пачалі біць па танках. Ланцуг іх станавіўся ўсё радзей, але няўмольна набліжаўся да батарэі. Змоўкла адна гармата, разлік якой загінуў, але астатнія працягвалі агонь. Не вытрымаўшы ўдару артылерыі, нямецкія танкісты, страціўшы 3 танкі, павярнулі да чыгуначнай станцыі, дзе непадалёк знаходзіліся пазіцыі батарэі процітанкавых пушак малодшага лейтэнанта ***Прашчалыкіна.*** Атрымалася так, што павярнуўшы, танкі падставілі свае барты пад агонь процітанкавых пушак. У выніку знішчальнага агню батарэі яшчэ некалькі танкаў было падбіта.

Прайшоўшы чыгуначную станцыю, варожыя танкі прасачыліся ў глыбіню абароны 388-га палка і наблізіліся да неадольнага процітанкавага рова. Тут яны трапілі пад агонь батарэі лейтэнанта ***Возгрына.*** Выйшла са строю яшчэ некалькі нямецкіх машын. Уцалеўшыя раздзяліліся на дзве групы і пайшлі ў абход процітанкавага рова.

Адна група накіравалася налева, перасекла Бабруйскае шасэ і рушыла да Дняпра, дзе процітанкавы роў злучаўся з глыбокімі непраходнымі абрывістымі ярамі. Убачыўшы перашкоду, танкісты павярнулі назад, але іх закідалі бутэлькамі з запальнай вадкасцю байцы атрада шоўкавай фабрыкі, якія падпалілі два танкі.

Другая група танкаў трапіла на міннае поле, дзе большасць з іх падарвалася. Некалькі машын усё ж прарваліся на нашы абарончыя пазіцыі і абрушыліліся на акопы пяхоты, паліваючы ўсё навокал свінцовым агнём з кулямётаў. У адзінаборства з імі ўступілі стралкі-пехацінцы. Яны закідвалі танкі бутэлькамі з запальнай вадкасцю, расстрэльвалі танкістаў, спрабаваўшых выбрацца з палаючых машын.

Гарматы з нашага боку перасталі страляць, каб не трапіць у сваіх байцоў. Пэўна, вырашыўшы, што шлях адкрыты, немцы сталі ўводзіць у бой пяхоту. На шасэ з’явілася камандзірская машына і каля дзясятка грузавікоў і бронетранспарцёраў з аўтаматчыкамі. 8-я стр.рота лейтэнанта ***Хорашава*** з батальёна капітана ***Гаўрушына*** сустрэла калону машын кінжальным агнём. Нямецкія салдаты саскоквалі з машын і спрабавалі схавацца ў лесе, але ўдалося гэта нямногім. Дарога каля ўзлеску была ўсеяна трупамі.

...12 танкаў па шасэ рушылі да моста праз процітанкавы роў. Лейтэнант ***Хорашаў*** падпільнаваў, калі галоўны танк будзе на замініраваным мосце і ўзарваў яго. Артылерысты капітана ***Возгрына*** падбілі яшчэ 4 машыны. Аднаму з танкаў усё ж ўдалося прарвацца на батарэю і знішчыць гармату, але ён тут жа запалаў. Гэта сяржант ***Тарасевіч*** кінуў бутэльку з запалкавай вадкасцю. Нямецкі экіпаж выскачыў на дарогу, але граната ***Тарасевіча*** і кулі снайпера ***Сербіенкі*** нагналі іх.

Праз некаторы час немцы паўтарылі атаку. На гэты раз пяхота знаходзілася на браніраваных пляцоўках, прычэпленых да танкаў. Частку з іх знішчылі артылерысты, а другія, дасягнуўшы акопаў нашай пяхоты ў глыбіні



На Буйніцкім полі пасля бою 12 ліпеня 1941 г.

абароны, былі падбіты процітанкавымі гарматамі. У гэты час капітан ***Гаўрушын*** падняў батальён у атаку, варожая пяхота адкацілася, а за ёй па полю адышлі і танкі.

Гэты бой 12 ліпеня 1941 г. працягваўся 14 гадзін і закончыўся перамогай абаронцаў Магілёва. У ходзе боя было ***падбіта і спалена 39 нямецкіх танкаў і бронемашын***, знішчаны сотні салдат ворага. З наступленнем цемры ўсё змоўкла. На тым і другім баках працавалі пахавальныя каманды, падбіралі забітых і параненых.

13 ліпеня бой працягваўся ўжо з пяхотнымі часцямі. З раніцы немцы паспрабавалі прымяніць хітрасць: на Бабруйскім шасэ, з боку Салтанаўкі, з’явілася наша машына ЗІС-5 з салдатамі ў чырвонаармейскай форме. Наш дазорны спрабаваў яе спыніць, але быў забіты. На вялікай хуткасці машына заехала ў зону абароны. Тут яе сустрэлі кулямётным агнём. Пераапранутыя 30 нямецкіх аўтаматчыкаў былі знішчаны.

На працягу дня варожай пяхоце ўдалося пацясніць асобныя падраздзяленні палка і нават падысці да каманднага пункта ***Куцепава С.Ф.*** У адзін з такіх момантаў, калі немцы пацяснілі 3-ці батальён капітана Гаўрушына, палкоўнік Куцепаў асабіста ўзначаліў контратаку 2-га батальёна і рэшткаў 3-га батальёна. У рукапашнай схватцы байцы выбілі немцаў са сваіх акопаў. У час атакі камандзір 1-й кулямётнай роты ст. лейтэнант ***Аненкаў*** і малодшы палітрук ***Шорнікаў*** вывелі ўперад два кулямётныя ўзводы і адкрылі агонь у флангі праціўніка, знішчыўшы каля сотні варожых салдат.

У другой палове дня вораг прадпрыняў псіхічную атаку. З Ямніцкага лесу стройнымі калонамі з разгорнутымі сцягамі пайшла пяхота. Куцепаў С.Ф. загадаў без каманды агню не адкрываць. Каля кожнай з дванаццаці 4-

ствольных зенітных кулямётных установак застылі ў баявой гатоўнасці байцы. Мінамётчыкі ўдакладнілі наводку, падцягнулі скрыні з мінамі. І калі варожыя калоны выйшлі ў адкрытае поле, на іх абрушыўся шквальны агонь кулямётаў і мінамётаў. Нямногім з немцаў удалося ўцалець.

Вялікія страты панеслі і воіны палка. Амаль поўнасцю палёг у баях 2-гі батальён, загінулі яго камандзір капітан ***Абрамаў*** і нач.штаба ст.лейтэнант ***Маркаў***. Вялікія страты панёс 3-ці батальён, цяжка паранілі яго камандзіра капітана ***Гаўрушына,*** немцамі былі захоплены штабныя дакументы батальёна. Многіх камандзіраў 388-га стр.палка паранілі, у тым ліку камісара палка Зобніна, але яны заставаліся ў страі і працягвалі кіраваць абаронай.

З перыядычнай актыўнасцю баі праходзілі тут да ***22 ліпеня,*** калі немцы, каб расчысціць дарогу для сваіх падышоўшых пяхотных дывізій, пачалі бесперапынную паўсутачную бамбардзіроўку нашых пазіцый. Вось як апісаны гэты жудасны бой ***К.Сіманавым*** у яго рамане ***“Жывыя і мёртвыя”***, дзе правобразам ***Сярпіліна Ф.Ф.*** з’яўляецца ***Куцепаў С.Ф***. : “Роўна дванаццаць гадзін – з дзевяці раніцы да дзевяці вечара – на пазіцыі палка пікіравалі нямецкія бамбардзіроўшчыкі, змяняючы адзін другога і ні разу больш чым на паўгадзіны не перапыняючы сваёй смяротнай малацьбы. Цяжкія паўтонныя і чвэрцьтонныя бомбы, бомбы вагою ў сто, пяцьдесят і дваццаць кілаграмаў, касеты з дробнымі, што сыпаліся як гарох, трох- і двухкілаграмовымі бомбамі – усё гэта з ранку да вечара валілася з неба на пазіцыі сярпілінскага палка...

Калі закончыўся апошні налёт і немцы паляцелі да сябе вячэраць і спаць, пазіцыі палка былі так пераараныя ўпаўшым з паветра жалезам, што на іх нельга было знайсці ніводнага цэлага кавалка тэлефоннага проваду даўжынёй у 5-10 метраў.За ўвесь час удалося збіць толькі адзін “юнкерс”, а страты ў палку былі амаль такія ж, як і ў самы крывавы з усіх дзён – учарашні. Да пачатку баёў у палку налічвалася ***дзве тысячы сто чалавек.*** Зараз, паводле грубых падлікаў, не заставалася і ***шасцісот***”.



Пошукавы атрад “Віккру” (фота 2003 г.)

З тых пор час адлічвае сёмае дзесяцігоддзе. Даўно скапаны акопы, траншэі, варонкі ад разрываў снарадаў. Дзесяткі шчодрых ураджаеў дала некалі зраненая снарадамі, начынёная кулямі і асколкамі зямля Буйніцкага поля. Але часам яна, акрамя жалеза вайны, выдае і іншыя “сюрпрызы”. Кожны год Магілёўскі пошукавы атрад моладзі **“ВІККРУ”** ***(“VICTORIA CRUENTA”***- лац. - ***“ПЕРАМОГА, ЗАВАЯВАНАЯ КРЫВЁЮ”)*** праводзіць экспедыцыі ў ваколіцах Магілёва на месцах абароны горада ў ліпені 1941 г. У апошнія гады ім выяўлены невядомыя раней баявыя пахаванні нашых воінаў, у якіх знаходзіліся

***астанкі 50-ці байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі.*** На жаль, толькі прозвішчы 5-ці з іх ўстаноўлены па смяротных медальёнах, наладжана сувязь з роднымі і блізкімі загінуўшых. Астанкі мужных абаронцаў горада з усімі воінскімі рытуаламі і ўрачыстасцямі перазахаваны ў брацкія магілы, у тым ліку і ў склеп ***мемарыяльнай капліцы*** на гэтым полі, якую вы бачыце.

***Зараз мы знаходзімся ля аркі-ўвахода***, якая злучана з цэнтральнай кампазіцыяй ***мемарыяльнага комплексу абаронцам Магілёва "Буйніцкае поле"*** – 27-метровай чырвонай капліцай, пабудаванай у стылі традыцыйнай усходне-славянскай архітэктуры. Унутры паўсферу верхняга нефа-купала і верхнюю частку сцен пакрылі роспісы-фрэскі з хрысціянскімі сімваламі, у прыватнасці, выявай ***св.Георгія Пабеданосца,*** героямі нашай гісторыі, пачынаючы з вялікага князя Літоўскага ***Альгерда*** (XIV ст.) - пераможцы бітваў з Тэўтонскім ордэнам і Залатой Ардой і заканчваючы эпізодамі абароны г.Магілёва і Вялікай Айчыннай вайны (1941-45 гг.).

Сцены капліцы знутры абліцаваны светлым мармурам. На іх размешчаны мемарыяльныя дошкі з дзесяткамі прозвішчаў воінаў і народных апалчэнцаў, загінуўшых пры абароне Магілёва. На ўзвышшы ў цэнтры – ***"Кніга памяці"*** Буйніцкага мемарыяла. Пад капліцай знаходзіцца ***склеп,*** прызначаны для ўрачыстага перазахавання астанкаў загінуўшых воінаў Чырвонай Арміі, знойдзеных на палях баёў у ваколіцах Магілёва (аўтар комплексу арх. ***У.Чаленка***).



Мемарыял абаронцам Магілёва
на Буйніцкім полі.

Алеі злучаюць капліцу з ***аркай,*** дзе размешчаны гарэльефныя мемарыяльныя дошкі, памятным каменем пісьменніку ***К.Сіманаву,*** а таксама ***"Возерам слёз"***. Вакол размешчаны ўзоры баявога ўзбраення і тэхнікі перыяду вайны, у т.л. і нямецкі танк, падняты з р.Друць каля в.Чачэвічы. Справа ад капліцы добра бачны астаткі процітанкавага рова.

Цяпер перамесцімся да ***Сіманаўскага камня-валуна***, прысвечанага памяці ***першага летапісца магілёўскай абароны, журналіста і пісьменніка Канстанціна (Кірыла) Сіманава,*** чый прах, па яго завяшчанню, развеяны на Буйніцкім полі разам з прахам вядомых і невядомых абаронцаў Магілёва. На адваротным баку камня замацавана таблічка з надпісам: "К. М. Симонов. 1916-1979. Всю жизнь он помнил это поле боя 1941 года и завещал развеять здесь свой прах."

Лёс выдатнага пісьменніка Сіманава К.М., лаурэата шасці Дзяржаўных прэмій СССР і Ленінскай прэміі, Героя Сацыялістычнай працы, цесна пераплёўся з Магілёвам. У 1941 г. ён, ваенны карэспандэнт газет “Известия” і “Красная Звезда” быў сведкам шматдзённай гераічнай абароны горада. Гэта гістарычная падзея пакінула глыбокі след у жыцці пісьменніка. ***Магілёву прысвечаны яркія старонкі трылогіі “Жывыя і мёртвыя”, “Салдатамі не нараджаюцца”, “Апошняе лета”, кнігі “Розныя дні вайны”.***

У фільме ***“Шел солдат”*** знята Буйніцкае поле – лета, высокае хлебнае поле, прастор на гарызонце. І аўтар фільма Сіманаў расказвае: “Одному человеку этот мирный сейчас пейзаж ничего не говорит, а для другого - это поле боя… Я не был солдатом, был всего-навсего корреспондентом, но и у меня есть кусок земли, который мне вовек не забыть – вот это поле за Могилёвом, где я впервые видел в июле сорок первого, как наши сожгли тридцать девять немецких танков и бронетранспортёров”.

Менш сутак былі ваенныя карэспандэнты ў 1941-м у распалажэнні палка Куцепава. Гутарылі з людзьмі, прайшлі па траншэях да падбітых танкаў. І Сіманаў убачыў у камдзіве генерале Раманаве, у Куцепаве і людзях яго палка сапраўдных герояў. Сёння мы ўжо ведаем, што ў аснове збіральнага літаратурнага вобраза Сярпіліна ляжаць асобы камандзіраў, сустрэтых Сіманавым пад Магілёвам.

Нашаму гораду належала вялікае сэрца ***Сіманава***. Ён неаднаразова прыязджаў сюды, падоўгу хадзіў па гэтаму полю і іншых месцах былых баёў, сустракаўся з ветэранамі вайны, выступаў перад рабочымі і студэнтамі, вёў ажыўленую перапіску з магіляўчанамі.

Была ў Сіманава і асабістая сімпатыя да Магілёўшчыны – першая яго жонка ***Яўгенія Самуілаўна Ласкіна*** нарадзілася ў Шклове.

28 жніўня 1979 г. пісьменніка не стала. Яго пахаванне – яшчэ адна драматычная старонка нашай гісторыі. У ЦК КПСС не захацелі прызнаць волю пакойнага і прынялі рашэнне аб пахаванні К.Сіманава на Новадзявочых могілках у Маскве. Але родныя зрабілі так, як завяшчаў іх муж і бацька. ***8 верасня 1979 г.*** жонка Сіманава ***Ларыса Жадава,*** яго дзеці ***Аляксей, Марыя, Кацярына*** і сакратар ***Ніна Гардон*** прывезлі ўрну з прахам пісьменніка ў Магілёў. На Савецкай плошчы іх сустрэлі абласны ваенны камісар палкоўнік ***Ціханаў І.А.,*** супрацоўнік абласнога краязнаўчага музея ***Палажэнцава Т.Ф.,*** дырэктар Крычаўскага краязнаўчага музея ***Мельнікаў М.Ф.*** і ветэран 388-га стр. палка ***Пяткоў В.А..*** Далей Ціханаў І.А. расказвае: “ У такім складзе мы і накіраваліся на Буйніцкае поле. І толькі па дарозе я даведаўся, што Ларыса Аляксееўна прывезла ўрну з прахам. “Гэта наша сямейная справа”, - сказала яна.

Усё праходзіла імкліва. На полі Аляксей узняў урну, сышоў з дарогі, адкрыў яе і рассеяў прах бацькі. Выкапалі невялікую яму-магілку, паставілі туды ўрну і ўсе па звычаю кінулі ўніз па жмені зямлі. Дзеці выціралі слёзы. Было трывожна на душы, нервы напружаны. Над полем апускаўся змрок”.



Мемарыяльны камень К. Сіманаву.

Праз год, 25 лістапада 1980 года, на Буйніцкім полі адбылося адкрыццё мемарыяльнага знака Сіманаву К.М.. Быў мітынг, на які прыехала вялікая дэлегацыя маскоўскіх і беларускіх пісьменнікаў, сярод іх – ***Васіль Быкаў, Ніл Гілевіч, Аляксей Пысін.*** Камень – валун, на якім высечана прозвішча-аўтограф пісьменніка, быў выбраны роднымі Сіманава на тэрыторыі рэспубліканскага музея валуноў, а пісьменнік ***Алесь Адамовіч*** дамовіўся з кіраўніцтвам Беларускай ваеннай акругі аб дастаўцы яго ў Магілёў. Дарэчы, важыць камень 15 тон...

Зараз мы праедзем да ***будынку СШ–11 г. Магілёва,*** дзе ў ліпені 1941 г. размяшчаўся штаб 172-й стр. дывізіі – цэнтр кіраўніцтва абаронай горада.

## ***“Б А Б Р У Й С К А Е  Ш А С Э - вул. Ч А Л Ю С К І Н Ц А Ў – вул. М Я Н Ж Ы Н С К А Г А “***

388-ы стр.полк утрымліваў пазіцыі на Буйніцкім полі да ***22 ліпеня,*** пасля чаго Куцепаў С.Ф. адвёў астаткі сваіх падраздзяленняў на ўскраіну горада, да фабрыкі штучнага шоўку. Злева ад нас знаходзяцца будынкі былой ***аўтакалоны №2426.*** Перад вайной на гэтым месцы знаходзіўся ***цагельны завод № 7.*** На яго тэрыторыі і размясцілі свае назіральныя пункты палкоўнікі ***Куцепаў С.Ф.*** і ***Мазалаў І.С.*** Высокая цагельная труба стала назіральным пунктам камандзіра 340-га лап, адкуль ён кіраваў агнём артылерыі.

Калі баі перамясціліся ў горад, Куцепаў, выкарыстоўваючы ўцалеўшыя будынкі і баракі, зноў арганізаваў абарону. ***24 ліпеня***, у сярэдзіне дня, немцы зрабілі адну з апошніх спроб зламіць абаронцаў горада. Пасля артабстрэла ў атаку пайшлі танкі і пяхота. Звязкамі гранат і бутэлькамі з запальнай вадкасцю байцы падбілі некалькі машын. Але пяхоце ворага ўдалося захапіць асобныя будынкі на лініі абароны. І тут нашы воіны, на чале з Куцепавым, з вінтоўкамі пайшлі ў рукапашную контратаку. Немцы не вытрымалі і пабеглі, страціўшы некалькі дзесяткаў загінуўшымі, 4 мінамёты з баекапмлектам, 50-мм гармату і 5 скрынь са снарадамі. Гэта быў адзін з апошніх баёў куцепаўскага палка.

Зараз мы праязджаем каля тэрыторыі ордэна Кастрычніцкай рэвалюцыі завода штучнага валакна імя В.Куйбышава. На будынку заводаўпраўлення на ***мемарыяльных дошках*** нанесены прозвішчы рабочых і служачых, загунуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

У першыя ж дні вайны на фабрыцы быў арганізаваны ***атрад народнага апалчэння,*** у які запісалася да 800 дабраахвотнікаў. Камандзірам атрада быў

прызначаны ***Кандратаў,*** камісарам – ***Шчарбакоў.*** Апалчэнцы мужна змагаліся на паўднёва-заходніх подступах да горада, утрымліваючы ўчастак паміж р.Дняпро і Бабруйскім шасэ. Падчас баёў у самім горадзе яны займалі пазіцыі на тэрыторыі сваёй фабрыкі. Сярод герояў з ліку яе работнікаў – ***Сяргей Каваленка***, Герой Савецкага Саюза (пасмяротна), ***Сяргей Сабалеўскі*** і ***Іван Невядомскі***, удзельнікі абароны Магілёва і актыўныя падпольшчыкі ў гады акупацыі горада немцамі.

Ціхая і зялёная вуліца Мянжынскага ў дні абароны была адной з самых ажыўленых. Днём і ноччу па ёй праязджалі штабныя машыны, запыленыя матацыклы і коннікі. Тут размяшчаўся штаб 172-й стр.дывізіі, а пазней - адзіны штаб абароны Магілёва. Сюды сыходзіліся звесткі аб палажэнні на ўсіх участках абароны, адсюль дэлегаты сувязі перадавалі ў часці і падраздзяленні загады  і распараджэнні.

***Вечарам 13 ліпеня*** да гэтага будынку пад канвоем нашага “газіка” пад’ехала нямецкая легкавая машына з маёрам вермахта. У суправаджальнай запісцы ўказвалася: «Сей майор из полка «Великая Германия» задержан нами у деревни Ново-Любуж. Он следовал по Оршанскому шоссе в могилёвский ресторан. Направляем вам по принадлежности. 13 июля 1941 г. Подполковник Щеглов».

Маёр быў вельмі здзіўлены, бо, па нямецкіх дадзеных, Магілёў узяты яшчэ ў пачатку ліпеня. Ён быў упэўнены, што едзе па акупіраванай тэрыторыі і раптам – палон.

Да гэтага часу абстаноўка на рубяжах абароны значна змянілася. Баі ішлі ўжо на бліжніх подступах да горада. На флангах Магілёўскай групоўкі немцы прасунуліся глыбока ўперад і імкнуліся акружыць горад. Генерал ***Раманаў М.Ц***. склікаў у штабе дывізіі нараду, каб вызначыць далейшыя дзеянні.

***15 ліпеня*** у гэтым будынку сабраліся камандзіры, камісары і начальнікі штабоў часцей, савецкія і партыйныя работнікі горада. Першым выступіў генерал Раманаў, які далажыў абстаноўку і папрасіў кожнага выказаць свае меркаванні аб далейшых дзеяннях. Выступілі палкоўнік ***Куцепаў С.Ф.,*** камісар дывізіі ***Чарнічэнка Л.К.***, іншыя камандзіры, палітработнікі. Усе ўдзельнікі нарады выразілі намер адстойваць горад да канца, каб затрымаць немцаў на Дняпры як мага далей і даць магчымасць камандаванню сканцэнтраваць сілы на ўсходнім беразе ракі. Усе яны ясна ўяўлялі сабе, што палажэнне дывізіі крытычнае і, што відавочна, працягваць абарону прыйдзецца ў поўным акружэнні, магчымасць выхаду з якога вельмі малая. Аднак, нягледзячы на гэта, ўсе былі ўпэўнены, што ў гарнізона яшчэ дастаткова сіл для барацьбы і вырашылі працягваць абараняцца.

16 ліпеня стала вядома, што ў Чавусах немцы замкнулі кальцо акружэння і адрэзалі дывізію ад баз забяспячэння. Цяпер мы ведаем, што ў гэты ж дзень вораг ужо захапіў правабярэжную частку Смаленска, што ў 200 км ад Магілёва.

Са Стаўкі Галоўнакамандавання на імя камандуючага 13-й арміі генерал-лейтэнанта ***Герасіменкі В.Ф.*** прыйшоў загад: ***“Магілёў пад кіраўніцтвам Бакуніна зрабіць Мадрыдам”.***

***24 ліпеня*** на Мінскай шашы байцамі 394-га стр.палка 110-й дывізіі былі захоплены і дастаўлены к штабу дывізіі ***3 нямецкія штабныя машыны.*** Яны аказаліся ***загружанымі жалезнымі крыжамі і іншымі ордэнамі, парадным абмундзіраваннем і сцягамі***. Як паведаміў афіцэр, які суправаджаў машыны, гэтыя ўзнагароды прызначаліся для тых салдат і афіцэраў вермахта, што парадным маршам пройдуць па Маскве.

Немцы зрабілі шалёныя спробы адбіць свае “баявыя рэліквіі”. Бой праходзіў у непасрэднай блізкасці ад штаба дывізіі, і ім удалося захапіць частку першага паверха школы. Аднак хутка яны былі выбіты адтуль.

***25 ліпеня***, пасля абеду, агонь з боку немцаў нечакана спыніўся, наступіла цішыня.У суправаджэнні групы нашых байцоў да будынка школы падышлі два ***нямецкія афіцэры з белымі павязкамі на рукавах.*** Парламенцёры прапанавалі абаронцам горада капітуліраваць, а таксама вярнуць штабныя машыны з узнагародамі. Яны расклалі на сталах каляровыя фотаздымкі нямецкіх салдат, якія быццам бы маршыруюць па вуліцах Масквы, і альбомы са здымкамі, на якіх адлюстроўвалася спакойнае і сытае жыццё ў нямецкім тыле. Аднак пакінулі штаб дывізіі яны ні з чым, калі не лічыць 2-х крыжоў, якія былі ўручаны ім у знак падцверджання таго, што нямецкія машыны з крыжамі сапраўды захоплены абаронцамі Магілёва.

Роўна праз паўгадзіны немцы пачалі ўраганны артабстрэл будынка школы. У гэты ж час артылерыйская група пад камандаваннем начальніка артылерыі дывізіі палкоўніка ***Салаўёва*** накрыла агнём некалькі нямецкіх батарэй. Артылерыя ворага прымоўкла...

Вечарам ***25 ліпеня*** ў падвале школы было многалюдна і шумна. Сюды ў апошні раз збіраліся кіраўнікі Магілёўскай абароны. Абмеркаваўшы абставіны, якія склаліся, ўдзельнікі нарады прыйшлі да вываду: магчымасці далейшай абароны вычарпаны, боепрыпасы на зыходзе, утрыманне горада немагчыма. ***Генерал Раманаў аддаў загад на выхад з акружэння.***

Палку Куцепава было даручана сфарміраваць дзве ўдарныя групы ўмацаваныя лёгкай артылерыяй 340-га лап палкоўніка Мазалава. За імі павінны былі ісці тылавыя часці і параненыя, якія маглі рухацца. Зводнаму палку пад камандаваннем нач.аператыўнага аддзялення дывізіі маёра Кацюшына загадвалася весці вулічныя баі для прыкрыцця прарыву асноўных сіл дывізіі.

Абцяжарваючыя абозы і маёмасць было загадана знішчыць. У шпіталях горада заставалася больш 4-х тысяч параненых. З імі засталіся ваенурачы 172-й стр.дывізіі Кузняцоў В.П. і Паршын А.І. Вечарам 25 ліпеня ўсе часці дывізіі павінны былі сканцэнтравацца на ўчастку абароны 388 стр. палка.

Атрымалася так, што прарыў адбыўся не зусім па плану. Вяртаючыся з апошняй нарады ў штабе дывізіі, ***зніклі палкоўнік Куцепаў і нач. штаба 388 стр. палка капітан Плотнікаў.*** Доўгі час лічылася, што яны былі забіты дыверсантамі, пераапранутымі ў чырвонаармейскую форму.

Аднак, ***па версіі К.Сіманава,*** пісьмы людзей, былых партызан, сведчаць аб тым, што палкоўнік Куцепаў мог застацца жывым: будучы цяжка параненым аказацца ў палоне, збегчы і затым змагацца ў партызанскім атрадзе.

***Па версіі ж тульскага пісьменніка М.Дружыніна,*** за паўгадзіны да пачатку прарыву Куцепаў атрымаў паведамленне, што штаб дывізіі ў поўным складзе захоплены ворагам. Але ў гэтым трагічным дакладзе была маленькая недакладнасць. Будынак штаба сапраўды быў захоплены, але ўжо пасля таго, як штаб выехаў з яго. Куцепаў жа аб гэтым не ведаў. І сабраўшы ўсіх, хто аказаўся побач, ён кінуўся на выручку камдзіва. У шалёнай схватцы ён уварваўся ў будынак школы, аднак штаба там не аказалася. Пасля жорсткага бою, калі скончыліся патроны, Куцепава схапілі і разам з нач.штаба палка капітанам Плотнікавым расстралялі на месцы.

Улічваючы, што Куцепаў са штабам да 24-00 25 ліпеня не знайшоўся, ударную групу прарыву ўзначаліў камандзір 340-га лап палкоўнік ***Мазалаў І.С***. і генерал-маёр ***Раманаў М.Ц.*** Усяго ў калоне выходзячых з акружэння сабралася каля 4-х тысяч чалавек. Пасля першага начнога бою ля в. Цішоўка засталося яшчэ менш. Але жывыя ўпарта ішлі наперад, бо назад шляху не было. Па пятах за калонай ішлі немцы. На досвітку 26 ліпеня абаронцы горада прайшлі праз в. Брускі і ўцягнуліся ў лес.

Не ведалі нашы воіны, што большасць з іх чакае ў гэтым лесе смерць. Да гэтага часу немцы ўжо паспелі перакрыць лясныя дарогі і ўсё мацней націскалі на калону ззаду. Калі апошнія салдаты ўвайшлі ў лес, адразу разгарэўся бой. Заняўшы кругавую абарону, нашы салдаты змагаліся не на жыццё, а на смерць. Бой працягваўся ўвесь дзень, немцы не спяшаліся... Да вечара застаўшыхся ў жывых заціснулі ў кальцо ва ўрочышчы “Лаза”. Гэта месца да нашых дзён добра памятаюць старажылы вёскі Брускі. З наступленнем цемнаты малым групам і асобным байцам удалося прасачыцца праз кальцо акружэння, перайсці Дняпро і па тылах ворага выйсці на ўсход.

Гэта быў апошні бой 172-й дывізіі першага фарміравання, як арганізаванай вайсковай адзінкі. Зараз Магілёўскім райвыканкамам прынята рашэнне на гэтым месцы паставіць ***мемарыяльны знак “Прарыў”.*** Менавіта ў час гэтага бою камандзір дывізіі генерал-маёр ***Раманаў М.Ц.,*** цяжка паранены быў вынесены з лесу аператыўнікамі і пакінуты ў в. Барсукі Магілёўскага р-на для выздараўлення.

## *“ СШ – 11 - вул. Р А М А Н А В А “*

Наш аўтобус паварочвае на вуліцу, якая носіць імя генерала Раманава М.Ц. Злева на сцяне двухпавярховага будынка вы бачыце ***мемарыяльную дошку, прысвечаную гэтаму адважнаму военачальніку.***



Мемарыяльная дошка Раманаву М.Ц.

***Міхаіл Цімафеевіч Раманаў*** нарадзіўся ў 1891 г. у Ніжнім Ноўгарадзе. З 1915 г. ён у царскай арміі, з 1918 г. – у Чырвонай арміі. У 1939-1940 гг.удзельнічаў у савецка-фінскай вайне. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны – на Заходнім фронце камандуе 172-й стр.дывізіяй, сфарміраванай у горадзе Сталінагорску (зараз г.Новамаскоўск) Тульскай вобласці. Пад яго кіраўніцтвам праходзіла гераічная абарона горада, за арганізацыю якой Раманаў М.Ц. Указам ПВС СССР ад 9 жніўня 1941 г. быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.


Асмалоўскі М.Ф.

Як ужо адзначалася, у час прарыву з акружэння ён быў цяжка паранены і пакінуты для выздараўлення ў в. Барсукі ў ***сям'і Асмалоўскага Міхаіла Фёдаравіча.*** Амаль два месяцы мужныя людзі хавалі і лячылі савецкага генерала. Доўгі час разам з ім скрываўся лейтэнант ***Марк Іванавіч Набатаў*** і старшына ***Рыгор Мікалаевіч Бабак***. 15 верасня 1941 г. Раманаў адправіў іх з заданнем праз лінію фронта. У гэты час генерал адчуваў сябе добра і быў гатовы зноў уступіць у барацьбу з ворагам. Са свайго боку Асмалоўскія пачалі шукаць сувязь з партызанамі, каб пераправіць да іх Міхаіла Цімафеевіча. Але здарылася непрадбачанае. Знайшоўся здраднік, які данёс немцам аб тым, што сям'я Асмалоўскіх хавае параненага генерала. Па выкліку бургамістра Апосталава і старасты Царанкова 22 верасня ў в. Барсукі ўварваліся карнікі. Раманаў М.Ц. разам з сям'ёй Асмалоўскіх быў схоплены.

13 чалавек расстралялі фашысты ў тую раніцу. Сярод іх былі амаль усе члены сям'і Асмалоўскіх. Засталіся ў жывых толькі малалетнія сын і дачка, якія ў гэты час знаходзіліся за межамі вёскі. ***Генерал Раманаў*** быў дастаўлены ў Лупалаўскі лагер смерці, адкуль хутка перавезены ў Германію, у ***афлаг XIII-C г. Хамельбурга,*** дзе 3 снежня 1941 г. ён загінуў. Пахаваны там жа на рускіх могілках. Да 100 годдзя з дня нараджэння генерала на месцы яго пахавання нямецкімі ўладамі на сцяне-стэле ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

## *“ Вул. К А С М А Н А Ў Т А Ў - вул. Л А З А Р Э Н К І “*

Зараз мы праедзем па вуліцы імя Лазарэнкі І.С. (былая Віленская). Яна названа ў гонар героя, загінуўшага пры вызваленні горада ад ворага ў 1944 годзе, камандзіра 369-й Карачаўскай стр.дывізіі генерал-маёра ***Івана Сідаравіча Лазарэнкі,*** Героя Савецкага Саюза.




Мемарыяльная дошка.

На гэтай вуліцы знаходзіца ***помнік-пліта народным апалчэнцам Магілёва,*** абараняўшых горад у 1941 годзе, які быў адкрыты 7 мая 1997 года (арх.***У.В.Чаленка***).

Маршал Савецкага Саюза (у 1941 г. камандуючы Заходнім фронтам*)* ***Яроменка А.І.,*** ацэньваючы ў сваіх успамінах гістарычнае значэнне абароны Магілёва, сярод іншых важных фактараў адзначаў: “ ... геаічная 23-х дзённая абарона Магілёва явіла сабой прыклад доблесці і самаадданасці савецкіх воінаў і грамадзянскага насельніцтва, іх непарыўнага адзінства”.

Шмат гераічных старонак унеслі ў гісторыю абароны горада народныя апалчэнцы. Стварэннем і накіраваннем на пазіцыі ***атрадаў народнага апалчэння*** займаўся гарадскі штаб, які ўзначальваў сакратар гаркама партыі ***Марозаў А.І.*** Вялікую дапамогу атрадам у забяспячэнні ўзбраеннем, баявой падрыхтоўцы, амуніцыяй і харчаваннем аказаў Магілёўскі абласны ваенны камісар палкоўнік ***Ваяводзін І.П.*** Воінскія навыкі большасць з іх атрымлівалі непасрэдна ў час баёў. Калі горад быў акружаны і баі перанесліся на ўскраіны, апалчэнцы дапамагалі адбіваць атакі немцаў воінам 172-й стр. дывізіі. Параненыя не пакідалі поле бою, працягваючы змагацца далей. Па сведчаннях відавочцаў самаахвярнасць апалчэнцаў была вельмі высокай.

Зараз мы знаходзімся каля ***брацкай магілы на вул. Лазарэнкі***. Тут, каля падножжа велічнага помніка ў вечным спакоі знаходзіцца прах савецкіх людзей. Сярод іх і абаронцы горада і ўдзельнікі вызвалення Магілёва ў чэрвені 1944 г. Тут ляжаць побач камандзір 121-га партызанскага палка, Герой Савецкага Саюза (1965 г.*)* ***Асман Мусаевіч Касаеў*** і Героі Савецкага Саюза, удзельнікі вызвалення Магілёва і вобласці ***Рамашка Мікалай Васільевіч***, мал.лейтэнант ***Замулаеў Міхаіл Апанасавіч***, сяржант ***Буянаў Міхаіл Кандрацьевіч***. Усяго больш за 100 чалавек.



Брацкая магіла на вул. Лазарэнкі.

Тут жа пахаваны і падпалкоўнік ***Яфрэм Гаўрылавіч Салаў,*** камандзір 718-га стр.палка 139-й Рослаўскай стр.дывізіі. Ён загінуў 28 чэрвеня 1944 г. пры вызваленні Магілёва, у той самы дзень, калі горад быў поўнасцю ачышчаны ад ворага. Добра вядомая песня В.Баснера і М. Матусоўскага ***“На безымяннай вышыні”*** з кінафільма “Цішыня” напісана аб 18 героях-дабраахвотніках з палка Салава Я.Г. Менавіта яны здзейснілі бессмяротны подзвіг на вышыні 224.1 каля в. Рубежанка Калужскай вобласці.

Непадалёку ад брацкай магілы ўстаноўлены сціплы ***абеліск -*** строгая пліта з чорнага граніту, гладка апрацаваная з аднаго боку. Рэзка кантрасны ёй другі бок, няроўны, груба абламаны. Вось так

жа нечакана абарвалася жыццё людзей, чые прозвішчы вы бачыце на мемарыяльнай дошцы, і яшчэ многіх невядомых у апошні дзень абароны горада – 25 ліпеня 1941 г.

Гэта былі простыя гараджане – рабочыя і служачыя, студэнты і настаўнікі – да вайны не знаёмыя адзін з другім. Але яны сустрэліся ў ***народным апалчэнні,*** калі вайна падышла да роднага горада. У апошні дзень абароны, выкарыстоўваючы шматлікія яры, глыбокія рэчышчы рэк Дубравенкі і Струшні, немцам удалося прасачыцца да цэнтра горада. У раёне Струшненскага яра яны адрэзалі ад асноўных сіл частку апалчэнцаў, абараняўшых пазіцыі за Дубравенкай і захапілі іх у палон.




Абеліск расстраляным апалчэнцам.

Каб знішчыць апошнія ачагі супраціўлення ў цэнтры горада, немцы пагналі спераду сябе па вуліцы Віленскай абяззброеных апалчэнцаў. Але гэта правакацыя не ўдалася: народныя апалчэнцы начале са ст. палітруком, начальнікам палітаддзела аблваенкамата ***Нікалаевым*** (пазней загінуў каля драмтэатра) пры падтрымцы трох кулямётаў і танкеткі ў жорсткім баі адрэзалі фашыстаў ад прыкрыцця і амаль усіх знішчылі. У знак помсты, ***немцы частку палонных апалчэнцаў (каля 50 чал.) расстралялі на гэтым месцы.*** Не ўсе прозвішчы іх удалося ўстанавіць, большасць засталіся невядомымі. І сёння мы схіляем галовы перад светлай памяццю мужных абаронцаў роднага горада.

## *“ Вул. Л А З А Р Э Н К І - М І Н С К А Е Ш А С Э “*

Па вуліцы Якубоўскага мы праязджаем каля пастаўленага на высокім пастаменце помніка вызваліцелям горада ў 1944 годзе – ***танка Т - 34.***

З гэтага напрамку наступалі ворагі ў грозным ліпені 1941 г. Вул. ***Якубоўскага І.І.*** (названа у гонар нашага земляка, удзельніка абароны горада ў 1941 г., Маршала Савецкага Саюза, двойчы Героя Савецкага Саюза) за межамі горада пераходзіць у ***Мінскае шасэ***. Яшчэ да вайны гэта дарога была добраўпарадкавана і заасфальтавана. Таму не выпадкова яна лічылася адным з найбольш танканебяспечных напрамкаў. Камандаванне 61-га стр.корпуса меркавала, што менавіта тут паспрабуюць прарвацца буйныя танкавыя злучэнні групы Гудэрыяна. Сюды, на заходні напрамак быў накіраваны 394-ы стр.полк палкоўніка ***Слепакурава Я.С.*** са 110-й стр.дывізіі і батальён 514-га палка 172-й стр.дывізіі. Падтрымліваў іх 493-ці гап палкоўніка ***Жывалупа І.Ф.***

Кіраўнікам абароны вельмі важна было выявіць сілы наступаўшых варожых войск, іх намеры і, па магчымасці, навязаць бой на дальніх подступах да горада. Немцам пры гэтым прыйшлося б разгарнуцца ў баявы парадак і пачаць бой на нязручнай для сябе мясцовасці, замарудзіць тэмп наступлення. Тым самым выйграваўся час для стварэння абарончых збудаванняў вакол горада, работы на якіх ішлі поўным ходам.

Гэтыя задачы павінны былі выканаць перадавыя і разведвальныя атрады 172-й і 110-й стр.дывізій, накіраваныя ў пачатку ліпеня 1941 г. на дальнія подступы да горада. У меру сваіх сіл стрымлівалі наступаючага праціўніка і адыходзячыя з-пад Мінска часці Чырвонай Арміі.

На Мінскім шасэ такую задачу выконваў 2-гі батальён ст. лейтэнанта ***Ваўчка А.П***. з 514-га стр. палка. Раніцай 4 ліпеня 1941 г. батальён дайшоў да р.Вослiўка, што ў 50 км на захад ад Магілёва па дарозе на Мінск. Каля пераправы праз раку ўжо заняла пазіцыі артылерыйская батарэя, агнём якой кіраваў камандзір артдывізіёна капітан ***Хігрын Б.Л.*** з адыходзячага 462-га гап. Тут жа занялі абарону і байцы ст. лейтэнанта Ваўчка А.П.

І вось на шасэ з’явілася варожая матацыклетная разведка, з якой хутка расправіліся пехацінцы Ваўчка А.П. Але адразу ж паказаліся бронетанкавыя часці немцаў. З імі ўступілі ў бой артылерысты капітана Хігрына Б.Л., якія з гаўбіц, прамой наводкай падбілі 6 танкаў, а сапёры ўзарвалі мост праз Вослiўку. Немцы рынуліся да мелкаводдзя і на танках “марскі леў” спрабавалі пераадолець перашкоду. Каля дзесятка танкаў выйшлі на ўсходні бераг, аднак былі сустрэты агнём з процітанкавых гармат. Некалькі танкаў падпалілі бутэлькамі з запальнай вадкасцю байцы Ваўчка А.П. і 7-й паветрана-дэсантнай брыгады (пдб), якая займала абарону непадалёку.

***Баі на рэках Вослiўка і Друць каля Бялыніч*** працягваліся 4 і 5 ліпеня. Каля гарматы загінуў капітан ***Хігрын Б.Л.,*** асабіста знішчыўшы 4 варожых танкі. Указам ПВС СССР ад 31 жніўня 1941 г. яму прысвоена ***званне Героя Савецкага Саюза*** (пасмяротна). Ст. лейтэнант Ваўчок А.П. і некалькі байцоў яго батальёна былі адзначаны ордэнамі і медалямі. Дывізіённая газета 172-й стр.дывізіі выпусціла лістоўку “Жги немецкие танки”, у якой расказвалася аб смелых дзеяннях батальёна Ваўчка А.П., а на старонках газеты падрабязна апісваўся вопыт прымянення бутэлек з запальнай вадкасцю.

Гэтыя першыя баі на далёкіх подступах да горада дазволілі замарудзіць наступленне ворага, разведаць яго колькасць і намеры, а таксама выйграць час для ўмацавання абароны горада.

Каля в.Казіміраўка (цяпер яна ў межах горада), дзе мы зараз знаходзімся, праходзіў пярэдні край абароны Магілёва ў ліпені 1941 г. Злева, на ўскрайку леса, яшчэ бачны астаткі абарончых збудаванняў – акопаў і траншэй, якія ўваходзілі ў сістэму абароны горада. Жыхары Казіміраўкі ў гады вайны ўнеслі значны ўклад у перамогу над ворагам, многія з іх не дажылі да яе, загінулі ў час абароны Магілёва, у партызанскай і падпольнай барацьбе. Мы накіроўваемся да ***брацкай магілы землякоў.*** Злева, непадалёк ад дарогі, знаходзіцца абеліск з зоркай на вяршыні. Каля падножжа абеліска на



Брацкая магіла землякоў

мармуравых плітах высечаны прозвішчы жыхароў вёсак ***Казіміраўка, Пашкава, Прысна, Жукава,*** загінуўшых у гады вайны.

Злева і справа ад дарогі да гэтага часу можна назіраць глыбокія калдобіны, парослыя хмызняком. Гэта астаткі проціtанкавага рова, які мы ўжо бачылі на Буйніцкім полі. Тут ён перасякаў Мінскае шасэ, праходзіў непадалёк ад вёсак Пашкава і Гаі, а каля в. Палыкавічы зноў, як і каля Буйніч, упіраўся ў Дняпро. Як мы ужо ведаем, на гэтым участку займаў абарону 394-ы стр. полк палкоўніка ***Слепакурава Я.С.***

4 ліпеня тут пачаліся сутычкі з прасачыўшыміся асобнымі разведвальнымі матацыклетнымі групамі праціўніка. У першым баі былі ўзяты ў плен 4 матацыклісты і штабная машына з дакументамі, а на наступны дзень – нямецкі палкоўнік. З 6 ліпеня полк уступіў у бой з ***падраздзяленнем матарызаванай дывізіі СС "Рэйх",*** якая наступала з боку Бялыніч і выйшла на пярэдні край абароны палка. Гэта быў цяжкі бой з танкамі і бронемашынамі ворага, у ім загінуў камандзір 1-га батальёна палка лейтэнант ***Трацяк.*** Многія байцы і малодшыя камандзіры былі паранены, альбо загінулі... Упарта абараняючыся полк заняў абарону за р.Лахва, дзе сумесна з адыходзячымі часцямі 7-й пдб палкоўніка ***Ціханава М.Ф.*** і дывізіёнамі 394-га гап палкоўніка ***Жывалупа І.Ф.,*** замацаваўся на больш трывалых пазіцыях.



Слепакураў Я.С.

... 20 ліпеня пры адбіцці варожай атакі ***загінуў палкоўнік Жывалуп І.Ф***. У крытычны момант танкавай атакі ён са звязкай гранат у руках уступіў у адзінаборства з нямецкім танкам. Танк запалаў, але адважны камандзір-артылерыст быў смяротна паранены. Некалькі пазней, пры выхадзе з акружэння на берагах Дняпра ў раёне в.Навасёлкі, ***загінуў са штабам і камандзір 394-га стр. палка палкоўнік Слепакураў Я.С.*** За гераічную абарону Магілёва Указам ПВС СССР ад 9 жніўня 1941 г. ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Калі на заходніх і паўночных напрамках абароны склалася пагражальнае становішча, сюды былі накіраваны падраздзяленні народнага апалчэння.

### ***"МІНСКАЕ ШАСЭ - в.ПАШКАВА"***

Зараз мы накіроўваемся яшчэ да аднаго велічнага помніка героям Магілёўскай абароны – ***байцам батальёна міліцыі*** пад камандаваннем

***капітана Уладзімірава К.Р.*** Ён знаходзіцца на вышыні каля в.Гаі Магілёўскага раёна.



Абеліск на месцы расстрэлу мірных жыхароў.

Але перш, чым распавесці аб батальёне міліцыі, спынімся каля невялікага ***шэрага абеліска, які знаходзіцца паміж вёскамі Новае і Старое Пашкава***. Гэта адзін са шматлікіх на беларускай зямлі помнікаў ахвярам антычалавечай палітыкі фашысцкага нацызму. На мемарыяльнай дошцы чытаем: ***“Здесь покоятся останки более 10 тысяч мирных советских граждан г. Могилёва, погибших от рук немецко-фашистских оккупантов в годы Великой Отечественной войны 1941-1945 гг.”*** (Дошка адноўлена, раней надпіс быў на двух мовах– яўрэйскай і рускай).

Процітанкавы роў пасля захопу горада быў выкарыстаны немцамі для массавага знішчэння мірных жыхароў. Людзей прыганялі ці прывозілі сюды і на дне рова расстрэльвалі, але кулі забівалі не ўсіх. Многія з ахвяр былі толькі паранены, а дзясяткі з іх, асабліва дзеці, жанчыны і старыя, ад жаху і слабасці, пакут і голаду страчвалі прытомнасць і жывыя падалі ў роў. Бязлітасныя каты засыпалі іх зямлёй разам з забітымі. Відавочцы расказваюць, што яшчэ доўга пасля гэтага зямля варушылася над жывымі пахаванымі людзьмі, быццам бы дыхала...

У 1943 г., калі фронт падышоў да Магілёва, фашысты пачалі замятаць свае злачынныя сляды. Сагнаўшы з навакольных вёсак жыхароў, яны загадвалі раскопваць роў, даставаць з яго трупы і спальваць іх у спецыяльна пабудаваных для гэтай мэты ямах-печах. Усе тыя, хто прымаў удзел у гэтай жудаснай рабоце былі знішчаны, каб не было сведкаў. Адзінкі з іх засталіся ў жывых і расказалі аб тых падзеях. У гэтым процітанкавым рове знішчана каля 10 тысяч людзей і яшчэ некалькі тысяч непадалёк адсюль – у Палыкавіцкім лесе.

Усяго ж нацыстамі ў Магілёве і бліжэйшым наваколлі было знішчана звыш 100 тысяч нашых ваеннапалонных і мірных жыхароў.

Злачынствы нямецкіх карнікаў не заставаліся беспакаранымі. Партызаны і падпольшчыкі бязлітасна каралі захопнікаў і іх памагатых. Зараз мы праязджаем ***в.Ст. Пашкава,*** з якой звязаны ***адзін з яркіх эпізодаў партызанскай барацьбы на Магілёўшчыне***.

З мабілізаваных украінскіх нацыялістычна настроеных ваеннапалонных немцы сфарміравалі ***ўласаўскі батальён***, які намерваліся выкарыстаць для барацьбы супраць партызан. (***Уласаў А.А.*** - генерал-лейтэнант Чырвонай Арміі, камандуючы 2-й ударнай арміяй на Волхаўскім фронце. Аказаўшыся ў акружэнні, здаўся ў палон, супрацоўнічаў з немцамі, стварыў часці Рускай Вызваленчай Арміі.) У 1943 г. ён размяшчаўся ў ваенным гарадку

“Пашкава”, што непадалёку ад вёскі. Камандаванне 6-й Магілёўскай партызанскай брыгады вырашыла разграміць гарнізон.

З атрадаў брыгады было падабрана 70 добраахвотнікаў. У зыходнае становішча – лес каля в. Ст.Пашкава – яны прыбылі познім вечарам 10 лютага 1943 г. Праз агентурную разведку звязаліся з групай вайскоўцаў 53-га нацыяналістычнага батальёна, якія паведамілі, што 20 чалавек украінцаў настроены на карысць партызан. Яны былі выкарыстаны для знішчэння аховы і як праваднікі груп да тых будынкаў, дзе жылі немцы, бо планам прадугледжвалася знішчэнне ў першую чаргу немцаў і толькі потым, калі акажуць супраціўленне - астатніх.

***Штурм і агнявы бой пачаўся глыбокай ноччу 11 лютага.*** Раптоўнага нападзення не адбылося, таму што да нямецкіх афіцэраў прыехалі госці з Магілёва, якія ў гэты час весяліліся ў адным з пакояў, і аказалі моцнае супраціўленне. На працягу амаль 5 гадзін ішоў жорсткі бой, гранатамётная дуэль. Раніцай з Пячэрска на падмацаванне гарнізона пачала падыходзіць падмога – ахоўны атрад СС. Партызаны пад камандаваннем нач.штаба брыгады ***Сідарэнкі-Салдаценкі С.Г.*** , знішчыўшы гарнізон, адышлі. У выніку аперацыі былі абяззброены і ўзяты ў палон 250 чал., захоплены кулямёты і пісталеты, 128 вінтовак, 8 тыс. патронаў і інш. маёмасць.

Немцы доўга не маглі паверыць, што ў такі ўмацаваны гарнізон, побач з горадам, змаглі прабрацца партызаны, тым больш, што ў гэты час карныя атрады блакіравалі навакольныя лясы. Яны вырашылі, што батальён узняў паўстанне. Напалоханае гэтым нямецкае камандаванне неўзабаве ***абяззброіла тры другіх падобных батальёны, што размяшчаліся на Магілёўшчыне.***

## ***“ВЫШЫНЯ УЛАДЗІМІРАВА”***

Нарэшце мы пад’ехалі да таго месца, дзе ў ліпеньскія дні 1941 г. гераічна змагаўся ***батальён міліцыі.***

У адпаведнасці з вусным загадам начальніка Магілёўскага гарнізона палкоўніка ***Ваяводзіна І.П.*** у дапамогу 172-й стр.дывізіі ***11 ліпеня 1941 г.*** з работнікаў міліцыі быў сфарміраваны батальён. 1-я яго рота складалася з работнікаў Магілёўскага абласнога упраўлення і курсантаў мясцовай школы міліцыі. У 2-ю роту ўваходзілі курсанты і выкладчыкі Мінскай школы міліцыі, якія прыбылі ў Магілёў 26 чэрвеня. З асабовага складу Гродзенскай школы міліцыі (у Магілёве з 27 чэрвеня) была створана 3-я рота. Узначаліў батальён начальнік аддзела баявой падрыхтоўкі абласнога ўпраўлення міліцыі капітан ***Уладзіміраў Канстанцін Рыгоравіч.*** Арганізацыйна падраздзяленне ўваходзіла ў зводны полк (астаткі 394-га стр.палка 110-й дывізіі, батальён НКВД з народнымі апалчэнцамі, батальён міліцыі, 2-гі батальён 514-га стр.палка 172-й дывізіі і сродкі артылерыйскай падтрымкі 493-га гап), якім да 15 ліпеня камандаваў палкоўнік ***Семякін*** (загінуў). З 16 ліпеня і да выхаду з акружэння палком камандаваў нач. аператыўнага аддзялення штаба 172-й стр. дывізіі маёр ***Кацюшын В.А.***

У ноч з 11 на 12 ліпеня батальён быў праінструкціраваны, узброены вінтоўкамі, наганамі, бутэлькамі з запальнай вадкасцю і адпраўлены на пазіцыі ў раён весак Гаі – Старое Пашкава. На працягу сутак роты батальёна ўмацоўвалі пазіцыі, паглыблялі траншэі і асабістыя акопы. Час захаваў да нашых дзён сляды тых падзей. Вы бачыце яміны траншэй і варонак ад снарадаў. Тут, на гэтай вышыні кіпеў кровапралітны бой ...

Пацярпеўшы няўдачу 12 ліпеня на Буйніцкім полі і не дабіўшыся поспеху на Мінскім шасэ, немцы сканцэнтравалі значныя сілы на поўнач ад Магілёва. Яны планавалі прарвацца ў горад па Шклоўскім шасэ і захапіць чыгуначны вузел. Але на шляху ворага паўстаў батальён міліцыі. З раніцы ***13 ліпеня*** тут разгарэўся жорсткі бой. З дапамогай мотапяхоты немцам удалося захапіць вёскі Ст.Пашкава і Гаі – 1-я рота адышла ў запасныя траншэі. У гэтым баі міліцыянеры захапілі добрыя трафеі: кулямёт, аўтаматы, многа гранат. Гэта ўзбраенне ў далейшым стала асноўнай агнявой сілай батальёна.

У начным баі міліцыянеры з дапамогай суседніх часцей і артылерыстаў адбілі вёскі Ст.Пашкава, Гаі і ваенны гарадок, дзе ўжо размясціліся немцы. Праз некаторы час праціўнік з дапамогай шасціствольных мінамётаў і некалькіх танкаў зноў заняў вёскі. Значныя страты панеслі абодва бакі.

З раніцы ***15 ліпеня*** пяхота немцаў, пры падтрымцы танкаў, пайшла ў наступленне з боку в.Ст.Пашкава. Адзін танк міліцыянерам удалося падпаліць, астатнія павярнулі назад. Некалькі разоў у гэты дзень спрабаваў хадзіць у атакі праціўнік. Гінулі немцы, але і байцоў батальёна заставалася ўсё менш і менш.

***16 ліпеня*** батальён зменшыў свае пазіцыі, яго асноўныя сілы перамясціліся бліжэй да в.Гаі. Сюды ж на падмацаванне 1-й і 2-й рот з Мінскага шасэ прыбыла і 3-я рота. Значна парадзелыя падраздзяленні батальёна занялі пазіцыі на ўзлессі, якраз на гэтай безымяннай вышыні каля в. Гаі.

***18 ліпеня*** немцы зрабілі некалькі атак, але ўзяць вышыню, на якой замацаваліся каля 50 апошніх байцоў-міліцыянераў, не змаглі. У другой палове дня вораг пачаў чарговы штурм. Рэшткі батальёна, параненыя, кантужаныя, страціўшыя адлік часу, на чале з параненым камандзірам ***Уладзіміравым К.Р.,*** без артылерыйскай падтрымкі падняліся ў контратаку, для большасці з іх - апошнюю. Пасля гэтага бою ў жывых засталося толькі 19 чалавек. Загінуў капітан Уладзіміраў К.Р., быў цяжка паранены камісар ***Чарноў К.Ф.,*** больш двух соцен загінуўшых байцоў і камандзіраў батальёна засталіся безымяннымі. Дзякуючы Магілёўскаму пошукаваму атраду ***"Віккру"*** сёння вядома каля 30 прозвішчаў міліцыянераў батальёна ...


Уладзіміраў К.Р.

У чэрвені 1995 г. пошукавікі атрада, праводзячы экспедыцыю на месцах баёў батальёна ў 1941 г., выявілі невядомае раней пахаванне 29-ці міліцыянераў і байцоў 394-га стр. палка. На жаль, прозвішчаў загінуўшых устанавіць не ўдалося. Усе яны з адпаведнымі воінскімі рытуаламі былі

перазахаваны ў брацкую магілу на гэтай вышыні. Цяпер на сціплым абеліску можна прачытаць: ***“Тут пахаваны 29-ць байцоў-міліцыянераў і чырвонаармейцаў з батальёнаў народнага апалчэння і 394-га стр.палка 110-й стр.дывізіі, загінуўшых у канцы ліпеня 1941 г. пры абароне Магілёва.”***

Ветэран батальёна, падпалкоўнік міліцыі ў адстаўцы ***Кожаў І.Ф.,*** у 1970-ыя гады напісаў, магчыма не зусім дасканалыя ў паэтычных адносінах, але перажытыя і сардэчныя радкі:

Тогда в боях на стойкость выверив,
Сквозь чёрный дым, снарядов град,
Вёл роты в бой комбат ***Владимиров***,
Милиции прославленный комбат.

И, сотрясаясь в грохоте орудий,
Высотка встала словно бастион.
И путь врагу закрыл солдатской грудью
Поправший смерть бессмертный батальон.



Мемарыял на вышыні Уладзімірава К.Р.

Сёння ўжо няма безымяннай вышыні. У сэрцах магіляўчан яна стала вышынёй Уладзімірава, а на яе вяршыні ў 1980 г. устаноўлены помнік (скульптар ***Кавалёў М.,*** архітэктар ***Аляксееў К.***) у выглядзе стэлы, сімвалізуючай сцяг, з барэльефнай выявай твару байца. Да стэлы вядзе лесвіца, па баках якой устаноўлены бетонныя блокі трохвугольнай і прамавугольнай формы, якія нагадваюць урачыстыя прапілеі.

## *“Ш К Л О Ў С К А Е   Ш А С Э  -  вул. П Е Р Ш А М А Й С К А Я ”*

***20 ліпеня*** немцы, нягледзячы на папярэднія страты, падцягнулі значныя сілы і зноў рынуліся на пазіцыі ***зводнага палка.*** Абяскроўленыя і парадзелыя часці палка з баямі адышлі і замацаваліся на ўскраіне горада. Маёр ***Кацюшын В.А.*** перанёс свой назіральны пункт на воданапорную вежу ля чыгуначнага вакзала. Штаб абароны прадпрыняў экстраныя меры для ўмацавання горада. З дапамогай жыхароў на вуліцах узводзіліся барыкады, устанаўліваліся загароджы. Мураваныя дамы ператвараліся ў абарончыя

кропкі, вокны ніжніх паверхаў закладваліся камянямі і мяшкамі з пяском. У байніцах устанаўліваліся куляметы.

Пачынаючы з ***23 ліпеня,*** пасля падыходу пяхотных дывізій і массіраванай артылерыйскай падрыхтоўкі, немцы ўзнавілі атакі на ўсім фронце абароны горада. На ўчастку зводнага палка ім удалося прарвацца на ўскраіны горада і выйсці да станцыі Магілёў-Таварная (цяпер Магілёў-3), дзе жорсткімі контратакамі яны былі спынены і стрымліваліся на працягу 24 ліпеня.

***25 ліпеня*** наступленне немцаў працягвалася, ноччу яны захапілі прадмесце ***Карабанаўка*** і стварылі пагрозу чыгуначнаму вакзалу. Абаронцы адышлі за барыкады і ў акопы ля чыгуначнага вакзала і завода “Адраджэнне” (цяпер “Строммашына”). Пачаліся вулічныя баі, горад апынуўся ў агні і дыме. У гэты ж дзень разведчыкамі палка быў захоплены ў палон нямецкі штабны афіцэр, які паказаў, што страты немцаў забітымі і параненымі з пачатку вайны склалі 30-35% усёй колькасці, а страты ў танках і бронетранспарцёрах яшчэ большыя – 45-50%.


Кацюшын В.А.

Цяжкім стала палажэнне байцоў зводнага палка. Скаваныя бесперапыннымі баямі з немцамі, яны не змаглі злучыцца з асноўнымі сіламі 172-й стр. дывізіі, каб разам з імі выходзіць з акружэння ў ноч на 26 ліпеня. У горадзе гарэлі і абрушваліся дамы, завалы перакрывалі вуліцы, ачагамі ўспыхівала перастрэлка. Ужо пасля выхаду з горада асноўных сіл дывізіі байцы палка працягвалі баі, гераічна адстойваючы апошнія пазіцыі ў раёне завода “Адраджэнне” і чыгуначнай станцыі Магілёў – Таварная. У палку засталося ў жывых не больш 300 чалавек. Сабраўшы іх, маёр ***Кацюшын В.А***. аддаў загад выходзіць з акружэння ва ўсходнім накірунку.

У ноч на 28 ліпеня, скрытна сабраўшыся, астаткі палка, з дапамогай мясцовых жыхароў, вышлі з горада. Прайшоўшы з баямі больш 200 км, лінію фронта ў раёне Рагачова перайшло толькі 50 з іх.

## ***“САВЕЦКАЯ ПЛОШЧА“***

Мы зноў вярнуліся на плошчу, з якой пачалася наша экскурсія. ***Савецкая плошча*** (Гандлёвая, Губернатарская) – сведка шматлікіх падзей і гістарычнае сэрца горада.

На плошчы і на архірэйскім валу імя Г.Каніскага (раней вал Чырвонай Зоркі) з 22 па 26 ліпеня 1941 г. знаходзіўся адзін з апошніх рубяжоў гераічнай абароны Магілёва. Асноўны цяжар баёў тут лёг на народнае апалчэнне на чале з начальнікам гарадскога штаба ***Марозавым А.І.,***

аблваенкомам палкоўнікам ***Ваяводзіным І.П.*** і іх памочнікамі ***Цярэнцьевым П.Я***., ***Хаўкіным І.Л., Эстэркіным А.А.***

***22 ліпеня*** немцам удалося адціснуць 747-ы стр. полк падпалкоўніка ***Шчаглова А.У.*** ад усходняга берага Дняпра, з боку Лупалава захапіць аэрадром і выйсці да дняпроўскага маста. З гэтага часу яны не спынялі шалёных атак, спрабуючы захапіць мост і ўварвацца ў цэнтр горада. У час адной  з атак немцы прарваліся на правы бераг, але гранатамі ўсе яны былі знішчаны.

Узлаванае адчайнай упартасцю абаронцаў нямецкае камандаванне вырашыла падвергнуць горад ***масіраванаму артылерыйскаму абстрэлу і бамбёжцы з самалётаў.*** Ад выбуху снарада ля харчовага магазіна на вул. Першамайскай, насупраць кінатэатра “Чырвоная зорка”. загінулі дзясяткі гараджан. Больш за 60 параненых былі накіраваны ў бальніцу (ваенны шпіталь). Абрушваліся будынкі  на Савецкай плошчы, варожыя снарады рыкашэцілі ад сцен старажытнай ратушы. Асабліва прыводзіў немцаў у шаленства ***чырвоны сцяг,*** замацаваны апалчэнцамі на вяршыні ратушы. Некалькі разоў сцяг падаў, збіты асколкамі снарадаў, але зноў і зноў ***Эстэркін А. А***. узнімаў яго на шпіле ратушы. У час аднаго з абстрэлаў Эстэркін А. А. быў смяротна паранены, але сцяг працягваў лунаць над горадам.

Легендарным стаў ***подзвіг невядомага салдата-кулямётчыка***, які з ратушы страляў у ворага да самой сваёй смерці. Яго астанкі былі знойдзены ўжо пасля вайны пры абследаванні вежы ратушы. На трэцім яе паверсе, сярод прабітых сцен і згарэўшых лесвіц, ляжаў шкілет чалавека з астаткамі чырвонаармейскай формы, а радам з ім - пржавеўшы кулямёт.

Пасля артабстрэлаў і бамбёжак дзесяткі варожых аўтаматчыкаў кідаліся на мост, але, сустрэўшы дружны агонь апалчэнцаў і чырвонаармейцаў, зноў і зноў адыходзілі назад, пакідаючы на мосце сваіх забітых і параненых. Мост паступова ўсцілаўся трупамі. Палкоўнік ***Ваяводзін І.П.,*** знаходзячыся ў траншэях на валу, асабістым прыкладам натхняў абаронцаў.

Доблесна змагаўся адзін з кулямётчыкаў зенітнай установкі, якая размяшчалася на грузавіку ў раёне вала. З буйнакалібернага 4-х ствольнага кулямёта ён паліваў свінцовым агнём варожую пяхоту, якая раз за разам ішла ў атакі. Гэта быў ***Яшка Цыган***, адважны шыракаплечы баец у чырвоных шараварах, любімец усіх абаронцаў дняпроўскага маста.



Ваяводзін І.П.

Трое сутак спрабаваў вораг прарвацца ў горад праз мост, але ўсе спробы аказаліся марнымі.

Вялікія страты неслі і абаронцы горада. Поўнасцю разам з камандзірам загінуў атрад міліцыянераў ***А.Вольскага,*** многія з апалчэнцаў былі паранены, але заставаліся ў акопах. На пазіцыях кругласутачна працавалі медыцынскія сёстры, бо раненых (без уліку ваенных) было ўжо больш тысячы. А дняпроўскі вал заставаўся непрыступным...

Вечарам 25 ліпеня лейтэнант з штаба 172-й стр. дывізіі цудам дабраўся да ***штаба гарнізона***, які размяшчаўся ***ў падвале касцёла св. Станіслава***. Ён перадаў загад генерала ***Раманава М. Ц.*** аб выхадзе з акружэння ў заходнім накірунку і аб неабходнасці ўзрыву маста праз Дняпро.

***Эпізод з узрывам маста*** яркай легендай увайшоў у гісторыю абароны горада.

Для выканання гэтай задачы папярэдні былі падрыхтаваны два спосабы яго знішчэння: асноўны – шляхам падрыву і дубліруючы – спаліць яго, для чаго ўздоўж стропаў маста былі пастаўлены па 2-3 бочкі керасіна і мазута. Немцы агнём з кулямётаў і аўтаматаў зрашэцілі бочкі і гаручае з іх выцекла. Застаўся адзін спосаб – узрыў. Аднак ў час шматлікіх атак электраўзрыўная сетка была пашкоджана. Некалькі разоў пасылаў камандзір групы сваіх сапёраў пад мост для выпраўлення ўзрыўной сеткі, але безвынікова. Сапёры гінулі, а сетка не дзейнічала.

У гэтыя ж дні да сапёраў-падрыўнікоў прыбіўся хлопчык гадоў 10-12. Ён быў галодны, абарваны і жаласліва прасіў ст. лейтэнанта пакінуць яго з імі. Байцам ён спадабаўся адразу і яму дазволілі застацца. У апошнюю ноч на 26 ліпеня камандзір асобнага атрада загароджванняў маёр ***Кавалёў А. Т.*** загадаў любымі сродкамі ўзарваць мост. Паправіць электрычную сетку ўзрыўнога прыстасавання вызваўся хлопчык. Хоць і шкада было яго байцам, але іншага выйсця не было.

...Падлетак плаўна слізнуў пад мост і ціхенька спусціўся ў ваду. Маленькі хлопчык пралез там, дзе не змаглі прабрацца дарослыя і на здзіўленне ўсім зрасціў правады, як яго навучылі. Ажыла сетка омметра, і на досвітку, калі часці дывізіі з боем выходзілі з горада, а вораг рушыў у чарговую атаку, мост узляцеў у паветра.

У час выхаду з акружэння згубіліся сляды юнага патрыёта і толькі праз 30 год стала вядома першае прозвішча – ***Іван Саміраў.*** Перад вайной ён - выхаванец дзіцячага дома ў в. Прысна Магілёўскага раёна, а затым дзіцячага дома ў Чачэвічах, у гарачыя дні ліпеня 1941 г. быццам бы прыбіўся да сапёраў ля дняпроўскага маста.

Але гісторыя з падлеткам на гэтым не скончылася. Пасля вайны адшукаўся яшчэ адзін удзельнік падрыву маста – ***Павел Канапліцкі*** з в. Прыбар Быхаўскага раёна. У 1980-м годзе стала вядома імя і трэццяга ўдзельніка гэтых падзей – ***Мацвей Койда*** з в.Навасёлкі Магілёўскага р-на. Так гэты эпізод у абароне горада набыў пасля вайны “трох легендарных падрыўнікоў”. Хто з іх сапраўды здзейсніў геройскі ўчынак у ліпені 1941-га года сёння дакладна невядома.



Кузняцоў В.П.

У апошнія дні абароны дывізіённы шпіталь у горадзе быў перапоўнены раненымі. Эвакуіраваць каля 4-х тыс. чалавек было не магчыма. Каб выратаваць ад гібелі камандзіраў і палітработнікаў, ваенныя ўрачы 224-га медсанбата дывізіі ***Кузняцоў В.П., Паршын А.І.*** і ўрач ***Пашанін Ф.І.*** за адну ноч выправілі іх лячэбныя

дакументы, зрабіўшы ўсіх радавымі і беспартыйнымі байцамі.

Атрымаўшы ад камандавання дывізіі адрасы явак і інструкцыі, ***урачы сталі першымі арганізатарамі падпольнай барацьбы ў акупіраваным Магілёве.*** Воінаў, якія папраўляліся, яны тайнымі шляхамі перапраўлялі ў партызаны ці проста на волю, бо шпіталь быў ужо абнесены калючым дротам і хворыя ўтрымліваліся тут, як ваеннапалонныя.

Нямногім больш 3-х месяцаў дзейнічалі ў падполлі ўрачы, але справу зрабілі вялікую – былі выратаваны жыцці соцен людзей і ў рады народных мсціўцаў улілася значная колькасць добра абучаных салдат. Самі ж яны не зберагліся, па даносу правакатара ўрачы былі схоплены і 17 лістапада 1941 г. павешаны на плошчы Свабоды (Савецкай).


Паршын А.І.

За свае геройскія дзеянні ўрачы-патрыёты ў 1970 г. былі пасмяротна ўзнагароджаны ***ордэнамі Айчыннай вайны I ступені***.

Дзесяцігоддзі прайшлі з тых часоў, калі на берагах Дняпра воіны Чырвонай Арміі і апалчэнцы мужна адстойвалі наш горад ад ворага. На працягу трох тыдняў Магілёў быў сапраўднай крэпасцю. За такі час войскі вермахта раней захоплівалі тэрыторыі цэлых дзяржаў. Тут жа галоўнымі бастыёнамі сталі не каменныя сцены і форты, а людзі – байцы і камандзіры двух стралковых дывізій, народныя апалчэнцы – гараджане, рабочыя і служачыя фабрык і заводаў, - усе, для каго Магілёў стаў апошнім блізкім і родным рубяжом. Нямецкае камандаванне разлічвала хутка і без перашкод авалодаць горадам- важным аператыўна-стратэгічным пунктам, буйным вузлом дарог і ліній сувязі. Аднак яно пралічылася, сутыкнуўшыся з добра арганізаванай абаронай, падрыхтаванай воінамі і гараджанамі. Наш ***горад стаў першым, які немцы не змаглі захапіць з ходу***. На подступах да яго войскі Чырвонай Арміі і апалчэнцы скавалі значныя сілы вермахта, спынілі наступальны тэмп бліцкрыга, выйгралі час і сарвалі іх стратэгічныя планы. ***У першы месяц вайны тут было пераканаўча прадэманстравана, што жорсткага і моцнага ворага можна не толькі біць, але і перамагаць.***

Яркія ўспаміны аб значэнні Магілёўскай абароны пакінулі былы першы сакратар ЦК КПБ(б) ***Панамарэнка П.К.***, нямецкі гісторык, былы начальнік аддзела друку гітлераўскага МЗС ***Карэл П. (Пауль Шміт),*** Маршалы Савецкага Саюза ***Варашылаў К. Я., Васілеўскі А. М., Жукаў Р. К., Яроменка А. І.*** Але мы спынімся на ўспамінах апошняга, бо менавіта былы камандуючы Заходнім фронтам Яроменка А. Г. быў сапраўдным знаўцам Магілёўскай абароны, ведаў усе яе складаныя акалічнасці, пасля вайны бываў у Магілёве і неаднойчы сустракаўся з яе ўдзельнікамі. Вось што ён пісаў у сваёй кнізе ***“В начале войны”***: “...благодаря хорошей организации обороны сравнительно малочисленные силы советских войск сдержали напор во много раз превосходящих сил противника. В итоге врагу был нанесён большой урон. Могилёвский очаг обороны содействовал задержке сначала

танковых, а затем и пехотных соединений гитлеровцев и затруднил им взаимодействие с передовыми танковыми группами.

Длительная оборона могилёвского и других рубежей не позволила гитлеровцам произвести фактическую оккупацию занятой ими территории, что ***дало возможность большому количеству наших войск в составе соединений, частей, подразделений мелкими группами выйти из окружения, соединиться со своими частями.***

Удерживая Могилёв в своих руках, ***советские войска в немалой мере нарушали систему снабжения гитлеровских войск.*** Могилёв являлся крупным узлом железных и шоссейных дорог и должен был служить перевалочным пунктом для следовавших с запада людских резервов и воинских грузов. Поэтому гитлеровское командование бросило в 20-х числах июля крупные силы трёх дивизий своих войск на подавление сопротивления одной, лишённой всякой связи с тылами, обескровленной советской дивизии, хотя было ясно, что её сопротивление не может продлиться долго.


Яроменка А.І.

Вместе с тем героическая 23-х дневная оборона Могилёва явила собой ***пример доблести и самоотвер- женности советских воинов и гражданского населения...*** Подвиг могилевчан был неоднократно повторен в дальнейшем, он явился прообразом героической обороны Волгограда, где подвиг защитников белорусского города был повторён в ином, гораздо более крупном масштабе и с иным исходом ...

... народ низко склоняет голову перед этими легендарными героями, без страха и упрёка глядевшими в глаза смерти ... В веках не померкнет слава доблестных защитников Могилёва”.

Па розных дадзеных у баях пад Магілёвам немцы страцілі 24 самалёты, ад 120 да 500 танкаў, каля 400 матацыклаў, ад 500 да 1500 аўтамашын, было знішчана і ўзята ў палон ад 15 да 30 тысяч салдат і афіцэраў. На жаль, дакладны звестак аб стратах праціўніка пад Магілёвам дагэтуль не існуе.

Подзвіг, здзейснены жыхарамі горада і тымі, для каго ён стаў родным і вечным, доўга незаслужана замоўчваўся пасля вайны. Разам з тым, за гэты час абарона Магілёва незабыўнай старонкай лягла ў летапіс Айчыны. ***Мы спадзяемся і глыбока ўпэўнены: прыйдзе час і горад будзе ўдастоены залатой Зоркі Героя.*** Сваім укладам у перамогу над ворагам ён гэтага заслужыў.

## *Л І Т А Р А Т У Р А,*
## *выкарыстаная пры складанні тэксту экскурсіі.*

1. Центральный архив Министерства обороны Российской Федерации (ЦАМО РФ). Полевое управление Брянского фронта. Боевые донесения, оперсводки, разведдонесения, приказы и др.

2. ЦАМО РФ. Ф. 202, о.5, д.65. Отчёты о боевых действиях штабов Западного фронта, 13-й армии, 61-го и 2-го стр. корпусов.

3. ЦАМО РФ. Ф. 747 сп, о.8829, дд. 1,2.

4. ЦАМО РФ. О.2511, д.170. Описание боевых действий 13-й армии.

5. ЦАМО РФ. Ф.6958, о.12484, д. 128. Фотокопии немецких трофейных карт.

6. ЦАМО РФ. Ф. 388 сп., о. 197493, дд. 1, 2, 3.

7. Архив Могилёвского историко-патриотического поискового клуба “Виккру”.

8. Басюк І. А. Навагрудскі “кацёл”.- Гродна, 1998.- 174с.: карт.

9. Барысенка М. Героі вайны – вачыма ворага. //Весн.Магілёва.-1996.- 21 снеж.

10. Барысенка М.С. Батальён пайшоў у легенду. //Весн. Магілёва.- 1995.- 13 крас.

11. Борисенко Н. 110-я уходит в бессмертие. //Весн. Магілёва.- 1999.- 2 лют.

12. Борисенко Н.С. Жаркое лето 41-го. //Магілёўс. ведамасці.- 2000.- 22 чэрв.

13. Борисенко Н.С. Чтобы память жила: Путеводитель по школьным музеям Могилёв. обл. . В 2-х частях.- Могилёв, 2002.

14. Борисенко Н., Борисенко С. К 60-,летию героической обороны г. Могилёва. //Могилёвский поисковый вестник. Вып. 1.- Могилёв, 2001.- С.5-23.

15. Благов И. Дивизия пропавших без вести. //Магілёўс. праўда.- 1991.- 17 студз.

16. Буянов В.И. Истребители танков.- М., 1997.

17. В пламени сражений. Боевой путь 13-й армии.- М., 1973.

18. Великая Отечетвенная война: Краткий научно-попул. очерк. /Под общ. ред. П.А.Жилина.- М., 1970.

19. Воложин П.Ф. Приказано Родиной... .- Мн.: “Силвоксгрупп”, 1997.- 256с.: илл.

20. Громов И.И., Пигунов В. Н. Четвёртый воздушно-десантный.- М., 1990.

21. Дружинин Н. И грянул бой... . //Магілёўс. ведамасці.- 2000.- 10 кастр..

22. Ерёменко А.И. В начале войны.- М., 1965.

23. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць.- Мн.: БелСЭ, 1986.- 406с.: іл.

24. Зинькевич Л. Камень под Могилёвом. //Могилёв. правда.- 2000.- 24 нояб.

25. Кларк А. План “Барбаросса”.- Мн., 2002.

26. Крисковец Е. Только скажите, что вы из Могилёва … . //Могилёв. правда.- 1997.- 24 нояб.

27. Макаров И.Н. Живая земля: Записки секретаря обкома партии.- Мн.: Беларусь, 1985.- 208с.: илл.

28. Могилёв. Энцикл. справ. Мн.: БелСЭ, 1990.-472с.: илл.

29. Навечно в сердце народном. 3-е изд., доп. и испр..- Мн.: БелСЭ, 1984.-607с.: илл.

30. Ножников Н. Судьбы солдатской поле. //Весн. Магілёва.- 2003.- 2 ліп.

31. Ножников Н. Неизвестные ополченцы? //Весн. Магілёва.- 1996.- 11 ліп.

32. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва.- Мн.: БелЭН, 1998.-496с.: іл.

33. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка. Магілёўс. раён.- Мн.: Полымя, 1996.- 660с.: іл.

34. Сандалов Л.М. На московском направлении.- М., 1970.

35. Симонов К. Разные дни войны. Т. 1.- М., 1981.

36. Симонов К. Горячий день. //Известия.- 1941.- 19 июля.

37. Солдатами были все.- Мн.: Беларусь, 1972.-560с.: илл.

38. Стенограмма выступлений участников обороны г. Могилёва в 1941 г. на встрече с бывшым командующим войсками Западного фронта Маршалом Советского Союза Ерёменко А. И. 12 апреля 1963 г.

39. Тарасенко Л. Будешь гидом Симонова! //Могилёв. правда.- 1997.- 4 нояб.

40. Указ ПВС СССР от 9 августа 1941 г. “О награждении орденами и медалями СССР начальствующего и рядового состава Красной Армии”. //Комс. правда.- 1941.- 10 авг.

41. Фонды Могилёвского областного краеведческого музея (МОКМ).

42. Фролов Г. Поимённо …. //Огонёк.- 1966.- №50.

43. Хаўранкова З. Дарагая рэліквія. //Магілёўс. праўда.- 1971.- 10 лістап.

*ДАДАТАК.*

### *АЎТОБУСНЫЯ ЭКСКУРСІЙНЫЯ МАРШРУТЫ, ЯКІЯ СКЛАДУЦЬ 2-ю ЧАСТКУ ЗБОРНІКА "МАГІЛЁЎШЧЫНА – МОЙ ЛЮБЫ І НЕВЯДОМЫ КРАЙ" З УКАЗАННЕМ АСНОЎНЫХ ЭКСКУРСІЙНЫХ АБ'ЕКТАЎ.*

Не шукай ты шчасця, долі,
На чужым далёкім полі,
Ты ўсё знойдзеш гэта блізка
Там, дзе маці над калыскай
Табе песні напявала,
Як малога калыхала.

***Я. Купала.***

### *М А Р Ш Р У Т № 1 ( працягласць 108 км).*




**Магілёў – Буйнічы** (мемарыяльны комплекс абаронцам Магілёва ў 1941 г., бой 1595 г. паміж паўстанцкім атрадам украінскіх казакоў ***С.Налівайкі*** і войскам ВКЛ пад кіраўніцтвам ***К.Буйвіда***) – **Дашкаўка** (гісторыка-краязнаўчы музей Дашкаўскай СШ Магілёўскага р-на; памятны знак на месцы бітвы ў 1812 г. паміж рускімі і французскімі войскамі) **– Баркалабава** ( Баркалабаўскі манастыр і Саборная царква (рэшткі), дзе ствараўся вядомы помнік беларускага і магілёўскага летапісання пач. XVIIст. "Баркалабаўскі летапіс"; гісторыка-краязнаўчы музей Баркалабаўскай СШ Быхаўскага р-на, у якім маюцца звесткі аб заснавальніку замка і в.Баркалабава – ***Баркулабе Корсаку***, дзейнасці ў бібліятэцы замка вядомых асветнікаў XVI – XVII ст.ст. ***Л.Зізанія*** і ***М.Сматрыцкага***; дзейнасці ўраджэнца г. Быхава атамана ***І.Гаркушы***) – **Сапежынка** (стэла на месцы штаба 2-й Заходняй арміі пад камандаваннем генерала ***П.І.Баграціёна*** ў 1812 г.) – **Быхаў** (помнік XVI ст.- замак ***Хадкевічаў-Сапегаў***; архітэктурны помнік пач.XVII ст.- яўрэйская сінагога; раённы гісторыка-краязнаўчы музей) – **Лудчыцы** ( мемарыял воінскай славы на месцы жорсткіх баёў у 1944 г.; этнаграфічны музей Лудчыцкай СШ Быхаўскага р-на) **– Быхаў – Следзюкі** (этнаграфічны музей Следзюкоўскай СШ Быхаўскага р-на) – **Гадылёв**а (торфабрыкетны завод; музей Гадылёўскай СШ Быхаўскага р-на) **– Грудзінаўка** (палаца-паркавы ансамбль пач. XIX ст.; краязнаучы музей Грудзінаўскай СШ Быхаўскага р-на) – **Махава – Магілёў**.

***М А Р Ш Р У Т № 2*** ( працягласць 216 км).




**Магілёў – Лясная** (мемарыяльная капліца і помнік у гонар перамогі рускіх войскаў над шведамі ў бітве пры Лясной у 1708 г.) – **Слаўгарад** (царква Раства Багародзіцы – архітэктурны помнік канца XVIII ст.; будынкі царкоўна-прыхадской школы кан.XVIII ст. і паштовай станцыі 2-й пал. XIX ст.; алея памяці ахвяр чарнобыльскай трагедыі; этнаграфічны музей Дома дзіцячай творчасці; радзіма ***І.І.Грыгаровіча*** (1792-1862) – беларускага археографа, гісторыка, краязнаўца) – **Чэрыкаў** (раённы гісторыка-краязнаўчы музей, будынак бальніцы XIX ст.; радзіма ***С.Кутаргі*** (1809-1886) – рускага гісторыка, доктара філасофіі, члена-карэспандэнта Расійскай Акадэміі навук, ***М.К.Куракі*** (1872-1920) – знакамітага металурга, заснавальніка школы айчынных доменшчыкаў; магіла ***М.М.Лепяшынскага*** – заснавальніка Леменскай доследна-паказальнай школы-камуны, брата П.М.Лепяшынскага) **– Верамейкі** (краязнаўчы музей Верамейкаўскай СШ Чэрыкаўскага р-на) – **Чавусы** (раённы гісторыка-краязнаўчы музей; радзіма ***Кашаваравай-Рудневай В.А.*** – першай у Расіі жанчыны – доктара медыцынскіх навук і ***Насовіча І.І.*** (1788-1877) – беларускага этнографа і фалькларыста) **– Самулкі** (помнік на месцы прарыву з акружэння ў ліпені 1941 г. 61-га стр. корпуса 13-й арміі Заходнягя фронту) – **Гарбавічы** (краязнаўчы музей Гарбавіцкай СШ Чавускага р-на) – **Магілёў** (“Зямлянка” – месца размяшчэння штаба Заходнягя фронту ў ліпені 1941 г.; мемарыяльны знак на пр-це Дзімітрава, дзе ў 1944 г. знаходзіўся назіральны пункт 121-га стр. корпуса, вызваляўшага г. Магілёў).

***М А Р Ш Р У Т  № 3*** (працягласць 324 км).




**Магілёў** (м.2) **– Гарбавічы** (м.2*)* - **Самулкі** (м.2)**–Чавусы** – **Ходасы - Мазалава** (Мазалаўскі Праабражэнскі манастыр) – **Мсціслаў** (раённы гісторыка-краязнаўчы музей; будынкі грамадзянскай архітэктуры кан. XIX – пач. XX ст.ст.; касцёл кармелітаў 1637 г.; Мікалаеўскі сабор XIX ст.; рэшткі Тупічэўскага манастыра XVII ст.; цэрквы: Слабадская XIX ст., Спаса-Праабражэнская XIX ст.,Троіцкая 1831 г., Аляксандра Неўскага 1870 г.; радзіма ***Кутаргі С.С.*** (1805-1861)- доктара медыцынскіх навук, прафесара заалогіі, ***Капіевіча І.Ф.*** (1651-1714) – паплечніка ***Пятра І***, асветніка, кнігавыдаўца; ***Максіма Гарэцкага*** (1893-1938) – беларускага пісьменніка, аднаго з заснавальнікаў нацыянальнай прозы; ***Ткачова М.А.*** (1942-1982) – беларускага археолага, доктара гістарычных навук, ***Пятра Мсціслаўца*** – аднаго з усходнеславянскіх першадрукароў XVI ст.; Дзявочая гара і Замкавая гара) – **Пустынкі** (рэшткі Пустынскага Успенскага манастыру, заснаванага ў 1380 г. мсціслаўскім князем ***Сямёнам Лугвенем***) – **Мсціслаў** – **Горкі** (раённы гісторыка-краязнаўчы музей, Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія; аўтарства паэмы "Тарас на Парнасе"; царква Ушэсця XIX ст.; радзіма двойчы Героя Савецкага Саюза ***Якубоўскага І.І.*** (1912 – 1976) – **Леніно** ( мемарыяльны комплекс савецка-польскай баявой садружнасці) – **Горкі – Дрыбін – Трылесіна** (музей баявой славы Трылесінскай СШ Дрыбінскага р-на, радзіма археолага, гісторыка, краязнаўца ***В.Ф.Капыціна***) – **Кароўчына** (гісторыка-этнаграфічны музей "Бабіна хата" Кароўчынскай СШ

Дрыбінскага р-на) – **Пудаўня** (ваенна-патрыятычны музей Пудаўнянскай СШ Дрыбінскага р-на) – **Магілёў** *(* мемарыяльны знак на месцы назіральнага пункта 121-га ск у 1944 годзе).

***М А Р Ш Р У Т № 4*** (працягласць 237 км).




**Магілёў – Гаі** (помнік батальёну міліцыі капітана ***К.Р.Уладзімірава***) – **Шклоў** (адноўленая ратуша XVIII ст); дом-музей акцёра ***П.М.Алейнікава*** (1914 – 1965); шклоўскі тэатр і балет графа ***С.Г.Зорыча***; касцёл Пятра і Паўла кан. XIX ст; Спаса-Праабражэнская царква пач. XX ст.; былая сінагога XVII ст.; турысцка-экскурсійны комплекс "Лысая гара" і помнік прыроды рэспубліканскага значэння "Ніжнінскі роў") – **Круглае** (раённы гісторыка-краязнаўчы музей; месца дыслакацыі штаба ***Кутузава М.І.*** 15–19 лістапада 1812 г.) – **Дудаковічы** ( Пакроўская царква 1869 г.) – **Тубушкі** (радзіма і месца пахавання генерала ***М.Р.Чарняева*** (1828 – 1898) – ваеннага губернатара Туркестанскага краю, галоўнакамандуючага сербскай арміяй; ***Неўраў М.В.*** (1830-1904) – буйнейшы мастак-перасоўнік, які жыў, працаваў і пахаваны ў в. Лыскаўшчына Круглянскага р-на) – **Цяцерына** (Цяцерынская гідраэлектрастанцыя (1956) – **Бялынічы** (музей і помнік мастаку ***В.К.Бялыніцкаму-Бірулі*** (1872-1957); Бялыніцкі кляштар кармелітаў і царква Раства Багародзіцы (1624-1930) з цудатворнай іконай Бялыніцкай Маці Божай (не існуюць); месца баявых дзеянняў ***Дзяніса Давыдава*** ў 1812 годзе) **– Галоўчын** (месца бітвы ў 1071 г. полацкага князя ***Усяслава Брачыславіча*** з князем Уладзіміра-Валынскім і Тураўскім ***Яраполкам Ізяславічам,*** рускіх і шведскіх войскаў у Паўночную вайну ў 1708 г.; месца баявых дзеянняў у 1812 г. партызанскага атрада Дзяніса Давыдава; калгасны гісторыка-краязнаўчы музей) – **Нежкава** ( XVIII ст.) – **Магілёў**.

*М А Р Ш Р У Т* ***№ 5*** (працягласць 264 км).




**Магілёў** ("Зямлянка") **- Гарбавічы** (м. 2) – **Самулкі** (м. 2) – **Чавусы** (м.2) – **Чэрыкаў** (м.2) – **Сакольнічы** (краязнаўчы музей Сакольніцкай СШ Крычаўскага р-на) - **Крычаў** (раённы гісторыка-краязнаўчы музей; гарадзішча "Замкавая гара"; Мікалаеўская царква XIX ст.; палац князя ***Г.А. Пацёмкіна*** XVIII ст.; сялянскае паўстанне 1743 г. пад кіраўніцтвам ***Васіля Вашчылы***; помнік у гонар абаронцаў горада ў 1941 г., радзіма гісторыка-краязнаўцы ***М.Мельнікава***) – **Мсціслаў** (м.3; былы Андрэеўскі манастыр у в. Сялец Мсціслаўскага р-на) – **Мазалава** (м.3) **- Ходасы** (м.3) – **Чавусы – Магілёў.**

*М А Р Ш Р У Т* ***№ 6*** ( працягласць 306 км).




**Магілёў – Нежкава – Галоўчын** *(*м.4) – **Бялынічы** (м.4) – **Вослiўка** (помнік на месцы боя арт. дывізіёна Героя Савецкага Саюза капітана ***Хігрына Б.Л.*** (1909-1941) у ліпені 1941 г. з нямецкімі танкамі) – **Цяхцін** (гісторыка-краязнаўчы музей Цяхцінскай СШ Былыніцкага р-на; памятны знак на радзіме мастака ***В.К.Бялыніцкага-Бірулі*** (1872-1957) - былым фальварку Крынкі) – **Асман–Касаева** ( да 1964 в. Сермяжынка) перайменавана ў гонар Героя Савецкага Саюза, камандзіра 121-га партызанскага атрада (1941 – 44 гг.*)* ***А.М.Касаева*** (1916 -1944) – **Ядраная Слабада** (XIX ст.) – **Доўгае** (XVI ст.) – **Клічаў** (раённы гісторыка-краязнаўчы музей; Клічаўская партызанская зона; в. Бацэвічы- радзіма ***А.Смоліча*** (1891-1938), вядомага географа, першага беларускага прафесара геаграфіі і першага старшыні Цэнтральнага бюро краязнаўства БССР) – **Усакіна** (Усакінскі мемарыяльны партызанскі комплекс) **– Клічаў – Чыгірынка** (гідраэлектрастанцыя, подзвіг у 1921 г. селяніна ***Мінчукова Н.З.*** (1870-1933), кавалера ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга № 1 РСФСР, атрыманага ім за выратаванне ў час крыгаходу моста праз р. Друць) – **Глухі** (народны музей баявой славы Глухскай СШ Быхаўскага р-на, Маршала авіяцыі Героя Савецкага Саюза ***Красоўскага С.А.***(1897 - 1983), ураджэнца в. Глухі) – **Салтанаўка** (мемарыяльная капліца 1912 г. у гонар 100-годдзя бітвы 7-га корпуса генерал-лейтэнанта ***Раеўскага М.М.*** і французскага корпуса маршала ***Даву Л.Н.*** 11 ліпеня 1812 г.) – **Буйнічы** (м.1) **– Магілёў.**

*М А Р Ш Р У Т № 7* (працягласць 380 км.)




**Магілёў – Буйнічы** (м.6) – **Дашкаўка** (м.1) – **Баркалабава** (м.1) – **Быхаў** (м.1) – **Лудчыцы** (м.1) – **Быхаў –Глухі** (м.6) –**Чыгірынка** (м.6) – **Кіраўск** ( да 1935г. в.Старцы; гісторыка-краязнаўчыя музеі СШ-1 і СШ-2 г.п. Кіраўска) – **Бабруйск** (Бабруйскі гісторыка-краязнаўчы музей; помнікі культавай і грамадзянскай архітэктуры; Бабруйская крэпасць перш. пал. XIXст. - комплекс помнікаў гісторыі і культуры) – **Жылічы** (палаца-паркавы ансамбль XVIII-XIX ст.) – **Бабруйск – Салтанаўка** (м.6) – **Магілёў**.

***М А Р Ш Р У Т № 8*** (працягласць 382 км.)




**Магілёў – Буйнічы** (м.6) – **Салтанаўка** (м.6) – **Глухі** (м.6) – **Чачэвічы** (адпачынак на водасховішчы) – **Клічаў** (м.6) – **Усакіна** (м.6) – **Клічаў – Бацэвічы** (радзіма ***А.Смоліча***) – **р.Ольса** – **Любонічы** (этнаграфічны музей і музей баявой славы Любоніцкай СШ Кіраўскага р-на) – **Бабруйск** (м.7) – **Жылічы** (м.7) – **Бабруйск – Магілёў.**

***М А Р Ш Р У Т № 9*** (працягласць 163 км.).




**Магілёў – Галоўчын** (м.4) – **Круглае** (м.4) – **Друцк** (XI-XII ст.ст., вал гарадзішча, Друцкае Евангелле (знаходзіцца ў Навасібірску) – **Круглае – Цяцерына** (м.4) – **Бялынічы** (м.4) – **Свяцілавічы** (XVI ст., гісторыка -краязнаўчы музей Свяцілавіцкай СШ Бялыніцкага р-на) – **Вішоў** (XVII ст., гісторыка-краязнаўчы музей Вішоўскай СШ) **– Магілёў.**

***М А Р Ш Р У Т № 10*** (працягласць 200 км.)




**Магілёў – Гаі** (м.4) **-Шклоў** (м.4) – **Ляўк**і Аршанскага р-на (філіял Літаратурнага музея ***Я.Купалы*** (1882-1942), былая дача паэта, а зараз Купалаўскі мемарыяльны запаведнік) – **Орша** (1067 г. заснавання; замчышча; рэшткі езуіцкага калегіума 1690г.; былы кляштар трынітарыяў -1714 г.; рэшткі бернардзінскага кляштара 1636 г.; Свята-Троіцкая царква XVII ст.на тэрыторыі былога Багаяўленскага храма; будынак, дзе размяшчалася знакамітая тыпаграфія ***Спірыдона Собаля*** у Куцеінскім манастыры; рэшткі былога базіліянскага мужчынскага кляштара 1774г.; Ільінская царква 1880г.; помнік “Кацюша” каля в. Пішчалава Аршанскага р-на; мемарыяльны музей кіраўніка падпольнай арганізацыі, а затым партызанскага камандзіра Героя Савецкага Саюза ***К.С.Заслонава*** (1910-1942); музей гісторыі і культуры Оршы) – **Магілёў.**

***ЗМЕСТ:***

Кароткі гістарычны нарыс ........................................................................ 6

Архітэктурная спадчына Магілёва (пешаходная экскурсія)........................ 20

Экскурсія – агляд па Старому гораду (пешаходная экскурсія) .................... 93

Абарона Магілёва ў 1941-м годзе (аўтобусная экскурсія) .......................... 139

*Дадатак.* Аўтобусныя экскурсійныя маршруты, якія складуць 2-ю
частку зборніка *“Магілёўшчына – мой любы і невядомы край”*
з указаннем асноўных экскурсійных аб’ектаў............................................ 182

Змест ......................................................................................................... 192

Навукова – папулярнае выданне.

Барысенка Мікалай Сяргеевіч

# *МАГІЛЁЎШЧЫНА – МОЙ ЛЮБЫ І НЕВЯДОМЫ КРАЙ*

Дапаможнік для экскурсаводаў, кіраўнікоў
турысцка – экскурсійных груп навучэнцаў і педагогаў.

Фотаздымкі прадастаўлены Магілёўскім хранікальна – дакументальным цэнтрам "Памяць" і з асабістага архіва аўтара.

Рэдактар *Бяспанскі С.І.*
Карэктар *Ножнікаў М.А.*
Камп'ютарны набор *Барысенка Г.Н.*